МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ПРАГРАМЫ

ДАПАМОЖНАЙ ШКОЛЫ
З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

І АДДЗЯЛЕННЕ

## БЕЛАРУСКАЯ МОВА
## РУССКИЙ ЯЗЫК
## МАТЭМАТЫКА
## ЧАЛАВЕК І СВЕТ
## ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ
## ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ
## САЦЫЯЛЬНА-БЫТАВАЯ АРЫЕНЦІРОЎКА

## I–V класы

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2007

А ў т а р ы - с к л а д а л ь н і к і:

Беларуская мова — **А. М. Змушко, Т. Л. Ляшчынская;**

Русский язык — **Т. Л. Ляшчынская;**

Матэматыка — **У. П. Грыханаў;**

Чалавек і свет — **Т. Л. Ляшчынская, В. І. Аляшкевіч, Ю. М. Кіслякова, Т. В. Лісоўская;**

Працоўнае навучанне — **У. А. Шынкарэнка;**

Фізічная культура і здароўе — **І. Дз. Рацьковіч, В. І. Рацьковіч;**

Сацыяльна-бытавая арыенціроўка — **В. У. Гладкая.**

---

© Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь, 2007
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны
інстытут адукацыі», 2007

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Асаблівасці пазнавальнай дзейнасці ў цэлым і маўлення ў прыватнасці, характэрныя для вучняў дапаможнай школы, абумоўліваюць элементарна-практычны характар навучання іх беларускай мове. Пачатковы курс беларускай мовы ў дапаможнай школе закліканы вырашаць наступныя **задачы**:

- навучыць школьнікаў правільнаму і свядомаму чытанню;
- выпрацаваць свядомыя навыкі пісьма;
- навучыць паслядоўна і дакладна выказваць свае думкі ў вуснай і пісьмовай форме;
- павысіць узровень агульнага развіцця вучняў;
- на матэрыяле мовы і яе сродкамі фарміраваць у вучняў станоўчыя рысы характару;
- выпрацаваць уменне вучыцца, развіваць абагульненыя спосабы вучэбнай дзейнасці;
- карэгіраваць асаблівасці пазнавальнай дзейнасці, маўлення і асобы вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю.

Галоўнай **мэтай** навучання мове ў малодшых класах дапаможнай школы з'яўляецца аваладанне мовай як сродкам зносін дзяцей паміж сабой і з дарослымі. З дадзенай мэты вынікае вядучы карэкцыйны прынцып, які аб'ядноўвае ўсе раздзелы праграмы, — развіццё маўлення, фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі.

Змест і структура праграмы па беларускай мове для малодшых класаў дапаможнай школы адлюстроўвае пошук новай канцэпцыі моўнай адукацыі. Згодна з антрапацэнтрычнай канцэпцыяй, мэтай навучання мове з'яўляецца фарміраванне моўнай асобы — чалавека, які гаворыць, піша, чытае, успрымае мову, з яго маўленчымі і разумовымі здольнасцямі ўспрымаць і параджаць маўленчыя выказванні. На першы план вылучаецца чатырохузроўневая маўленчая дзейнасць (аўдзіраванне, чытанне,

гаварэнне і пісьмо), а асноўнай адзінкай навучання становіцца вусны і пісьмовы тэксты. Школьная граматыка перастае разглядацца як прадмет вывучэння, а робіцца сродкам авалодання мовай ва ўсіх яе функцыях, што спрыяе фарміраванню камунікатыўна актыўнай асобы.

Праграма па беларускай мове для I—V класаў I аддзялення дапаможнай школы з беларускай мовай навучання складаецца з наступных раздзелаў:

1. Навучанне грамаце і развіццё маўлення (I—II класы).
2. Чытанне і развіццё маўлення (II—V класы).
3. Практыкаванні па лексіцы, фанетыцы, граматыцы, правапісе і развіццё маўлення (III—V класы).

Праграма з'яўляецца аднаварыянтнай. Аднак неабходна адзначыць, што ўзроўню патрабаванняў, які заяўлены ў праграме, будуць адпавядаць магчымасці не ўсіх вучняў. Асобным вучням, у залежнасці ад іх пазнавальных магчымасцей, настаўнік сам вызначае індывідуальную праграму навучання.

Працягласць урока ў I класе складае 35 мінут, у II—V класах — 45 мінут. Пасля 15—20 мінут працы арганізуецца дынамічная паўза. Апошнія 10—15 мінут урока, як правіла, адводзяцца на замацаванне, паўтарэнне, таму што ў гэты час працаздольнасць дзяцей ужо зніжана. Хатнія заданні вучням рэкамендуюцца з трэцяй чвэрці II класа, па аб'ёме яны не перавышаюць 1/3 таго, што выканана вучнем на ўроку.

Спецыяльным вучэбным планам на ўрокі беларускай мовы ў I—II класах адводзіцца па 5 гадзін на тыдзень, у III—V класах — па 6 гадзін (3 гадзіны на чытанне і 3 гадзіны на практыкаванні).

## Навучанне грамаце і развіццё маўлення

Навучанне дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю патрабуе дыферэнцыраванага падыходу і ўважлівых адносін да індывідуальных асаблівасцей пазнавальнай дзейнасці кожнага вучня. Нават у сем-восем гадоў некаторыя дзеці няздольныя ўспрымаць і перапрацоўваць той аб'ём інфармацыі, які прадугледжаны праграмай I класа дапаможнай школы. Таму не ўзрост дзяцей з'яўляецца галоўным крытэрыем для залічэння ў I клас. Вызначальнымі з'яўляюцца сфарміраванасць пазнавальных працэсаў, школьная сталасць і псіхалагічная падрыхтаванасць да навучання.

Навучанне грамаце разглядаецца не толькі як навучальны, але і як карэкцыйны працэс. Развіццё пазнавальнай дзейнасці дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю патрабуе спецыяльнага, мэтанакіраванага ўздзеяння і актуалізацыі пачуццёвага ўспрымання, уліку цяжкасцей пераносу сфарміраваных ведаў і ўменняў у новыя сітуацыі. Настаўніку патрэбна быць падрыхтаваным да таго, што вучань I класа не зможа ў многіх выпадках ажыццявіць перанос нават засвоенага спосабу дзеяння, спосабу чытання складоў і напісання асобных элементаў літар.

Складанасць працэсу навучання заключаецца ў тым, што вучні маюць розны ўзровень развіцця. У выкананні заданняў няма аднастайнасці. У адных дзяцей цяжкасці ў навучанні выклікаsuccessfully неразуменнем слова, у другіх — неразвітасцю дробнай маторыкі, у трэціх — няздольнасцю дзейнічаць з апорай на ўзор і г. д. Адукацыйны працэс патрабуе ўліку несфарміраванасці, кароткатэрміновасці цікавасці дзяцей да любой дзейнасці, справы і з'явы. Дзеці хутка страчваюць цікавасць да вучэбнага задання, што патрабуе ад настаўніка вынаходлівасці, імправізацыі, цярплівасці, разумення, добразычлівасці і ўмення разнастаіць дзейнасць на ўроку.

Навучанне грамаце і развіццё маўлення вырашаюць шэраг **задач**, сярод якіх найбольш важнымі з'яўляюцца:

- узбагачэнне і актывізацыя маўленчага вопыту, развіццё маўлення;
- падрыхтоўка да чытання і авалоданне чытаннем даступнага разуменню дзяцей вучэбнага матэрыялу (складоў, слоў, сказаў);
- падрыхтоўка вучняў да пісьма літар, складоў, слоў;
- усебаковае развіццё сенсорнай сферы малодшых школьнікаў і карэкцыя псіхічнага развіцця;
- фарміраванне элементарных уменняў па задавальненні камунікатыўна-дзейнасных патрэбнасцей.

Канцэптуальныя падыходы да навучання грамаце, як і наогул да навучання мове, адлюстроўваюцца ў наступных меркаваннях.

Праграма навучання мове носіць элементарна-практычны характар. Асноўным прынцыпам, які аб'ядноўвае і арганізуе ўсю работу на ўроках мовы, у тым ліку і навучання грамаце, з'яўляецца развіццё маўлення. Асобных урокаў па развіцці маўлення не прадугледжваецца. Яны не значацца ў раскладзе заняткаў,

асобна не плануюцца і не праводзяцца. Развіццё маўлення з'яўляецца неад'емнай, арганічнай часткай кожнага ўрока: ці то ўрок чытання, пісьма, ці інтэграваны ўрок навучання грамаце. Кожны ўрок навучання грамаце ў I—II класах развівае маўленчыя ўменні і навыкі, а таксама элементарныя ўменні чытання і пісьма.

На ўроках навучання грамаце рэалізуецца камунікатыўная стратэгія навучання. Настаўнік на ўроку стварае і падтрымлівае матываваную маўленчую дзейнасць. Першапачаткова выкарыстоўваюцца вербальныя і невербальныя сродкі зносін у працэсе камунікацыі. Гэта абумоўліваецца абмежаванасцю маўленчага развіцця вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Для ўстанаўлення кантакту і ўключэння ў сацыяльнае ўзаемадзеянне безмаўленчых вучняў вербальныя сродкі дапаўняюцца або, пры неабходнасці, замяняюцца невербальнымі (жэстамі, мімікай, рухамі, сімваламі, піктаграмамі). Фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі з'яўляецца галоўнай задачай пры навучанні мове вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Навучанне мове накіравана не столькі на тое, каб вучань засвоіў веды аб мове, колькі на тое, каб навучыць яго карыстацца мовай, выказваць свае патрэбнасці і жаданні, а гэта значыць разумець пачутае, гаварыць, чытаць і пісаць адэкватна сітуацыі зносін.

Навучанне грамаце разглядаецца ў кантэксце сацыялізацыі вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Гэта патрабуе адпаведнага сацыякультурнага развіцця, засваення правіл паводзін, прынятых у грамадстве, сацыяльных правіл выкарыстання мовы. Вучні паступова асэнсоўваюць сваё месца ў зносінах, ролю кожнага ўдзельніка зносін. Камунікатыўнае навучанне прадугледжвае навучанне мове як сродку зносін, гэта значыць навучанне маўленчай дзейнасці. Навучанне не дасць жадаемых вынікаў, калі мова як вучэбны прадмет будзе падзелена на дзве часткі: навучанне грамаце і развіццё маўлення. Інакш кажучы, навучанне грамаце неаддзельна ад фарміравання камунікатыўнай і моўнай кампетэнцыі па задавальненні дзейнасна-камунікатыўных патрэбнасцей. Навучанне маўленчым зносінам патрабуе стварэння маўленчых сітуацый, максімальна набліжаных да натуральных. На ўроках і ў пазакласны час ствараюцца сітуацыі, у якіх вучань для задавальнення актуальнай камунікатыўна-пазнавальнай патрэбнасці карыстаецца мовай у вербальнай ці невербальнай форме (просіць вучэбныя прылады, якіх у яго ня-

ма, паведамляе аб жаданні ўзяць патрэбны прадмет або выканаць пэўнае дзеянне). Вядома, гэта будзе магчыма, калі ў сітуацыях будуць закранацца інтарэсы дзяцей і яны будуць стымуляваццa да ўступлення ў зносіны.

На ўроках навучання грамаце звяртаецца ўвага на фарміраванне маўленчых паводзін. Яны павінны адпавядаць прынятым у беларускамоўнай культуры нормам вербальных зносін, правілам рытуальных (этыкетных) зносін: *добры дзень, дабранач, смачна есці, прабачайце* і г. д. Дзеці знаёмяцца і засвойваюць правілы маўленчага этыкету з першых урокаў. У класе культывуюцца нацыянальна спецыфічныя, устойлівыя ўзоры зносін, прынятыя ў мікрасоцыуме.

Урокі навучання грамаце, як адзначалася, рашаюць задачы карэкцыі псіхафізічнага развіцця вучняў. Карэгіруюцца ўсе пазнавальныя працэсы: адчуванне, успрыманне, уяўленне, памяць, маўленне, мысленне. Разам з тым карэкцыйная работа ажыццяўляецца «зверху ўніз». У карэкцыйнай рабоце вытрымліваецца пэўная паслядоўнасць, улічваецца іерархічнасць парушэнняў. У дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю больш за ўсё парушана мысленне. Таму галоўным у карэкцыйнай рабоце з'яўляецца карэкцыя вышэйшых псіхічных працэсаў: мыслення, маўлення, памяці, праз якія ўдасканальваюцца ніжэйшыя (па генезісу) псіхічныя працэсы: адчуванне, успрыманне, уяўленне, над развіццём якіх таксама вядзецца мэтанакіраваная карэкцыйная работа.

Праграма І класа ўлічвае, што маўленчая практыка дзяцей дашкольнага ўзросту з інтэлектуальнай недастатковасцю недасканалая і няякасная. Працэс авалодання мовай да пачатку навучання такі, што не можа забяспечыць паспяховае засваенне праграмнага матэрыялу кожнага з вучэбных прадметаў. Да таго ж змяненне парадыгмы навучання мове, прызнанне прыярытэтнасці камунікатыўна арыентаванага навучання патрабуюць асаблівай увагі да развіцця вуснага (размоўнага) маўлення ў сітуацыях, максімальна набліжаных да рэальных умоў зносін. У маўленчай практыцы забяспечваецца розная ступень самастойнасці вучняў. Спачатку школьнікі ўзнаўляюць гатовыя ўзоры, затым з дапамогай настаўніка будуюць аналагічныя выказванні, у далейшым спрабуюць самастойна прымяняць набытыя веды.

Работа вучняў на ўроку ў прапедэўтычны перыяд не ацэньваецца сістэмай балаў. Дасягненні ацэньваюцца па шкале «добра»,

«малайчына», «вельмі добра», «выдатна». Галоўным з'яўляецца не канчатковы вынік работы вучня, а станоўчая дынаміка яго дзейнасці, авалоданне новымі маўленчымі ўменнямі. Стымулюецца кожная спроба вучня ўдзельнічаць у камунікацыі.

Навучанне грамаце ў дапаможнай школе працягваецца ў II класе на працягу ўсяго навучальнага года і ажыццяўляецца на аснове гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду. Матэрыялам з'яўляюцца гукі і літары, склады, словы, сказы, кароткія тэксты. Прапануецца іншая, чым у масавай школе, паслядоўнасць вывучэння гукаў і літар, якая адпавядае асаблівасцям пазнавальнай дзейнасці разумова адсталых вучняў. Засваенне гука адбываецца наступным чынам: вылучэнне яго з маўлення, правільнае і выразнае вымаўленне, адрозніванне ў сукупнасці з іншымі гукамі, дыферэнцыяцыя гукаў, якія змешваюцца. Літару вывучаюць у такой паслядоўнасці: успрыманне агульнай яе формы, друкаванай і рукапіснай, вывучэнне саставу літары (элементы і іх месца), параўнанне з іншымі, раней вывучанымі літарамі. Важным момантам з'яўляецца суаднясенне гука з вобразам літары або літары з гукам, які яна абазначае.

Склады вывучаюцца паступова. Спачатку чытаюцца склады-словы ***(ау, уа)***, адваротныя склады ***(ам, ум)***, а потым прамыя склады ***(ма, му)***, закрытыя ***(сам, мох)*** і склады са збегам зычных у пачатку або канцы слова ***(сноп, ліст)***.

У вучняў фаміруюцца першапачатковыя навыкі чытання. Спачатку дзеці авалодваюць навыкамі злітнага чытання складоў і аднаскладовых слоў друкаванага і рукапіснага тэксту, потым чытаюць двух- і трохскладовыя словы, вызначаюць у іх націск. Адначасова вядзецца праца над удакладненнем, накапленнем і актывізацыяй слоўніка вучняў.

Паралельна з чытаннем школьнікі авалодваюць элементарнымі навыкамі пісьма. Дзеці вучацца правільна сядзець за партай (сталом), карыстацца пісьмовымі прыладамі, пісаць вывучаныя літары, злучаць іх у склады і словы, пісаць літару з патрэбным нахілам, прытрымлівацца радка. Практыкаванні ў напісанні слоў, сказаў абапіраюцца на гука-літарны аналіз, папярэдні ўмоўна-графічны запіс.

Пры навучанні грамаце абавязковым з'яўляецца выкарыстанне насценнай касы літар і складоў, індывідуальных кас літар і складоў, наборнага палатна, складовых табліц, набораў для выкладвання ўмоўна-графічнага адлюстравання сказаў і слоў,

складоў і гукаў. Праграмны матэрыял паслябукварнага перыяду з II класа можа быць перанесены ў III, неабходнасць гэтага вызначаецца пазнавальнымі магчымасцямі вучняў.

### Чытанне і развіццё маўлення

Урокі чытання вырашаюць наступныя задачы:

- выпрацоўка навыкаў правільнага, свядомага, выразнага і беглага чытання;
- пашырэнне і паглыбленне ведаў школьнікаў аб навакольным свеце;
- фарміраванне элементарнага ўмення дзяліцца ўражаннем аб прачытаным, пераказваць тэкст.

Для чытання ў III—V класах дапаможнай школы выкарыстоўваюцца творы вуснай народнай творчасці, беларускіх і замежных пісьменнікаў, даступныя для ўспрымання і разумення малодшых школьнікаў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Пры падборы тэкстаў для чытання настаўнік максімальна ўлічвае магчымасці і асаблівасці кожнага вучня.

Праграмай вызначана прыкладная тэматыка чытання, узровень патрабаванняў да тэхнікі чытання, аналізу тэксту і да т. п.

Удасканаленне ўмення чытаць працягваецца ў паслябукварны перыяд, у другім паўгоддзі II класа і ў працэсе пазакласнага чытання.

### Практыкаванні па лексіцы, фанетыцы, граматыцы, правапісе і развіццё маўлення

Асобным раздзелам у праграме III—V класаў з’яўляюцца практыкаванні лексічнага, фанетычнага, граматычнага і правапіснага характару, у працэсе якіх у вучняў фарміруецца ўяўленне аб элементах моўнай рэчаіснасці: тэксце, сказе, слове, гуках і літарах.

Практычны матэрыял гэтага раздзела, як і іншых раздзелаў праграмы, накіраваны на ажыццяўленне маўленчай дзейнасці на роднай мове, г. зн. на развіццё навыкаў слухання і разумення пачутага, чытання, гаварэння і пісьма, а таксама элементарных уменняў і навыкаў у галіне лексічнага і фанетычнага, марфалагічнага і сінтаксічнага аналізу.

Антрапацэнтрычная канцэпцыя навучання мове патрабуе прынцыпова іншай паслядоўнасці падачы вучэбнага матэрыялу.

Асноўнай адзінкай навучання становіцца тэкст. Моўны матэрыял падаецца ў дэдуктыўнай паслядоўнасці: тэкст, сказ, слова, гукі і літары.

**Тэкст**. У ходзе вывучэння матэрыялу гэтага падраздзела школьнікі вучацца распазнаваць тэкст, адрозніваць яго ад групы сказаў, не звязаных паміж сабой па значэнні, вылучаць назву тэксту, асноўную думку, дзяліць тэкст на часткі, упарадкоўваць дэфармаваны тэкст.

**Сказ**. Вучні вылучаюць сказ з тэксту, дзеляць тэкст на сказы, складаюць і развіваюць (пашыраюць) сказы, знаходзяць у сказе галоўныя і даданыя члены, вучацца інтанацыйна і пунктуацыйна правільна афармляць сказ.

**Слова**. У працэсе вывучэння дадзенага падраздзела вучні знаёмяцца з групамі слоў, якія абазначаюць назвы прадметаў, дзеянні і прыметы прадметаў, атрымліваюць першапачатковыя звесткі аб будове слова, вылучаюць корань, вызначаюць групы роднасных слоў, набываюць першапачатковыя ўяўленні аб лексічным значэнні слова, відавых і родавых паняццях, блізкім, процілеглым і мнагазначным значэннях слоў.

**Гукі і літары**. На працягу ўсіх гадоў навучання праводзіцца гука-літарны аналіз, удасканальваецца ўменне адрозніваць гук ад літары, дзяліць словы на склады. Дзеці развіваюць навыкі вымаўлення, засвойваюць правапіс слоў з ***о, э—а, е, ё—я, ў, дз, ц***; галосных пасля ***ж, ш, ч, р, дж***; ужыванне раздзяляльнага мяккага знака і апострафа; напісанне слоў з падоўжанымі зычнымі.

На працягу ўсіх гадоў навучання фарміруюцца і ўдасканальваюцца **графічныя навыкі**: правільнае напісанне малых і вялікіх літар і іх злучэнняў, дасягненне рытмічнасці і плаўнасці пісьма. Увага да дакладнага пісьма павінна мець месца на кожным уроку (па 5—8 мінут). На занятках праводзяцца таксама практыкаванні па выпраўленні і папярэджанні хібаў каліграфічнага характару: непрытрымліванне нахілу літар і роўнай адлегласці паміж элементамі літар, літарамі і словамі на радку; парушэнне паралельнасці аднолькава накіраваных штрыхоў, суразмернасці прапорцый вялікіх і малых літар, лінейнасці (захаванне аднолькавай вышыні літар на ўсім радку пісьма); скажэнне формаў літар або іх асобных элементаў і інш.

ПРАГРАМЫ

# І КЛАС

## НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ І РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ

У навучанні грамаце вылучаюць тры перыяды: дабукварны (прапедэўтычны), букварны (асноўны) і паслябукварны. Працягласць перыядаў вызначаецца ў залежнасці ад складу вучняў, іх падрыхтаванасці да навучання грамаце. Працягласць дабукварнага перыяду — першая чвэрць І класа. Максімальная працягласць можа быць большая, яе вызначае настаўнік у залежнасці ад узроўню падрыхтаванасці вучняў.

Букварны перыяд пачынаецца ў І класе і заканчваецца ў трэцяй чвэрці ІІ класа (можа рэгулявацца настаўнікам у залежнасці ад узроўню падрыхтаванасці дзяцей). Паслябукварны перыяд — другое паўгоддзе (або чацвёртая чвэрць) ІІ класа.

### ДАБУКВАРНЫ ПЕРЫЯД

Пераадоленне ў вучня адчужанасці, боязі і няўмення ўступаць у зносіны з дарослымі і аднагодкамі. Стварэнне матывацыі зносін і практычнага ўзаемадзеяння. Выказванне згоды або нязгоды кіўком галавы, жэстамі. Выказванне словамі і жэстамі просьбы: *дай піць, дай ручку, дай кніжку* і г. д.

Выкананне простых даручэнняў па слоўным заданні настаўніка і вучняў: *падай, прынясі, вазьмі, пакажы, схадзі* і г. д. У час выканання даручэнняў звяртаецца ўвага на маторнае развіццё вучня: што ўмее рабіць, як рухаецца. Заняткі па меры магчымасці носяць дынамічны характар, прадугледжваюць перамяшчэнні вучняў.

Авалоданне вучнямі дыялогамі этыкетнага характару: прывітанне, развітанне, падзяка, прабачэнне.

У рабоце адносна кожнага вучня вызначаюцца аб'ём разумення маўлення і ўзровень развіцця асабістага актыўнага маўлення. Разуменне маўлення выяўляецца пры выкарыстанні ці паказе вучнямі добра знаёмых прадметаў, якія шырока ўжываюцца ў паўсядзённым жыцці. Правяраецца таксама, ці пазнае вучань такія прадметы на малюнках. Паказ прадметаў і дзеянняў імітаваннем: *ідзе дождж, расцвітае кветачка, каток мыец-*

*ца, сабака гаўкае, піла піліць, птушка ляціць; сякуць дровы, забіваюць цвік, шыюць адзенне, мыюць бялізну, выціраюць пыл, наліваюць малако, вешаюць адзенне, надзяваюць абутак* і г. д.

Вучню даюцца рэальныя прадметы ці іх выявы, набліжаныя да натуральных прадметаў або з элементарнай стылізацыяй. Слова і прадмет спачатку даюцца адначасова. Затым вучань паказвае прадмет (малюнак) па яго назве.

Вучні вывучаюць прадметы і выконваюць пальчыкавую гімнастыку.

Устанаўленне ўзроўню разумення маўлення кожным вучнем. Узровень можа быць нулявы, калі вучань добра чуе, але не ўспрымае маўлення тых, хто побач. Сітуатыўны ўзровень развіцця разумення маўлення адносіцца да тых выпадкаў, калі вучань разумее маўленне, просьбы, звязаныя з прадметамі паўсядзённага ўжытку, з пэўнай, добра знаёмай сітуацыяй.

Намінатыўны ўзровень характарызуецца тым, што вучань добра арыентуецца ў назвах прадметаў, але з цяжкасцю арыентуецца ў назвах дзеянняў. Прэдыкатыўны ўзровень развіцця маўлення адлюстроўвае веданне назваў дзеянняў. Нарэшце, расчлянёны ўзровень характарызуе тое, што вучань адрознівае змяненні ў значэнні слова, якія ўносяцца прыстаўкамі, суфіксамі, канчаткамі.

Удакладняюцца распазнаванне і называнне прадметаў, аб'ём зрокава-прасторавых успрыманняў *(злева направа, зверху ўніз)* і часавых уяўленняў *(спачатку, затым, нарэшце)*. Правяраецца разуменне значэння слоў-назваў прадуктаў, адзення, посуду. Пазнаванне гэтых і іншых прадметаў, прад'яўленых у незнаёмым ракурсе.

Распазнаванне агародніны і садавіны ва ўмовах візуальнай зашумленасці, пры накладванні адной выявы на іншую.

Класіфікацыя прадметаў па колеры, форме, велічыні, матэрыяле, прызначэнні.

Прыкладная тэматыка абагульнення і групоўкі прадметаў: звяры, птушкі, насякомыя, дрэвы, кусты, травы, адзенне, абутак, мэбля, посуд, інструменты, машыны. Напрыклад, *кот, сабака, елка — каго ці што можна згрупаваць?* (Якія словы можна аб'яднаць у адну групу?) Выключэнне лішняга прадмета. Напрыклад, *певень, курыца мядзведзь — хто лішні?*

Слоўнікавая работа ў дабукварны перыяд заключаецца ва ўдакладненні і пашырэнні ўяўленняў дзяцей аб навакольнай

рэчаіснасці і развіцці на гэтай аснове маўлення. Гэтая задача вырашаецца як у працэсе назіранняў і экскурсій, так і пры рабоце над сюжэтнымі карцінкамі, прадметнымі малюнкамі, серыямі ілюстрацый да казак, вершаў, апавяданняў. Дзеці суадносяць словы, якія ўжываюцца ў вусным маўленні, з прадметамі і з'явамі навакольнага асяроддзя.

Лексічны матэрыял (па азначаных тэмах) уводзіцца і прапрацоўваецца ў наступнай паслядоўнасці:

словы-гукапераймanні;

словы, якія складаюцца з двух аднолькавых складоў: *баба, ляля, няня, тата, мама;*

словы з двух складоў з націскам на першым складзе: *Ніна, мыла, каша, рама, сані;*

аднаскладовыя словы: *кот, суп, лоб, нос, лес, мяч;*

двухскладовыя словы з націскам на другім складзе: *вада, нага, рука, бурак;*

двухскладовыя словы са збегам зычных і трохскладовыя словы: *шапка, лыжка, агурок.*

Лагічныя практыкаванні прадугледжваюць аналіз, сінтэз, параўнанне. Вучні па частцы пазнаюць прадмет, вылучаюць прыметы прадмета, параўноўваюць, абагульняюць і групуюць прадметы, знаходзяць недакладнасці: чаго не бывае, што намалявана няправільна.

Развучванне кароткіх вершаў з голасу настаўніка. Называнне карцінак і складванне па карцінках простых сказаў. Слуханне казак і апавяданняў пры выкарыстанні нагляднага матэрыялу і драматызацыі. Адказы па змесце праслуханага на аснове выкарыстання нагляднага матэрыялу.

Выкананне інструкцыі: *пакажы, выберы, параўнай, прынясі, пакладзі, падымі, знайдзі, дай* і г. д.

Дабукварны перыяд забяспечвае падрыхтоўку да чытання і ўключае работу над словам, сказам, складам, гукам.

**Слова**. Практычнае знаёмства са словамі. Фіксацыя слова ўмоўна-графічным абазначэннем. «Чытанне» зафіксаваных слоў, жэстаў, выразу твару. Падбор слоў да карцінак. Вылучэнне слоў з маўленчага матэрыялу.

**Сказ.** Практычнае знаёмства са сказам. Фіксацыя сказа ўмоўна-графічным абазначэннем. Выдзяленне слоў у сказе. Складанне схем сказаў. Раскадзіраванне ўмоўна-графічнай схемы сказа, якi адносіцца да пэўнай карцінкі. «Чытанне» сказаў па схеме.

Падлік колькасці слоў (2—3 словы). Складанне сказаў па карцінках. Выдзяленне сказаў з маўлення.

**Склад.** Плаўнае і пакладовае прагаворванне слоў. Практычнае знаёмства са складам як часткай слова. Адстукванне, адпляскванне складовага саставу слова. Дзяленне слоў на склады з фіксацыяй умоўна-графічнай схемы. «Чытанне» слоў па складах з апорай на схемы да прадметных карцінак.

**Гук.** Адпрацоўка дакладнага, правільнага гукавымаўлення ў складах, словах, вершах, забаўлянках. Адрозненне гукаў у навакольнай рэчаіснасці. Развіццё слыхавога ўспрымання на матэрыяле гульнёвых практыкаванняў. Выдзяленне гука і яго кадзіраванне ўмоўным значком.

Падбор слоў, якія пачынаюцца з пэўнага гука з апорай на нагляднасць.

Распазнаванне зададзенага гука ў словах. Вызначэнне месца гука ў слове: у пачатку, у канцы.

Кадзіраванне гукаў у слове і раскадзіраванне слова пад прадметнай карцінкай па графічнай схеме.

## БУКВАРНЫ ПЕРЫЯД

### *1-ы этап:* гукі і літары *а, у, о, м, с, х*

Правільнае і выразнае вымаўленне дадзеных гукаў. Распазнаванне іх у пачатку, у сярэдзіне і на канцы слова. Літара. Суаднясенне літары з гукам. Практычнае адрозненне галосных і зычных пры чытанні. Утварэнне слоў з дадзеных гукаў і літар і чытанне гэтых слоў: ***ау, уа, ах, ох.*** Утварэнне і чытанне адваротных і прамых, адкрытых і закрытых складоў (пасля аналізу і па падабенстве): ***ам, ом, ум, ма, му, мо, ас, ос, ус, са, со, су, ах, ух, ох, ха, ху, хо*** і інш. Параўнанне складоў. Складанне і чытанне слоў з двух складоў: *ма-ма, са-ма, му-ха* і г. д.

Утварэнне і чытанне трохлітарных слоў, якія складаюцца з аднаго закрытага складу: *сам* і да т. п.

Навучанне пісьму. Пісьмо друкаваных літар. Выкананне «бардзюраў». Напісанне літар па ўзоры, іх замалёўка.

### *2-і этап:* гукі і літары *ш, л, н, ы, р, і, к, п, т*

Паўтарэнне вывучаных гукаў і літар і вывучэнне новых. Абазначэнне іх літарамі. Вызначэнне месца гука і літары (у пачатку, у сярэдзіне, на канцы слова). Складанне літар з дзвюх пала-

чак: ***Т, Х, Л, У***. Складанне літар з трох палачак: ***А, Н***. Складанне літар з чатырох палачак: ***О, М, Ш***. Знаходжанне пэўнай літары ва ўмовах візуальнай зашумленасці; пазнаванне літар пры накладванні адной на іншую; вылучэнне літары сярод тых, якія напісаны люстрана. Канструяванне літар з мазаікі, кавалачкаў паперы, з асобных элементаў. Пераўтварэнне літар на аснове агульных элементаў: ***Л — А***. Называнне і параўнанне падобных літар.

**Чытанне складоў і слоў.** Чытанне адваротных і прамых двухгукавых складоў у парадку праходжання літар. Параўнанне складоў.

Складанне слоў са складоў з апорай на карцінку. Умоўнаграфічная схема слоў. Далучэнне складу да складу для ўтварэння новага слова. Чытанне слоў, якія складаюцца з аднаго і двух складоў. Спосаб (гукавы аналітыка-сінтэтычны, цэлых слоў, па падабенстве, з кінетычным падмацаваннем і інш.) выбірае настаўнік.

### Навучанне пісьму

Змест, паслядоўнасць, тэмп работы залежаць ад развітасці дробнай маторыкі пальцаў рук вучня.

Развіццё каардынацыі рухаў кісці і пальцаў рукі. Выразанне карцінак, правядзенне гарызантальных, вертыкальных і нахіленых прамых ліній.

Пісьмо друкаваных літар (па трафарэтах і адвольна). Выкананне «бардзюраў», якія складаюцца з прамых палачак, з палачак з закругленнем уверсе і ўнізе. Напісанне авалаў, паўавалаў, палачак з пяцелькай.

Напісанне літар па ўзоры, дамалёўка літар, напісанне кароткіх слоў. Вялікая літара ў пачатку сказа. Кропка ў канцы сказа *(практычнае знаёмства)*.

# II КЛАС

## НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ І РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ

### *1-ы і 2-і этапы:* гукі і літары *а, у, о, м, с, х, ш, л, н, ы, р, і, к, п, т*

**Чытанне.** Паўтарэнне вывучаных гукаў і літар.

Чытанне сказаў з двух-трох слоў.

Чытанне тэкстаў з двух-трох сказаў.

**Пісьмо.** Засваенне рукапіснага напісання вывучаемых літар, вялікіх і малых.

Спісванне з друкаванага і рукапіснага тэкстаў літар і складоў.

Спісванне з рукапіснага тэксту слоў, якія ўтвораны з вывучаных складоў.

Пісьмо пад дыктоўку асобных літар, складоў, слоў пасля іх гука-літарнага аналізу.

### *3-і этап:* гукі і літары *з, в, ж, б, г, д, й, ь, ў, э, дз, дж*

**Чытанне.** Дакладнае вымаўленне гукаў дадзеных літар.

Вызначэнне месца гука і літары ў слове.

Практычнае адрозненне галосных і зычных гукаў. Дыферэнцыяцыя парных зычных у складах і словах.

Утварэнне і чытанне адваротных і прамых, адкрытых і закрытых складоў з цвёрдымі і мяккімі зычнымі ў пачатку складу, чытанне закрытых складоў з мяккім зычным на канцы; ***ка, ко, кі, па, пы, пі, за, зу, зо, зі, аз, ань, унь*** і інш.

Складанне і чытанне па складах слоў з двух складоў: *ка-за, ва-за, жа-ба, та-та, ва-зі* і інш.

Складанне і чытанне па складах слоў з трох складоў: *да-ро-га, ры-ба-кі, ва-ро-ты* і інш.

Чытанне сказаў з двух—чатырох слоў з адпаведнай інтанацыяй канца сказа.

Чытанне невялікіх тэкстаў з двух—чатырох сказаў. Падбор слова, сказа, тэксту да малюнка. Выбар патрэбнага малюнка да слова, сказа, тэксту з шэрагу падобных.

**Пісьмо.** Засваенне рукапіснага напісання малых і вялікіх (калі яны існуюць) літар ***з, в, ж, б, г, д, й, ў, ь.***

Спісванне з рукапіснага і друкаванага тэкстаў літар, складоў, слоў.

Пісьмо па ўзоры сказаў з двух слоў.

Вялікая літара ў пачатку сказа, кропка на канцы сказа.

Пісьмо пад дыктоўку літар, складоў, простых слоў пасля іх гука-літарнага аналізу.

Складанне і запіс вывучаных складоў.

Спісванне слоў пад малюнкам з устаўкай прапушчанай літары.

### *4-ы этап:* гукі і літары *е, я, ё, ю, ц, ч, ф.* Апостраф

Паўтарэнне вывучаных гукаў і літар і вывучэнне новых.

**Чытанне.** Дакладнае вымаўленне гукаў. Практыкаванні ў правільным вымаўленні гукаў, спецыфічных для беларускай мовы. Знаходжанне гэтых гукаў у словах.

Практычнае адрозніванне галосных і зычных гукаў, цвёрдых і мяккіх зычных.

Утварэнне і чытанне складоў, у тым ліку са збегам двух зычных.

Утварэнне і чытанне слоў з аднаго—трох складоў.

Чытанне сказаў з двух—пяці слоў з інтанацыяй канца сказа, пытання і воклічу.

Чытанне тэксту з гэтых сказаў.

Вызначэнне назвы з тэксту. Вызначэнне, аб кім або аб чым гаворыцца ў тэксце.

Суаднясенне ілюстрацый і слоўнага матэрыялу. Выбар патрэбнай ілюстрацыі з шэрагу падобных.

Знаходжанне і чытанне ў тэксце сказаў, слоў да малюнка, пытання, задання.

Чытанне з прыдумваннем канца апавядання па малюнку, апорных словах, заданні.

Развучванне вершаў, пацешак, скорагаворак, загадак на слых і па буквары.

### ПАСЛЯБУКВАРНЫ ПЕРЫЯД

**Чытанне.** Чытанне спецыяльна складзеных або падабраных складоў, слоў, сказаў, тэкстаў на замацаванне цяжкіх для засваення гукаў і літар; апазіцыйных гукаў; груп зычных гукаў, што змешваюцца (звонкія і глухія, свісцячыя і шыпячыя); груп літар, падобных па напісанні; цяжкіх для вымаўлення складоў; слоў з чатырох-пяці складоў.

Развучванне невялікіх вершаў, загадак на слых і па кнізе.

Пры нізкім узроўні пазнавальных магчымасцей вучняў паслябукварны перыяд можа быць перанесены ў III клас.

**Пазакласнае чытанне.** Разглядванне і чытанне (чытанне-разглядванне) невялікіх маляўнічых кніг для дзяцей дашкольнага ўзросту. Знаходжанне назвы кнігі, твора і прозвішча аўтара.

**Пісьмо.** Засваенне рукапіснага напісання малых і вялікіх літар, апострафа.

Спісванне з друкаванага і рукапіснага тэкстаў складоў, слоў і сказаў з трох-чатырох слоў.

Вялікая літара ў імёнах людзей.

Пісьмо на слых літар і складоў.

Пісьмо пад дыктоўку слоў і сказаў з двух—чатырох слоў з іх папярэднім аналізам.

Самастойнае складанне і запіс слоў з дзвюх—чатырох літар.

Падстаноўка прапушчаных літар у словах пры спісванні.

Кантрольнае спісванне.

ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ:

распазнаваць гукі на слых і ў вымаўленні;

аналізаваць словы па гукавым складзе, складаць словы з літар і складоў;

плаўна і правільна чытаць па складах, з паступовым пераходам да чытання цэлымі словамі, словы, сказы, кароткія тэксты;

адказваць на пытанні па змесце прачытанага і па ілюстрацыях да тэксту;

слухаць невялікі тэкст (апавяданне, казку, верш) і адказваць на пытанні па змесце;

арыентавацца ў змесце дзіцячай кнігі па малюнках, назве кнігі і твораў у ёй;

пісаць малыя і вялікія літары;

спісваць з друкаванага і рукапіснага тэкстаў словы і кароткія сказы;

пісаць на слых асобныя літары, словы і сказы.

# III КЛАС

## ЧЫТАННЕ І РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ

### Прыкладная тэматыка чытання

Невялікія па аб'ёме творы вуснай народнай творчасці: прыказкі, казкі, скорагаворкі, пацешкі, песні, загадкі; мастацкія творы пра восень, зіму, вясну, лета; невялікія апавяданні і вершы пра жыццё і справы дзяцей, іх сяброўства, клопаты; тэксты пра маці, сям'ю.

### Свядомае чытанне

Вызначэнне, пра каго або пра што гаворыцца ў прачытаным тэксце, сказе.

Выбар слова, сказа, якія адпавядаюць ілюстрацыі, і наадварот.

Знаходжанне і чытанне слова, сказа, указаных настаўнікам (выбарачнае чытанне).

Падбор назвы да тэксту.

Развучванне невялікіх вершаў на слых.

### Спосаб чытання

Чытанне па складах з паступовым пераходам да чытання цэлымі словамі.

### Правільнае арфаграфічнае чытанне

Дакладнае вымаўленне гукаў і складоў усіх відаў (адваротных, прамых, адкрытых, закрытых, са збегам зычных).

Чытанне слоў з аднаго-двух складоў без скажэння гукавога складу.

### Выразнае чытанне

Чытанне з захаваннем неабходных інтанацый (канца сказа, пытання, воклічу).

Чытанне са змяненнем сілы голасу (гучна, ціха, шэптам).

Выразнае чытанне па памяці вершаў, пацешак.

**Пазакласнае чытанне** невялікіх маляўнічых кніг для дзяцей дашкольнага ўзросту. Знаходжанне ў кнізе месца, якое адпавядае малюнку, і наадварот. Арыентацыя ў назве кнігі. Аўтар кнігі.

ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ:

слухаць невялікія казкі, вершы, апавяданні;

чытаць па складах невялікія тэксты;

перадаваць эмацыянальныя адносіны да тэксту;

ведаць на памяць 3—4 кароткія вершы і выразна чытаць іх перад класам;

вызначаць тэму тэкстаў.

## ПРАКТЫКАВАННІ ПА ЛЕКСІЦЫ, ФАНЕТЫЦЫ, ГРАМАТЫЦЫ, ПРАВАПІСЕ І РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ

### Тэкст

Элементарнае ўяўленне пра тэкст. Назва тэксту.

Упарадкаванне дэфармаванага тэксту (з двух-трох сказаў).

Адказы на пытанні настаўніка па тэксце.

Стварэнне тэксту па серыі малюнкаў.

### Сказ

Вылучэнне сказа з тэксту ці з вуснага маўлення.

Графічнае адлюстраванне сказа.

Вялікая літара ў пачатку сказа і кропка ў канцы.

Вызначэнне ў сказе колькасці слоў. Паслядоўнасць слоў у сказе.

Утварэнне сказа з прапанаваных слоў (у патрэбнай форме), па пытанні, па малюнку.

Заканчэнне сказа.

### Слова

Вычляненне слова са сказа.

Практычнае азнаямленне са словамі, якія абазначаюць назву прадмета. Пастаноўка да іх пытанняў х т о? ш т о?

Распазнаванне слоў, якія абазначаюць: адзін і некалькі аднолькавых прадметаў *(дом—дамы, лялька—лялькі)*; частку прадмета і цэлы прадмет *(сцябло—дрэва, кветка)*; некалькі падобных прадметаў *(канапа, ложак)*.

Віда-радавая групоўка слоў, што абазначаюць прадметы *(цацкі, мэбля, агародніна, садавіна, адзенне, посуд)*. Падбор абагульняльнага слова.

Вялікая літара ў імёнах, прозвішчах людзей, у мянушках жывёл.

Распазнаванне слоў, якія называюць дзеянні прадметаў. Пастаноўка да іх пытанняў ш т о р о б і ц ь? ш т о р о б я ц ь? ш т о р а б і ў?

Вылучэнне са сказаў слоў, якія называюць дзеянне.

Адрозненне прадметаў па дзеянні.

Выяўленне некаторых прымет прадметаў па пытаннях я к і? я к а я? я к о е? я к і я? (колер, форма, велічыня, матэрыял).

## Гукі і літары

Вычляненне гукаў са слоў.

Гукі і літары. Супадзенне гука і літары ў слове.

Гука-літарны аналіз слоў з супадзеннем гукаў і літар.

Галосныя і зычныя гукі і іх літары; іх адрозненне.

Галосныя гукі і іх літары. Абазначэнне на пісьме шасці галосных гукаў [*а*], [*о*], [*э*], [*і*], [*ы*], [*у*] дзесяццю літарамі: ***а, о, э, і, ы, у, я, ё, е, ю***. Гукі літар ***я, ё, е, ю*** ў пазіцыі пасля зычнага.

Зычныя гукі і іх літары.

Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі, іх адрозненне. Абазначэнне мяккасці зычных гукаў на пісьме літарамі ***я, ё, е, ю, і***.

Літара мяккі знак ***(ь)***. Выкарыстанне яе для абазначэння мяккасці зычных гукаў на пісьме.

Звонкія і глухія зычныя гукі і іх літары.

Літары і гукі ***д, дз, дж***.

Літары і гукі ***у—ў***, іх адрозненне ([*у*] — галосны, [*ў*] — зычны).

Літары і гукі ***і—й***, іх адрозненне ([*і*] — галосны, [*й*] — зычны).

Склад як частка слова. Дзяленне слова на склады. Перанос слоў па складах на пісьме (з дапамогай настаўніка).

Націск. Выдзяленне націску ў словах, выяўленне націскных і ненаціскных складоў.

## Пісьмо і чыстапісанне

Адпрацоўка правільнага напісання малых і вялікіх літар і іх злучэнняў.

Замацаванне гігіенічных навыкаў пісьма: правільнай пасадкі, размяшчэння сшытка, ручкі і інш.

Выкананне пісьмовых заданняў з дапамогай настаўніка.

Спісванне (з рукапіснага і друкаванага тэкстаў; з дапісваннем прапушчаных літар, выбарачнае, кантрольнае). Складанне слоў-надпісаў да малюнкаў з літар разразной азбукі.

Дыктанты (літарныя, складовыя, слоўнікавыя; зрокавыя, слыхавыя; папераджальныя, тлумачальныя, кантрольныя).

Запіс пад дыктоўку кароткіх сказаў.

ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ:

вылучаць назву з тэксту;

вылучаць сказ з тэксту, з маўлення, складаць сказ;

пісаць сказ з вялікай літары, ставіць кропку ў канцы сказа;

ставіць пытанне да слова;

аналізаваць словы па літарным складзе, дыферэнцыраваць гукі галосныя і зычныя, зычныя цвёрдыя і мяккія;

спісваць з прагаворваннем па складах з рукапіснага і друкаванага тэкстаў;

пісаць пад дыктоўку словы, вымаўленне і напісанне якіх супадае; кароткія сказы (з двух-трох слоў).

# IV КЛАС

## ЧЫТАННЕ І РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ

### Прыкладная тэматыка чытання

Творы вуснай народнай творчасці. Невялікія апавяданні, вершы, артыкулы беларускіх аўтараў пра Радзіму, пра дзяцей і дарослых, пра святы і знамянальныя даты, пра адносіны чалавека да працы, прыроды, пра жывёл і расліны, на тэмы, звязаныя з этычнымі паводзінамі, і інш.

### Спосаб чытання

Чытанне цэлымі словамі.

Паскладовае чытанне цяжкіх для ўспрымання слоў.

### Правільнае чытанне

Арфаэпічнае чытанне ўголас знаёмага і незнаёмага тэкстаў, простых па змесце і невялікіх па аб'ёме.

### Свядомае чытанне

Элементарнае ўсведамленне зместу і эмацыянальная ацэнка тэксту.

Вызначэнне тэмы тэксту.

Аналіз назвы тэксту.

Тлумачэнне слоў і выразаў з апорай на нагляднасць. Слоўнікі пасля тэксту.

Адказы на пытанні па змесце прачытанага і па ілюстрацыях.

Выбарачнае чытанне.

Падзел тэксту на часткі з апорай на ілюстрацыі, упарадкаванне па ілюстрацыях дэфармаванага тэксту.

Працяг незакончанага апавядання па ілюстрацыях.

Вывады па прачытаным тэксце, параўнанне прачытанага з вопытам дзяцей, са зместам раней прачытанага тэксту.

Складанне апавядання па серыі малюнкаў.

### Выразнае чытанне

Плаўнае чытанне з паўзамі на знаках прыпынку.

Чытанне з інтанацыяй, адпаведнай знаку прыпынку ў канцы сказа.

Выразнае чытанне па асобах дыялогаў і невялікіх сцэнак з прачытаных казак і апавяданняў.

Выразнае чытанне па памяці кароткіх вершаў.

**Пазакласнае чытанне** невялікіх, маляўніча афармленых твораў беларускіх пісьменнікаў для дзяцей. Запіс назвы і аўтара твора. Арыентацыя ў структуры кнігі: вокладка, змест (тэкст і ілюстрацыі), колькасць старонак.

ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ:

правільна і свядома чытаць тэкст цэлымі словамі, цяжкія па структуры словы — па складах;

адказваць на пытанні да прачытанага;

выказваць адносіны да падзей, з'яў і ўчынкаў герояў;

ведаць на памяць 4—5 вершаў;

выбіраць кнігі для пазакласнага чытання ў школьнай бібліятэцы.

## ПРАКТЫКАВАННІ ПА ЛЕКСІЦЫ, ФАНЕТЫЦЫ, ГРАМАТЫЦЫ, ПРАВАПІСЕ І РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ

### Тэкст

Тэкст і не тэкст. Адрозненне тэкстаў ад асобных сказаў, не аб'яднаных па сэнсе. Распазнаванне тэксту і не тэксту.

Тэма тэксту. Назва тэксту.

Чырвоны радок у пачатку тэксту. Абзац.

Узнаўленне дэфармаванага тэксту з дапамогай серыі малюнкаў.

Падзел тэксту на сказы.

Сувязь сказаў у тэксце.Назіранне за заменай назвы прадмета асабовымі займеннікамі *(я, ён, яна, яно, ты, яны, ім, іх, яго, яму, яе, ёй, ёю)*.

Пераказ тэксту па пытаннях і па дадзеным плане.

Калектыўнае складанне невялікага тэксту на аснове ўласных назіранняў, па сюжэтным малюнку з дапамогай пытанняў.

## Сказ

Сказ як адзінка маўлення.

Вычляненне сказа з тэксту.

Вызначэнне, пра што або пра каго гаворыцца ў сказе.

Графічнае адлюстраванне сказа.

Вялікая літара ў пачатку сказа і кропка ў канцы.

Заканчэнне сказа адным або некалькімі словамі з дапамогай пытанняў.

Пашырэнне сказа адным або некалькімі словамі па пытаннях я к і? я к а я? я к о е? я к і я?

Складанне сказаў па пытаннях настаўніка.

Упарадкаванне дэфармаванага сказа, у якім словы знаходзяцца ў патрэбнай форме.

## Слова

Вычляненне слова са сказа.

Словы як назвы прадметаў, прымет, дзеянняў.

Словы, якія абазначаюць назвы прадметаў.

Вызначэнне слоў-назваў прадметаў па пытаннях х т о? ш т о?

Падбор слоў, якія адказваюць на пытанні х т о? ш т о? на пэўную тэму.

Ужыванне дадзенай катэгорыі слоў у розных формах у залежнасці ад сувязі іх з іншымі словамі ў сказе па пытаннях к а г о? ч а г о? к а м у? ч а м у? к а г о? ш т о? к і м? ч ы м? а б к і м? а б ч ы м?

Вялікая літара ў імёнах, імёнах па бацьку, прозвішчах людзей, мянушках жывёл, у назвах гарадоў, вёсак, вуліц. Хатні адрас. Адрас школы.

Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

Распазнаванне слоў, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, у сказах.

Называнне слоў па пытаннях ш т о р о б і ц ь? ш т о р а б і ў? ш т о з р а б і ў? ш т о з р о б і ц ь? ш т о б у д з е р а б і ц ь?

Дапасаванне па пытаннях слоў, якія абазначаюць дзеянні, да слоў, якія абазначаюць назвы прадметаў.

Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

Называнне прыметы прадмета па пытаннях я к і? я к а я? я к о е? я к і я? Падбор некалькіх слоў-назваў прымет аднаго прадмета.

Дапасаванне па пытаннях слоў, якія абазначаюць прыметы прадметаў, да слоў-назваў прадметаў.

Складанне спалучэнняў слоў па малюнках.

Пашырэнне сказаў словамі, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

### Гукі і літары

Вычляненне гукаў са слоў.

Назіранне за вымаўленнем гукаў у слове, за залежнасцю лексічнага значэння ад гукавога саставу слова: *кот—кіт—кут, шыба—шына—шыла; вочы—ночы; шар—пар—жар.*

Літара як графічнае адлюстраванне гука.

Алфавіт. Чытанне літар алфавіта.

Выкарыстанне алфавіта: размяшчэнне слоў у алфавітным парадку (спіс вучняў класа).

Літары ***е, ё, і, ю, я,*** іх гукі ў пачатку слова або складу.

Гук і літара ***й***. Адрозненне гукаў [***й***] і [***і***].

Гук і літара ***ў***. Назіранне за чаргаваннем ***в—ў*** *(трава—траўка)*, ***л—ў*** *(вучыла—вучыў)*. Правапіс літары ***ў*** у сярэдзіне і пачатку слова.

Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме літарамі ***е, ё, і, ю, я***. Напісанне літар ***а, о, у, ы, э*** пасля цвёрдых зычных і ***е, ё, і, ю, я*** пасля мяккіх зычных.

Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме мяккім знакам.

Мяккі знак як літара, якая не абазначае гука.

Падзел слоў на склады.

Правільны перанос слоў. Асаблівасці пераносу слоў з літарамі ***дз*** *(ся-дзець)*, ***дж*** *(ся-джу)*, ***й*** *(со-ней-ка)*, ***ў*** *(лаў-ка)*, ***ь*** *(кань-кі)*.

Гукі і літары ***д—дз*** і ***т—ц***. Напісанне літар ***дз, ц*** перад галоснымі ***е, ё, і, ю, я*** *(горад—у горадзе, лета—аб леце)*.

Зацвярдзелыя зычныя [***ж***], [***ш***], [***р***], [***ц***], [***ч***], [***дж***] і літары ***а, о, у, ы, э*** пасля іх.

Націск. Адрозненне націскных і ненаціскных складоў. Вызначэнне націску ў слове. Знак націску.

Залежнасць правапісу літар галосных гукаў ***о, э, а*** і ***е, ё, я*** ад націску. Вымаўленне і напісанне ***о, э*** пад націскам, ***а*** — на месцы ***о, э*** ў ненаціскным становішчы *(ногі—нага, рэкі—рака)*. Вымаўленне і напісанне ***я*** на месцы ***е, ё*** ў першым пераднаціскным складзе *(несці—нясу, сёстры—сястра)*.

Раздзяляльныя знакі: апостраф *(сям'я, вераб'і)* і мяккі знак *(палью, паштальён)*. Вымаўленне слоў з раздзяляльнымі знакамі.

Падоўжаныя зычныя. Вымаўленне слоў з падоўжанымі зычнымі. Абазначэнне падоўжаных зычных на пісьме. Правапіс слоў з падоўжанымі зычнымі. Правілы пераносу такіх слоў.

Гука-літарны разбор слоў.

### Пісьмо і чыстапісанне

Выпрацоўка навыкаў каліграфічна правільнага пісьма і спісвання з паступовым паскарэннем тэмпу пісьма.

Дакладнае і графічна правільнае пісьмо малых і вялікіх літар у парадку ўскладнення іх напісання:

1) *і, ш, І, Ш, п, р, т, г;*
2) *л, м, Л, М, я, Я, А;*
3) *у, ц, Ч, ч;*
4) *с, С, е, Е, о, О, а, д, б;*
5) *ь, ы* (і іх варыянты ў літарных злучэннях);
6) *н, ю, Н, Ю, к, К;*
7) *В, в, З, з, э, Э, ж, Ж, х, Х, ф;*
8) *Ф, У, Г, П, Т, Р, Б, Д.*

Выкананне пісьмовых заданняў.

Спісванне тэксту цэлымі словамі.

Кантрольнае спісванне. Выбарачнае спісванне.

Пісьмо пад дыктоўку сказаў і невялікіх тэкстаў (10—20 слоў).

Зрокавыя, слыхавыя, тлумачальныя, папераджальныя, кантрольныя дыктанты.

#### ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ:

удзельнічаць у абмеркаванні тэмы тэксту і яго назвы;

адрозніваць тэкст ад групы сказаў;

складаць сказы, упарадкоўваць дэфармаваныя сказы;

адрозніваць і падбіраць словы, якія абазначаюць назвы прадметаў, дзеянні і прыметы прадметаў;

аналізаваць словы па гукавым і літарным складзе;

адрозніваць галосныя і зычныя гукі, галосныя націскныя і ненаціскныя;

дзяліць словы на склады, пераносіць часткі слова на пісьме;

спісваць тэкст з прагаворваннем цэлых слоў;

пісаць пад дыктоўку невялікі тэкст з вывучанымі арфаграмамі;

пісаць запіскі бацькам, родным і таварышам.

# V КЛАС

## ЧЫТАННЕ І РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ

### Прыкладная тэматыка чытання

Казкі, апавяданні і вершы беларускіх, рускіх і замежных класікаў, сучасных дзіцячых пісьменнікаў аб прыродзе, родным краі, жыцці дзяцей, іх адносінах адзін з адным і з дарослымі; творы вуснай народнай творчасці: загадкі, прыказкі і прымаўкі, забаўлянкі і інш.

### Правільнае чытанне

Арфаэпічнае чытанне без скажэння гукавога саставу слова, правільны націск у словах.

### Спосаб чытання

Чытанне цэлымі словамі, пакладовае чытанне малазнаёмых слоў складанай структуры.

Адпрацоўка чытання цэлымі словамі на спецыяльна складзеных тэкстах.

### Свядомае чытанне

Вызначэнне тэмы твора; знаходжанне асноўнай думкі, дзеля чаго напісаны твор; аналіз назвы твора.

Пераход да падрабязнага пераказу твора.

Выбарачны пераказ, блізкі да тэксту, з выкарыстаннем аўтарскіх слоў і выразаў.

Тлумачэнне слоў і выразаў з выкарыстаннем нагляднасці і слоўніка да тэксту.

Эмацыянальная ацэнка тэксту.

Ацэнка ўчынкаў герояў, пацвярджэнне яе ўрыўкамі з тэксту.

Устанаўленне паслядоўнасці падзей у творы: спачатку, потым, пасля, нарэшце.

Узнаўленне парушанага парадку частак тэксту з мэтай забеспячэння цэласнасці тэксту.

Суаднясенне малюнка з урыўкам твора.

Адказы на пытанні па змесце.

Чытанне «сам сабе», выкананне пэўнага задання.

### Выразнае чытанне

Плаўнае чытанне з улікам знакаў прыпынку ў канцы і ў сярэдзіне сказа.

Перадача з дапамогай голасу эмацыянальнага зместу прачытанага.

Чытанне са змяненнем сілы голасу і тэмпу.

Выразнае чытанне па памяці вершаў, вершаваных загадак і забаўлянак.

**Пазакласнае чытанне** дзіцячых кніг, газет, часопіса «Вясёлка», веданне назвы твора і яго аўтара, адказы на пытанні па прачытаным, пераказ асобных эпізодаў. Вядзенне ўліковага лістка самастойна прачытаных твораў.

ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ:

чытаць свядома, арфаэпічна правільна тэкст цэлымі словамі ўслых з захаваннем правільнага націску ў словах, адпаведнай інтанацыі, паўз паміж словамі і сказамі;

чытаць «сам сабе» даступныя тэксты з выкананнем заданняў;

адказваць на пытанні па прачытаным сваімі словамі і ўрыўкамі з тэксту;

вылучаць галоўных дзеючых асоб, выказваць свае адносіны да іх;

пераказваць прачытанае з дапамогай настаўніка;

дзяліць тэкст на часткі і прыдумваць загалоўкі да іх;

ведаць на памяць 5—6 вершаў;

карыстацца кнігамі школьнай бібліятэкі.

## ПРАКТЫКАВАННІ ПА ЛЕКСІЦЫ, ФАНЕТЫЦЫ, ГРАМАТЫЦЫ, ПРАВАПІСЕ І РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ

### Тэкст

Тэкст. Тэма тэксту. Назва тэксту, якая адлюстроўвае тэму.

Асноўная думка тэксту.

Паслядоўнасць сказаў у тэксце.

Афармленне групы сказаў у тэкст, выключэнне сказа, які не звязаны з тэмай.

Часткі тэксту. Чырвоны радок.

Сувязь частак тэксту з дапамогай ланцужка слоў: *спачатку, потым, пасля, нарэшце*.

Упарадкаванне дэфармаванага тэксту.

Адрас на канверце. Напісанне ліста родным або знаёмым.

Вуснае і пісьмовае віншаванне.

## Сказ

Сказ як адзінка маўлення.

Падзел маўлення (тэксту) на сказы.

Складанне сказаў па пытаннях.

Вылучэнне ў сказе слоў, якія ўказваюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, што гаворыцца.

Галоўныя (дзейнік і выказнік) і даданыя (без падзелу на віды) члены сказа.

Вылучэнне дзейніка і выказніка.

Сказы з галоўнымі і даданымі членамі.

Пашырэнне сказаў даданымі членамі з дапамогай малюнка, пытання. Устанаўленне сувязі паміж словамі ў сказе па пытаннях.

Упарадкаванне дэфармаванага сказа. Варыятыўнасць слоў у сказе.

Сказы, розныя па інтанацыі.

Знакі прыпынку ў канцы сказа (кропка, пытальнік, клічнік).

Практыкаванні ў пастаноўцы знакаў прыпынку па зададзенай у сказе інтанацыі.

## Слова

Паняцце пра ролю слова ў мове.

Сэнсавае значэнне слова. Знаёмства з тлумачальным слоўнікам беларускай мовы.

Роднасныя словы. Агульная частка роднасных слоў (корань).

Практыкаванні ў падборы аднакаранёвых слоў.

Словы, блізкія і супрацьлеглыя па сэнсе. Мнагазначныя словы.

Словы — назвы прадметаў, прымет і дзеянняў. Пастаноўка пытанняў да іх. Знаходжанне ў сказе такіх слоў па пытаннях.

Складанне спалучэнняў слоў на зададзеную тэму. Пастаноўка пытанняў да слоў у спалучэннях.

Асабовыя імёны.

Вялікая літара ў назвах краін, рэк, азёр, мораў.

Словы ***у, на, з, па, да, ад, пад, над, каля*** і інш., якія выконваюць у сказе службовую (дапаможную) ролю. Асобнае напісанне гэтых слоў з іншымі словамі.

## Гукі і літары

Гукі і літары. Гука-літарны аналіз слоў. Суаднясенне гука і літары ў словах. Несупадзенне гука і літары ў словах. Значэнне алфавіта. Сферы выкарыстання алфавіта.

Мяккі знак на канцы і ў сярэдзіне слоў.

Раздзяляльныя знакі: апостраф і мяккі знак. Іх правапіс у асобных словах.

Падзел слоў на склады. Правілы пераносу слоў.

Літары ***е, ё, і, ю, я*** і гукі, якія яны абазначаюць.

Правапіс ***д—дз, т—ц.***

Звонкія і глухія зычныя. Вымаўленне звонкіх і глухіх зычных на канцы і ў сярэдзіне слова перад глухімі. Падбор праверачных слоў і правапіс звонкіх і глухіх зычных.

Правапіс ***о, э—а; е, ё—я.***

## Пісьмо і чыстапісанне

Замацаванне навыкаў правільнага і акуратнага пісьма і спісвання з далейшым паскарэннем тэмпу пісьма.

Дакладнае і графічна правільнае пісьмо вялікіх літар:

1) *І, Ц, Ш, Ч, Л, М, А;*

2) *О, С, З, Х, Ж, Е, Э, Я;*

3) *У, Н, К, Ю, Р, В;*

4) *Г, П, Т, Б, Ф, Д.*

Практыкаванні ў безадрыўным пісьме злучэнняў літар тыпу: ***ол, ое, во, вл, се, од, ас, об, уе, до, св*** і інш.

Звязнае, рытмічнае пісьмо слоў, сказаў і невялікіх тэкстаў.

Выкананне пісьмовых заданняў па падручніку ў адпаведнасці з інструкцыяй.

Спісванне з рукапіснага і друкаванага тэкстаў з прагаворваннем цэлых слоў і словазлучэнняў. Кантрольнае спісванне. Выбарачнае спісванне.

Пісьмо пад дыктоўку сказаў і тэкстаў з захаваннем вывучаных нормаў правапісу.

Зрокавыя, слыхавыя, папераджальныя, тлумачальныя, кантрольныя дыктанты.

ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ:

вылучаць тэму і асноўную думку тэксту;
устанаўліваць паслядоўнасць падзей у тэксце;
складаць і пашыраць сказы;
з дапамогай настаўніка выяўляць сувязь паміж словамі па пытаннях;
ставіць знакі прыпынку ў канцы сказа;
ажыццяўляць гука-літарны аналіз слова;
спісваць рукапісны і друкаваны тэкст з прагаворваннем цэлымі словамі;
пісаць пад дыктоўку тэкст з вывучанымі арфаграмамі і пунктаграмамі (у канцы сказа).

# РУССКИЙ ЯЗЫК

## ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Программа по русскому языку для V класса I отделения вспомогательной школы с белорусским языком обучения носит коммуникативную направленность. Русский язык выступает как средство социальной адаптации учащихся, коррекции их мыслительной деятельности, формирования личности.

Новый подход к образованию лиц с интеллектуальной недостаточностью связан с переходом от лингвоцентрической концепции языкового образования к антропоцентрической, согласно которой обучение ориентируется на формирование у школьников умений реально использовать язык (речь) как средство общения и орудие мышления. Это означает, что учитель не просто учит языку, а прежде всего учит умению пользоваться им, т. е. умению слушать и понимать то, что говорят, самому читать, говорить и правильно строить свое речевое поведение.

В V классе вспомогательной школы с белорусским языком обучения впервые начинают изучать русский язык. На его изучение отводится 2 часа в неделю. Принимается во внимание, что учащиеся, как правило, находятся в условиях русскоязычного окружения. Родственность русского и белорусского языков облегчает восприятие и понимание второго языка.

Обучение языку осуществляется в соответствии с концептуальными положениями современной методики его изучения (В. У. Протченко, А. Я. Супрун, Н. Г. Еленский; С. А. Зыков, А. К. Аксёнова; И. М. Бобла, А. М. Змушко и др.). Знаниеориентированная модель обучения не противопоставляется личностно ориентированной. Обучение включает формирование знаний, способов речевой деятельности, аксиологической (ценностной) составляющей личности школьника и создание условий для его личностного становления и самореализации.

Основными закономерностями изучения русского языка как второго являются: семантическая бесконфликтность, межречевая идентификация, положительная роль речевого окружения. С раннего возраста дети с интеллектуальной недостаточностью включаются в общение с русскоязычным населением, что позволяет констатировать приобщение ко второму языку в сензитивный период в речевом развитии и успешное усвоение русской речи в дошкольный период, если этому не препятствуют познавательные возможности детей.

В учебном процессе реализуется комплексный деятельностный подход к формированию речи как средства общения с учетом индивидуальных особенностей школьников. Это означает, что речевое развитие осуществляется в условиях разных видов деятельности при одновременном формировании лексической, грамматической и фонематической сторон речи.

Программа предусматривает обучение русскому языку в условиях педагогически организованного общения ученика с учителем, воспитателем, одноклассниками и другими значимыми людьми. В процессе овладения коммуникацией школьник осваивает язык, который становится для него средством общения, обучения, познания, мышления.

Приоритетными направлениями коррекционной работы на уроках русского языка являются формирование речевой деятельности, речевого поведения и развитие языковой способности. Эти задачи реализуются в основном в процессе практического овладения речью.

Воспитание речевого поведения является центральной задачей обучения детей с интеллектуальной недостаточностью и требует особого внимания. Используются занимательные формы работы с целью повышения мотивации речевой активности, желания и умения вступать в контакт с окружающими. Продуктивность общения определяется не только пониманием учащимися с интеллектуальной недостаточностью того или иного слова, той или иной речевой инструкции, но и умением пользоваться ими.

Обучение детей с интеллектуальной недостаточностью речевой деятельности предусматривает формирование разных ее видов: говорения, письма, чтения, слушания. Реализуются принципы обучения языку, характерные для коммуникативной системы: связь с деятельностью, создание речевой среды, создание и реализация потребности в общении, организация коммуникации

учащихся между собой и со взрослыми. В качестве первостепенных рассматриваются задачи развития речи как средства общения и как способа коррекции мыслительной деятельности.

Необходимым условием успешности обучения языку является дифференциация учебных требований. Дифференцированный подход основывается на изучении индивидуальных особенностей учащихся класса. Учитель определяет обучаемость школьников, их работоспособность, отмечает их учебные возможности. Это позволяет выделять группы детей с приблизительно равными характеристиками речевого развития и предъявлять адекватные их возможностям требования. Дифференцированный подход позволяет выделять для обучения в V классе минимум требований, без которого невозможно дальнейшее обучение. Эти базовые требования относятся к разным видам речевой деятельности: слушанию, говорению, чтению, письму.

Ученики, не усваивающие программный материал и те, чьи умения не соответствуют базовым требованиям, переводятся на индивидуальную программу обучения русскому языку. Их успехи оцениваются согласно этим программным требованиям.

В V классе русский язык является вводным курсом во вспомогательной школе с белорусским языком обучения. Вводный курс может иметь различное построение. Русский язык может быть интегрированным учебным предметом. В этом случае уроки чтения и письма отдельно не изучаются. Обучение всем видам речевой деятельности: слушанию, чтению, письму, говорению — осуществляется синхронно, на каждом уроке. Это не исключает акцентирования внимания на том или ином виде речевой деятельности. Доминирующим может быть слушание, может преобладать чтение, занятие языком (письмом). Не исключается раздельное проведение уроков чтения и уроков письма (по одному уроку чтения и письма в неделю).

Интегрированные уроки, отнесенные к определенным образовательным модулям, представляются нам предпочтительнее. В этом случае учащиеся 2 раза в неделю занимаются чтением и письмом.

На уроках изучаются доступные пониманию детей произведения устного народного творчества, сказки, стихи, рассказы.

Главной особенностью уроков вводного, пропедевтического этапа (V класс) является коммуникативно-речевая направленность обучения. Работа над усвоением грамматических категорий

и орфографических правил не является самоцелью, она реализуется в процессе формирования речевых умений и навыков. Большое значение приобретает не столько запоминание грамматических и орфографических правил, сколько умение их применять в речевой практике.

Изучение русского языка в V классе начинается с раздела «Язык. Речь. Текст». Это позволяет обратить внимание учеников на особенности русского языка. Ученики имеют возможность прослушать различные произведения, тексты разных стилей, ощутить красоту русской речи. Уже на первых уроках можно обратить внимание на особенности русского произношения, на значение отдельных слов. Учащиеся могут допускать ошибки, потому что не осознают значения отдельных используемых слов. Это требует системной словарной работы, включающей объяснение не только отдельных слов, словосочетаний, но и выражений, стихотворных строк.

При изучении темы «Звуки и буквы» важно добиться не столько дифференциации оппозиционных фонем (мягких и твердых, звонких и глухих), сколько правильных произносительных умений и навыков применительно к звукам русского языка.

При изучении слов-названий предметов, слов-названий признаков предметов и слов-названий действий уделяется внимание грамматическим и семантическим признакам, правильному использованию слов в речи.

Коммуникативно-речевая направленность обучения русскому языку находит наиболее полное выражение в теме «Предложение». Учащиеся овладевают умением правильно строить и употреблять предложения. Они практикуются в интонировании предложений, упражняются в диалоговой речевой деятельности. Учащиеся поэтапно осваивают русский язык и русскую речь в практической деятельности.

Изучение русского языка ставит целью заинтересовать детей, вызвать положительные эмоции на уроке. Обязательна на уроках занимательность, использование материала, который может в необходимой мере упростить, облегчить учение, сделать трудности преодолимыми, доставить радость. Каждый урок должен дарить ученикам хорошее настроение, обеспечивать успех в речевой деятельности.

ПРОГРАММА

# V КЛАСС

## ЧТЕНИЕ И РАЗВИТИЕ РЕЧИ

### Примерная тематика чтения

**Устное народное творчество.** Малые формы фольклора. Песни, считалки, потешки. Сказки.

**Люблю свой родной край.** Рассказы, стихи и сказки о природе в разные времена года, о праздниках нашего народа.

Краткие сведения о героическом прошлом страны, о знаменитых и славных ее представителях.

**Мы учимся, трудимся, дружим.** Рассказы и стихи о школе, верности, дружбе, людях труда. Произведения помогают познавать добро и зло, хорошее и плохое в окружающей жизни.

**Важные слова.** Учебный материал знакомит с этикетом, правилами вежливого поведения, общепринятыми нормами взаимоотношений.

**Моя семья.** Рассказы и стихи о членах семьи, взаимоотношениях и общении в семье, об обязанностях детей в семье, о заботе о своих близких, старших и младших по возрасту.

**Весело всем.** Потешки, смешные истории, помогающие осознать смешное в окружающей жизни, вводящие в мир юмора и веселья.

УЧАЩИЕСЯ ПРИОБРЕТАЮТ СЛЕДУЮЩИЕ УМЕНИЯ ПО ЧТЕНИЮ И РАЗВИТИЮ РЕЧИ:

правильно читать доступный текст целыми словами, в трудных случаях — по слогам;

отвечать на вопросы учителя;

выражать свое отношение к поступкам героев и событиям;

выучить наизусть 4—5 стихотворений;

находить предложения, отрывки в тексте по указанию учителя.

## РУССКИЙ ЯЗЫК
## (орфоэпия, правописание, грамматика, развитие речи)

**Язык. Речь. Текст.** Связь предложений в тексте. Слова в предложении.

**Звуки и буквы.** Звук и буква ***и***, звук и буква ***г***. Звук и буква ***р***. Звук и буква ***ч***. Звуки и буква ***щ***. Буква твердый знак.

Гласные звуки и их буквы.

Согласные звуки и их буквы.

Алфавит. Шипящие согласные звуки. Правописание ***ши, жи, ча, ща, чу, щу***.

Слоги. Перенос слов.

**Слово.** Слова-названия предметов. Большая буква в словах. Слова-названия действий. Слова-названия признаков предметов.

**Предложение.** Составление и распространение предложений. Наблюдение за интонацией предложений. Точка, вопросительный и восклицательный знак в конце предложения. Предложения в зависимости от цели высказывания: повествовательные, вопросительные, побудительные.

Составление диалогов по образцу, с опорой на картинку, ситуацию.

### УЧАЩИЕСЯ ПРИОБРЕТАЮТ СЛЕДУЮЩИЕ УМЕНИЯ ПО ПИСЬМУ И РАЗВИТИЮ РЕЧИ:

списывать целые слова, предложения, несложный текст;

списывать сложные слова по слогам;

писать под диктовку предложения или несложный текст (25—30 слов) с предварительным разбором написания отдельных слов;

различать по вопросам слова-названия предметов, слова-названия признаков предметов и слова-названия действий;

участвовать в этикетных диалогах, поддерживать их, правильно выстраивая речевое поведение.

# МАТЭМАТЫКА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма па матэматыцы распрацавана з улікам змяненняў у структуры навучання вучняў дапаможнай школы, вопыту работы па праграмах рэфармаваных класаў, створаных вучэбна-метадычных комплексаў.

Адукацыйны кампанент праграмы (за выключэннем зместу прапедэўтычнага перыяду) складаецца з пастаянных раздзелаў: нумарацыя цэлых неадмоўных лікаў, арыфметычныя дзеянні, тэкставыя арыфметычныя задачы, велічыні і адзінкі іх вымярэння, геаметрычны матэрыял.

Аперацыйны (метадычны) кампанент праграмы арыентуе на спецыфіку вывучэння канкрэтных тэм, выкарыстання спалучэнняў метадаў, прыёмаў, сродкаў навучання. Гэта дазваляе максімальна ўлічваць асаблівасці псіхічнага развіцця вучняў, фарміравання матэматычных уяўленняў, уменняў (наглядная аснова фарміравання ведаў, стварэнне ўмоў для іх прымянення, прадметна-практычныя дзеянні, вербальнае каменціраванне выконваемых аперацый), пашырае магчымасці вызначэння зместу ўрока, яго спецыфікі, забеспячэння комплекснасці планавання матэрыялу і бесперапыннасці яго паўтарэння.

Практычны кампанент праграмы змяшчае прыкладны пералік практыкаванняў, сітуацый, якія падкрэсліваюць адну з асаблівасцей навучання матэматыцы: практычную накіраванасць.

Змест праграмы кожнага класа завяршае кантрольны кампанент (асноўныя патрабаванні да ведаў, уменняў вучняў). Ён прадстаўлены двума ўзроўнямі патрабаванняў, якія маюць рэкамендацыйны характар. Першы ўзровень патрабаванняў адрасаваны вучням, якія па заканчэнні V класа змогуць авалодаць ведамі, уменнямі ў канцэнтры «сотня»; другі ўзровень патрабаванняў абмяжоўвае авалоданне матэрыялам у межах другога дзесятка.

Змест праграмы ўключае матэрыял для паўтарэння (пачатак навучальнага года, вучэбнай чвэрці).

На ўроках матэматыкі ажыццяўляецца цесная сувязь арыфметычнага і геаметрычнага матэрыялу. Праграмны матэрыял уключаецца ў прадметна-практычную дзейнасць. Вялікая ўвага надаецца матэрыялізацыі фарміруемых паняццяў, іх выкарыстанню ў жыццёвых сітуацыях.

У праграме закладзены магчымасці рэалізацыі ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей. Карэкцыйны патэнцыял зместу адлюстроўваюць аперацыйны (метадычны) і практычны кампаненты.

Праграма дазваляе настаўніку мяняць паслядоўнасць вывучэння матэрыялу, пераразмяркоўваць яго па вучэбных чвэрцях, ускладняць ці спрашчаць, ствараць індывідуальныя праграмы навучання, вызначаць час вывучэння ў межах гадзін вучэбнага плана.

Навучанне матэматыцы дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю ў І класе заклікана ствараць умовы для рашэння карэкцыйна-адукацыйных задач, комплекснага, дынамічнага вывучэння дзіцяці, фарміравання ў яго псіхалагічнай гатоўнасці да навучання ў класным калектыве.

У І класе ў вучняў фарміруюцца ўменні адрозніваць аб'екты і групы аб'ектаў па пэўных прыметах, выконваць элементарныя лагічныя аперацыі. Тут закладваецца аснова для авалодання нескладанымі вуснымі і пісьмовымі вылічэннямі, прагназуюцца магчымасці навучання дзяцей матэматыцы. Разуменню мовы лікаў, іх колькаснай, парадкавай і аператарнай функцый садзейнічае стварэнне дзецьмі прадметных мностваў, іх змяненне, параўнанне. Вучні выконваюць практыкаванні з мноствамі, якія складаюцца з 5—10 элементаў, вучацца адрозніваць і ўзнаўляць лічбы. У працэсе мэтанакіраваных заняткаў адбываюцца карэкцыя і развіццё псіхічных функцый, мовы; вучні набываюць навыкі калектыўнай вучэбнай дзейнасці.

Рашэнне названых задач ажыццяўляецца пры дапамозе гульні, у канкрэтных сітуацыях на ўроку матэматыкі, на ўроках па іншых прадметах, у працэсе шматразовага выканання варыянтаў адных і тых жа ці падобных заданняў з выкарыстаннем разнастайнага, добра знаёмага дзецям матэрыялу (цацкі, прадметы побыту, прыродны матэрыял). Асаблівае значэнне надаецца выкарыстанню розных відаў інструктавання: выканання задан-

няў па перайманню, на аснове ўзору, звяртання да вербальных і невербальных інструкцый. Вучні набываюць вопыт у разуменні маўлення настаўніка.

Прадметныя мноствы, як правіла, не выражаюцца лікава, але дазваляюць успрымаць элементы навакольнага свету, звяртацца да іх. Ствараецца аснова для фарміравання паняцця ліку і арыфметычнага дзеяння. Гэта адбываецца ў працэсе малявання, выразвання, канструявання, лепкі прадметаў, класіфікацыі кругоў рознага дыяметра, прадметаў рознага колеру, памеру, даўжыні.

Вучні (у пэўных межах) атрымліваюць уяўленні аб ліках і іх абазначэнні, заканамернасцях атрымання лікаў, іх уласцівасцях, вылічальных прыёмах. Дасягненне гэтай задачы магчыма толькі пры ўмове развіцця наглядных формаў мыслення, зладжанай, разнастайнай прадметна-практычнай дзейнасці, якая суправаджаецца маўленнем настаўніка і вучняў, выкарыстаннем магчымасцей аналізатараў.

Спецыяльнай арганізацыі патрабуе вывучэнне стану і асаблівасцей авалодання дзецьмі ўяўленнямі, уменнямі. Гэта важна ў дыягнастычным плане і дазваляе на працягу навучальнага года рашаць пытанне аб пераводзе вучня ў наступны клас ці навучанні яго ў іншым тыпе спецыяльнай школы (клас інтэграванага навучання), вызначаць праграмы індывідуальнай карэкцыйнай падтрымкі.

Змест праграмы першай чвэрці арыентаваны на выяўленне гатоўнасці дзяцей да засваення матэматыкі, сфарміраванасці ў іх элементарных уяўленняў, уменняў, што дасць магчымасць удакладніць, канкрэтызаваць работу на наступных этапах навучальнага года, унесці карэктывы ў змест другой—чацвёртай чвэрцяў. Асабліва трэба падкрэсліць, што настаўнік мае права пераразмяркоўваць, планаваць матэрыял зыходзячы з асаблівасцей кантынгенту вучняў.

Навучанне матэматыцы ў малодшых класах стварае перадумовы для навучання ў старшых класах. Таму асаблівую ўвагу трэба надаць вывучэнню розных спосабаў утварэння лікаў, іх запісу, чытанню, вывучэнню ўласцівасцей у лікавым радзе, параўнанню, аналізу. Вучні малодшых класаў авалодваюць асноўнымі прыёмамі складання і аднімання ў межах 100, уменнямі карыстацца табліцамі складання і аднімання ў межах 10 (20), множання і дзялення ў межах 20 (100); вучацца разумець, выкарыстоўваць у маўленні матэматычную тэрміналогію.

Засваенне лагічнай сутнасці матэматычных адносін, прадстаўленых ва ўмовах простых арыфметычных задач, — аснова разумення і рашэння састаўных задач, якія праграмай прадугледжаны з V класа.

## Прапедэўтычны перыяд

Змест навучання вучняў I класа рашае асноўныя задачы прапедэўтычнага перыяду: фарміраванне ў вучняў далікавых уяўленняў, гатоўнасці да школьнага навучання, развіццё і карэкцыю псіхічных працэсаў.

У першай чвэрці I класа, у залежнасці ад складу класа, вызначаецца змест і працягласць прапедэўтычнага перыяду. Да тэм даматэматычнага характару рэкамендуецца звяртацца на працягу навучальнага года з мэтай іх канкрэтызацыі, праверкі засваення матэрыялу вучнямі.

Планаванне вядучых тэм мяркуе комплексны адбор матэрыялу, вывучэнне розных пытанняў у цеснай узаемасувязі (фарміраванне далікавых уяўленняў, арыенціроўка ў прасторы, у памерах прадметаў). Асаблівай увагі патрабуе развіццё мовы вучняў, якое неабходна уключыць ва ўсе віды практычнай дзейнасці.

Навучанне пачынаюць з выяўлення ўзроўню ведаў, уменняў вучняў. Прыкладны змест заданняў уключае:

- лічэнне на канкрэтным матэрыяле і абстрактна; суаднясенне прадметнага мноства з лікам (адказ на пытанне *Колькі? Які лік па парадку?*); распазнаванне лічбаў; суаднясенне ліку з лічбай; прылічванне па адной і па некалькі адзінак (на канкрэтным матэрыяле);
- разуменне аперацый складання і аднімання (аб'яднанне сукупнасці прадметаў, адніманне яе часткі);
- узнаўленне ўмовы і рашэння задачы па выніках выканання практычных дзеянняў, назірання);
- называнне паслядоўнасці, прымет частак сутак, пораў года;
- паказванне, называнне геаметрычных фігур (мадэль, чарцёж): круг, трохвугольнік, прамавугольнік, квадрат; шар, брус (прамавугольны паралелепіпед), куб.

Адным з паказчыкаў гатоўнасці вучняў да вывучэння матэматыкі будуць вынікі назіранняў за іх дзейнасцю (разуменне вербальных і невербальных формаў інструктавання, адказы на пытанні, самастойнасць пры выкананні заданняў, прыняцце дапамогі).

## Нумарацыя лікаў

Вучні атрымліваюць абагульненыя ўяўленні аб утварэнні лікаў першага дзесятка, іх саставе, адрозніваюць лікі па іх месцы ў натуральным радзе лікаў, запамінаюць назвы, дзесятковы састаў, паказваюць лікі з дапамогай дыдактычнага матэрыялу, калькулятара, даведваюцца па ілюстрацыях.

Вывучэнне кожнага канцэнтра заснавана на выкарыстанні пераважна аднолькавых прыёмаў вывучэння лікаў і натуральнага рада лікаў, прымянення ведаў у практычных сітуацыях. Вучні I класа ў першай чвэрці вывучаюць лікі ў межах 5.

## Арыфметычныя дзеянні

Аснову разумення сутнасці складання і аднімання вучнямі I класа ствараюць практычныя дзеянні з сукупнасцямі прадметаў. У працэсе выканання практыкаванняў адбываецца ўсведамленне прыёмаў вылічэння: складанне (адніманне) з лікам 1, з групай адзінак, перастаноўка складаемых. Складанне і адніманне вывучаецца ў цеснай сувязі з вывучэннем саставу лікаў першага дзесятка.

Вучні малодшых класаў завучваюць табліцу складання і аднімання ў межах 10. У далейшым увага акцэнтуецца на навучанні прыёмам вылічэнняў, паказе ўзаемасувязі дзеянняў, рашэнні камбінаваных прыкладаў, завучванні табліц множання і дзялення ў межах 20 і 100.

## Тэкставыя арыфметычныя задачы

Уяўленні аб структуры тэкставай арыфметычнай задачы, спосабах рашэння фарміруюцца на аснове колькасных адносін прадметных мностваў, з'яў навакольнай рэчаіснасці. Асаблівае месца адводзіцца прапедэўтыцы навучання рашэнню арыфметычных задач: фарміраванне ўяўленняў, якія раскрываюць прадметную і матэрыяльную сутнасць задачы; практыка вымярэнняў з дапамогай умоўных мерак; складанне задач на аснове дзеянняў з прадметнымі мноствамі без іх пераліку і з пералікам.

Адным з асноўных прыёмаў навучання рашэнню задач з'яўляецца канкрэтызацыя ўмовы і рашэння практычнымі дзеяннямі з прадметамі, малюнкамі. Вучні авалодваюць уменнем чытаць умову задачы, узнаўляць змест, адказваць на пытанні.

### Велічыні і адзінкі іх вымярэння

Асноўная задача заключаецца ў фарміраванні ўяўленняў аб велічынях і ўменняў практычнага іх выкарыстання. Вывучэнне метрычнай сістэмы мер звязана з вывучэннем нумарацыі лікаў.

### Геаметрычны матэрыял

Геаметрычныя фігуры (матэрыяльныя мадэлі, чарцяжы) выкарыстоўваюцца пры вывучэнні арыфметычнага матэрыялу і як аб'екты спецыяльнага вывучэння. Вучні пазнаюць геаметрычныя фігуры на мадэлях, малюнках, фотаздымках, у прадметах навакольнай рэчаіснасці, авалодваюць элементарнымі ўменнямі пабудовы геаметрычных фігур, атрымліваюць веды аб некаторых іх уласцівасцях, разумеюць геаметрычную тэрміналогію і карыстаюцца ёю.

Вывучэнне матэрыялу асноўваецца на выкананні разнастайных практыкаванняў, гульняў і гульнёвых сітуацый геаметрычнага зместу.

## ПРАГРАМЫ

# I КЛАС

### ПЕРШАЯ ЧВЭРЦЬ

Вывучэнне гатоўнасці дзяцей да навучання ў школе і авалодання матэматычнымі ведамі і ўменнямі.

Адрозніванне прадметаў (іх адлюстраванняў) па памерах: *вялікі—маленькі, доўгі—караткі, тоўсты—тонкі, высокі—нізкі, шырокі—вузкі, розны—аднолькавы, такі самы* (адбор, сарціроўка, паказ прадметаў, кантрастных па памерах, аднолькавых (розных) па колеры, распазнаванне колеру прадметаў і іх адлюстраванняў (выкарыстоўваюцца вербальныя і невербальныя формы інструктавання)).

Лічэнне прадметаў у межах 5 (10). Называнне выніковага ліку *(усяго пяць, сем, дзесяць)*. Адказ на пытанне *Колькі?*. Суаднясенне колькасці прадметаў з лікам. Для лічэння прапануюцца добра знаёмыя прадметы, цацкі — спачатку аднолькавага памеру і колеру, затым розныя як па памерах, так і па колеры,

матэрыяле вырабу, прызначэнні; змяняецца прасторавае размяшчэнне прадметаў ці іх адлюстраванняў. Лічэнне выконваецца шляхам перакладвання, перасоўвання прадметаў па адным, дакранаючыся пальцам, «вачамі», абстрактна з называннем выніку.

Параўнанне прадметных мностваў (адлюстраванняў сукупнасці прадметаў): *многа—мала, больш—менш, столькі ж, адзін* (прыёмы ўстанаўлення ўзаемааднзначнай адпаведнасці элементаў мностваў: *кожнаму кубку па лыжачцы, кожнай птушцы па зернетку; вазьмі, пакладзі, пастаў адзін ... , столькі ж, пароўну*).

Прадметныя сукупнасці размяшчаюцца ў рад злева направа, гарызантальна, вертыкальна, адзін прадмет пад другім, кожны прадмет на кожным.

Прыёмы параўнання: накладванне, укладванне, прыкладванне аднаго прадмета да другога.

Аб'яднанне прадметных мностваў і выключэнне іх часткі *(Дадай адзін, два кубікі, забяры. Што ты зрабіў? Дадаў — стала больш; забраў — стала менш. Палічы. Адлічы).*

Размяшчэнне прадметаў у прасторы і на плоскасці: *справа—злева, уперадзе—ззаду, уверсе—унізе, побач, паміж, над, пад* (вызначэнне прасторавага размяшчэння прадметаў у класным пакоі, на малюнку. Выкананне практыкаванняў па інструкцыі настаўніка: *пастаў, пакладзі злева, справа, уверсе, унізе, побач, паміж*).

Задачы-даручэнні, інструкцыі (дзеянні з прадметамі і іх сукупнасцямі без пералічвання і з пералічваннем). Афармленне выконваемых дзеянняў у маўленні: *кніжкі склалі разам — стала больш; узялі алоўкі — стала менш; было ... , цяпер дабавілі (паклалі) — стала больш; забралі — стала менш.*

Часавыя ўяўленні: *раніца, дзень, вечар, ноч* (прадметы, сітуацыі, характэрныя для рознага часу сутак). Разуменне інструкцый: *Цяпер раніца ці вечар? Цяпер дзень ці ноч?*

Геаметрычныя фігуры: круг, трохвугольнік, прамавугольнік (квадрат). Шар, куб, брус (класіфікацыя мадэлей фігур па ўзоры, па вербальнай інструкцыі, мадэліраванне па ўзоры, параўнанне па велічыні). Уласцівасць шара: коціцца. Круг і шар (круг можна закрыць лістом паперы, выразаць з паперы; шар можна вылепіць з пластыліну).

Параўнанне прадметаў па колеры, росце, памеры *(Чым падобныя памідор, клубніца? Знайдзі цацкі аднолькавага колеру. Чым адрозніваюцца дзеці на малюнках?* (рознае адлюстраванне аднаго прадмета, дзеці рознага росту)).

Параўнанне і ўраўноўванне прадметных мностваў прыёмамі накладвання (укладвання), прыкладвання (выкарыстоўваюцца прадметы, малюнкі). Выкананне заданняў тыпу: *Дзе больш? Дзе менш? Дзе пароўну? Дзе столькі ж? Пакажы. Пакладзі ... на, над, пад, у. Што ты зрабіў? Гэта цацкі. Гэта кветкі. Гэта птушкі. Гэта рыбы.*

Ацэнка размяшчэння прадметаў: *першы, апошні, перад, за, пасля, тут, там* (прадметы размяшчаюцца ў рад).

Размяшчэнне прадметаў у прасторы: *на, над, пад, перад, за, паміж, справа, злева, уверсе, унізе, у сярэдзіне* (пазнаванне прасторавага размяшчэння прадметаў у класным пакоі, на дошцы. Верх, ніз, левы, правы бакі класнай дошкі, парты, сярэдзіна дошкі (у сярэдзіне). Разуменне большасці слоў, якія адлюстроўваюць прасторавыя адносіны).

Лічэнне прадметаў (іх адлюстраванняў) у межах 5 (10) (выкарыстоўваюцца аднародныя і разнародныя прадметы з аднолькавымі і living рознымі прыметамі, размешчаныя ў розных прасторавых адносінах. Выкананне заданняў па інструкцыі: *палічы, адлічы, вазьмі спачатку, потым, пасля, раней*).

Адрозніванне, ацэнка прадметных мностваў: *многа—мала, пусты—поўны, многа—адзін.* Прылічванне і адлічванне прадметаў. Лічбы (1, 2, 3...). Парадкавыя лічэбнікі (назвы лічэбнікаў: *адзін, адна, адно ... , першы, другі, трэці ... .* Лічэнне пальцаў на руцэ: *Адзін, два, тры, чатыры, пяць. Адзін і яшчэ адзін, некалькі, многа. Адзін менш, чым многа. Многа больш, чым адзін.* Пазнаванне лічбы. Абвядзенне контуру лічбы. Тушоўка, штрыхоўка ўнутранай часткі лічбы. Выдзяленне з групы прадметаў аднаго і некалькіх (выкарыстоўваюцца аднародныя і разнародныя прадметы, іх адлюстраванні, якія адрозніваюцца адной, дзвюма і больш прыметамі)).

Дзеянні з прадметнымі мноствамі, якія адлюстроўваюць сутнасць складання і аднімання (выкананне аперацый па аб'яднанні прадметных мностваў і адніманні іх часткі, ацэнка выконваемых дзеянняў па малюнках; разуменне слоў: *дадаў, адняў, забраў, стала больш, стала менш*).

Задачы-даручэнні (гульнёвыя сітуацыі, дзеянні з прадметнымі мноствамі без іх пералічвання і з пералічваннем. Адлюстраванне ў маўленні абыгранай сітуацыі, фармулёўка пытання *Аб чым можна даведацца?*).

Паслядоўнасць частак сутак: *раніца, дзень, вечар, ноч* (разуменне інструкцый тыпу: *Што зараз — дзень ці вечар? Раніца ці дзень?*).

Пункт. Прамая лінія. Круг, квадрат. Трохвугольнік. Прамавугольнік (класіфікацыя мадэлей па ўзоры, па вербальнай інструкцыі, суаднясенне прадметаў па форме — «геаметрычнае лато»).

ТРЭЦЯЯ ЧВЭРЦЬ

Устанаўленне адносін падабенства і адрознення паміж прадметамі (падбор пар аднолькавых прадметаў, іх адлюстраванняў, састаўленне пар з розных прадметаў: *кубак—лыжка, машына—гараж, кветка—пчала.* Словы і інструкцыі: *такі ж, іншы, аднолькавыя, падобныя, розныя; Дай (вазьмі, пакажы) такі ж ... . Дай падобны ... . Дай аднолькавыя ... . Дай розныя ... . Дай іншы ... . Пастаў кубікі блізка адзін да аднаго. Дай доўгую вяроўку. Гэта вяроўка даўжэйшая за ...*).

Параўнанне прадметаў па масе: *цяжкі—лёгкі, цяжэйшы—лягчэйшы (Які прадмет цяжкі? Які прадмет лёгкі? Правер. Які прадмет цяжэйшы?).*

Серыяцыя прадметаў і іх адлюстраванняў *(Гэта сняжынка самая вялікая, гэта меншая, гэта самая маленькая. Гэта шышка самая маленькая, гэта шышка большая. Пакажы, раскладзі па парадку. Гэта самае вялікае кольца (самая доўгая палоска). Гзта самае маленькае кольца (самая кароткая палоска)).*

Захаванне мностваў (прадметы адрозніваюцца велічынёй, колерам, размяшчэннем у прасторы. *Тут многа. Тут столькі ж*).

Лічэнне ў прамым (адваротным) парадку ў межах 5 (10) (выкананне практыкаванняў на канкрэтным матэрыяле і абстрактна: *Пакладзі столькі ж (больш, менш) ... . Плясні ў далоні (падскоч) адзін, два, чатыры разы*).

Лічбы 1, 2, 3, 4, 5 (абвядзенне контураў, шаблонаў лічбаў. Спісванне лічбаў са старонак падручніка, з дошкі).

Параўнанне бесперапынных мностваў: *аднолькава, больш, менш* (практыкаванні з выкарыстаннем умоўных мерак: *Насып дзве шклянкі ... . Налі столькі ж ...*).

Аб’яднанне прадметных мностваў. Адніманне часткі прадметнага мноства (каменціраванне выконваемых аперацый настаўнікам, вучнямі).

Рашэнне і складанне арыфметычных задач на знаходжанне сумы і астачы (дзеянні з прадметамі, выкарыстанне сітуацый, прадстаўленых на малюнку, разуменне сэнсу слоў: *стала, засталося, усяго, разам, прынеслі, аднеслі*... Складанне расказу па двух-трох сюжэтна звязаных малюнках).

Часавыя паняцці: *спачатку—потым, учора, сягоння, заўтра.*

Лініі: прамая, крывая. Круг. Трохвугольнік. Прамавугольнік (квадрат). Шар. Куб. Брус (параўнанне фігур па колеры, памеры, мадэліраванне, пазнаванне прадметаў у навакольным асяроддзі. Уласцівасці шара (коціцца), куба, бруса (не коцяцца)).

## ЧАЦВЁРТАЯ ЧВЭРЦЬ

Становішча прадметаў у прасторы. Размяшчэнне прадметаў у розных прасторавых адносінах: *направа (управа, справа), налева (злева, улева), ззаду, спераду (уперад, назад), блізка, далёка (далей, бліжэй)* (канкрэтныя гульнёвыя, бытавыя сітуацыі на ўроку і ў пасляўрочны час. Агучванне выконваемых дзеянняў: *Дрэва ніжэйшае за дом. Дом вышэйшы за дрэва. Левы чаравік, правы чаравік. Рукавіца з левай рукі. Рукавіца з правай рукі. Самы вялікі куб. Самая доўгая (кароткая) вяроўка*).

Лічэнне прадметаў абстрактна ў межах 5 (10) (шматразовыя практыкаванні на суаднясенне называемага ліку (паказваемай лічбы) з назвамі прадметаў. Па названым ліку (паказанай лічбе) узяць і паказаць столькі ж прадметаў: *Адзін, тры, два. Адзін, многа, па адным. Пакажы, дзе прадметы ляжаць, як у мяне.* Лічбы 6—9. Абвядзенне контураў, шаблонаў лічбаў, спісванне лічбаў са старонак падручніка, з дошкі: 1—5 (6—9). Прыёмы ўстанаўлення ўзаемаадназначнай адпаведнасці паміж элементамі мностваў.

Практыкаванні на падрыхтоўку разумення сутнасці складання і аднімання. Знакі: +, −, =.

Дзяленне прадметных мностваў на дзве роўныя і няроўныя часткі (раскласці, раздаць, разарваць).

Уяўленне аб скорасці руху аб’ектаў: хутка, павольна.

Задачы-даручэнні, наглядныя задачы (рашэнне задач з адкрытым і закрытым вынікам. Разуменне значэння слоў: *даба-*

*вілі, пасадзілі, пабудавалі, з'елі, забралі, паляцелі.* Складанне расказу па паслядоўна размешчаных малюнках, звязаных адным сюжэтам).

Пабудова прамых, крывых ліній. Круг. Трохвугольнік. Прамавугольнік (квадрат). Шар, куб, брус.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЕДАЎ, УМЕННЯЎ ВУЧНЯЎ

***Першы ўзровень***

Вучні ўмеюць:

адрозніваць прадметы (адлюстраванні) па колеры;

адрозніваць прадметы (адлюстраванні) па велічыні (памеры);

даваць ацэнку прадметным сукупнасцям (многа, мала, адзін);

арыентавацца ў навакольным асяроддзі (злева—справа, улева—управа, спераду—ззаду, уперад—назад, пасярэдзіне, уверсе—унізе);

арыентавацца на лісце паперы (злева—справа, уверсе—унізе, пасярэдзіне);

адрозніваць адлюстраванні лічбаў 1—9, пазнаваць лік 10;

пералічваць прадметы ў межах 10;

адрозніваць круг, трохвугольнік, прамавугольнік (квадрат), шар, куб, брус.

***Другі ўзровень***

Вучні ўмеюць:

адрозніваць прадметы па колеры;

адрозніваць прадметы па іх памерах (вялікі—маленькі, доўгі—кароткі, высокі—нізкі, тоўсты—тонкі);

пералічваць прадметы ў межах 5 (10);

паказваць па інструкцыі настаўніка круг, трохвугольнік, квадрат, прамавугольнік, шар, куб (мадэлі, адлюстраванні).

## II КЛАС

### ПЕРШАЯ ЧВЭРЦЬ

Паўтарэнне праграмнага матэрыялу I класа. Высвятленне гатоўнасці вучняў да засваення паняццяў ліку, арыфметычнага дзеяння, велічыні, геаметрычнай фігуры. Параўнанне двух і больш прадметаў па памерах. Разуменне інструкцый тыпу: *Параўнай. Пакажы самае высокае дрэва.* Прыёмы параўнання: накладванне, прыкладванне, «на вока».

Параўнанне прадметных сукупнасцей і іх адлюстраванняў: устанаўленнем узаемааднназначнай адпаведнасці паміж іх элементамі, у выніку пераліку, «на вока» *(многа, мала, менш, тут тры кубікі, тут шэсць, тут больш)*. Параўноўваюцца прадметныя сукупнасці, роўныя па колькасці, але розныя па памеры, прасторавым размяшчэнні адносна адна адной (аперацыя захавання). Разуменне інструкцый тыпу: *Дай кожнаму кураняці зернетка. Дай па адной моркве кожнаму трусіку. Пакажы, чаго больш: трусоў ці моркавак. Чаго менш? Пакладзі столькі ж палачак.*

Размяшчэнне аднародных прадметаў, якія адрозніваюцца адной прыметай (памерам) у парадку павелічэння ці памяншэння (аперацыя серыяцыі). Разуменне інструкцый тыпу: *Пакажы любую кветку. Пакажы кожную кветку. Пакажы ўсе кветкі. Пакажы такую самую кветку*. Размяшчэнне прадметаў у рад злева направа. Пазнаванне сукупнасцей прадметаў, якія размешчаны ў рад і не ў рад, іх пералік. Параўнанне бесперапынных мностваў: *Насып столькі лыжак круп, колькі на малюнку кругоў*.

Лічэнне ў межах 10 на канкрэтным матэрыяле: перакладваючы прадметы, дакранаючыся «вачыма», абстрактна — з называннем выніковага ліку. Выкарыстоўваюцца аднародныя і разнародныя прадметы, іх адлюстраванні, размешчаныя ў розных прасторавых адносінах.

Парадкавае лічэнне: *трэці, чацвёрты куб; першая, другая елачка; пяты яблык*. Разуменне інструкцый тыпу: *Вазьмі (пакажы) першы, апошні грыб. Што ляжыць перад ... , пасля ... , за ... ? Хто ідзе следам за ... ? Наступны за зайцам — вожык. Апошні ў лесе — воўк. Тут гуляюць, а там ... .*

Суаднясенне лічбы і прадметнай сукупнасці. Разуменне інструкцый тыпу: *пакажы лічбу 3. Пакладзі лічбы ў рад, пачынаючы з лічбы 1. Называй лікі*.

Аб'яднанне прадметных сукупнасцей, адніманне часткі прадметнай сукупнасці. Каменціраванне выконваемых дзеянняў: *Паклалі яшчэ — стала больш. Паклалі тры сшыткі — стала больш. Узялі адну кнігу — стала менш*. Разуменне інструкцый тыпу: *Пакладзі, складзі, прынясі, забяры; Вазьмі не ўсе палачкі, а толькі дзве. Аднясі, адкладзі, вазьмі і пакладзі побач.*

Пазнаванне знакаў арыфметычных дзеянняў +, −, =. Разуменне інструкцый тыпу: *Пакажы знак складання, знак аднімання, роўна, знакі «плюс», «мінус», «дадаць», «адняць»*.

Рашэнне наглядных задач з адкрытым і закрытым вынікамі, якія раскрываюць сутнасць складання і аднімання (дзеянні з прадметнымі сукупнасцямі без іх пералічвання і з пералічваннем; вербальнае ўзнаўленне сітуацый па малюнку і серыі малюнкаў).

Арыенціроўка ў прасторавым размяшчэнні прадметаў у класным пакоі, якія адлюстраваны на старонках падручніка, рабочага сшытка (*злева—справа, уверсе—унізе, пасярэдзіне*; выкарыстоўваюцца вербальныя і невербальныя формы інструктавання).

Узнаўленне паслядоўнасці частак сутак, пораў года; іх прымет (па ўяўленні, з выкарыстаннем ілюстрацый, вербальных і невербальных формаў інструкцый, якія стымулююць арыенціроўку ў прыметах сутак і пораў года).

Дыферэнцыяцыя паняццяў: *рана, позна, на наступны дзень.*

Параўнанне прадметаў па масе, «на вока», кантроль вынікаў з дапамогай мускульных адчуванняў.

Адбор, паказ, мадэліраванне, класіфікацыя, называнне геаметрычных фігур (мадэлі, адлюстраванні, канструкцыйныя элементы мадэлей) па ўзоры, па вербальнай інструкцыі (круг, трохвугольнік, квадрат, прамавугольнік, шар, куб, брус).

Параўнанне мадэлей, адлюстраванняў геаметрычных фігур (колер, памер). Пазнаванне адлюстраванняў ліній; пабудова прамых, крывых ліній з дапамогай лінейкі.

Паняцці: *многа—адзін, па адным, многа—некалькі.* Выдзяленне з сукупнасці прадметаў «аднаго» і атрыманне з асобных прадметаў «многа».

Лік і лічба 1.

Утварэнне лікаў 2—5 (прылічванне і адлічванне па адным, на аснове ўспрымання сукупнасці прадметаў, на аснове выкарыстання ўмоўных мерак (палоска кардону, сталовая лыжка, кубак, кавалак вяроўкі)).

Пазнаванне лічбаў і называнне лікаў і канечнага ліку пры лічэнні (адказ на пытанне *Колькі?* Называнне лікаў пры лічэнні: *адзін, адна, адно, два, дзве, тры…*).

Суадносіны: лік—прадметная сукупнасць, лік—лічба, лічба—прадметная сукупнасць, лічба—лік. Параўнанне прадметных сукупнасцей і лікаў (выкарыстоўваюцца аднародныя і разнародныя прадметы, прадметы навакольнага асяроддзя, ілюстрацыі. Разуменне выразаў: *адзін і яшчэ адзін — будзе многа; адзін менш, чым многа; многа больш, чым адзін; лік 5 большы за лік 3; лік 3 меншы за лік 5).*

Парадкавыя лічэбнікі. Работа з лічыльнікамі.

Састаў лікаў у межах 5 (выкарыстоўваюцца прадметныя сукупнасці поўнасцю або часткова).

Складанне і адніманне ў межах 5 на канкрэтным матэрыяле. Знакі арыфметычных дзеянняў (дзеянні з прадметнымі сукупнасцямі, выкарыстанне ілюстрацый, запіс, рашэнне, чытанне). Разуменне інструкцый: *Якое арыфметычнае дзеянне выканаў? Прачытай: «Да трох дадаць адзін — атрымаецца ... . Тры плюс адзін ... . Ад чатырох адняць адзін — застаецца ... . Чатыры мінус адзін — застаецца ...».*

Прыёмы вылічэнняў: перамяшчальная ўласцівасць складання, прыбаўленне і адніманне па адной і па некалькі адзінак.

Рашэнне наглядных задач і задач-даручэнняў. Складанне задач па малюнку, па паслядоўна размешчаных згодна з сюжэтам двух, трох малюнках.

Пункт. Прамая лінія. Крывая лінія. Лінейка. Пабудова прамых ліній у розных напрамках *(Правядзі прамую лінію так, як у мяне. Правядзі прамую лінію злева направа, зверху ўніз, знізу ўверх. Правядзі прамую лінію па лініі).*

## ДРУГАЯ ЧВЭРЦЬ

Утварэнне лікаў 6—9. Лік 10. Колькасныя і парадкавыя лічэбнікі (разуменне пытанняў *Колькі? Каторы пры лічэнні?*).

Састаў лікаў першага дзесятка (лік 5 — гэта: 3 + 2; 4 + 1; 3 + 1 + 1; 2 + 2 + 1; 2 + 1 + 1 + 1; 1 + 1 + 1 + 1 + 1).

Лічэнне ў межах 10 на канкрэтным матэрыяле, абстрактна, пачынаючы ад любога ліку. Лікавы рад 1—10; 10—1. Уласцівасці лікаў у лікавым радзе *(лік ... стаіць перад лікам ... , стаіць за лікам ... , ідзе ўслед за лікам ... , папярэднічае ліку ... , лік ... стаіць паміж лікамі ... , суседзі ліку ... , усе лікі пасля ліку 3 — гэта ... , усе лікі перад лікам 6 — гэта ... , лік 7 большы за лік 6, лік 6 меншы за лік 7).*

Два прадметы. Пара прадметаў. Лічэнне парамі, лічэнне па 2 на канкрэтным матэрыяле.

Параўнанне сукупнасцей прадметаў *(больш—менш, пароўну)* і лікаў (*лік 5 меншы за лік 8, лік 8 большы за лік 5.* Разуменне інструкцый: *Пакладзі столькі ж. Вазьмі менш*).

Лік і лічба 0 (нуль як сімвал астачы).

Табліца складання і аднімання лікаў у межах 5. Складанне і адніманне лікаў у межах 10 на аснове дзеянняў з прадметнымі

сукупнасцямі (канкрэтызацыя лікавых адносін, раскрыццё іх сутнасці, ілюстрацыя саставу ліку).

Разуменне тэрмінаў, якія абазначаюць кампаненты арыфметычных дзеянняў: першае складаемае, другое складаемае, сума; памяншаемае, аднімаемае, рознасць (ужываюцца ў мове настаўніка).

Часавыя ўяўленні: *даўно, нядаўна.*

Арыфметычныя задачы на знаходжанне сумы і астачы (успрыманне ўмовы са слоў настаўніка, ілюстрацыя прадметнай і матэматычнай сутнасці задачы прадметнымі дзеяннямі, малюнкамі).

Састаўленне арыфметычных задач на аснове прадметных дзеянняў, па малюнку, па серыі двух-трох малюнкаў.

Прамая, крывая лініі. Правядзенне прамой лініі ў розных напрамках (гарызантальна, вертыкальна, нахілена). Атрыманне прамой лініі згінаннем ліста паперы.

Заданні: *Правядзі (начарці) прамую лінію. Пастаў пункт на лініі, над лініяй, злева (справа) ад прамой лініі. Пазнай прамыя лініі на прадметах, на чарцяжы, у розным становішчы. Правядзі (начарці) крывую лінію зверху ўніз, нахілена, знізу ўверх.*

Размяшчэнне мадэлей геаметрычных фігур у розных прасторавых адносінах.

## ТРЭЦЯЯ ЧВЭРЦЬ

Нумарацыя лікаў у межах 10. Уласцівасці лікаў у лікавым радзе. Састаў лікаў, параўнанне. Спосабы атрымання лікаў у межах 10.

Лік 10. Лікавы рад 1—10; 10—1. Адназначныя лікі і двухзначны лік. Нуль як сімвал пустога мноства *(многа, адзін, па адным, ніводнага).*

Складанне і адніманне ў межах 10. Прыёмы вылічэнняў. Рашэнне камбінаваных прыкладаў. Параўнанне прыкладаў і вынікаў вылічэнняў (назвы кампанентаў арыфметычных дзеянняў успрымаюцца са слоў настаўніка). Рашэнне прыкладаў тыпу: $6 + 1 + 1 + 1$; $6 - 1 - 1$; $6 - 3 - 1$.

Структура арыфметычнай задачы (умова, пытанне, рашэнне, адказ). Арыфметычная задача і арыфметычны прыклад.

Паняцці: *уперад, назад, ззаду, направа (управа, справа), налева (злева, улева), далей.*

*Павольна—хутка, стары—малады, старэйшы—маладзейшы, глыбокі—мелкі, глыбей—мяльчэй* (вербальная ацэнка адносін у працэсе назірання, па малюнку).

Пабудова ліній. Узаемнае размяшчэнне ліній, круга і многавугольнікаў.

### ЧАЦВЁРТАЯ ЧВЭРЦЬ

Спосабы ўтварэння лікаў першага дзесятка. Адносіны: лік—лічба—прадметнае мноства (разглядаюцца ў розных узаемасувязях на аснове прадметна-практычных дзеянняў, запісу, каменціравання).

Уласцівасці лікаў у лікавым радзе, параўнанне (выкарыстоўваюцца лічбавы рад, вербальнае ўзнаўленне адносін лікаў).

Параўнанне прадметных сукупнасцей і лікаў (вербальнае ўзнаўленне адносін, прыёмы ўстанаўлення ўзаемаадназначнай адпаведнасці паміж элементамі мностваў).

Складанне і адніманне лікаў у межах 10 (на канкрэтным матэрыяле, абстрактна, з частковым выкарыстаннем наглядных дапаможнікаў). Прыёмы складання і аднімання.

Табліца складання і аднімання ў межах 10 (з лікамі 1, 2, 3, 4, 5). Рашэнне камбінаваных прыкладаў.

Арыфметычныя задачы на знаходжанне сумы і астачы (запіс рашэння, ілюстрацыя ўмовы і рашэння прадметнымі дзеяннямі). Структура арыфметычнай задачы. Састаўленне задач (прадметныя дзеянні, малюнак). Вербальнае ўзнаўленне ўмовы, пытання задачы на аснове прадметна-практычных дзеянняў, малюнка. Пастаноўка пытання да ўмовы задачы.

Пабудова прамых ліній, якія праходзяць праз адзін і два пункты.

Узаемнае размяшчэнне прамых ліній і пунктаў. Круг. Многавугольнікі. Шар, куб, брус. Размяшчэнне мадэлей геаметрычных фігур у розных прасторавых адносінах. Трохвугольнік, прамавугольнік (квадрат). Стораны, вуглы прамавугольніка (квадрата).

## ПРАКТЫЧНЫ КАМПАНЕНТ

Практыкаванні:

параўнаць прадметы па даўжыні *(доўгі—кароткі, даўжэйшы—карацейшы)*, па масе *(цяжкі—лёгкі, цяжэйшы—лягчэйшы)*;

устанавіць (па заданні настаўніка) прасторавае размяшчэнне прадметаў (аднародныя, разнародныя), размясціць іх у рад; паказаць (назваць) *першы, апошні*; прадмет, які знаходзіцца *перад ... , за ... , пасля ...* ;

параўнаць сукупнасць прадметаў *(больш—менш, пароўну, столькі ж)*;

аб'яднаць прадметы, адняць частку сукупнасці прадметаў *(дадалі, паклалі ... — стала больш; забралі, аднеслі ... — стала менш)*;

вызначыць па лічбе нумар дома, школы, маршрут гарадскога транспарту, старонку кнігі, падручніка (у межах 10);

палічыць прадметы і назваць канечны лік; вызначыць колькасць невялікіх сукупнасцей прадметаў (2, 3) без іх пералічвання;

узнавіць умову нагляднай задачы і задачы-даручэння;

назваць паслядоўнасць частак сутак, пораў года і іх прыметы;

вызначыць геаметрычную форму прадмета, яго частак;

пабудаваць з дапамогай лінейкі прамыя лініі ў розных напрамках, якія праходзяць праз адзін і два пункты.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЕДАЎ, УМЕННЯЎ ВУЧНЯЎ

***Першы ўзровень***

Вучні в е д а ю ц ь:

лікі 1—10, іх назвы і лічбавае абазначэнне;

паслядоўнасць лікаў у лікавым радзе, абазначэнне прадметнай сукупнасці лікам, лічбай;

табліцу складання і аднімання з лікам 1 у межах 10 і ўсе выпадкі ў межах 5.

Вучні ў м е ю ц ь:

лічыць, адлічваць прадметы (іх адлюстраванні) у межах 10 і адказваць на пытанне *Колькі?*;

суадносіць прадметную сукупнасць, лік і лічбу;

вызначаць парадкавае размяшчэнне прадметаў і адказваць на пытанні *Які па парадку чырвоны куб? Пакажы пяты ...* ;

параўноўваць дзве сукупнасці прадметаў і вызначаць, дзе іх больш, менш, пароўну; параўноўваць лікі;

выконваць складанне і адніманне лікаў на аснове прадметных дзеянняў;

адрозніваць знакі арыфметычных дзеянняў, называць іх, адказваць на пытанні *Якое арыфметычнае дзеянне ты выканаў? Прачытай рашэнне*;

пазнаваць і называць мадэлі, адлюстраванні круга, трохвугольніка, прамавугольніка (квадрата), класіфікаваць мадэлі, выконваць чарцяжы ліній (прамую, крывую).

***Другі ўзровень***

Вучні в е д а ю ц ь:

назвы і лічбавае абазначэнне лікаў 1—5 (1—10).

Вучні ў м е ю ц ь:

лічыць прадметы ў межах 10, адказваць на пытанні *Колькі? Які лік па парадку? Пакажы трэці …* ;

выконваць складанне і адніманне лікаў на аснове прадметна-практычных дзеянняў у межах 5 (10);

адрозніваць арыфметычныя дзеянні, знакі: дадаць (+), адняць (−), роўна (=);

пазнаваць геаметрычныя фігуры (мадэль, чарцёж); чарціць прамую і крывую лініі.

## III КЛАС

### ПЕРШАЯ ЧВЭРЦЬ

Назва і абазначэнне лічбамі лікаў 1—10. Дзесяць адзінак і адзін дзесятак (выкарыстоўваюцца прадметна-практычныя дзеянні, лічыльнікі, абак).

Утварэнне лікаў 2—10 прылічваннем і адлічваннем адзінкі, на аснове вымярэнняў. Выкананне практыкаванняў тыпу: *Складзі палоску з дзвюх, трох, чатырох папяровых палосак. Складзі дзве палоскі. У кожнай палосцы па тры прамавугольнікі*.

Узнаўленне паслядоўнасці лікаў у прамым і адваротным парадку, пачынаючы з любога ліку *(Лік стаіць перад … , папярэдні лік … , лік ідзе за … , наступны лік … . Нуль знаходзіцца перад лікам 1. Злева ў лікавым радзе — лікі меншыя, справа — большыя. Суседзі ліку …)*. Прымяненне ведаў аб нумарацыі лікаў да колькаснай ацэнкі сукупнасці прадметаў і з’яў навакольнай рэчаіснасці. Выкананне інструкцый, адказы на пытанні *Колькі? Які па парадку лічэння? Колькі ўсяго?*

Параўнанне і ўраўноўванне сукупнасцей прадметаў. Параўнанне лікаў па велічыні *(лік 7 больш за лік 6, лік 6 меншы за лік 7, лікі роўныя).*

Паказ параўноўваемых лікаў на прадметах, малюнках.

Лічэнне па 2, па 3.

Складанне і адніманне лікаў у межах 10. Прыёмы вылічэнняў: перастаноўка складаемых, прыбаўленне і адніманне па адным, групы адзінак. Рашэнне прыкладаў тыпу: $3 + 2$; $5 - 3$; $5 + 1 + 1 + 1$; $5 + 2 + 1$; $8 - 1 - 1 - 1$; $8 - 2 - 1$; $0 + 6$; $6 - 6$; $9 + 0$.

Састаў лікаў першага дзесятка, лік 10. Дапаўненне да 10. Складанне лікаў і іх састаў. Састаўленне арыфметычных прыкладаў (з частковым выкарыстаннем наглядных дапаможнікаў і без іх). Работа з лічыльнікамі.

Дзяленне прадметаў і іх сукупнасцей на дзве роўныя і няроўныя часткі (рашэнне практычных задач). Разуменне слоў: *пароўну, не пароўну, стольки ж.*

Часавыя ўяўленні: *сёння, заўтра, учора, на наступны дзень* (мадэліраванне практычных сітуацый).

Арыфметычныя задачы на знаходжанне сумы і рознасці (структура задачы, практычная ілюстрацыя ўмовы і рашэння задачы з дапамогай прадметных наглядных дапаможнікаў, малюнка да і пасля рашэння. Састаўленне задач).

Адрэзак. Пабудова адрэзкаў рознай (аднолькавай) даўжыні. Параўнанне адрэзкаў. Параўнанне адрэзкаў па даўжыні цыркулем.

Мадэліраванне многавугольнікаў, абвядзенне шаблонаў, штрыхоўка ўнутранай часткі контуру.

### ДРУГАЯ ЧВЭРЦЬ

Лікавы рад 0, 1, 2, 3, ... , 10.

Састаў лікаў першага дзесятка. Дапаўненне да 10 (практычныя дзеянні з прадметамі, графічныя заданні, выкарыстанне малюнкаў, якія паказваюць састаў лікаў. Лічэнне ад зададзенага ліку да зададзенага).

Адзін дзесятак і дзесяць адзінак. Два дзесяткі — дваццаць (выкарыстоўваюцца лічыльныя палачкі, лічыльныя палоскі, абак, лічыльнікі).

Утварэнне лікаў 11—15. Дзесятковы састаў лікаў. Адназначныя і двухзначныя лікі. Параўнанне лікаў. Знакі =, <, >. Работа з абакам, лічыльнікамі.

Правілы называння лікаў, запіс, паместнае значэнне лічбаў у ліку. Выкананне графічных заданняў, паказ двухзначных лікаў на абаку, лічыльніках, лічыльных палосках. Выкарыстанне ведаў нумарацыі пры рашэнні практычных задач.

Табліца складання і аднімання лікаў у межах 10.

Складанне двухзначных лікаў з адназначнымі. Адніманне адназначных і двухзначных лікаў ад двухзначнага. Прыёмы вылічэнняў (рашэнне прыкладаў тыпу: 10 + 2; 15 − 5; 15 − 10; 13 + 2; 2 + 13).

Простыя арыфметычныя задачы на знаходжанне сумы і астачы. Структура задачы.

Параўнанне сукупнасцей прадметаў, адлюстраванняў на малюнках, выкананне графічных заданняў *(пароўну, столькі ж, больш на ... , менш на ...).*

Адзінка вымярэння даўжыні — сантыметр (см). Вымярэнне даўжыні адрэзкаў.

Узаемнае размяшчэнне на чарцяжы адрэзка і пунктаў, мадэлей (малюнкаў) круга, многавугольнікаў *(злева, справа, над, пад, на).*

## ТРЭЦЯЯ ЧВЭРЦЬ

Утварэнне лікаў 16—19. Лік 20.

Параўнанне адназначных і двухзначных лікаў. Уласцівасці лікаў у лікавым радзе *(лік ідзе за ... , лік стаіць перад ... , папярэдні лік ... , наступны лік ... , лік 16 большы за лік 15, лік 15 меншы за лік 16).*

Вызначэнне парадкавага нумара прадмета. Знаходжанне прадмета па займаемым парадкавым месцы.

Лічэнне роўнымі лікавымі групамі ў межах 10, 20.

Састаў лікаў першага дзесятка. Дадаванне лікаў да 10. Складанне двухзначных лікаў з адназначнымі, адніманне ад двухзначнага ліку адназначнага і двухзначнага лікаў. Рашэнне прыкладаў тыпу: 15 + 3; 18 − 5; 6 + 11; 15 − 12; 6 + 4 + 2; 12 − 2 − 3; 12 − 10 − 1.

Прыёмы вылічэнняў (выкарыстанне слоў: *прыбавіць, скласці, адняць, дабавіць, і яшчэ ... — будзе, атрымаецца, застанецца, роўна*).

Паняцце *больш (менш) на некалькі адзінак*. Арыфметычныя задачы, якія змяшчаюць названыя паняцці (практыкаванні ў параўнанні сукупнасцей прадметаў, параўнанне прадметаў па

працягласці, прадметныя дзеянні, графічныя заданні, выкарыстанне малюнкаў. Выкананне заданняў тыпу: *Пакладзі столькі ж, але без ... . Пакладзі столькі ж і яшчэ ...*) Практычныя дзеянні па адлюстраванні ўмовы і рашэння задач.

Адзінка вымярэння часу — суткі (сут.). Тыдзень — сем сутак. Дні тыдня.

Пабудова адрэзкаў зададзенай даўжыні; адрэзкаў, даўжэйшых (карацейшых) за дадзены.

Прамень. Вугал. Прамы вугал. Вяршыня, стораны вугла. Вуглы прамыя і непрамыя. Пазнаванне вугла, большага (меншага) за прамы вугал.

## ЧАЦВЁРТАЯ ЧВЭРЦЬ

Назва і абазначэнне лікаў 11—20. Парадкавае лічэнне ў межах 20. Параўнанне лікаў. Запіс няроўнасцей. Уласцівасці лікаў у лікавым радзе.

Лічэнне па 2, па 5 (паказ лічэння роўнымі лікавымі групамі, малюнкамі і графічнымі заданнямі).

Знаходжанне сумы некалькіх аднолькавых складаемых (вербальнае афармленне выконваемых дзеянняў: *Да 2 дадаць 2, дадаць ... . 2 узяць ... разы. Па 2 узяць ... разы — атрымаецца ... .*

Табліца складання і аднімання лікаў у межах 10. Складанне і адніманне ў межах 20 без пераходу праз разрад (усе выпадкі). Рашэнне прыкладаў тыпу: 13 + 4; 12 + 7; 10 + 10; 20 − 7; 20 − 12; 19 − 12; 14 + 2 + 2; 15 + 3 + 1; 15 − 5 − 6 (выкарыстоўваюцца абак, лічыльнікі). Прыёмы вылічэнняў.

Дапаўненне да 20.

Дзяленне прадметаў і іх сукупнасцей на 2, 3 і больш роўныя і няроўныя часткі (палоска паперы, алоўкі, прыродны матэрыял).

Рашэнне, састаўленне простых арыфметычных задач раней вывучаных відаў. Практычнае ілюстраванне ўмовы і рашэння задачы. Навучанне чытанню тэкставай арыфметычнай задачы.

Адзінка часу — гадзіна (гадз.). Вызначэнне часу з дакладнасцю да гадзіны (работа з цыферблатам гадзінніка і рэальнымі гадзіннікамі).

Паслядоўнасць дзён тыдня і іх парадкавы нумар, назва *(першы, трэці, апошні дзень тыдня; пасля, перад, за, усяго).*

Пабудова, вымярэнне, параўнанне адрэзкаў.

Прамы, востры, тупы вуглы (параўнанне мадэлей вуглоў накладваннем. Вызначэнне велічыні вугла «на вока»). Вугал, мен-

шы за прамы (востры вугал); вугал, большы за прамы (тупы вугал). Пазнаванне вуглоў на малюнках (кніга, канверт, дом).

Пабудова трохвугольніка, прамавугольніка (квадрата) па дадзеных пунктах.

## ПРАКТЫЧНЫ КАМПАНЕНТ

Практыкаванні:

параўнаць сукупнасці прадметаў (іх адлюстраванні): *пароўну, столькі ж, аднолькава, больш на ... , менш на ... ; параўнаць лікі па велічыні*;

параўнаць колькасць вадкасці (сыпкіх рэчываў) у рознай пасудзіне *(больш, менш, пароўну, аднолькава)*; выканаць вымярэнні ўмоўнымі меркамі (шклянка, лыжка);

раздзяліць прадмет (сукупнасць прадметаў) на некалькі роўных і няроўных частак;

вызначыць характар руху розных аб’ектаў *(павольна, хутка)*, колькасныя паказчыкі навакольных прадметаў або з’яў *(многа, мала, некалькі; пяць, дзесяць)*;

даць ацэнку масы прадмета «на вока» *(цяжкі, лёгкі)*, праверыць вынікі з дапамогай мускульнага адчування;

узнавіць па памяці табліцу складання і аднімання ў межах 10;

вызначыць па лічбавым абазначэнні нумар дома, старонку падручніка, дзень месяца (у межах 20);

выканаць лічэнне па 2, па 3, па 5;

пералічыць роўныя групы прадметаў ці іх малюнкі.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЕДАЎ, УМЕННЯЎ ВУЧНЯЎ

***Першы ўзровень***

Вучні в е д а ю ц ь:

лікі 11—20, іх назву і лічбавае абазначэнне; значэнне кожнай лічбы ў ліку;

паслядоўнасць лікаў у лікавым радзе;

табліцу складання і аднімання ў межах 10;

назвы дзён тыдня, іх паслядоўнасць.

Вучні ў м е ю ц ь:

чытаць, запісваць лікі 11—20, паказваць іх на абаку, пазнаваць на малюнках;

выконваць складанне і адніманне ў межах 20 без пераходу праз разрад;

рашаць арыфметычныя задачы на знаходжанне сумы і астачы;

чарціць многавугольнікі па дадзеных пунктах, вымяраць адрэзкі і будаваць адрэзкі зададзенай даўжыні (у сантыметрах);

пазнаваць і называць вуглы (прамы, востры, тупы).

***Другі ўзровень***

Вучні в е д а ю ц ь:

назву і лічбавае абазначэнне лікаў 1—10, іх паслядоўнасць.

Вучні ў м е ю ц ь:

чытаць, запісваць лікі ў межах 10, суадносіць прадметнае мноства, лік, лічбу;

выконваць складанне і адніманне ў межах 10 на канкрэтным матэрыяле;

рашаць наглядныя задачы, задачы-даручэнні (знаходжанне сумы і астачы);

пазнаваць круг, многавугольнікі; вызначаць геаметрычную форму прадметаў; чарціць прамыя лініі ў розным напрамку па ўзоры.

## IV КЛАС

### ПЕРШАЯ ЧВЭРЦЬ

Назва і паслядоўнасць лікаў 1—20. Дзесятковы састаў двухзначнага ліку (найбольшы і найменшы адназначны і двухзначны лік). Параўнанне лікаў. Запіс няроўнасцей *(лік ... большы за ... , лік ... меншы за ...)*. Ілюстраванне выконваемых дзеянняў з лікамі нагляднымі сродкамі: абак, малюнкі, прадметныя сукупнасці.

Табліца складання і аднімання ў межах 10. Састаў лікаў. Дадаванне да 10.

Складанне і адніманне ў межах 20 з пераходам праз разрад. Запіс прыкладаў:

$$\frac{7 + 5 =}{7 + 3 + 2 =} \qquad \frac{12 - 8 =}{12 - 2 - 6 =}$$

Лічэнне роўнымі лікавымі групамі па 2, 3, 4, 5.

Састаўленне набораў з двух, трох, чатырох, пяці прадметаў. Запіс у выглядзе складання аднолькавых лікаў. Каменціраванне

запісаў і вынікаў вылічэнняў, выкананне заданняў па вербальнай інструкцыі: *Да 2 дадаць 2, дадаць 2 да ... . Па 2 узяць 3 разы. 2 узяць 3 разы. Колькі ўзялі картак? Па колькі грыбоў намалявана на кожнай з іх? Колькі ўсяго грыбоў налічылі?*

Дзяленне сукупнасцей прадметаў на 2, 3, 4, 5 роўных частак. *(Колькі прадметаў узялі? На колькі роўных частак раздзялілі (раздалі, разлажылі)?)*

Вызначэнне часу з дакладнасцю да адной гадзіны. Адзінка вымярэння часу — месяц (мес.). Назва і паслядоўнасць месяцаў. Парадкавыя нумары дзён тыдня, тыдняў месяца (другі дзень тыдня, першы тыдзень месяца, асеннія месяцы).

Грашовыя знакі.

Адзінка вымярэння ёмістасці — літр (л), палова літра (лабараторная работа па вызначэнні ёмістасці пасудзіны, вымярэнні. Запіс вынікаў).

Арыфметычныя задачы, якія ўключаюць паняцці: *больш (даўжэй, вышэй), менш (карацей, ніжэй) на некалькі адзінак* (паказ умовы і рашэння задачы дзеяннямі з прадметамі, выкананнем малюнка. Параўнанне ўмоў і рашэнняў задач). Чытанне ўмовы задачы.

Вуглы: прамы, востры, тупы (параўнанне мадэлей вуглоў, пабудова з дапамогай чарцёжнага вугольніка. Пабудова прамога вугла з розным становішчам вяршыні, напрамкам старон. Вызначэнне віду вугла «на вока», праверка з дапамогай чарцёжнага трохвугольніка, мадэліраванне вуглоў, пазнаванне на малюнках).

## ДРУГАЯ ЧВЭРЦЬ

Нумарацыя лікаў у межах 20. Дзесяць адзінак і адзін дзесятак (утварэнне двухзначных лікаў, называнне, запіс, аналіз дзесятковага саставу, месца ліку ў лікавым радзе, параўнанне адназначных і двухзначных лікаў. Ілюстраванне выконваемых аперацый нагляднымі дапаможнікамі, малюнкамі).

Складанне і адніманне лікаў у межах 20 (усе выпадкі). Прыёмы вылічэнняў. Разуменне і карыстанне тэрмінамі, якія абазначаюць кампаненты складання і аднімання.

Множанне лікаў на 2, 3, 4, 5. Назва кампанентаў: першы множнік, другі множнік, множнікі, здабытак (выкарыстоўваюцца ў мове настаўніка).

Адзінка вымярэння часу — год (г.). 1 г. = 12 мес. Назвы, паслядоўнасць месяцаў года.

Адзінка вымярэння даўжыні — метр (м). Практыкаванні па вымярэнні метрам невялікіх адлегласцей. Пабудова адрэзкаў на класнай дошцы. Запіс вынікаў.

Арыфметычныя дзеянні з лікамі, атрыманымі ад вымярэння адной мерай.

Арыфметычныя задачы на знаходжанне сумы аднолькавых складаемых, на знаходжанне здабытку (ілюстраванне ўмовы і рашэння задач прадметнымі дзеяннямі, малюнкамі, параўнаннем задач).

Трохвугольнік. Чатырохвугольнік. Многавугольнікі. Стораны, вуглы, вяршыні геаметрычных фігур. Вымярэнне даўжыні старон многавугольнікаў.

## ТРЭЦЯЯ ЧВЭРЦЬ

Нумарацыя лікаў 10, 20, 30, ... , 100. Складанне і адніманне дзесяткаў (лічэнне дзесяткамі, па 10, параўнанне лікаў, іх месца ў лікавым радзе. Выкарыстанне лічыльнікаў, абака. Рашэнне арыфметычных задач).

Арыфметычныя дзеянні ў межах 20.

Табліца множання лікаў на 2, 3, 4, 5.

Дзяленне на 2, 3, 4, 5 роўных частак (практычныя дзеянні па дзяленні сукупнасцей прадметаў, запіс у выглядзе лікавай формулы).

Рашэнне прыкладаў тыпу: $8 + 4 - 5$; $3 \times 4 + 2$; $5 \times 2 - 4$.

Адзінка вымярэння часу — мінута (мін). Фарміраванне ўяўленняў аб працягласці часу *(адна, некалькі мінут)*.

Адзінка вымярэння даўжыні — дэцыметр (дм). Суадносіны 1 дм = 10 см; 1 м = 10 дм (практыкаванні ў вымярэнні рознымі вымяральнымі інструментамі даўжыні ў сантыметрах, метрах, дэцыметрах). Адмерванне паласы кардону, вяроўкі зададзенай даўжыні.

Адзінка вымярэння масы — кілаграм (кг). Практыкаванні па вызначэнні масы прадметаў вагой 1 кг з дапамогай мускульных намаганняў, вагаў; пазнаванне прадметаў масай 1 кг.

Арыфметычныя задачы на дзяленне на роўныя часткі (ілюстраванне ўмовы і рашэння задач прадметнымі дзеяннямі, малюнкам).

Круг. Акружнасць. Пабудова акружнасці з дапамогай цыркуля (параўнанне круга і акружнасці, пазнаванне прадметаў, якія маюць форму круга, акружнасці).

ЧАЦВЁРТАЯ ЧВЭРЦЬ

Табліца множання і дзялення лікаў у межах 20. Рашэнне камбінаваных прыкладаў. Назвы кампанентаў дзялення: дзялімае, дзельнік, дзель (выкарыстоўваюцца ў мове настаўніка).

Адзінкі вымярэння часу: суткі, месяц (паслядоўнасць дзён тыдня, месяцаў года). Знаходжанне месяцаў па табельным календары.

Паняцці, звязаныя з вызначэннем узросту чалавека (адказы на пытанні *Колькі табе гадоў? Колькі гадоў твайму сябру?*).

Арыфметычныя задачы на дзяленне па змесце (параўнанне рашэнняў задач на дзяленне на роўныя часткі і па змесце). Рашэнне арыфметычных задач вывучаных відаў, састаўленне задач.

Многавугольнікі. Трохвугольнік. Стораны, вуглы, вяршыні. Вымярэнне даўжынь старон трохвугольнікаў. Пабудова трохвугольнікаў па дадзеных пунктах. Вырэзванне з паперы.

## ПРАКТЫЧНЫ КАМПАНЕНТ

Практыкаванні:

палічыць роўнымі лікавымі групамі па 2, 3, 4, 5 (у межах 20), дзесяткамі, па 10 (у межах 100);

выкарыстаць веданне табліцы складання і аднімання лікаў у межах 10 у канкрэтных сітуацыях, пры рашэнні задач;

выконваць заданні на лічыльніках, абаку (паказаць лік, параўнаць, выканаць складанне і адніманне ў межах 20);

выкарыстаць веданне нумарацыі лікаў пры рашэнні практычных задач: пазнаць нумар дома, старонку падручніка, запомніць нумар аўтобуса (колькасныя і парадкавыя лікі);

падзяліць сукупнасць прадметаў на 2, 3, 4, 5 роўных частак;

пазнаць і назваць грашовыя адзінкі;

вымераць даўжыню (шырыню) класнага пакоя (у метрах); назваць (вымераць) даўжыню вяроўкі; адмераць даўжыню папяровай палоскі зададзенай даўжыні (у сантыметрах, дэцыметрах);

назваць месяцы вучэбнай чвэрці, месяцы года (па календары), іх парадкавы нумар, колькасць, адказаць на пытанні *Колькі табе гадоў? Колькі гадоў твайму таварышу?*;

пазнаць па цыферблаце гадзінніка час з дакладнасцю да адной гадзіны (прыкладна арыентавацца ў працягласці адной гадзіны, мінуты);

пазнаць «на вока» велічыню вугла (мадэль, чарцёж), праверыць вынік накладваннем мадэлі;
назваць прадметы, якія маюць форму шара, бруса, куба;
пабудаваць акружнасць, круг з дапамогай цыркуля.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЕДАЎ, УМЕННЯЎ ВУЧНЯЎ

***Першы ўзровень***

Вучні ведаюць:
назву і лічбавае абазначэнне лікаў 1—20, дзесяткаў;
табліцу множання і дзялення лікаў у межах 20 (з выкарыстаннем табліц);
назвы месяцаў года, іх паслядоўнасць;
элементы многавугольніка (стораны, вуглы, вяршыні), круг і акружнасць.

Вучні ўмеюць:
называць і запісваць лікі 1—20, дзесяткі, параўноўваць, паказваць іх на абаку, лічыльніках;
выконваць чатыры арыфметычныя дзеянні ў межах 20;
вымяраць даўжыню (у сантыметрах, метрах).

***Другі ўзровень***

Вучні ведаюць:
назвы і абазначэнне лікаў 11—20, іх паслядоўнасць;
табліцу складання і аднімання ў межах 10;
назвы дзён тыдня і іх паслядоўнасць.

Вучні ўмеюць:
называць, запісваць лікі 1—20, паказваць на абаку, лічыльніках;
выконваць складанне і адніманне лікаў у межах 20 (нескладаныя выпадкі, без пераходу праз разрад);
рашаць арыфметычныя задачы на знаходжанне сумы і астачы;
вымяраць адрэзкі (у сантыметрах), пазнаваць вуглы, чарціць многавугольнікі па дадзеных пунктах.

## V КЛАС

### ПЕРШАЯ ЧВЭРЦЬ

Нумарацыя лікаў 11—20, круглых дзесяткаў.
Нумарацыя лікаў 21—100. Дзесятковы састаў, назва (уласцівасці лікаў у лікавым радзе, утварэнне лікаў з разрадных адзі-

нак і дадаваннем або адніманнем адзінкі. Абак, лічыльнікі, наглядныя дапаможнікі, якія ілюструюць утварэнне лікаў у межах 100).

Складанне і адніманне лікаў у межах 100 без пераходу праз разрад (прыёмы вылічэнняў). Рашэнне прыкладаў тыпу: 60 + + 30 − 20; 3 дзесяткі + 6 дзесяткаў; 50 + 8; 78 − 8; 49 + 1; 96 − 1; 9 + 6 − 3; 13 − 5 + 2; 60 − (20 − 16); 35 + 20; 69 − 30; 42 + 7; 87 − 4; 45 + 23; 45 − 23; 4 × (19 − 14); 18 : 3 + 4.

Прылічванне і адлічванне па 2, па 3 (да 30), па 4 (да 40), па 5 (да 50). Выкарыстанне набораў прадметаў, малюнкаў, якія канкрэтызуюць лічэнне.

Табліца множання і дзялення ў межах 20.

Суадносіны адзінак вымярэння: 1 м = 100 см. Адзінка вымярэння даўжыні — міліметр (мм). 1 см = 10 мм. Рашэнне прыкладаў тыпу: 40 см + 60 см; 1 м − 20 см, 5 мм + 5 мм.

Грашовыя знакі (рашэнне практычных задач).

Арыфметычныя задачы на дзяленне на роўныя часткі і па змесце. Рашэнне задач раней вывучаных відаў, параўнанне ўмоў, рашэнняў.

Простыя арыфметычныя задачы тыпу: 8 + 8 + 4; 12 − 4 − 1.

Прамая, крывая лініі. Адрэзак. Прамень. Лініі, якія перасякаюцца. Многавугольнікі. Пабудова ліній, многавугольнікаў па дадзеных пунктах, адвольна.

### ДРУГАЯ ЧВЭРЦЬ

Дзесятковы састаў лікаў 21—100, месца ліку ў радзе лікаў, уласцівасці, параўнанне лікаў, аналіз ліку.

Складанне і адніманне ў межах 100 без пераходу праз разрад (усе выпадкі). Прыёмы выканання вылічэнняў. Спалучальны закон множання. Рашэнне камбінаваных прыкладаў тыпу: 88 + + 2 + 3; 93 − 3 − 2; 21 + (5 + 4); 53 + 27; (13 + 5) × 2; 15 : 5 × 2.

Прылічванне і адлічванне па 6, 7, 8 (у невялікіх адрэзках лікавага рада), састаўленне набораў з малюнкаў, на якіх адлюстраваны групы прадметаў.

Суткі. 1 сут. = 24 гадз. Мінута. 1 гадз. = 60 мін. Тыдзень. 1 тыдзень = 7 дзён. Месяц. 1 мес. = 28 (29, 30, 31 сут.). Год. 1 г. = 12 мес. (рашэнне практычных задач з выкарыстаннем табельнага календара, вызначэнне часу па цыферблаце гадзінніка, пастаноўка стрэлак на патрэбны час).

Састаўныя арыфметычныя задачы, якія ўключаюць дзеянні складання і аднімання (мадэліраванне практычных сітуацый, якія ілюструюць умову задачы, атрыманне састаўной задачы з дзвюх простых і раскладванне састаўной задачы на дзве простыя).

Паняцце *павялічыць (паменшыць) у некалькі разоў* (практыкаванні з дыдактычным матэрыялам, графічныя заданні). Рашэнне арыфметычных задач, якія ўключаюць названыя адносіны.

Ломаная лінія (мадэліраванне з дроту, графічныя заданні на лістах лінеенай і нелінеенай паперы, на класнай дошцы).

## ТРЭЦЯЯ ЧВЭРЦЬ

Лікавы рад 21—100. Аналіз лікавага рада і канкрэтных лікаў, параўнанне лікаў, запіс, назва. Работа з абакам, лічыльнікамі, калькулятарам.

Табліцы складання і аднімання, множання і дзялення ў межах 20 (узнаўленне па памяці, з апорай на наглядныя дапаможнікі, на складзеныя табліцы).

Складанне і адніманне ў межах 100 з пераходам праз разрад пісьмовымі прыёмамі вылічэнняў. Перамяшчальны закон складання. Рашэнне прыкладаў тыпу: $59 + 4$; $62 - 5$; $45 + 27$; $97 - 18$; $50 - 12$.

Множанне лікаў на 3, 4, 5, 6 і дзяленне на 3, 4, 5, 6 роўных частак. Перамяшчальны закон множання. Рашэнне камбінаваных прыкладаў тыпу: $15 : 5 + 3$; $18 : 3 : 2$; $38 - 4 \times 5$; $20 : 2 - 9$; $(57 - 53) \times 3$. Парадак арыфметычных дзеянняў з дужкамі і без дужак. Разуменне і выкарыстанне тэрмінаў, якія паказваюць кампаненты множання і дзялення.

Практычнае знаходжанне палавіны, чвэрці долі прадмета або ліку.

Адзінкі вымярэння кошту. Грашовыя знакі (рашэнне практычных задач).

Адзінкі вымярэння масы. Цэнтнер (ц). 1 ц = 100 кг. Практычныя работы па ўзважванні на розных вагах.

Адзінкі вымярэння часу *(паўтарэнне)*. Адносіны: суткі, тыдзень, месяц, год, паўгоддзе. Паслядоўнасць месяцаў года. Адна гадзіна (палова гадзіны). Вымярэнне часу з дакладнасцю да адной гадзіны (да пяці мінут).

Арыфметычныя задачы, якія ўключаюць паняцці: *больш (даўжэй, вышэй), менш (карацей, ніжэй) у некалькі разоў*. Дыфе-

рэнцыяцыя спосабаў рашэння задач, якія ўключаюць адносіны: *больш (менш) на некалькі адзінак і ў некалькі разоў*.

Састаўныя арыфметычныя задачы (два-тры арыфметычныя дзеянні).

Замкнёная і незамкнёная ломаныя лініі. Мадэліраванне ломаных ліній. Вымярэнне даўжыні ломанай лініі. Крывыя замкнёныя і незамкнёныя лініі. Круг і акружнасць. Цэнтр круга. Параўнанне круга і акружнасці.

Трохвугольнік (стораны трохвугольніка). Чатырохвугольнікі. Прамавугольнік (квадрат). Вуглы, процілеглыя стораны, вяршыні прамавугольніка (квадрата). Параўнанне прамавугольніка і квадрата. Пабудова геаметрычных фігур па зададзенай даўжыні старон.

### ЧАЦВЁРТАЯ ЧВЭРЦЬ

Нумарацыя лікаў у межах 100. Нумарацыя круглых соцень у межах 1000 (паслядоўнасць, называнне, лічэнне).

Складанне і адніманне ў межах 100 (усе выпадкі). Рашэнне камбінаваных прыкладаў, якія ўключаюць чатыры арыфметычныя дзеянні з дужкамі і без іх. Парадак выканання дзеянняў.

Множанне лікаў на 7, 8, 9 і дзяленне на 7, 8, 9 роўных частак. Табліца множання і дзялення.

Дзяленне з астачай. Рашэнне прыкладаў тыпу: 7 : 3; 12 : 5.

Практычнае вызначэнне пятай, дзесятай долей прадмета, ліку.

Суадносіны паміж адзінкамі вымярэння даўжыні, масы, кошту, часу. Запіс лікаў. Практыкаванні па вымярэнні прадметаў рознымі адзінкамі вымярэння, па адмерванні прадметаў зададзенай даўжыні (см, мм, м).

Арыфметычныя задачы на вызначэнне працягласці падзеі па яе пачатку і заканчэнні; заканчэння падзеі па яе пачатку і працягласці; пачатку падзеі па яе працягласці і заканчэнні (рашэнне ў межах сутак, тыдня. Выкарыстоўваюцца цыферблат гадзінніка, каляндар, графічныя апоры).

Параўнанне ўмоў, спосабаў рашэння задач, што ўключаюць адносіны: *больш (менш) на некалькі адзінак і ў некалькі разоў*. Арыфметычныя задачы на знаходжанне невядомага складаемага (запіс у выглядзе ўраўнення). Рашэнне састаўных задач.

Многавугольнікі. Вымярэнне даўжыні замкнёнай і незамкнёнай ломаных ліній.

Круг, акружнасць. Радыус круга. Рашэнне задач геаметрычнага зместу. Мадэліраванне геаметрычных фігур.

## П Р А К Т Ы Ч Н Ы  К А М П А Н Е Н Т

Практыкаванні:

пазнаць, назваць лікі ў межах 100, запісаць лікі па заданні настаўніка (выкарыстоўваюцца малюнкі, калькулятар, разрадная табліца);

выканаць складанне і адніманне з выкарыстаннем вусных, паўпісьмовых і пісьмовых прыёмаў вылічэнняў;

рашыць камбінаваныя прыклады, прымяняючы веданне табліц множання і дзялення ў межах 20, парадку выканання дзеянняў;

палічыць аднолькавымі групамі лікаў; знайсці палову, чвэрць прадмета, ліку;

вызначыць даўжыню прадмета (адрэзка) «на вока» і праверыць вынік вымярэннем (см, м, мм);

рашыць задачы жыццёва-практычнага зместу, якія ўключаюць паняцце *больш (менш) у некалькі разоў*, на дзяленне на роўныя часткі і па змесце; паказаць умову задачы, рашэнне прадметна-практычнымі дзеяннямі, малюнкамі;

вызначыць ёмістасць пасудзіны (у літрах) «на вока» *(літр, больш за літр, тры літры, палова літра, дзесяць літраў)*;

вызначыць час па розных відах гадзіннікаў (наручныя, будзільнік) з дакладнасцю да адной гадзіны; часавыя прамежкі па становішчы стрэлак гадзіннікаў (1, 5, 10, 30 мін);

узнавіць па памяці назвы месяцаў года ў іх паслядоўнасці; вызначыць колькасць тыдняў і дзён у месяцы па табельным календары;

вызначыць па цыферблаце гадзінніка, табельным календары працягласць падзеі па яе пачатку і заканчэнні; заканчэнне падзеі па яе пачатку і працягласці; пачатак падзеі па яе працягласці і заканчэнні (у межах сутак, тыдня);

узнавіць па памяці лікі, якія перадаюць суадносіны адзінак вымярэнні даўжыні, масы, часу;

пабудаваць круг, акружнасць, многавугольнікі.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЕДАЎ, УМЕННЯЎ ВУЧНЯЎ

***Першы ўзровень***

Вучні в е д а ю ц ь:

назву лікаў і іх лічбавае абазначэнне ў межах 100, дзесятковы састаў;

табліцу множання і дзялення ў межах 20;

спосабы рашэння простых задач на знаходжанне сумы і астачы, якія ўключаюць адносіны *больш (менш) на некалькі адзінак і ў некалькі разоў*, на дзяленне на роўныя часткі;

адзінкі вымярэння даўжыні, масы, часу, ёмістасці;

уласцівасці прамавугольніка (квадрата).

Вучні у м е ю ц ь:

запісваць, чытаць, пазнаваць лікі ў межах 100;

выконваць складанне і адніманне, карыстаючыся вуснымі і пісьмовымі прыёмамі вылічэнняў; карыстацца таблічнымі выпадкамі множання і дзялення пры выкананні вылічэнняў;

выконваць вымярэнні, карыстаючыся адзінкамі вымярэння даўжыні;

вызначаць час з дакладнасцю да адной гадзіны;

адрозніваць грашовыя знакі;

рашаць простыя арыфметычныя задачы, уключаныя ў праграму;

будаваць геаметрычныя фігуры (лініі, круг, акружнасць, многавугольнікі).

***Другі ўзровень***

Вучні в е д а ю ц ь:

назву і лічбавае абазначэнне лікаў 1—20;

уласцівасці лікаў у радзе лікаў;

лініі, многавугольнікі.

Вучні у м е ю ц ь:

распазнаваць лікі 1—20 па прадметным адлюстраванні, называць і запісваць іх, паказваць на абаку і лічыльніках;

выконваць складанне і адніманне ў межах 20, карыстацца табліцай множання і дзялення;

на канкрэтным матэрыяле рашаць простыя задачы вывучаных відаў;

вымяраць (будаваць) адрэзкі ў сантыметрах;

пазнаваць геаметрычныя фігуры, будаваць іх, вызначаць геаметрычную форму прадметаў і іх элементаў.

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Пытанні фарміравання ў дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю жыццёва неабходных уменняў і навыкаў прыстасаванасці да жыцця ў грамадстве, зніжэння залежнасці ад дапамогі іншых складаюць важны аспект сацыяльнай адаптацыі такіх дзяцей. Змест і арганізацыя іх навучання ўскладняюцца неабходнасцю карэкцыі пазнавальнай дзейнасці.

Уключэнню вучняў у самастойнае жыццё перашкаджае недастатковая сфарміраванасць у іх гатоўнасці да працы і нізкі ўзровень развіцця інтэлектуальных кампанентаў дзейнасці, такіх, як мэтанакіраванасць, планаванне і кантроль асобных дзеянняў. Выяўленыя цяжкасці ў працэсе «пераносу» тэарэтычных ведаў у практычныя віды дзейнасці, неразуменне неабходнасці авалодання ведамі ў сістэме «чалавек—прырода—грамадства» патрабуюць стварэння сістэмы жыццёва-практычных ведаў і ўменняў, прыцягнення вучняў да самастойнай арганізацыі свайго жыцця ва ўмовах школьнага навучання.

Прадмет «Чалавек і свет» з’яўляецца прапедэўтычным этапам фарміравання ў вучняў малодшых класаў дапаможнай школы жыццёвай кампетэнцыі. Ён не з’яўляецца толькі пачатковым звяном прыродазнаўства і геаграфіі і раздзелам па развіцці маўлення, бо мае пэўны важны самастойны змест, які дазваляе знаёміць вучняў з аб’ектамі і з’явамі навакольнага свету, з правіламі паводзін у грамадстве.

Галоўнай задачай урокаў па прадмеце «Чалавек і свет» з’яўляецца пашырэнне, удакладненне і сістэматызацыя ведаў пра грамадства, чалавека і прыроду ў цеснай узаемасувязі з фарміраваннем прыёмаў і спосабаў пазнавальнай дзейнасці. Прадмет «Чалавек і свет» сістэмна фарміруе веды дзяцей і дазваляе рэалізаваць карэкцыйна-развіваючую функцыю навучання і першасную сацыялізацыю дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю.

Праграма пабудавана паводле канцэнтрычнага прынцыпу, г. зн., пачынаючы з I класа, змест вучэбнага матэрыялу ў межах пэўнага раздзела ўдакладняецца, паглыбляецца, абагульняецца; фарміруюцца мысленчыя здольнасці: уменне абследаваць, параўноўваць прадметы, устанаўліваць простыя прычынна-выніковыя сувязі. Праграмныя матэрыялы ўключаюць наступныя раздзелы: «Чалавек і грамадства» (I клас — «Я — чалавек»), «Прырода і чалавек» (I клас — «Я і прырода»), «Чалавек і яго здароўе» (I клас — «Я і маё здароўе»).

Праграмны матэрыял можа планавацца ў іншай паслядоўнасці, чым выкладзены. Настаўнік самастойна вар'іруе яго, улічваючы сезонныя змены ў прыродзе, у працы людзей, падрыхтаванасць вучняў, наяўнасць дадатковага матэрыялу, магчымасць арганізацыі назіранняў і правядзення практычных работ, якія б пашыралі ўяўленні пра жывую і нежывую прыроду, іх узаемасувязь і месца чалавека ў навакольным свеце.

Актуальным у працэсе вывучэння прадмета «Чалавек і свет» з'яўляецца ўключэнне вучэбнага матэрыялу ў прадуктыўную дзейнасць дзяцей. Мяркуецца, што практычная дзейнасць стане патрэбнасцю для кожнага вучня. З гэтай мэтай настаўнік вызначае практычныя заданні, раскрывае іх значэнне, падкрэслівае іх неабходнасць. На ўроку шырока выкарыстоўваюцца розныя наглядныя сродкі навучання: натуральныя аб'екты, гербарыі, калекцыі, кіна- і дыяфільмы. Практычная дзейнасць (канструяванне, аплікацыя, работа з прыродным матэрыялам) стварае магчымасць для ажыццяўлення міжпрадметных сувязей.

Адной з асноўных задач вывучэння прадмета «Чалавек і свет» з'яўляецца фарміраванне навыкаў узаемаадносін і вопыту сумеснай дзейнасці. З першых дзён знаходжання дзіцяці ў школе важна пераадолець яго адчужанасць, страх і няўменне ўступаць у зносіны з аднагодкамі і дарослымі, навучыць карыстацца невербальнымі сродкамі зносін, жэстамі, мімікай, малюнкамі. Важна, каб дзіця ўступала ў зносіны з людзьмі і не адчувала, што камунікацыя залежыць ад стану яго маўлення. Задача настаўніка заключаецца ў тым, каб стварыць сітуацыі, у якіх вучань будзе стаяць перад неабходнасцю і жаданнем мець зносіны з іншымі дзецьмі. Усталяванню абстаноўкі даверу спрыяе візуальны кантакт «вочы ў вочы», трыманне за руку і інш.

На ўроках па прадмеце «Чалавек і свет» фарміруюцца правілы паводзін, матывамі якіх з'яўляюцца зносіны дзяцей паміж сабой, зносіны паміж дарослымі і дзецьмі. Для засваення гэтых

правілаў рэкамендуецца пастаянна працаваць над імі і над этыкетнымі формамі зносін, выклікаючы ў дзяцей праяўленне станоўчых эмоцый. Важна забяспечыць пашырэнне кола сацыяльных кантактаў і сувязей вучня. Спачатку ён уступае ў зносіны з аднакласнікамі, потым з вучнямі іншых класаў, выхавацелямі, знаёмымі людзьмі і г. д.

Веды па прадмеце «Чалавек і свет» знаходзяць прымяненне ў пазаўрочны час, на ўроках па іншых прадметах. Яны ствараюць перадумовы для паспяховай сацыяльна-бытавой арыенціроўкі і інтэграцыі вучня ў грамадства.

Праграма вызначае абавязковы базавы ўзровень ведаў. Складаныя тэмы пазначаны зорачкай (*). Яны прапануюцца для дзяцей з больш высокімі пазнавальнымі магчымасцямі. На падставе дадзенай праграмы настаўнік мае права вызначыць змест індывідуальнай праграмы навучання для вучня з выражанай, цяжкай формай інтэлектуальнай недастатковасці.

# ПРАГРАМЫ

# I КЛАС

## Я — ЧАЛАВЕК

### Я і людзі навокал

Звесткі пра сябе. Імя, прозвішча. Узрост. Што я ўмею. Што я люблю. Мае захапленні.

Я — хлопчык (дзяўчынка). Знаёмства дзяцей адзін з адным. Маё імя. Гэта я (мой настрой: добры, дрэнны, вясёлы, бадзёры).

Я і дзеці. Узаемаадносіны хлопчыкаў і дзяўчынак. Уменне разам гуляць, уступаць у зносіны. Я гуляю з сябрамі. Я дапамагаю. Паважлівыя і прыязныя адносіны адзін да аднаго. Добрыя ўчынкі.

Я і іншыя людзі. Прывітальныя словы. Вызначэнне па ўчынку добрых і дрэнных людзей. Які я чалавек. Куды я хаджу ў госці, як сустракаю гасцей.

### Мой клас

Я — вучань (вучаніца). Я і мае школьныя таварышы. З кім я сяджу побач, як завуць майго таварыша па парце.

Я дзяжурны. Абавязкі і вынікі працы кожнага дзяжурнага. Што патрэбна дзяжурнаму (крэйда, анучка, лейка).

### Мая школа

Мая школа. Я іду ў школу. Памяшканні школы. Мае вучэбныя прылады (сшытак, ручка, аловак і інш.), іх прызначэнне. Выдзяленне вучэбных прылад з шэрагу цацак. Беражлівыя адносіны да кніг, школьнай мэблі.

### Я і мая сям'я

Мая сям'я. Склад сям'і. Называнне імёнаў бацькі, маці, сястры (брата). Роля маці ў сям'і. Роля бацькі ў сям'і. Іншыя члены сям'і: дзядуля, бабуля, брат, сястра. Іх імёны, абавязкі. Дамашняя праца. Дапамога старэйшых малодшым. Правілы паводзін у сям'і. *Выкананне пасільных даручэнняў у сям'і.

### Прадметы вакол мяне

Цацкі (мяч, піраміда, машына і г. д.) — 2—3 на выбар. Любімая цацка: колер, *форма, велічыня, матэрыял, з якога яна зроблена, прызначэнне. Беражлівыя адносіны да цацак. Уменне трымаць у парадку, прыбіраць пасля гульні. Я суадношу цацкі па памеры, размяшчаю іх у прасторы.

Мэбля. Стол, стул, ложак і інш. Пасцельныя рэчы (матрац, прасціна, коўдра, падушка). Я паказваю і называю іх. Паслядоўнасць засцілання пасцелі. Гігіена цела.

Посуд. Я называю і паказваю посуд, у якім гатуюць ежу, з якога ядуць. Правілы мыцця посуду.

Адзенне. Маё адзенне. Адзенне для хлопчыкаў і дзяўчынак. *Правілы догляду адзення (чыстка, мыццё, прасаванне).

### Мой родны край

Краіна, у якой я жыву. Назва краіны (дзяржавы): Рэспубліка Беларусь. Мой горад, мая вёска. Грамадскія пабудовы і іх прызначэнне (школа, магазін і інш.).

## Я І ПРЫРОДА

### Прырода вакол мяне

Што такое прырода. Знаёмства з аб'ектамі прыроды (сонца, месяц, воблака, расліны, жывёлы).

Арганізацыя назіранняў за зменамі ў жыцці раслін і жывёл, працы людзей. Збор лістоў. Знаёмства з назвамі раслін, пладоў.

Часавыя ўяўленні: дзень, ноч. Іх прыметы.

## Раслінны свет

Разнастайнасць раслін: травяністыя расліны, кусты, дрэвы. Пазнаванне ў найбліжэйшым акружэнні. Называнне найбольш распаўсюджаных (2—3 на выбар) раслін. Іх параўнанне, адрозніванне па знешнім выглядзе.

Расліны — упрыгажэнне Зямлі. Будова раслін: корань, сцябло, ліст, кветка. Паказванне і называнне частак раслін.

Значэнне раслін у жыцці чалавека. Беражлівыя адносіны да раслін. Назіранне і догляд пакаёвых раслін.

Вырошчванне раслін чалавекам.

Называнне і паказванне агародніны: агурок, капуста, морква і г. д. (2—3 на выбар); садавіны: яблык, груша, сліва і г. д. (2—3 на выбар). Пазнаванне садавіны, агародніны па сілуэтах, контуры. Параўнанне па велічыні, форме, колеры, смаку. Ужыванне ў ежу.

Праца людзей на агародзе і ў садзе (пасадка, паліў, прапалка, збор ураджаю).

Ягады. Называнне ягад (2—3 на выбар). Параўнанне па велічыні, колеры, смаку.

*Пазнаванне ягад па знешнім выглядзе, сілуэце, контуры. Што гатуюць з ягад.

## Жывёльны свет

Свойскія і дзікія жывёлы.

Свойскія жывёлы: карова, кот, сабака і інш. (2—3 на выбар), дзіцяняты (кот — кацяня, сабака — шчаня).

Знешні выгляд, звычкі, голас, ежа, жыллё. *Карысць ад іх чалавеку. Клопат чалавека пра свойскіх жывёл.

Дзікія жывёлы: ліса, вожык, заяц, мядзведзь і інш. (2—3 на выбар).

Знешні выгляд, дзіцяняты, спосабы здабывання ежы. Называнне самай вялікай, самай маленькай жывёлы.

Дзікія і свойскія птушкі. Назіранне за птушкамі. Называнне найбольш вядомых птушак (2—3 на выбар). *Адрозніванне ўмоў жыцця дзікіх і свойскіх птушак. *Карысць чалавеку ад дзікіх і свойскіх птушак.

Знешні выгляд курыцы, качкі, іх птушаняты. Клопат чалавека пра свойскіх птушак.

Дзікія птушкі: вераб'і, вароны і інш. (2—3 на выбар). Знешні выгляд. Дапамога птушкам зімой. *Зімуючыя птушкі (сарока, сініца, снягір). Месца зімоўкі. *Пералётныя птушкі (бусел, ластаўка, шпак). Параўнанне ўмоў жыцця. Клопат чалавека пра дзікіх птушак.

Насякомыя: муха, жук, матылёк (2—3 на выбар).

### Поры года

Змены ў жыцці раслін і жывёл, працы людзей у розныя поры года. Прыгажосць прыроды ў кожную пару года.

***Восень.*** Прыметы восені (халодны вецер, падае лісце, дождж). Адлёт пералётных птушак у цёплыя краіны. Падрыхтоўка звяроў да зімы (збор арэхаў, грыбоў і г. д.).

Праца людзей восенню. Збор ураджаю. Уборка лісця. *Пасадка дрэў.

Адзенне па сезоне (плашч, куртка, боты і інш.).

***Зіма.*** Прыметы зімы (холадна, мароз, снег). Надвор'е, умоўнае абазначэнне надвор'я (❄ — снег, ☼ — сонейка).

Жыццё птушак зімой. *Як зімуюць дзікія звяры. Дапамога чалавека дзікім жывёлам і птушкам.

Зімовыя гульні і забавы. Катанне на санках, лыжах, каньках. Гульня ў снежкі. Навагодняя ёлка. Я святкую Новы год.

Адзенне і абутак па сезоне (шуба, шапка, валёнкі).

Праца людзей зімой (уборка снегу, пасыпанне дарожак пяском).

***Вясна.*** Прыметы вясны (цёплы вецер, раставанне снегу, *павелічэнне працягласці дня, крыгаход). Надвор'е.

Расліны вясной. Набуханне пупышак у дрэў. Першыя веснавыя кветкі. *Ахова раслін вясной.

Жывёлы вясной. Прылёт, гнездаванне птушак. Клопат пра птушак.

Веснавыя работы ў садзе, на агародзе (аруць зямлю, сеюць зерне, саджаюць бульбу, беляць ствалы дрэў). *Паказванне і называнне прылад працы (граблі, рыдлёўка, лейка). Ахова прыроды вясной.

Адзенне па сезоне.

***Лета.*** Асноўныя прыметы (доўгі дзень, цёплае надвор'е, *летнія дажджы, навальніцы).

Цвіценне раслін. Пасяванне пладоў.

*Жыццё жывёл летам, іх клопаты пра патомства. Догляд свойскіх жывёл.

Як я адпачываю. Правілы паводзін на прыродзе.

Праца на палях і агародах (праполка, паліў і г. д.).

## Я І МАЁ ЗДАРОЎЕ

### Часткі цела

Я называю і паказваю часткі цела (галава, шыя, тулава, рукі, ногі). Практычнае адрозніванне частак цела (правая рука, левая нага).

Як я пазнаю навакольны свет. Органы пачуццяў (зрок, слых, смак, нюх), іх роля і значэнне. Паказванне і называнне. Ахова зроку і слыху. Небяспечныя дзеянні для органаў зроку і слыху. Правілы прагляду тэлеперадач.

### Асабістая гігіена

Я заўсёды выконваю правілы асабістай гігіены. Я ўмею ўмывацца, прычэсвацца. *Парадак апранання (распранання).

У мяне добры знешні выгляд. У мяне акуратная прычоска, адзенне, абутак. Я ўмею даглядаць сябе, сваё адзенне і абутак.

Я выконваю правілы асабістай гігіены, захоўваю і ўмацоўваю здароўе.

Прадметы асабістай гігіены (мыла, зубная паста, шчотка, расчоска, мачалка, ручнік, насоўка). Прызначэнне, правілы выкарыстання. Правілы догляду зубоў.

Мой рэжым дня. Ранішняя гімнастыка, гігіенічныя працэдуры. Фізічныя практыкаванні, гульні ў розныя поры года, іх значэнне.

*Азбука харчавання. Чаму чалавек павінен есці. *Чаму ежа павінна быць разнастайная. Карысная для здароўя ежа. Гігіена харчавання.

Папярэджанне захворванняў. Што шкодна для здароўя.

Прастудныя захворванні, іх прычыны (не смактаць зімой ледзяшы і інш.). Я хварэю, выконваю назначэнні ўрача.

Я хачу быць здаровым. Я загартоўваюся, я апранаюся па сезоне.

### Культура паводзін

Правілы майго жыцця: што можна, што нельга. Добрыя і дрэнныя ўчынкі. *Які я зараз і якім я хачу быць. Вызначэнне, у якіх выпадках чалавек зрабіў добра, у якіх — дрэнна.

Я ўмею ўступаць у зносіны. Я захоўваю правілы паводзін пры сустрэчы і развітанні. *Я ўжываю ветлівыя словы ў канкрэтных сітуацыях (*дзякуй, калі ласка, добры дзень, да пабачэння, прабачце* і г. д.). Я захоўваю правілы ўзаемаадносін з сябрамі (не крычу, не штурхаюся). Умею ветліва звярнуцца з просьбай.

Я на адпачынку.

### Правілы дарожнага руху

Транспарт. Я на вуліцы. Я ведаю праезную частку, тратуар. Я адрозніваю сігналы святлафора. Я захоўваю правілы паводзін на вуліцы, на дарозе.

## ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ

Вучні прымяняюць на практыцы в е д ы:

называюць сваё імя, прозвішча, імёны сваіх бацькоў, сяброў;

называюць горад, у якім яны жывуць, і сваю вуліцу;

называюць садавіну, агародніну, якую часта ўжываюць у ежу, знаёмыя расліны;

называюць некаторых жывёл і іх дзіцянят (2—3 на выбар), часткі іх цела;

называюць прыродныя з’явы, суадносяць іх з пэўнай парой года.

Вучні ў м е ю ц ь:

вітацца, развітвацца, дзякаваць за паслугу, выкарыстоўваючы розныя формы зносін: словы, жэсты («Добры дзень» — ківок галавой, «Да пабачэння» — махі рукой, «Дзякуй» і інш.);

арыентавацца ў кватэры, класе;

прымяняць цацкі, вучэбныя прылады, адзенне, абутак, посуд па прызначэнні;

раскладваць адзенне ў парадку апранання і распранання;

паказваць і называць часткі цела, часткі твару;

распазнаваць у найбліжэйшым акружэнні знаёмыя расліны і жывёл.

# II КЛАС

## ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА

### Мая сям'я

Звесткі пра сябе (імя, прозвішча, узрост). Склад сям'і, называнне імёнаў бацькі, маці, брата, сястры, бабулі, дзядулі. Работа бацькоў. Дамашні адрас вучня (назва горада, вуліцы, нумар дома, кватэры).

Шчаслівая сям'я. Як дарослыя і дзеці ў сям'і клапоцяцца адзін пра аднаго. Каб сям'я была шчаслівая, трэба дапамагаць адзін аднаму. Абавязкі ў сям'і. Хто што робіць у сям'і. Размеркаванне абавязкаў. У сям'і вучацца адзін у аднаго. У кватэры сям'я падтрымлівае парадак.

### Прадметы вакол мяне

Адзенне. Абутак. Адзенне для зімы і лета. Параўнанне адзення па прызначэнні. Адзенне святочнае і штодзённае.

Абутак для дзяўчынак і хлопчыкаў: туфлі, боты, чаравікі, тапачкі.

Цацкі. Апрананне і кармленне лялькі.

Сюжэтна-ролевыя гульні з цацкамі, агучванне цацак у гульнях. Ёлачныя цацкі: колер, форма, памер, матэрыял, з якога зробленыя, прызначэнне, параўнанне. Механічныя і электронныя цацкі (параўнанне 1—2). Беражлівыя адносіны да цацак: уменне трымаць іх у парадку, «кожнай рэчы — сваё месца».

Настольныя гульні (сумесная дзейнасць). Добразычлівыя адносіны адзін да аднаго. Спагадлівасць і ўзаемадапамога. Правілы гульні.

Прадметы асабістыя і школьныя (аловак, ручка, сшытак, падручнік, партфель і г. д.). Правільнае размяшчэнне іх на парце і ў партфелі, беражлівыя адносіны. Акуратнае і неакуратнае рабочае месца (параўнанне).

### Мой клас

Зоны школьных памяшканняў і іх прадметнае напаўненне: месца для заняткаў, месца для гульні. Мэбля класа (парты, сталы, дошка). Падтрыманне чысціні ў класе. Правілы паводзін на ўроку і на перапынку. Веданне абавязкаў дзяжурнага, кветавода, санітара.

## Мая школа

Будынак школы. Экскурсія па школе. Арыенціроўка ў школьным будынку: школьныя кабінеты, класы, спальні, сталовая, туалеты, спартыўная зала, музычная (актавая) зала, кабінет урача, настаўніцкая, бібліятэка. Правілы паводзін у розных памяшканнях. Беражлівыя адносіны да школьнай маёмасці.

Школьны двор. Назвы і прызначэнне школьных пабудоў (стадыён, пляцоўка для гульняў, месца для адпачынку). Арыенціроўка ў школьным двары.

Прафесіі работнікаў школы: настаўнік, выхавальнік, урач, медсястра, дырэктар, прыбіральшчыца. Абавязкі і вынікі працы кожнага. Паважлівыя адносіны да работнікаў школы. Дапамога школьнікаў дарослым. Рэжым дня школы.

## Мой горад (сяло)

Веданне назвы горада (сяла), галоўнай вуліцы і плошчы. *Графічныя сімвалы ў горадзе. Паводзіны ў грамадскіх месцах. Прыгожыя мясціны і будынкі, іх назвы і прызначэнне.

Транспарт. *Прызначэнне транспарту. Транспарт грузавы і пасажырскі.

Правілы дарожнага руху. Веданне сігналаў святлафора. Паводзіны на вуліцах. Дарожныя знакі: «Асцярожна, дзеці!», «Наземны пешаходны пераход», «Падземны пешаходны пераход». Паводзіны ў грамадскім транспарце.

Адрозніванне горада ад сяла. Параўнанне будынкаў горада і сяла. Колькасць насельніцтва горада і сяла (больш—менш).

## Мая Радзіма

Краіна, у якой мы жывём. Назва сталіцы Рэспублікі Беларусь — горад Мінск. Нацыянальнае адзенне. Пазнаванне і называнне частак нацыянальнага касцюма (кашуля, штаны, пояс). Параўнанне са штодзённым адзеннем.

## Арыенціроўка ў навакольным свеце

Напрамкі *наперад—назад, спераду—ззаду*. Указанне з іх дапамогай месца размяшчэння прадметаў.

Напрамкі *злева—справа, налева—направа*. Вызначэнне напрамкаў адносна сябе з дапамогай левай і правай рукі.

Напрамкі *ўверх—уніз, зверху—знізу, вышэй—ніжэй*. Уяўленне пра тое, што ўсе прадметы падаюць на зямлю, уніз. Прадметы аднолькавыя і розныя (па велічыні, форме, прызначэнні). Аднолькавыя прадметы ў розным становішчы бачацца па-рознаму.

Прадметныя адносіны *раней—пазней*. Вызначэнне часавай паслядоўнасці падзей: *што было раней, што пазней*.

## ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК

### Прырода вакол нас

Куток прыроды ў класе (школе). Пакаёвыя расліны. Беражлівыя адносіны да пакаёвых раслін. Умовы іх росту і жыцця: святло, цяпло, добрая глеба, вада. Дапамога чалавека раслінам.

Назвы жывёл, што знаходзяцца ў кутку прыроды. Прыметы жывых арганізмаў: дыхаюць, харчуюцца, размнажаюцца, растуць. Умовы жыцця: чысціня, паветра, ежа, святло, цяпло.

Прышкольны ўчастак. Кветнік, сад, агарод (цяпліца). Прызначэнне і адрозніванне. Арыенціроўка на прышкольным участку. Назвы раслін кветніка, саду, агарода (2—3 на выбар). Паказванне раслін па заданні настаўніка. Назіранне за раслінамі кветніка, саду, агарода. Беражлівыя адносіны да раслін. Пустазелле на прышкольным участку. Распазнаванне і называнне пустазелля, распаўсюджанага ў дадзенай мясцовасці (2—3 на выбар). Адрозніванне ад культурных раслін. Віды дзейнасці на прышкольным участку: ускопванне, баранаванне, рыхленне глебы; пасадка, паліў, праполка раслін.

### Раслінны свет

Дрэвы, кусты, травяністыя расліны. Параўнанне і адрозніванне іх па знешнім выглядзе. Будова дрэва, куста, травяністай расліны. Знаходжанне адрозненняў і падабенстваў. Называнне найбольш распаўсюджаных у дадзенай мясцовасці раслін (3—4 віды). Параўнанне формы лістоў (акруглы край ліста, зубчасты край ліста, іголкі).

Карысць чалавеку ад дрэў, травяністых раслін. Адносіны чалавека да расліннага свету. Дрэвы і кусты. Іх адрозніванне. Пазнаванне і называнне яблыні, грушы, слівы, вішні.

Плады садовых раслін і ягадных кустоў. Правілы ўжывання ў ежу садавіны і агародніны. Расліны агарода: агурок, морк-

ва, цыбуля, бурак, капуста і інш. Называнне і паказванне 4—5 відаў агародніны (на выбар). Параўнанне па форме, колеры, памеры. Карысць чалавеку ад раслін агарода. Правілы ўжывання ў ежу агародніны.

Праца людзей на агародзе вясной (абкопванне дрэў і кустоў, рыхленне глебы, пасадка), летам (праполка, паліў), восенню (збор ураджаю, падрыхтоўка да зімы). Наведванне магазіна «Садавіна і агародніна». Пасадка агародніны ў дамашніх умовах (цыбуля). Назіранне за ростам і развіццём раслін.

## Жывёльны свет

Свойскія і дзікія жывёлы. Свойскія жывёлы: карова, конь, свіння, кот, сабака і інш. Называнне і паказванне 3—4 відаў свойскіх жывёл (на выбар). Дзіцяняты: цяля, жарабя, парася, кацяня, шчаня. Клопат чалавека пра свойскіх жывёл. Карысць ад іх чалавеку.

Дзікія жывёлы: воўк, ліса, вожык, заяц, мядзведзь, вавёрка і інш. Называнне і паказванне 3—4 відаў (на выбар). Іх дзіцяняты. Умовы існавання свойскіх і дзікіх жывёл. Спосабы здабывання ежы дзікімі і свойскімі жывёламі.

Дзікія і свойскія птушкі. Свойскія тушкі: курыца, гусь, качка, індычка. Іх птушаняты. Клопат чалавека пра свойскіх птушак. Карысць чалавеку ад свойскіх птушак.

Дзікія птушкі: вераб'і, вароны, сарокі, сініцы, буслы, ластаўкі, шпакі, гракі. Называнне і паказванне 3—4 відаў дзікіх птушак (на выбар). Зімуючыя птушкі: вераб'і, вароны, сарокі, сініцы, снегіры. Пералётныя птушкі: буслы, ластаўкі, шпакі, гракі. Параўнанне ўмоў жыцця. Назіранне за птушкамі. Дапамога птушкам зімой (выраб кармушак).

Насякомыя: мухі, камары, жукі, конікі, матылькі. Называнне і паказванне 3—4 відаў насякомых (на выбар). Значэнне насякомых у раслінным і жывёльным свеце.

Неабходнасць і непаўторнасць кожнага прадстаўніка жывой прыроды. Месца чалавека ў прыродзе. Добрыя і дрэнныя адносіны чалавека да прыроды.

## Поры (сезоны) года, змена пораў года

***Восень.*** Прыметы восені (пахаладанне, змяненне колеру лісця, кароткія дні, частыя дажджы, адлёт птушак). Назіранне

за станам неба восенню. Экскурсія ў асенні лес (парк). Падрыхтоўка жывёл і птушак да зімы. Адзенне і атрыбуты адзення па сезоне (плашч, куртка з капюшонам, парасон, чаравікі, гумавыя боты, шапка).

***Зіма.*** Прыметы зімы (мароз, снег, замярзанне вадаёмаў). Надвор'е. Стан неба. Ясныя і пахмурныя дні. Падкормка жывёл і птушак. Пыгажосць зімы. Зімовыя гульні і забавы. Павілы паводзін на лёдзе. Адзенне па сезоне (шуба, шапка, рукавіцы, шалік, валёнкі).

***Вясна.*** Прыметы вясны (пацяпленне, раставанне снегу і лёду, крыгаход, прылёт птушак, распусканне лісця на дрэвах і кветках). Надвор'е. Ясныя і пахмурныя дні. Стан неба. Веснавыя навальніцы.

Сезонныя з'явы ў жыцці раслін і жывёл (набуханне пупышак, распусканне лісця на дрэвах і кветках; вывядзенне птушанят). Прыгажосць вясны. Экскурсія ў веснавы лес (парк). Падрыхтоўка і правядзенне веснавых работ на прышкольным участку, у садзе, на агародзе. Адзенне па сезоне.

***Лета.*** Прыметы (цёпла, горача, яснае надвор'е, летнія дажджы і навальніцы). Сезонныя з'явы ў жыцці раслін і жывёл. Прыгажосць лета. Адпачынак дзяцей і дарослых летам. Загаранне і купанне. Правілы паводзін у вадзе. Праца людзей на палях і агародах (праполка, рыхленне, паліў).

## ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ

### Часткі цела чалавека

Часткі цела: галава, шыя, тулава, рукі, ногі. Правая рука, левая нага і г. д.

Вока як орган зроку. Правілы аховы зроку пры чытанні, праглядзе тэлеперадач. Вуха як орган слыху. Нос як орган нюху. Язык як орган смаку. Скура як орган дотыку.

### Асабістая гігіена

Прадметы асабістай гігіены (мыла, зубная шчотка, зубная паста, мачалка, расчоска, насоўка). Іх прызначэнне. Правілы карыстання імі. Выкананне ранішняга і вячэрняга туалету. Зубы. Зубы малочныя і пастаянныя. Догляд поласці рота. Догляд цела. Паслядоўнасць і самастойнасць выканання дзеянняў па захаванні чысціні цела.

Догляд валасоў. Правілы прычэсвання кароткіх і доўгіх валасоў. Догляд пазногцяў рук і ног. Правілы стрыжкі пазногцяў. Знешні выгляд. Акуратнасць прычоскі, адзення, абутку. Дапамога адзін аднаму ў ацэнцы знешняга выгляду.

Выкананне правілаў асабістай гігіены — залог захавання і ўмацавання здароўя.

### Культура паводзін

Правілы нашага жыцця: што можна, што нельга. Добрыя і дрэнныя паводзіны. Які я зараз і якім я хачу стаць.

Правілы паводзін у грамадскіх месцах (у транспарце, тэатры, паліклініцы і г. д.).

Правілы адносін з равеснікамі і дарослымі. Правілы вітання (развітвання) равеснікаў і дарослых.

Адносіны паміж хлопчыкамі і дзяўчынкамі. Дапамога меншаму, хвораму, пажылому чалавеку; ветлівасць.

Культура ўжывання ежы. Культура паводзін у сталовай.

### Школа выхавання

Чалавек — сябар прыроды. Ён адказвае за ўсё жывое і нежывое на Зямлі, клапоціцца пра прыроду. Калі чалавек не будзе клапаціцца пра прыроду, яна загіне. Ён будуе караблі, самалёты, дамы, саджае лясы, ачышчае рэкі.

Паводзіны ў прыродзе. Правілы паводзін у лесе. Клопат пра мурашнікі. Уяўленне пра тое, што прырода — наш дом. Прыроду трэба берагчы (берагчы лес, дапамагаць птушкам зімой).

Паводзіны ў час навальніцы.

Як сябе паводзіць, калі заблудзіў на вуліцы, у лесе.

Захаванне правілаў супрацьпажарнай бяспекі.

#### ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ

У вучняў фарміруюцца ў я ў л е н н і пра:

школу, клас, вучэбныя прылады;

прадметы быту: адзенне, абутак, мэблю, посуд;

членаў сям'і, абавязкі членаў сям'і;

правілы культурных паводзін дома, у школе, грамадскіх месцах;

родную краіну, горад (сяло), нацыянальныя асаблівасці;

часткі цела чалавека, работу яго органаў пачуццяў;

свет нежывой прыроды, расліны, свойскіх і дзікіх жывёл;
надвор'е;
поры года.

Вучні прымяняюць на практыцы в е д ы:
называюць (паказваюць) вывучаныя аб'екты;
выдзяляюць асноўныя часткі прадметаў, некаторыя іх дэталі, адрозніваюць галоўнае і другаснае;
арыентуюцца ў часе і прасторы, ведаюць словы, якія характарызуюць нескладаныя часавыя і прасторавыя ўзаемаадносіны;
разумеюць простыя канструкцыі, адрозніваюць сцвярджальныя і пытальныя маўленчыя канструкцыі;
карыстаюцца словамі-вітаннямі, словамі падзякі;
называюць сваё імя, прозвішча, пол, узрост;
знаходзяць і паказваюць на сабе часткі цела;
суадносяць назву ўрока з вучэбнымі прыладамі;
суадносяць школьнае памяшканне з прафесіяй чалавека, які тут працуе;
ведаюць правілы культурных паводзін у сталовай, кінатэатры і іншых грамадскіх месцах;
адрозніваюць аб'екты жывой і нежывой прыроды;
выдзяляюць часткі раслін;
пазнаюць у прыродзе і на малюнках расліны, садавіну, агародніну, жывёл;
называюць найбольш распаўсюджаных дзікіх і свойскіх жывёл дадзенай мясцовасці;
называюць і паказваюць органы пачуццяў чалавека, ведаюць іх прызначэнне.

Вучні ў м е ю ц ь:
вітацца пры сустрэчы, развітвацца пры расставанні, дзякаваць за паслугу, прасіць прабачэння;
адказваць на пытанні пра сям'ю, называць імёны членаў сям'і;
выконваць свае абавязкі ў сям'і;
вызначаць характар учынку (добры, дрэнны), адпаведна паводзіць сябе;
самастойна апранацца, распранацца, абувацца, разувацца;
чысціць абутак;
арыентавацца ў школьным памяшканні, школьным двары;
даглядаць пакаёвыя расліны; выконваць простыя сезонныя работы на агародзе.

# III КЛАС

## ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА

### Школа

Знаёмства са школай. Арыентаванне ў школьным будынку: класы, настаўніцкая, фізкультурная зала, медыцынскі пакой, сталовая, месца для адпачынку, правае і левае крыло, лесвіцы, пераходы.

Прафесіі людзей, якія працуюць у школе: настаўнік, выхавальнік, дырэктар школы, повар, работнік кухні, прыбіральшчыца. Іх абавязкі і вынікі працы. Паважлівыя адносіны да працы кожнага работніка школы. Захаванне чысціні ў школе. Абавязкі дзяцей у школе.

Адрас школы. Бліжэйшыя грамадска-бытавыя ўстановы.

Наш клас. Абсталяванне, мэбля, вучэбныя прылады, вучэбныя дапаможнікі. Вучэбныя прылады да ўрокаў матэматыкі, пісьма, чытання. Самастойны выбар дапаможнікаў да патрэбнага ўрока.

Правілы паводзін у класе. Абавязкі дзяжурнага.

### Прадметы вакол нас

Адзенне: паліто, куртка, сукенка, кашуля, спадніца, джэмпер, шорты і інш. Віды абутку: чаравікі, боты, валёнкі, туфлі, галошы і інш.

Прадметы асабістага і грамадскага карыстання. Назвы асабістых рэчаў (адзенне, абутак, прадметы гігіены і інш.). Правілы карыстання імі. Беражлівыя адносіны да іх.

Назвы прадметаў агульнага карыстання (кнігі, цацкі, прадметы працы — іголка, нажніцы, малаток і інш.). Правілы карыстання імі. Захаванне правілаў бяспекі.

### Горад і сяло

Гарады вялікія і маленькія. Дамы шматпавярховыя і аднапавярховыя, цагляныя і драўляныя. Гарадскі шматпавярховы дом. Праца жыхароў горада.

Сяло. Сельскі дом. Сельскі магазін. Што дае горад сялу, а сяло — гораду. Праца жыхароў сяла.

Вуліцы горада (сяла). Назвы вуліц і нумарацыя дамоў. Транспарт пасажырскі, грузавы і спецыяльнага прызначэння.

Транспарт наземны, водны, паветраны. Метро. Правілы дарожнага руху. Дарожныя знакі: якія забараняюць, якія папярэджваюць. Сігналы рэгуліроўшчыка.

### Правілы паводзін у грамадстве

Правілы культурных паводзін. Ветлівыя словы. Дапамога слабым і старым людзям.

Праўдзівасць. Правіла: не бойся сказаць праўду, бойся схлусіць. Чаго трэба саромецца. Добрыя і дрэнныя справы.

Правілы паводзін у транспарце. Набыццё білетаў. Уваход і выхад. Масца для інвалідаў і старых людзей, пасажыраў з дзецьмі.

Паводзіны ў гасцях. Віншаванне са святам, днём нараджэння. Сервіроўка святочнага стала.

Чаму трэба быць працавітым. Ці можа чалавек жыць без працы. Працоўная дзейнасць бацькоў. Дапамога бацькам. Любімы занятак.

Правілы карыстання электрапрыборамі, іх уключэнне і выключэнне. Захаванне тэхнікі бяспекі.

Адпачынак. Любімыя песні і гульні.

### Наша краіна

Наша Радзіма — Рэспубліка Беларусь. Беларусь — краіна блакітных азёраў і рэк, зялёных лясоў. Мінск — сталіца Рэспублікі Беларусь.

Насельніцтва Беларусі. Беларускае нацыянальнае адзенне. Прадметы і колеры нацыянальнага касцюма. Нацыянальны арнамент.

## ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК

### Сезонныя змены ў прыродзе

***Восень.*** Змена надвор'я ў параўнанні з летам (укарачэнне дня, пахаладанне, частыя дажджы). Восень ранняя і позняя. Назвы асенніх месяцаў. Прыметы восені.

Змены ў жыцці раслін і жывёл (выспяванне пладоў і насення, завяданне кветак і траў, змяненне колеру лісця, знікненне насякомых, адлёт птушак).

Прышкольны ўчастак восенню. Сезонныя работы (збор насення, уборка ўраджаю).

***Зіма.*** Змена надвор'я ў параўнанні з восенню (укарачэнне дня, замаразкі, першы снег, маразы, снегапад, замярзанне вадаёмаў). Назвы зімовых месяцаў. Прыметы зімы.

Дрэвы і кусты зімой. Зімуючыя птушкі. Падкормка птушак зімой.

***Вясна.*** Змена надвор'я ў параўнанні з зімой (павелічэнне дня, прыграванне сонца, пацяпленне, раставанне снегу, ручаі, капеж, крыгаход). Назвы веснавых месяцаў. Прыметы вясны.

Набуханне пупышак, распусканне лісця, раннія кветкі (пралеска, ландыш, дзьмухавец). Прылёт птушак, вывядзенне птушанят.

Сезонныя работы на прышкольным участку (рыхленне, баранаванне, сяўба, пасадка). Работа ў садзе, на агародзе.

***Лета.*** Змена надвор'я ў параўнанні з вясной (доўгія дні, цёплае сонца, сіняе неба, прыгожыя аблокі, спякота, хмары, навальніца (гром, маланка), летнія дажджы, ліўні). Назвы летніх месяцаў. Прыметы лета.

Сезонныя работы на прышкольным участку і догляд раслін (праполка, паліў, уборка летняга ўраджаю).

## Раслінны свет

Дрэвы, кусты, травяністыя расліны. Параўнанне і адрозніванне іх па знешнім выглядзе *(паўтарэнне)*.

Дрэвы: бяроза, ліпа, клён, таполя, дуб (на выбар). Агульныя прыметы: корань, ствол, галіны, лісты. Адметныя адзнакі: афарбоўка ствала, форма лістоў. Састаўленне кампазіцый з асенніх лістоў.

Дрэвы саду: яблыня, груша, сліва, вішня (на выбар). Параўнанне і адрозніванне. Адметныя адзнакі: афарбоўка ствала, форма лістоў, форма пладоў. Апісанне пладоў па іх прыметах: форме, колеры, паху, смаку.

Сад. Садавіна (3—5 на выбар). Назвы і прыметы садавіны. Асаблівасці догляду садовых дрэў. Садавіна ў харчаванні чалавека.

Агарод. Агародніна (3—5 на выбар). Прыметы агародніны. Агародніна ў харчаванні чалавека. Адварная і сырая агародніна. Правілы гігіены пры ўжыванні сырой агародніны.

Кусты: бэз, шыпшына. Адрозніванне, называнне, параўнанне з дрэвамі. Адметныя адзнакі: шмат стналоў, форма лістоў.

Агульныя адзнакі: корань, галіны, лісты. Кусты пладова-ягадныя: парэчкі, маліны, агрэст. Параўнанне і адрозніванне.

Догляд раслін саду, агарода.

### Жывёльны свет

Свойскія і дзікія жывёлы. Знешні выгляд, харчаванне, назвы дзіцянят, звычкі, лад і месца жыцця (3—5 прадстаўнікоў). Неабходныя ўмовы для жыцця жывёл: вада, цяпло, паветра, ежа. Параўнанне: воўк—сабака.

Клопат чалавека пра свойскіх жывёл. Карысць ад іх чалавеку.

Дзікія і свойскія птушкі (3—5 прадстаўнікоў). Карысць ад птушак. Догляд свойскіх птушак. Клопат людзей пра дзікіх птушак.

Насякомыя: стракозы, мухі, камары, матылькі і інш. Прыгажосць і непаўторнасць кожнага. Месца чалавека ў прыродзе. Залежнасць жыцця чалавека на Зямлі ад змен, што адбываюцца ў прыродзе.

Чалавек — частка прыроды. Узаемадзеянне чалавека з прыродай. Правілы паводзін у прыродзе.

### Прырода вакол нас

Прышкольны ўчастак. Расліны кветніка: цюльпаны, нарцысы, астры, ружы, рамонкі і інш. Афарбоўка кветак. Форма лістоў. Прызначэнне раслін кветніка. Назіранні за кветнікам вясной, летам, восенню. Змяненні ў жыцці раслін. Збор пладоў і насення раслін кветніка. Умовы захоўвання насення (сухое месца, доступ паветра).

Газоны і кусты вакол школы, іх прызначэнне. Удзел дзяцей у захаванні навакольнай прыроды. Беражлівыя адносіны (нельга таптаць газоны, рваць лісце, ламаць галінкі).

Пакаёвыя расліны. Назвы і адметныя адзнакі (3—4 расліны).

Умовы, неабходныя для жыцця раслін: паветра, вада, святло, цяпло. Догляд пакаёвых раслін.

## ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ

### Часткі цела чалавека

Паўтарэнне вывучанага ў ІІ класе. Часткі цела: галава, шыя, тулава, рукі, ногі. Часткі тулава чалавека: спіна, бок, грудзі, жывот.

Назвы пальцаў рук. Часткі твару: лоб, шчокі, нос, вусны, вочы, бровы, вейкі.

Пастава, яе фарміраванне ў дзіцячым узросце. Значэнне правільнай пасадкі і гімнастыкі для фарміравання паставы.

### Гігіена цела

Чысціня — залог здароўя чалавека. Догляд цела: валасоў, скуры, пазногцяў. Правілы карыстання мылам, шампунямі, мачалкай. Рэгулярнасць правядзення працэдур.

Прадметы асабістай гігіены для выканання ранішняга і вячэрняга туалету, правілы карыстання імі. Паслядоўнасць выканання правілаў асабістай гігіены. Ацэнка знешняга выгляду. Эстэтычныя патрабаванні да знешняга выгляду.

Ранішняя гімнастыка. Рэжым дня.

### Гігіена харчавання, памяшкання, адзення і абутку

Ежа чалавека. Правільнае харчаванне. Прафілактыка харчовых атручэнняў. Гігіена месца ўжывання ежы. Сталовая. Правілы паводзін за сталом. Правілы карыстання сталовымі прыборамі. Эстэтыка ўжывання ежы. Беражлівыя адносіны да хлеба. Шкоднасць ужывання сухой ежы, пераядання.

Гігіена памяшкання. Значэнне чысціні ў памяшканнях, вільготная ўборка. Шкоднасць пылу ў памяшканнях. Паветраны рэжым у класным і спальным пакоях. Скразнякі, іх шкоднасць для здароўя. Меры засцярогі.

Гігіена адзення і абутку. Змена адзення і абутку, праветрыванне, сушка, захоўванне чысціні. Правілы догляду адзення і абутку.

### ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ

У вучняў фарміруюцца ў я ў л е н н і пра:

Рэспубліку Беларусь, сталіцу рэспублікі, насельніцтва, нацыянальную сімволіку;

назвы і прызначэнне посуду, мэблі, пасцельных рэчаў;

прадметы асабістага і грамадскага карыстання;

расліны саду і агарода, іх адрозненні;

расліны кветніка і пакаёвыя расліны;

разнастайнасць жывёльнага свету, лад жыцця і звычкі дзікіх і свойскіх жывёл;

сезонныя змены ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін, жывёл, чалавека;
значэнне вады, цяпла, святла ў жыцці раслін і жывёл;
гігіену адзення, абутку, памяшкання.

Вучні прымяняюць на практыцы в е д ы:
правільна называюць вывучаныя прадметы і з'явы;
адрозніваюць прыметы пораў года, высвятляюць элементарныя прычынна-выніковыя сувязі;
адрозніваюць садавіну і агародніну, ведаюць, дзе яны растуць, як выкарыстоўваюцца чалавекам;
адрозніваюць свойскіх і дзікіх жывёл, насякомых;
адрозніваюць 3—4 пакаёвыя расліны, паказваюць і называюць іх часткі, даглядаюць пакаёвыя расліны і расліны кветніка;
выконваюць элементарныя гігіенічныя патрабаванні, правілы ўжывання ежы;
паказваюць і называюць часткі цела, органы пачуццяў чалавека;
ведаюць правілы паводзін у грамадскіх месцах, выконваюць іх.

Вучні ў м е ю ц ь:
арыентавацца ў школьным будынку, на школьным двары;
вітаць дарослых і аднагодкаў пры сустрэчы, развітвацца пры расставанні;
дзякаваць за паслугу;
прасіць прабачэння за клопаты, дапушчаны промах ці здзейснены дрэнны ўчынак;
карыстацца спальнымі рэчамі, посудам і іншымі прадметамі;
выбіраць адзенне па сезоне.

# IV КЛАС

## ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА

### Мая Радзіма

Рэспубліка Беларусь. Яе дзяржаўныя сімвалы (флаг, герб, гімн). Сталіца, насельніцтва. Буйныя прамысловыя гарады рэспублікі (2—3 на выбар). Што вырабляюць у Беларусі (трактары, аўтамабілі, матацыклы, тэлевізары, дываны, веласіпеды і інш.).

## Мой горад (сяло)

Грамадска-бытавыя ўстановы (магазін, аптэка, кінатэатр, тэатр, кіёск), іх прызначэнне. Арыентаванне па вітрынах, шыльдах і графічных абазначэннях. Правілы паводзін у месцах грамадскага прызначэння.

Узаемасувязь паміж горадам і сялом. Асаблівасці працы ў горадзе і сяле.

## Мая сям'я

Анкетныя даныя пра сябе (прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас). Сям'я і сваяцкія адносіны ў сям'і (склад сям'і і ўзаемаадносіны паміж членамі сям'і). Сваякі (дзядуля, бабуля, дзядзька, цётка). Узаемадапамога паміж членамі сям'і і паміж сваякамі. Дапамога дзяцей старэйшым. Абавязкі дзяцей у сям'і. Адказнасць кожнага перад сваёй сям'ёй і за сваю сям'ю. Сумесная дзейнасць у сям'і.

## Праца людзей

Праца бацькоў (дзе працуюць, што робяць). Праца работнікаў школы (повара, медсястры, прыбіральшчыцы, сталяра, электрыка). Неабходнасць і вынікі працы кожнага. Узаемасувязь людзей працы (на прыкладзе школы).

Адкуль з'яўляюцца рэчы (цацкі, школьныя прылады, прадукты харчавання). Павага да працы людзей. Праца дзяцей (вучэбная і грамадска карысная). Залежнасць вынікаў працы ад навучання і добрасумленных адносін чалавека да справы.

## Рэчы вакол мяне

Адзенне, яго прызначэнне і разнастайнасць, неабходнасць чалавеку ў жыцці. Віды адзення: для вучэбных заняткаў, заняцця спортам, працы, свят. Выбар адзення па колеры і фасоне ў залежнасці ад індывідуальных асаблівасцей чалавека. Залежнасць знешняга выгляду ад ахайнасці адзення і абутку. Беражлівыя адносіны да адзення і абутку. Уменне пачысціць адзенне шчоткай, скласці, павесіць у шафу, пачысціць і паставіць абутак на месца.

Прас і пыласос, іх прызначэнне; правілы бяспекі. Уменне ўключаць і выключаць электрапрыборы, прасаваць невялікія рэчы, пыласосіць дыван. Веданне нумара тэлефона пажарнааварыйна-выратавальнай службы «01».

Прыбіранне памяшкання: мэблі, падлогі, дываноў, фіранак і інш. (на выбар). Залежнасць знешняга выгляду памяшкання ад прадметаў дэкору. Удзел дзяцей у афармленні памяшкання. Састаўленне букетаў з сухіх кветак і раслін. Беражлівыя адносіны да навакольных рэчаў. Падтрыманне парадку ў памяшканні.

## ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК

### Сезонныя змены ў прыродзе

Назвы сезонаў і іх паслядоўнасць. Назвы сезонных месяцаў. Тлумачэнне паняццяў «ранні», «позні» перыяды сезонаў.

Назіранне за вышынёй сонца над гарызонтам у розныя поры года (напрамак сонечных промняў, колькасць цяпла і святла).

Усход, захад сонца. Змяненне працягласці дня і ночы.

Прырода. Жывая прырода *(паўтарэнне)*. Фарміраванне ўяўленняў пра з'явы і станы нежывой прыроды: воблачнасць, дождж, туман, мяцеліца, завіруха, крыгаход, спёка, вясёлка, лістапад, прымаразкі, адліга. Назіранне за надвор'ем, яго апісанне.

Характэрныя з'явы кожнага сезона. Сезонная праца людзей, змена відаў дзейнасці ў залежнасці ад сезонных умоў:

а) восень: збор ураджаю, клопат пра дрэвы і кусты, пасадка новых раслін;

б) зіма: клопат пра жывёл, дапамога зімуючым птушкам, падрыхтоўка тэхнікі і насення да веснавой сяўбы;

в) вясна: пабел садовых дрэў; пасадка дрэў, кустоў, агародных раслін;

г) лета: догляд раслін саду, агарода; збор ранняга ўраджаю ягад, агародніны; касьба.

Сезонныя работы на прышкольным участку ў розныя поры года, удзел у іх дзяцей.

### Прырода вакол нас

Паняцце пра нежывую прыроду (вада, паветра, глеба, падземныя багацці). Паняцце пра жывую прыроду (расліны, жывёлы). Прыметы жывых арганізмаў. Чалавек — частка жывой прыроды. Месца чалавека ў прыродзе. Узаемасувязь жывой і нежывой прыроды.

Умовы існавання расліннага і жывёльнага свету. Непаўторнасць і унікальнасць кожнага віду. Прыгажосць прыроды. Пры-

родаахоўная дзейнасць чалавека. Расліны і жывёлы кутка прыроды ў класе (школе).

### Нежывая прырода

Вада, яе ўласцівасці: цякучасць, празрыстасць, утварэнне роўнай паверхні. Вада халодная і гарачая. Што плавае, што тоне. Некаторыя прадметы ўбіраюць ваду (намакаюць). Каб жыць, раслінам, жывёлам, людзям патрэбна вада. Выкарыстанне вады чалавекам у штодзённым жыцці.

Паветра вакол нас. Значэнне паветра ў жыцці раслін, жывёл, чалавека.

### Раслінны свет

Агульныя і адметныя адзнакі дрэў, кустоў, травяністых раслін.

Часткі раслін: корань, сцябло (ствол), галіны, пупышкі, лісты, кветка (кветкі).

Умовы жыцця раслін (святло, цяпло, вільгаць, пажыўная глеба). Стан глебы: рыхлая, цвёрдая, сухая, вільготная. Выяўленне па знешнім выглядзе недахопу асобных умоў: вянуць лісты, марудна растуць, расліны выцягваюцца ў бок святла.

Расліны саду. Фруктовыя дрэвы (2—3 на выбар); ягадныя кусты (2—3 на выбар). Знешні выгляд, адрозніванне. Плады. Ягады.

Лес. Расліны лесу. Дрэвы хваёвыя і ліставыя (сасна, елка, бяроза, дуб і інш.). Кусты (арэшнік). Дары лесу: грыбы, ягады, драўніна, чыстае паветра. Лясныя ягады (чарніцы, суніцы і інш.).

Ягады ядомыя і неядомыя. Грыбы ядомыя і неядомыя. Травы карысныя і небяспечныя. Правілы паводзін у лесе.

Расліны лугу: трава, лугавыя кветкі (рамонак, дзьмухавец, званочак, белы гарлачык і інш. — 2—3 на выбар).

Расліны поля і агарода (вырошчвае чалавек): пшаніца, кукуруза, жыта, бульба, капуста, морква, агуркі і інш. Умовы росту на полі, агародзе, лузе.

Ахова прыроды чалавекам. Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь. Значэнне раслін у жыцці чалавека.

### Жывёльны свет

Свойскія жывёлы: свіння, карова, каза і інш. Знешні выгляд, харчаванне, дзіцяняты. Догляд свойскіх жывёл.

Дзікія жывёлы: дзік, лось, заяц і інш. Знешні выгляд, харчаванне, дзіцяняты.

Параўнанне свойскіх і дзікіх жывёл. Падабенствы і адрозненні.

Птушкі: знешні выгляд, харчаванне, звычкі, лад жыцця. Птушкі зімуючыя і пералётныя (снягір, дзяцел, галка). Драпежныя птушкі (ястраб, каршун). Пеўчыя птушкі (салавей, ластаўка).

Рыбы: карась, шчупак і інш. Знешні выгляд, харчаванне. Умовы жыцця.

Роля чалавека ў жыцці жывёл.

## ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ

### Навакольнае асяроддзе і здароўе чалавека

Здароўе — багацце чалавека. Карысныя і шкодныя фактары (чыстае і забруджанае паветра, брудная і чыстая вада). Першая дапамога пры абмарожанні і апёку. Правілы карыстання ёдам і зялёнкай пры апрацоўцы невялікіх драпін. Лейкапластыр, яго прызначэнне і прымяненне. Меры бяспекі пры ўжыванні лекаў.

Прыметы атручэння і першая дапамога. Меры бяспекі пры карыстанні газам.

### Прафілактыка прастудных захворванняў

Прастудныя захворванні чалавека. Прычыны захворванняў. Догляд хворых. Градуснік і яго прызначэнне. Аказанне дапамогі пры высокай тэмпературы. Выклік хуткай медыцынскай дапамогі. Меры бяспекі пры зносінах з хворым чалавекам (ватна-марлевая павязка, гігіена рук, адзення, памяшкання).

Прафілактыка прастудных захворванняў. Вітаміны. Загартоўванне арганізма (сонечныя, водныя, паветраныя працэдуры). Заняцце фізкультурай. Значэнне рухавых гульняў на свежым паветры. Паводзіны ў час эпідэміі прастудных захворванняў.

Выкарыстанне народных сродкаў і лекавых раслін у час прастудных захворванняў (маліна, шыпшына, парэчкі). Прыгатаванне лячэбнага чаю.

### Харчаванне чалавека

Ужыванне ў ежу агародніны, садавіны, малочных прадуктаў, мяса. Прыгатаванне і захоўванне ежы. Прафілактыка харчовых атручэнняў.

ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ

У вучняў фарміруюцца у я ў л е н н і пра:

прадметы найбліжэйшага акружэння, іх прызначэнне, матэрыял, з якога яны выраблены;

прызначэнне грамадска-бытавых устаноў горада;

буйныя прамысловыя гарады Беларусі, прамысловыя аб'екты дадзенай мясцовасці;

расліны саду, лугу, лесу, іх адрозненні; часткі раслін; умовы жыцця раслін;

простыя ўласцівасці вады, яе значэнне ў жыцці раслін, жывёл, чалавека;

лад жыцця, звычкі свойскіх і дзікіх жывёл, птушак; ролю чалавека ў жыцці свойскіх жывёл;

сезонныя змены ў жывой і нежывой прыродзе;

прафілактыку прастудных захворванняў, харчовых атручэнняў;

прызначэнне градусніка, лейкапластыра, лекаў шырокага ўжывання.

Вучні прымяняюць на практыцы в е д ы:

правільна называюць вывучаныя прадметы, аб'екты і з'явы;

знаходзяць агульныя і адметныя адзнакі навакольных прадметаў: параўноўваюць і адрозніваюць расліны саду і агарода, дрэвы, кусты, травы, ягады, грыбы;

суадносяць сезонныя змены ў нежывой прыродзе са зменамі ў жыцці раслін, жывёл, чалавека; вядуць каляндар прыроды;

адрозніваюць штодзённае і святочнае адзенне;

даглядаюць адзенне і абутак;

разумеюць і ўжываюць у маўленні абагульненні, умеюць іх канкрэтызаваць;

захоўваюць правілы харчавання, гігіены, ведаюць пра правілы прыгатавання і захавання прадуктаў.

Вучні ў м е ю ц ь:

паказваць і называць вывучаныя аб'екты і з'явы;

параўноўваць прадметы па велічыні, колеры, форме, прызначэнні;

адрозніваць і называць расліны саду, агарода, лесу (па 2—3 віды), найбольш распаўсюджаныя ў дадзенай мясцовасці;

адрозніваць ядомыя і неядомыя грыбы;

захоўваць правілы гігіены пры ўжыванні ягад;

даглядаць агарод: саджаць, палiваць, палоць расліны;

параўноўваць свойскіх і дзікіх жывёл, апісваць іх звычкі.

# V КЛАС

## ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА

### Чалавек сярод людзей

Анкетныя даныя пра сябе: прозвішча, імя — кароткае і поўнае, імя па бацьку, узрост, адрас.

Мая сям'я: склад сям'і, імёны і імёны па бацьку членаў сям'і, сваяцкія адносіны. Сваякі. Месца работы дарослых членаў сям'і. Кім я ганаруся ў сям'і. Мае дамашнія абавязкі. Сумеснае выкананне дамашніх абавязкаў. Дапамога малодшых дарослым, пажылым людзям.

Мае сябры: іх імёны, узрост, месца жыхарства, захапленні. Каго можна лічыць сябрам. Што значыць «сябраваць». Добрыя і дрэнныя ўчынкі сяброў. Мая дапамога сябру. Усмешка як камунікатыўны сродак.

Мае суседзі. Імёны суседзяў. Уважлівыя і паважлівыя адносіны да суседзяў. Правілы ветлівых зносін з суседзямі. Дапамога адзінокім, хворым, пажылым суседзям. Правілы сумеснага пражывання (падтрыманне чысціні на лесвічнай пляцоўцы, у пад'ездзе, захаванне цішыні). Меры засцярогі пры знаёмстве з незнаёмымі дарослымі.

### Прадметы быту і працы людзей

Посуд, яго разнастайнасць, неабходнасць для чалавека ў штодзённым жыцці. Прызначэнне і адрозніванне посуду: кухонны, сталовы, чайны, *кафейны. Матэрыял, з якога выраблены посуд (шкло, гліна, метал, пластмаса) і яго ўласцівасці. Беражлівыя адносіны да посуду.

Меры бяспекі пры карыстанні посудам. Сервіроўка стала: абедзеннага, святочнага, да чаявання. Правілы мыцця і чысткі посуду. Мыйныя сродкі. Меры бяспекі пры іх выкарыстанні.

Электрабытавыя прыборы (электрачайнік, электрасамавар, электрапеч, *электратосцер). Прызначэнне электрапрыбораў. Правілы карыстання электрапрыборамі. Нумар тэлефона пажарна-аварыйна-выратавальнай службы «01».

Бытавыя прылады працы: малаток, абцугі, піла, тапор, адвёртка; іх прызначэнне, выкарыстанне. Правілы тэхнікі бяспекі пры выкарыстанні прылад працы. Культура працы (падрыхтоўка

рабочага месца, мэтанакіраванае размяшчэнне прылад працы, падтрыманне парадку на рабочым месцы, акуратнасць у працэсе выканання работы).

### Праца людзей

Прафесіі (рамёствы) людзей. Прафесіі сельскіх жыхароў: аграном, трактарыст, камбайнер, жывёлавод. Характар і змест працы сельскіх жыхароў (сувязь працы сельскіх жыхароў з парой года). Вынік працы — прадукты харчавання (мяса, малако, хлеб, агародніна).

Разнастайнасць прафесій гарадскіх жыхароў. Характар і змест працы гарадскіх жыхароў (пазменная работа, незалежнасць ад пары года). Вынік працы — прадметы штодзённага выкарыстання, абсталяванне, машыны. Прафесіі будаўнікоў. Змест і вынікі працы кожнага, іх узаемасувязь.

Асаблівасці працы ў вёсцы і ў горадзе. Адказныя адносіны людзей да прафесіі. Прафесіі бацькоў.

Прамысловыя аб’екты горада: фабрыкі, заводы, прадпрыемствы, будаўнічыя аб’екты. Прадукцыя фабрык і заводаў, яе неабходнасць для жыцця людзей. Рабочыя прафесіі: токар, слесар, зваршчык.

Будаўнічыя аб’екты. Прыметы будаўнічага аб’екта. Меры прафілактыкі траўматызму на будаўніцтве.

Калектыўная праца. Добрасумленныя адносіны да справы. Залежнасць якасці прадукцыі ад добрасумленнасці кожнага работніка.

Узаемасувязь і ўзаемадапамога людзей працы ў калектыве. Павага да працы людзей. Якасці работнікаў: працавітасць, стараннасць, акуратнасць, добрасумленнасць.

### Мой горад (сяло)

Установы культурна-бытавога абслугоўвання: майстэрні, атэлье, дамы быту, бальніцы. Правілы карыстання ўстановамі культурна-бытавога абслугоўвання. Правілы паводзін у грамадскіх месцах.

Майстэрні, іх прызначэнне. Разнастайнасць паслуг. Выбар паслугі ў залежнасці ад патрэбнасці. Прафесіі людзей, якія працуюць у майстэрнях. Знаходжанне майстэрні па яе ўмоўным абазначэнні, шыльдзе. Наведванне ўстаноў культурна-бытавога абслугоўвання найбліжэйшага акружэння. Правілы здачы ў рамонт абутку, афармленне заказу.

Атэлье. Віды атэлье. Прафесіі людзей, якія працуюць у атэлье. Дом быту: яго прызначэнне, месца знаходжання, зручнасць выкарыстання паслуг.

Медыцынскія ўстановы, іх віды, неабходнасць людзям. Прычыны звароту ў медыцынскую ўстанову. Прафесіі людзей, якія працуюць у медыцынскай установе. Асаблівасці амбулаторнага і стацыянарнага лячэння. Наведванне паліклінікі і бальніцы, іх адрозніванне. Уменне расказаць пра сваё самаадчуванне.

Сродкі сувязі: тэлефон, тэлеграф, іх прызначэнне, адрозніванне; Інтэрнет.

Установа сувязі — пошта. Афармленне і адпраўленне па пошце лістоў і бандэролей. Правілы перасылкі карэспандэнцыі (указанне адрасу: індэкс, населены пункт, вуліца, нумар дома).

Сродкі перамяшчэння. Транспарт (грузавы і пасажырскі). Грамадскі і асабісты транспарт. Віды транспарту — наземны, падземны, водны, паветраны, іх прызначэнне. Адметныя асаблівасці відаў транспарту. Меры бяспекі ў транспарце.

### Мая краіна

Рэспубліка Беларусь — старажытная і сучасная. Вытворчасць прадукцыі. Прырода роднага краю: лясы, запаведнікі, буйныя рэкі, азёры. Пейзажы роднага краю ў творах пісьменнікаў, мастакоў.

Нацыянальная сімволіка Рэспублікі Беларусь: флаг, герб, гімн.

## ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК

### Сезонныя змены ў прыродзе

Паслядоўнасць пораў года (сезонаў). Назвы сезонных месяцаў. Характэрныя з’явы кожнага сезона. Назіранне за надвор’ем, яго апісанне. Сезонныя змены ў жыцці раслін.

### Нежывая прырода

Вада — умова існавання ўсяго жывога. Роля вады ў прыродзе. Выкарыстанне вады ў вытворчасці прадукцыі. Прычыны забруджвання вады. Правілы паводзін паблізу вадаёмаў. Беражлівыя адносіны да вады.

Паветра — аснова дыхання. Роля паветра ў жыцці раслін, жывёл, чалавека. Крыніцы забруджвання паветра — фабрыкі,

заводы, транспарт. Уздзеянне забруджанага і чыстага паветра на здароўе чалавека, стан жывёл і раслін. Лес — санітар паветра.

Глеба. Значэнне глебы для раслін, жывёл, чалавека. Роля чалавека ў захаванні ўрадлівасці глебы.

Беражлівыя адносіны да прыроды, адказнасць перад ёй.

### Раслінны свет

Агульныя і адметныя адзнакі дрэў, кустоў, травяністых раслін. Умовы жыцця раслін: глеба, вада, паветра, святло. Вызначэнне па знешнім выглядзе расліны недахопу асобных умоў.

Дзікарослыя расліны: елка, сасна, бяроза. Знешні выгляд, месца і асаблівасці росту. Культурныя расліны (расліны саду, агарода, поля). Знешні выгляд, месца росту, умовы росту, залежнасць ад догляду чалавека (садавіна, агародніна — 3—4 на выбар).

Размнажэнне раслін насеннем і чаранкамі. Падрыхтоўка глебы да пасадкі насення. Умовы і стадыі развіцця расліны (семя, парастак, сцябло з лістамі, кветка, плод). Асноўныя і дадатковыя правілы догляду раслін.

### Жывёльны свет

Разнастайнасць прадстаўнікоў жывёльнага свету: звяры, птушкі, рыбы, насякомыя і інш. (3—4 на выбар). Адрозненне жывёл ад раслін. Выкарыстанне жывёламі раслін. Прыстасаванні жывёл, птушак для перамяшчэння, для абароны ад ворагаў.

Свойскія і дзікія жывёлы (падабенствы і адрозненні па знешнім выглядзе, па месцы жыцця: свойскія жывёлы жывуць побач з чалавекам, маюць патрэбу ў доглядзе і харчаванні, якія забяспечвае чалавек; дзікія жывёлы жывуць далёка ад чалавека, самастойна здабываюць сабе ежу).

Траваедныя жывёлы: заяц, вавёрка, карова, каза і інш. Спосаб іх харчавання. Назвы дарослых жывёл і дзіцянят.

Драпежныя жывёлы: воўк, ліса і інш. Знешні выгляд, звычкі, асаблівасці харчавання, дзіцяняты.

Усёедныя жывёлы: мядзведзь, вожык, свіння і інш. Адрозненне ад драпежных і траваедных жывёл спосабам харчавання. Карысныя і шкодныя жывёлы (шкода і карысць для чалавека, іншых жывёл, народнай гаспадаркі).

## ЧАЛАВЕК І ЯГО ЗДАРОЎЕ

### Рэжым — залог здароўя

Асаблівасці чалавечага арганізма: працаздольнасць і стомленасць. Залежнасць працаздольнасці чалавека ад стану здароўя і стану навакольнага асяроддзя. Працаздольнасць вучняў. Захаванне рэжыму — залог здароўя і поспеху ў працы. Рэжым працы і адпачынку ў школе, дома. Чаргаванне ўрокаў і перапынкаў, іх значэнне для здароўя вучняў. Спосабы пераадолення стомленасці: змена дзейнасці, праветрыванне памяшкання, фізкультмінутка, зрокавая гімнастыка, рэлаксацыйныя практыкаванні, псіхагімнастыка.

Рэжым сну, яго значэнне для здароўя чалавека. Гігіенічныя працэдуры перад сном. Рэчы для сну. Значэнне ранішняй гімнастыкі, фізкультурных практыкаванняў для ўмацавання здароўя.

### Асабістая гігіена

Правілы асабістай гігіены. Падтрыманне чысціні цела і асабістай гігіены. Асаблівасці гігіены хлопчыкаў і дзяўчынак. Акуратны і неакуратны знешні выгляд чалавека. Залежнасць знешняга выгляду ад выканання правілаў асабістай гігіены. Прадметы асабістай гігіены. Значэнне загартоўвання. Віды загартоўвання (воднае, паветранае). Правілы загартоўвання.

### Прафілактыка захворванняў

Клопат пра сваё здароўе. Інфекцыйныя, страўнікава-кішачныя і прастудныя захворванні. Прычыны захворванняў і іх прыметы. Шляхі перадачы інфекцыі. Меры прафілактыкі захворванняў. Правілы паводзін у час захворвання. Зварот па медыцынскую дапамогу.

#### ВУЧНІ НАБЫВАЮЦЬ НАСТУПНЫЯ ЎМЕННІ

У вучняў фарміруюцца у я ў л е н н і пра:

посуд, яго прызначэнне і ўласцівасці;

электрапрыборы, прылады працы, правілы выкарыстання іх у штодзённым жыцці;

характар і змест прафесій сельскіх і гарадскіх жыхароў, вынікі іх працы;

прызначэнне транспарту, правілы паводзін у транспарце;
нацыянальныя славутыя мясціны, традыцыі, святы;
прафілактыку інфекцыйных, прастудных, страўнікава-кішачных захворванняў, правілы паводзін пры захворванні;
правілы асабістай гігіены;
рэжым працы і адпачынку дома, у школе;
узаемадзеянне чалавека і прыроды, значэнне стану прыроды для здароўя і жыццядзейнасці чалавека.

Вучні прымяняюць на практыцы в е д ы:
адэкватна называюць (паказваюць) вывучаныя прадметы быту, аб'екты і з'явы прыроды;
сервіруюць стол (абедзенны, святочны, да чаявання);
мыюць і чысцяць посуд;
адрозніваюць і называюць расліны саду, агарода, лесу; культурныя і дзікарослыя расліны;
адрозніваюць паслядоўнасць пораў года, сезонную працу людзей, сезонныя змены ў жыцці раслін, жывёл;
ведаюць правілы догляду раслін: рыхленне глебы, адрыванне сухіх лістоў, паліў;
называюць жывёл, іх дзіцянят; ведаюць месцы жыцця жывёл, спосабы харчавання, сродкі абароны ад ворагаў, ад холаду.

Вучні ў м е ю ц ь:
называць вывучаныя прадметы, з'явы;
параўноўваць і адрозніваць расліны саду, агарода, лесу, поля;
класіфікаваць вывучаныя аб'екты па групах;
устанаўліваць паслядоўнасць пораў года, простыя прычынна-выніковыя залежнасці;
прытрымлівацца правілаў гігіены, своечасова ўстараняць недахопы ў адзенні, абутку.

# ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У працоўным навучанні малодшых школьнікаў з інтэлектуальнай недастатковасцю вылучаюцца наступныя перыяды.

*Першы перыяд* суадносіцца з навучаннем у I класе. Яго задача заключаецца ў забеспячэнні пераходу ад падрыхтоўкі дзяцей да працоўнага навучання — да развіцця іх працоўнай дзейнасці ў працэсе навучання рабоце з разнастайнымі матэрыяламі для дзіцячай працы і культуры быту. Улічваецца, што многія дзеці ў дашкольным узросце не атрымліваюць неабходнай карэкцыйна-педагагічнай дапамогі.

*Другі перыяд* ахоплівае час навучання ў II—IV класах і з’яўляецца асноўным у рашэнні задачы падрыхтоўкі вучняў да працоўнага навучання на базе школьных вучэбных майстэрняў (кабінетаў працы, прышкольнага ўчастка).

Спецыфічнай задачай *трэцяга перыяду* (навучанне ў V класе) з’яўляецца ўдакладненне перспектыў далейшай працоўнай падрыхтоўкі вучняў у працэсе разнастайнай па змесце працоўнай дзейнасці.

Развіццё ў вучняў навыкаў працоўнай дзейнасці ў кожным з названых перыядаў прадугледжвае спецыяльнае фарміраванне яе матываў і стварэнне перадумоў для пераходу ад дзейнасці на ўроку або спецыяльных занятках да дзейнасці па ўласным жаданні ў пазавучэбны час. Працоўнае навучанне павінна спрыяць фарміраванню ў дзяцей цікавасці да свету прафесій, паважлівых адносін да працы і яе вынікаў, станаўленню і замацаванню ў вучняў станоўчых якасцей асобы (акуратнасці, беражлівасці, дысцыплінаванасці, калектывізму і інш.).

Праграма прадугледжвае таксама фарміраванне ў вучняў уяўленняў і ведаў пра арганізацыю рабочага месца, правілы бяспечнай работы і санітарна-гігіенічныя патрабаванні на занятках з разнастайнымі матэрыяламі; пра ўласцівасці матэрыялаў,

іх віды, вытворчасць, прымяненне ў вырабах і народнай гаспадарцы, захоўванне і правілы апрацоўкі; пра будову і прызначэнне інструментаў; пра вывучаемыя віды работ і правілы іх выканання; пра некаторыя прафесіі, народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Адпаведныя задачы адлюстраваны ў праграмным падраздзеле «Пазнавальныя (тэхнічныя) звесткі». У ім акрэслена кола ведаў, неабходных для свядомага засваення прадугледжаных праграмай тэхналагічных (працоўных) аперацый і бяспечнага іх выканання, а таксама ўяўленні і веды, якія ў працэсе практычнай работы не прымяняюцца (напрыклад, пра рабочыя прафесіі), але з'яўляюцца важнымі для вучняў.

Найбольш характэрнай асаблівасцю і асноўным недахопам працоўнай дзейнасці школьнікаў з інтэлектуальнай недастатковасцю з'яўляецца нізкая самастойнасць працы. Таму спецыфіка карэкцыйна-развіццёвай работы на ўроках працоўнага навучання заключаецца ў стварэнні асаблівых умоў для развіцця ў вучняў агульнапрацоўных уменняў (арыентавацца ў заданні, планаваць ход работы і кантраляваць яе выкананне), узровень сфарміраванасці якіх вызначае ступень самастойнасці ў працы. Падчас развіцця гэтых уменняў стымулюецца авалоданне вучнямі пазнавальнымі псіхічнымі працэсамі, г. зн. рашаюцца важныя карэкцыйныя задачы, агульныя для ўрокаў па ўсіх вучэбных дысцыплінах.

З улікам розных магчымасцей вучняў у авалоданні агульнапрацоўнымі ўменнямі праграма з'яўляецца р о з н а ў з р о ў н е в а й. Пры навучанні па *першым узроўні* складанасці арыенціровачныя патрабаванні да развіцця ў вучняў агульнапрацоўных уменняў і звязаных з імі ўменняў арыентавацца ў прасторы, аналізаваць створаныя вырабы, рабіць справаздачу аб выкананай рабоце, а таксама патрабаванні да выкарыстання пры выкананні працоўных заданняў матэматычных уменняў і навыкаў адлюстраваны ў праграмным раздзеле «Уменні». Пры навучанні па *другім узроўні* складанасці настаўнік арыентуецца на дадзены раздзел праграмы папярэдняга паўгоддзя або года навучання.

Фарміраванне ў вучняў рухальных працоўных навыкаў і адначасова карэкцыя недахопаў развіцця маторыкі рук і зрокава-маторнай каардынацыі ажыццяўляюцца ў працэсе навучання прыёмам выканання тэхналагічных (працоўных) аперацый, прадугледжаных у падраздзелах «Аперацыі і прыёмы працы», «Практычныя работы».

Акрамя працоўных аперацый пры афармленні вырабаў могуць выкарыстоўвацца аперацыі выяўленчай дзейнасці, напрыклад штрыхоўка, дарысоўка асобных элементаў.

У праграме ўказаны толькі тыя аперацыі, прыёмы працы і звесткі, якія з'яўляюцца новымі для вучняў у дадзены перыяд навучання. Замацоўваць іх рэкамендуецца на працягу ўсяго наступнага перыяду навучання.

Навучанне па *першым узроўні* складанасці прадугледжвае вывучэнне ўсіх пералічаных у праграме тэхналагічных аперацый і прыёмаў працы і іх самастойнае выкананне на заключных уроках па кожным з відаў работ базавага кампанента праграмы. Пры навучанні па *другім узроўні* складанасці пералічаныя ніжэй тэхналагічныя аперацыі і прыёмы працы могуць выконвацца з дапамогай настаўніка на ўсіх уроках у дадзеным класе (паўгоддзі), вывучацца ў наступным паўгоддзі (годзе) навучання або замяняцца на больш простыя (напрыклад, замест разметкі па лінейцы можа выконвацца разметка па шаблоне або па мерачцы):

- наклейванне лістоў (I клас, другое паўгоддзе, «Аплікацыя з лістоў»);
- выцягванне часткі шара для атрымання грушападобнай формы (II клас, першае паўгоддзе, «Работа з глінай і пластылінам»);
- абразанне «зубчыкаў» (II клас, першае паўгоддзе, «Аплікацыя з лістоў»);
- наклейванне адносна невялікіх дэталей спосабам «ад дошкі» (II клас, другое паўгоддзе, «Работа з паперай»);
- разметка па лінейцы (III клас, другое паўгоддзе, «Работа з паперай і кардонам» і «Работа з тэкстыльнымі матэрыяламі»);
- перавод рысунка праз капіравальную паперу (IV клас, першае паўгоддзе, «Работа з паперай і кардонам»);
- рыцаванне кардону і тоўстай паперы (IV клас, другое паўгоддзе, «Работа з паперай і кардонам»).

У праграме пададзены пашыраны і прыкладны пералік вырабаў. Настаўнік выбірае з яго толькі тыя вырабы, у рабоце над якімі можна найбольш паспяхова рэалізаваць задачы навучання. Безумоўнае права настаўніка — планаваць стварэнне і іншых вырабаў. Галоўнае заключаецца не ў факце выканання таго ці іншага вырабу, а ў тым, каб работа над ім спрыяла развіццю матываў вучэбна-працоўнай дзейнасці, рашэнню выхаваўчых задач, засваенню вучнямі ведаў, уменняў і навыкаў.

Настаўнік мае таксама права выбару стварэння вырабу па ўзоры, рысунку, фотаздымку, славесным апісанні, уяўленні пра натуральны прадмет або асабістай задуме, арыентуючыся пры гэтым на патрабаванні раздзела «Уменні».

Праграма па працоўным навучанні I—IV класаў складаецца з дзвюх частак — базавага кампанента і работ на выбар настаўніка. Змест *базавага кампанента* праграмы распрацаваны з улікам жыццёва-практычнай значнасці для вучняў авалодвання пэўнымі тэхналагічнымі (працоўнымі) аперацыямі. На ўроκі базавага кампанента рэкамендуецца адводзіць 80—100 % вучэбнага часу ў I класе, скарачаючы яго да 50—60 % у IV класе.

Выбар работ з другой часткі праграмы *(на выбар настаўніка)* рэкамендуецца ажыццяўляць з улікам інтарэсаў дзяцей, спалучэння ўрокаў і пазакласных заняткаў, рэальных умоў навучання (напрыклад, наяўнасці прышкольнага вучэбна-вопытнага ўчастка), выкарыстання працоўных заданняў на занятках па развіцці пазнавальнай дзейнасці.

**Прыкладнае размеркаванне відаў работ, якія выбірае настаўнік**

| Віды работ | I клас | II клас | III клас | IV клас |
|---|---|---|---|---|
| Аплікацыя з разнастайных матэрыялаў | | | + | + |
| Вырошчванне раслін на прышкольным вучэбна-вопытным участку | + | + | + | + |
| Вышыванне | | | | + |
| Аб'ёмная аплікацыя з паперы | | + | + | |
| Работа з драўляным і пластмасавым канструктарамі | + | + | + | |
| Работа з драўнінай | | | | + |
| Работа з металаканструктарам | | | | + |
| Работа з саломкай (аплікацыя) | | | | + |
| Сіметрычнае вырэзванне | | + | + | + |
| Догляд свойскай жывёлы | + | + | + | + |

Навучанне любому з гэтых відаў работ не абавязкова праводзіць у поўным аб'ёме. У той жа час настаўнік можа пашырыць пералічаны ў дадзенай частцы вучэбны матэрыял, увесці віды работ, прадугледжаныя іншымі праграмамі малодшых класаў (пачатковай школы).

У вызначэнні патрабаванняў да развіцця ў вучняў агульнапрацоўных уменняў пры навучанні работам на выбар настаўніка трэба арыентавацца на раздзел «Уменні» базавага кампанента.

Праграма V класа дазваляе навучаць рабоце з паперай і кардонам, тэкстыльнымі матэрыяламі, дротам, драўнінай, простым работам у галіне раслінаводства і жывёлагадоўлі, апрацоўкі харчовых прадуктаў, тэхнічнай графіцы. З улікам складу вучняў і ўмоў арганізацыі навучання (дапаможная школа або клас інтэграванага навучання, сельская або гарадская школа і інш.) заняткі ў V класе могуць праводзіцца або па ўсіх пералічаных вышэй раздзелах, або па 4—6 з іх.

У V класе рэкамендуецца выдзяляць ад 20 да 50 % вучэбнага часу на заняткі практычнага паўтарэння. Іх аб'ём вызначае настаўнік з улікам колькасці раздзелаў, па якіх праводзяцца заняткі.

Заняткі з вучнямі V класа могуць праводзіцца настаўнікамі як малодшых класаў, так і працоўнага навучання. У якасці абавязковых для ўсіх вучняў рэкамендуюцца раздзелы «Работа з паперай і кардонам» і «Тэхнічная графіка». Іншыя раздзелы ў розных групах пры дзяленні класа на вучэбна-працоўныя групы ў адпаведнасці з вучэбным планам могуць быць розныя. Напрыклад, настаўнік V класа праводзіць з вучнямі першай групы заняткі па рабоце з паперай і кардонам і тэкстыльнымі матэрыяламі, па апрацоўцы харчовых прадуктаў, тэхнічнай графіцы, а вучні другой групы навучаюцца рабоце з паперай і кардонам, тэхнічнай графіцы, рабоце з драўнінай і дротам настаўнікам працоўнага навучання.

Магчымыя і іншыя варыянты арганізацыі навучання ў V класе, у тым ліку тыя, якія прадугледжваюць вывучэнне ў першым і другім паўгоддзях вучэбнага матэрыялу розных раздзелаў. Напрыклад, у першым паўгоддзі вучні першай групы вучацца рабоце з паперай і кардонам, тэхнічнай графіцы, а вучні другой групы — рабоце з тэкстыльнымі матэрыяламі і апрацоўцы харчовых прадуктаў. У другім паўгоддзі вучні кожнай групы вывучаюць раздзелы, па якіх у першым паўгоддзі праводзіліся заняткі з вучнямі паралельнай групы.

Заняткі па рабоце з дротам і драўнінай праводзяцца на базе вучэбных майстэрняў адпаведнага профілю.

П Р А Г Р А М Ы

# Б А З А В Ы  К А М П А Н Е Н Т

# I КЛАС

## П е р ш а е  п а ў г о д д з е

### УВОДНЫЯ ЗАНЯТКІ

Азнаямленне вучняў з кабінетам (майстэрняй) працоўнага навучання, узорамі вырабаў, правіламі паводзін, тэхнікі бяспекі, санітарыі і гігіены на занятках па працоўным навучанні.

### ВЫРОШЧВАННЕ ПАКАЁВЫХ РАСЛІН

**Практычныя работы.** Догляд пакаёвых раслін (папярэдняе адстойванне вады, паліў з лейкі).

**Пазнавальныя звесткі.** Правілы санітарыі і гігіены, бяспечнай работы ў працэсе догляду пакаёвых раслін. Назвы і знешні выгляд найбольш распаўсюджаных пакаёвых раслін. Значэнне паліву, патрабаванні да вады для паліву, частата паліву асобных раслін.

**Экскурсіі** на прышкольны вучэбна-вопытны ўчастак, у школьныя памяшканні, дзе растуць пакаёвыя расліны.

**Назіранні** за ростам і развіццём пакаёвых раслін, іх адносінамі да святла і вільгаці (на працягу ўсяго перыяду навучання).

### РАБОТА З ГЛІНАЙ І ПЛАСТЫЛІНАМ

**Папярэднія (азнаямляльныя) практыкаванні.** Драбленне сухой гліны, ссыпанне драблёнай гліны ў пасудзіны. Выкананне дзеянняў (мяць на падкладной дошцы, у далонях, пальцамі, адрываць кавалачкі, рэзаць, рабіць адпячаткі пальцаў і разнастайных прадметаў, скрэбці, рабіць дзірачкі ў камяку матэрыялу і інш.). Практыкаванні ў адрозніванні навобмацак сухой і гатовай да работы гліны. Практыкаванні ў пазнаванні ў ляпных вырабах рэальных аб'ектаў, у адрозніванні ў найбліжэйшым акружэнні прадметаў з гліны (вазоны, паддоны, посуд і інш.).

**Назіранні** за падрыхтоўкай настаўнікам гліны да работы, за лепкай настаўнікам выяў знаёмых, лёгка пазнавальных прадметаў (грыб, груша і інш.).

**Пазнавальныя звесткі.** Прымяненне гліны для вырабу прадметаў быту. Абсталяванне рабочага месца (прызначэнне і размяшчэнне на рабочым месцы падкладной дошкі, вільготнай анучкі). Санітарна-гігіенічныя патрабаванні і правілы бяспечнай работы на занятках па лепцы.

**Вырабы.** Простыя выявы, створаныя шляхам фармавання гліны спецыяльнымі формамі, накрыўкамі ад слоікаў, каробачкамі або іншымі прадметамі.

## РАБОТА З ЛІСТАМІ РАСЛІН

**Аперацыі і прыёмы працы.** Збор і першасная апрацоўка (ачыстка) лістоў.

**Пазнавальныя звесткі.** Правілы паводзін на экскурсіі ў прыроду. Правілы збору і апрацоўкі лістоў, санітарыі і гігіены, бяспечнай работы. Характэрныя прыметы лістоў дрэў і кустоў, найбольш распаўсюджаных у найбліжэйшым акружэнні. Змяненне колеру лістоў восенню.

**Экскурсія** ў прыроду з мэтай збору лістоў.

**Вырабы.** Букеты з асенніх лістоў (клёна, каштана, дуба і інш.): просты, камбінаваны.

## НАРЫХТОЎКА ПРЫРОДНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Збор і першасная апрацоўка жалудоў, каштанаў, шышак, сухіх галінак, ігліцы, крылатак. Сартаванне прыродных матэрыялаў і закладванне іх на захоўванне.

**Пазнавальныя звесткі.** Правілы паводзін на экскурсіі ў прыроду. Правілы збору, апрацоўкі і захоўвання пералічаных прыродных матэрыялаў, санітарыі і гігіены, бяспечнай работы пры выкананні дадзеных аперацый.

**Экскурсія** ў прыроду з мэтай збору прыродных матэрыялаў для далейшага стварэння вырабаў.

## РАБОТА З ПАПЕРАЙ

**Папярэднія (азнаямляльныя) практыкаванні.** Змінанне, разгладжванне далонню, разрыванне, адрыванне невялікіх кавалачкаў, згінанне ў розных напрамках, разгінанне, разгладжванне.

**Назіранні** за выкарыстаннем прадметаў з паперы.

**Пазнавальныя звесткі.** Папера тоўстая і тонкая. Колеры паперы. Што робяць з паперы. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні і правілы бяспечнай работы на занятках з паперай.

**Вырабы, практычныя работы.** Змінанне адходаў з паперы ў камякі, змяшчэнне іх у кошык для смецця. Шарыкі з тонкай (напрыклад, газетнай) паперы, выкананне з імі гульнявых (займальных) дзеянняў. «Сняжынкі» (невялікія кавалачкі белай паперы), выкананне з імі гульнявых (займальных) дзеянняў. Абгортванне тонкай каляровай паперай невялікіх прадметаў цыліндрычнай і шарападобнай формы (лялечныя цукеркі ў абгортцы).

**Другое паўгоддзе**

## ВЫРОШЧВАННЕ ПАКАЁВЫХ РАСЛІН

**Практычныя работы.** Абрыванне сухога лісця, праціранне вазонаў і мыццё паддонаў.

**Пазнавальныя звесткі.** Правілы санітарыі і гігіены, бяспечнай работы ў працэсе догляду пакаёвых раслін. Назвы і знешні выгляд пакаёвых раслін, якія раней не вывучаліся. Значэнне выконваемых практычных работ для жыцця раслін і правілы іх выканання.

**Экскурсіі** ў школьныя памяшканні, дзе растуць пакаёвыя расліны.

## РАБОТА З ГЛІНАЙ І ПЛАСТЫЛІНАМ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Размінанне пластыліну на падкладной дошцы, у далонях і пальцамі. Раскатванне невялікіх кавалачкаў пластыліну і гліны далонню на падкладной дошцы, паміж далонямі (прамымі рухамі) у валік, «палачку»; разразанне валіка, «палачкі» пластмасавым нажом (стэкай). Састаўленне выявы.

**Пазнавальныя звесткі.** Спосабы падрыхтоўкі да работы пластыліну (размінанне). Колеры гліны (белы, шэры, чырвоны, жоўты) і пластыліну (колеры і іх адценні, якія выкарыстоўваюцца ў наборы).

**Вырабы.** Вароты, лесвічка, домік, караблік і іншыя прадметныя выявы з «палачак» рознай даўжыні.

## РАБОТА З ПАПЕРАЙ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Складванне паперы (размяшчэнне ліста паперы на стале, адгінанне часткі ліста, сумяшчэнне

бакоў і вуглоў ліста, прыгладжванне згібу). Разметка па шаблонах. Рэзанне нажніцамі па прамой лініі (трыманне загатоўкі адной рукой, правільная хватка нажніц пальцамі другой рукі, шырокае развядзенне лёзаў нажніц і няпоўнае іх звядзенне). Наклейванне з выкарыстаннем клеявога алоўка (размяшчэнне ліста наклейваемым бокам уверх, правільнае трыманне інструмента, раўнамернае нанясенне клею на дэталь, размяшчэнне дэталі на месцы наклейвання, прыціскане і прыгладжванне дэталі анучкай) і пэндзліка (наліванне клейстару або клею, абмакванне пэндзліка ў клеявы састаў, абціранне лішняга клеявога саставу, разраўноўванне нанесенага на дэталь клеявога саставу).

**Пазнавальныя звесткі.** Выкарыстанне паперы ў паўсядзённым жыцці. Асаблівасці паверхні, магчымасць згінання, разрывання, рэзання паперы, страта трываласці пры намаканні. Клеявыя саставы (клейстар, клей ПВА або іншыя, зыходзячы з рэальных умоў). Правілы бяспечнай работы, санітарыі і гігіены пры рабоце з нажніцамі і клеявымі саставамі. Правілы абвядзення шаблонаў, рэзання і наклейвання.

**Вырабы.** Складванне сурвэтак рознымі спосабамі (з размяшчэннем іх у сурвэтніцах), кніжачка з сагнутых палосак паперы. Геаметрычныя фігуры (дыдактычны матэрыял), папярэдне размечаныя складваннем і па шаблоне. Закладкі, паштоўкі і іншыя вырабы, упрыгожаныя аплікатыўнымі дэталямі (асноўныя часткі вырабаў прапануюцца ў гатовым выглядзе).

### АПЛІКАЦЫЯ З ЛІСТОЎ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Наклейванне лістоў.

**Пазнавальныя звесткі.** Крохкасць засушаных лістоў. Правілы наклейвання лістоў. Спалучэнне колеру лістоў і фону выявы. Спалучэнне, паўтарэнне і чаргаванне ва ўзоры формы і колеру лістоў.

**Вырабы.** Узоры ў паласе, у квадраце, у крузе.

### СКУЛЬПТУРА МАЛЫХ ФОРМАЎ З ПРЫРОДНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ І ПЛАСТЫЛІНУ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Лепка простых дэталей вырабаў з пластыліну, злучэнне прыродных матэрыялаў і пластыліну. Размяшчэнне і замацаванне вырабаў на падстаўцы.

**Пазнавальныя звесткі.** Падабенства і адрозненне шышак сасны і елкі, крылатак ясеня і клёна.

**Вырабы.** Грыб (ножка з пластыліну, шапачка з каштана; ножка з жолуда, шапачка з пластыліну), страказа (тулава з пластыліну, крыльцы з крылатак клёна).

### ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫШЫВАННЯ ПА ПРАКОЛАХ

**Практыкаванні** ў выкананні праз дзіркі ў кардоне, якія паступова памяншаюцца, шнуроўкі ў выглядзе геаметрычных фігур і прадметных выяў з нескладаным контурам.

**Вырабы.** Выявы геаметрычных фігур, фруктаў, гародніны.

### УМЕННІ

Паўтарэнне папярэдне выдзеленых настаўнікам прымет вырабу на першых занятках па кожным з відаў работ; на наступных занятках — аналіз узору вырабу па пытаннях і з дапамогай настаўніка ў фармулёўцы адказаў. Выкананне работы па дэманстрацыі і славеснай інструкцыі настаўніка. Планаванне знаёмай найбліжэйшай аперацыі. Кантроль прамежкавых вынікаў, параўнанне зробленага вырабу з узорам з дапамогай настаўніка. Называнне выкананых аперацый і іх паслядоўнасці, параўнанне з узорам і ацэнка свайго вырабу па пытаннях і з дапамогай настаўніка.

Арыенціроўка з дапамогай настаўніка на плоскасці і ў трохвымернай прасторы. Выкарыстанне ў працэсе арыенціроўкі ў заданні і на іншых этапах урока паняццяў, якія фарміруюцца ў прапедэўтычны перыяд навучання матэматыцы.

## II КЛАС

### Першае паўгоддзе

### ВЫРОШЧВАННЕ ПАКАЁВЫХ РАСЛІН

**Практычныя работы.** Выціранне пылу з буйных скурыстых лістоў вільготнай анучкай, з апушаных лістоў — пэндзлікам. Апырскванне раслін з тоўстымі скурыстымі лістамі з ручнога апырсквальніка або пульверызатара.

**Пазнавальныя звесткі.** Правілы размяшчэння пакаёвых раслін з улікам патрэбнасці ў святле. Назвы і знешні выгляд най-

больш распаўсюджаных пакаёвых раслін. Значэнне выконваемых практычных работ для жыцця раслін і правілы іх выканання.

**Экскурсіі** на прышкольны вучэбна-вопытны ўчастак, у школьныя памяшканні, дзе растуць пакаёвыя расліны.

## РАБОТА З ГЛІНАЙ І ПЛАСТЫЛІНАМ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Скатванне шара на падкладной дошцы і кругавымі рухамі паміж далонямі, злучэнне канцоў «палачкі» з прымазваннем месца злучэння (колца), уціскание невялікіх ямак указальным пальцам, раскатванне шара ў далонях у авал і конус, сплескванне і выцягванне часткі шара для атрымання грушападобнай формы, расплескванне шара, разразанне шара ніткай на дзве паловы.

**Пазнавальныя звесткі.** Падабенства і адрозненне пластычных уласцівасцей гліны і пластыліну, змяненне пластычных уласцівасцей пры высыханні гліны і ахаладжэнні пластыліну.

**Вырабы.** Колцы аднолькавага дыяметра, ланцужок. Колцы рознага дыяметра, пірамідка з колцаў.

Прадметы шарападобнай формы (лялька-неваляшка, апельсіны, яблыкі). Кампазіцыя «Фрукты на падносе» (калектыўная работа; паднос прапануецца гатовы).

Прадметы авальнай,канічнай, грушападобнай формы (сліва, агурок, морква, груша).

Снегавік з шароў і з кругоў (на плоскасці), пірамідка з кругоў. Грыб з дзвюх палавінак шара.

## АПЛІКАЦЫЯ З ЛІСТОЎ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Першасная апрацоўка лістоў (адрыванне чаранка, абразанне «зубчыкаў»), засушванне лістоў.

**Пазнавальныя звесткі.** Правілы засушвання лістоў.

**Экскурсія** ў прыроду з мэтай збору лістоў.

**Вырабы.** Узоры ў паласе, у квадраце, у крузе.

## СКУЛЬПТУРА МАЛЫХ ФОРМАЎ З ПРЫРОДНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ І ПЛАСТЫЛІНУ

**Экскурсіі** ў прыроду з мэтай збору прыродных матэрыялаў.

**Вырабы.** Караблік са шкарлупіны грэцкага арэха, палачкі (мачта), ліста дрэва (парус), пластыліну (злучальны матэрыял);

павук (тулава са шкарлупіны грэцкага арэха, лапкі з тонкіх палачак ці дроту далучаюцца да пластыліну, якім запаўняецца тулава).

## ВЫШЫВАННЕ НА ПАПЕРЫ АБО КАРДОНЕ (па гатовых праколах)

**Папярэднія (азнаямляльныя) практыкаванні.** Разбіранне нітак і сартаванне іх па колеры і таўшчыні. Разрыванне тонкіх нетрывалых нітак. Намотванне нітак на шпульку, кардон, змотванне ў клубок. Адразанне нітак.

**Аперацыі і прыёмы працы.** Дапаможныя: адмотванне і адразанне ніткі, уцягванне ніткі ў іголку з шырокім вушкам. Асноўныя: замацоўванне ніткі ў пачатку вышывання (выкананне некалькіх шыўкоў на адным месцы), выкананне шыўкоў па контуры выявы спосабам «іголка ўверх — іголка ўніз», замацоўванне ніткі ў канцы вышывання. Штрыхоўка ўнутры контуру фігуры.

**Пазнавальныя звесткі.** Прымяненне нітак. Уласцівасці нітак: таўшчыня, колер, ірвуцца, намотваюцца. Правілы бяспечнага захоўвання іголак і бяспечнай работы з іголкай. Прызначэнне і прымяненне напарстка.

**Вырабы.** Выявы геаметрычных фігур.

## РАБОТА З ПАПЕРАЙ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Згінанне і складванне паперы. Рэзанне нажніцамі па дузе (шырокае развядзенне лёзаў нажніц і рэзанне іх часткай, якая прымыкае да восі-шарніра, накіроўванне загатоўкі ў патрэбны бок другой рукой).

**Пазнавальныя звесткі.** Разнастайнасць вырабаў з паперы.

**Вырабы.** Шкляначкі і пакеты розных канструкцый, простыя прадметныя выявы, вырабленыя спосабам складвання. Простыя ёлачныя гірлянды («ланцужок», «змейка», «гармонік», са сцяжкоў).

### УМЕННІ

Аналіз узору вырабу па пытаннях і з дапамогай настаўніка ў фармулёўцы адказаў. Выкананне работы па дэманстрацыі і славеснай інструкцыі настаўніка. Планаванне знаёмай найбліжэйшай аперацыі. Кантроль прамежкавых вынікаў, параўнанне зробленага вырабу з узорам з дапамогай настаўніка. Называнне

выкананых аперацый і іх паслядоўнасці, ацэнка свайго вырабу па пытаннях і з дапамогай настаўніка.

Арыенціроўка на плоскасці і ў трохвымернай прасторы з дапамогай настаўніка. Выкарыстанне ў працэсе арыенціроўкі ў заданні і на іншых этапах урока навыкаў лічэння (для больш падрыхтаваных дзяцей).

**Д р у г о е   п а ў г о д д з е**

## ВЫРОШЧВАННЕ ПАКАЁВЫХ РАСЛІН

**Практычныя работы.** Дапамога настаўніку ў выкананні размнажэння пакаёвых раслін чаранкамі.

**Пазнавальныя звесткі.** Чаранок. Умовы ўкаранення чаранкоў.

**Назіранні** за нарыхтоўкай чаранкоў настаўнікам, за з’яўленнем каранёў.

## РАБОТА З ГЛІНАЙ І ПЛАСТЫЛІНАМ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Разразанне пластычных матэрыялаў стэкай, расплескванне «трубачкі», апрацоўка дэталей вырабаў пальцамі і стэкай для надання ім роўнай паверхні і абазначэння межаў.

**Пазнавальныя звесткі.** Спосабы падрыхтоўкі да работы гліны (замочванне і замешванне). Прыметы гатоўнасці гліны да работы. Рэльеф як адзін з відаў лепкі.

**Вырабы.** Рэльефныя выявы літар і лічбаў.

## РАБОТА З ПАПЕРАЙ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Наклейванне адносна невялікіх дэталей спосабам «ад дошкі» (нанясенне тонкага роўнага слоя клею або клейстару на дошку або іншыя матэрыялы з роўнай паверхняй, размяшчэнне дэталей адваротным бокам на клеявы састаў, зняцце дэталей з клеявога саставу і наклейванне на сваё месца ў вырабе).

**Пазнавальныя звесткі.** Віды аплікацыі з паперы (прадметная, сюжэтная, геаметрычны і раслінны арнамент), выкарыстанне аплікацыі з паперы ў якасці пано і для ўпрыгожвання іншых вырабаў. Спалучэнне колераў паперы паміж сабой і з колерам фону, правілы захавання прапорцый, рытму, сіметрыі

(практычнае знаёмства без выкарыстання названых навуковых паняццяў), папярэдняе размяшчэнне элементаў аплікацыі.

**Вырабы.** Паштоўкі, упрыгожаныя прадметнай аплікацыяй (елачка вялікая і елачка маленькая, снегавік і інш.), закладкі і паштоўкі, упрыгожаныя аплікацыяй у выглядзе геаметрычнага расліннага арнаменту.

## АПЛІКАЦЫЯ З ЛІСТОЎ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Разразанне ліста на дзве часткі.

**Пазнавальныя звесткі.** Стылізацыя формы (у працэсе практыкаванняў па параўнанні формаў асноўных частак аб'ектаў, якія адлюстроўваюцца, з формамі розных лістоў або іх палавінкамі).

**Вырабы.** Пано «Лодачка», «Парашут», «Рыбка» і інш.

## СКУЛЬПТУРА МАЛЫХ ФОРМАЎ З ПРЫРОДНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ І ПЛАСТЫЛІНУ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Лепка і прымацаванне дробных дэталей выявы (вочы, вушы і інш.).

**Пазнавальныя звесткі.** Стылізацыя формы пры стварэнні аб'ёмных выяў. Падабенства прыродных матэрыялаў з аб'ектам, які адлюстроўваецца, па іншых уласцівасцях (калючасць іголак, лускаватасць паверхні шышак і г. д.). Правілы састаўлення кампазіцыі з выяў розных прадметаў.

**Вырабы.** Вожык (тулава з пластыліну, іголкі з ігліцы або абламаных крылатак ясеня, шалупіння семечак сланечніку), рыбка (тулава з шышкі, плаўнікі з пластыліну, хвост з пяра або пластыліну), мышка (тулава з нераскрытай сасновай шышкі, вушкі і вочкі з пластыліну, хвост з пластыліну або дроту). Кампазіцыя з названых і раней створаных вырабаў («Вожык на лясной сцяжынцы», «Вожык і грыбы» або іншыя з прымяненнем моху, галінак туі, сасны, елкі).

## ВЫШЫВАННЕ НА ПАПЕРЫ АБО КАРДОНЕ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Вышыванне спосабам «іголка ўверх — іголка ўніз» у адзін і два прыёмы (прашываецца адлегласць паміж шыўкамі) з самастойным праколваннем.

**Пазнавальныя звесткі.** Адрозніванне нітак па прызначэнні (швейныя, для вышывання, для вязання) і па асаблівасцях (таў-

шчыні, трываласці, колеры). Інструменты (нажніцы, іголкі) і прыстасаванні (ігольніцы, напарсткі) для работы. Арганізацыя рабочага месца, санітарна-гігіенічныя патрабаванні і правілы бяспечнай работы пры вышыванні. Спалучэнне колеру нітак з колерам выявы ўнутры яе контуру і колерам фону.

**Экскурсія** ў школьную швейную майстэрню.

**Вырабы.** Выявы гародніны і фруктаў (пры вышыванні з самастойным праколваннем кропкавы контур выконваецца або настаўнікам, або вучнямі па трафарэце).

### УМЕННІ

Арыенціроўка ў заданні па пытаннях настаўніка з апорай на ўзор вырабу. Планаванне знаёмай найбліжэйшай аперацыі ў працэсе практычнай работы з выкарыстаннем прадметнай карты. Кантроль прамежкавых вынікаў, параўнанне зробленага вырабу з узорам і аналіз якасці выкананай работы з дапамогай настаўніка. Называнне выкананых аперацый і іх паслядоўнасці, ацэнка свайго вырабу па пытаннях настаўніка.

Арыенціроўка на плоскасці і ў трохвымернай прасторы з дапамогай настаўніка. Прасторавая характарыстыка аб’ектаў і іх частак з называннем дзвюх-трох прымет у адказ на пытанне настаўніка. Выкарыстанне ў працэсе арыенціроўкі ў заданні і на іншых этапах урока паняццяў, вывучаемых у прапедэўтычны перыяд навучання матэматыцы, навыкаў лічэння (у межах 3, 5 і 10 у залежнасці ад стану матэматычнай падрыхтаванасці).

# III КЛАС

## П е р ш а е   п а ў г о д д з е

### ВЫРОШЧВАННЕ ПАКАЁВЫХ РАСЛІН*

**Практычныя работы.** Размнажэнне раслін (традэсканцыя) сцябловымі чаранкамі (падрыхтоўка глебы, укараненне чаранкоў у вадзе, высадка ў глебу).

* Замест урокаў з названым ніжэй зместам могуць быць праведзены паўторна-абагульняльныя ўрокі па практычных работах па доглядзе пакаёвых раслін, якія выконваліся ў II класе.

**Назіранні** за нарыхтоўкай чаранкоў настаўнікам, за з'яўленнем каранёў, за змяненнем колеру лістоў традэсканцыі ў залежнасці ад асвятлення.

**Пазнавальныя звесткі.** Санітарна-гігіенічныя патрабаванні і правілы бяспечнай работы пры размнажэнні раслін сцябловымі чаранкамі і падрыхтоўцы глебы.

## РАБОТА З ГЛІНАЙ І ПЛАСТЫЛІНАМ (лепка на плоскасці)

**Аперацыі і прыёмы працы.** Выкананне рэльефнай выявы (расплескванне і расціранне пластычных матэрыялаў, атрыманне выяў рознай выпукласці, нанясенне рысунка і падраўноўванне контуру выявы стэкай). Расціранне пластыліну на пластыліне для атрымання рознакаляровай выявы.

**Пазнавальныя звесткі.** Выкарыстанне раслінных формаў у беларускім дэкаратыўным мастацтве (нагляднае знаёмства).

**Вырабы.** Рэльефныя выявы слівы, агурка, розных грыбоў, яблыка, грушы, морквы, вішань на галінцы, цюльпана, галінкі з лістамі.

## СКУЛЬПТУРА З ПРЫРОДНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Злучэнне дэталей вырабу палачкамі або кавалачкамі дроту, склейванне дэталей з прыродных матэрыялаў. Праколванне дзірак для злучэння дэталей выконваецца педагогам.

**Пазнавальныя звесткі.** Асаблівасці формы і паверхні, памеры, колер, трываласць і іншыя прыметы прыродных матэрыялаў, якія раней не выкарыстоўваліся (жалудоў, ягад шыпшыны і інш.). Правілы бяспекі падчас работы з дротам.

**Экскурсіі** ў прыроду з мэтай збору прыродных матэрыялаў, на школьныя і іншыя выставы работ з прыродных матэрыялаў.

**Вырабы.** Птушка (тулава з шышкі або буйнога жолуда, галава з невялікага жолуда або ягады шыпшыны, крыльцы з невялікіх лістоў, злучальныя дэталі з палачак ці дроту), чарапаха (тулава са шкарлупіны грэцкага арэха, галава, шыя, ногі, хвост з пластыліну), рыбка (тулава са шкарлупіны грэцкага арэха, плаўнікі з пёраў, лістоў або паперы), казачныя персанажы з шышак, жалудоў і іншых прыродных матэрыялаў.

## РАБОТА З ПАПЕРАЙ І КАРДОНАМ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Вымярэнне ўзораў і шаблонаў лінейкай (у сантыметрах). Рэзанне кардону. Абклейванне кардону паперай (змазванне ўсёй паверхні папяровай дэталі клеем і наклейванне). Сіметрычнае вырэзванне прадметаў з контурам, які плаўна мяняецца. Замацаванне ніткі-пятлі паміж часткамі ёлачнай цацкі.

**Пазнавальныя звесткі.** Уласцівасці кардону (у параўнанні з уласцівасцямі паперы), яго прымяненне на ўроках працы і ў паўсядзённым жыцці. Правілы абклейвання кардону паперай. Правілы вымярэння памераў лінейкай. Правілы сіметрычнага вырэзвання.

**Вырабы.** Раздатачны матэрыял у выглядзе геаметрычных фігур (кардон, абклееная каляровай паперай з аднаго або двух бакоў). Віншавальныя паштоўкі ў выглядзе авала, сэрца, упрыгожаныя аплікацыяй (выконваюцца спосабам сіметрычнага вырэзвання). Плоскія ёлачныя цацкі (рознакаляровыя кругі, авалы, грушы, грыбы і іншыя цацкі з кардону, абклеенага паперай), гірлянды з іх. Аб’ёмныя ёлачныя цацкі («ліхтарыкі», «кошыкі» і інш.).

## РАБОТА З ТЭКСТЫЛЬНЫМІ МАТЭРЫЯЛАМІ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Завязванне вузельчыка, замацаванне ніткі на тканіне ў канцы работы. Прышыванне гузіка з дзвюма дзірачкамі да тканіны шчыльна і з утварэннем «ножкі». Вышыванне сфастрыгавальным швом (шво «ўперад іголку»).

**Пазнавальныя звесткі.** Гузікі, іх адрозніванне па памерах, колькасці дзірачак, прызначэнні. Тканіна, яе адрозніванне па прызначэнні і знешніх прыметах (таўшчыня, асаблівасці паверхні, колер). Знешні выгляд і правілы выканання сфастрыгавальнага шва, яго выкарыстанне для ўпрыгожвання вырабаў.

**Вырабы.** Калекцыя тканін (гатовыя ўзоры тканін замацоўваюцца на кардоне гузікамі). Закладка з тканіны, упрыгожаная трыма-чатырма сфастрыгавальнымі швамі (па гатовым крoі, месцы праколаў размячаюцца па трафарэце).

**Практыкаванні** ў прышыванні гузікаў з дзвюма дзірачкамі на швейныя вырабы.

### УМЕННІ

Арыенціроўка ў заданні па пытаннях настаўніка (пры стварэнні новых відаў вырабаў) і самастойна (пры стварэнні вырабаў,

аналагічных тым, якія раней выконваліся) з апорай на ўзор і рысунак вырабу. Папярэдняе планаванне ўсіх этапаў работы і справаздача аб паслядоўнасці стварэння вырабу па пытаннях настаўніка з апорай на прадметную (графічную) карту. Кантроль прамежкавых вынікаў работы з дапамогай настаўніка (пры выкананні новых аперацый або прыёмаў работы) і самастойна (пры выкананні засвоеных аперацый або прыёмаў работы). Параўнанне з узорам і ацэнка якасці свайго вырабу па пытаннях настаўніка.

Арыенціроўка на плоскасці і ў трохвымернай прасторы з дапамогай настаўніка. Прасторавая характарыстыка аб'ектаў і іх частак з называннем самастойна адной-дзвюх прымет. Рашэнне ў працэсе арыенціроўкі ў заданні і на іншых этапах урока простых задач на знаходжанне сумы, астачы, павелічэнне і памяншэнне ліку на некалькі адзінак у межах 10 з дапамогай настаўніка. Вымярэнне лінейкай (у сантыметрах) у працэсе арыенціроўкі ў заданні і практычнай работы.

**Д р у г о е п а ў г о д д з е**

## ВЫРОШЧВАННЕ ПАКАЁВЫХ РАСЛІН*

**Практычныя работы.** Размнажэнне раслін (бальзамін, плюшч звычайны або іншыя расліны, якія хутка ўкараняюцца) сцябловымі чаранкамі (падрыхтоўка рассадных скрынак, вазонаў, пасадка чаранкоў для ўкаранення і догляд іх, перасадка ў вазоны).

**Назіранні** за нарыхтоўкай чаранкоў настаўнікам, за развіццём чаранкоў.

**Пазнавальныя звесткі.** Расліны пакаёвыя і прышкольнага ўчастка. Назвы і знешні выгляд пакаёвых раслін, якія раней не вывучаліся. Асаблівасці догляду чаранкоў. Патрабаванні раслін да святла, вільгаці, цяпла і земляной сумесі.

## РАБОТА З ГЛІНАЙ І ПЛАСТЫЛІНАМ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Лепка полых прадметаў спосабам уціскання, расплесквання і выцягвання сценак. Выкананне рысунка на паверхні вырабу стэкай. Лепка дробных дэталей.

---

* Замест урокаў з названым ніжэй зместам могуць быць праведзены ўрокі па тэме «Агарод на акне». Змест даступных дзецям ведаў, уменняў і навыкаў вызначаецца настаўнікам.

**Пазнавальныя звесткі.** Прымяненне гліны для вырабу посуду. Беларуская гліняная цацка.

**Вырабы.** Выявы шклянкі, вазона, вядзерца, кубка, сподачка, талеркі, чайніка для заваркі з гліны або пластыліну. Кампазіцыя з названых прадметаў.

## СКУЛЬПТУРА МАЛЫХ ФОРМАЎ З ПРЫРОДНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ І ПЛАСТЫЛІНУ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Папярэдняе размяшчэнне дэталей макета на падстаўцы.

**Пазнавальныя звесткі.** Матэрыялы для падстаўкі. Кампазіцыйны цэнтр, пярэдні і задні план кампазіцыі макета, асаблівасці іх выдзялення.

**Вырабы.** Макеты «Возера», «Лясная палянка», па матывах казак «Калабок», «Церамок» і інш.

## РАБОТА З ПАПЕРАЙ І КАРДОНАМ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Разметка па лінейцы (сумяшчэнне дзялення «0» лінейкі з краем загатоўкі, адкладванне памераў, злучэнне рысак па лінейцы).

**Пазнавальныя звесткі.** Правілы разметкі па лінейцы. Адпаведнасць формы краю вырабу арнаменту.

**Вырабы.** Закладкі з трохвугольнымі, закругленымі, узорыстымі краямі, упрыгожаныя геаметрычным і раслінным арнаментам. Паштоўкі ў форме прамавугольніка, трохвугольніка, паўкруга, атрыманыя згінаннем геаметрычных фігур, аформленыя арнаментам або прадметнай аплікацыяй.

## РАБОТА З ТЭКСТЫЛЬНЫМІ МАТЭРЫЯЛАМІ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Выраб выкрайкі з кардону ці паперы (разметка па лінейцы, вырэзванне) і раскрой тканіны.

Вышыванне сфастрыгавальным швом у два прыёмы (шыўкі другога шва знаходзяцца паміж шыўкамі першага шва).

**Пазнавальныя звесткі.** Віды тканіны па паходжанні валокнаў. Адрозніванне тканіны з натуральных (ільняных, баваўняных, шарсцяных, шаўковых) і хімічных валокнаў. Правы і левы бок тканіны. Адпаведнасць колеру і таўшчыні нітак для вышывання вырабу. Знешні выгляд і правілы выканання сфастрыгавальнага шва, яго выкарыстанне для ўпрыгожвання вырабаў.

**Вырабы.** Закладкі і сурвэткі з тканіны, упрыгожаныя markdown рознымі выявамі, выкананымі сфастрыгавальным швом (у адзін і два прыёмы).

УМЕННІ

Арыенціроўка ў заданні з апорай на ўзор, рысунак, натуральны прадмет або ўяўленне аб прадмеце па пытаннях настаўніка (пры стварэнні новых відаў вырабаў) і самастойна (пры стварэнні вырабаў, аналагічных тым, якія раней выконваліся). Папярэдняе планаванне ўсіх этапаў работы і справаздача аб яе выкананні па пытаннях настаўніка (пры стварэнні новых або больш складаных вырабаў) і самастойна з апорай на прадметную (графічную) карту. Бягучы самакантроль вынікаў выканання знаёмых аперацый. Аналіз выкананых вырабаў і іх параўнанне з узорам па навадных пытаннях настаўніка.

Самастойная арыенціроўка на плоскасці і ў трохвымернай прасторы. Прасторавая характарыстыка аб'ектаў з самастойным называннем дзвюх-трох прымет. Рашэнне ў працэсе арыенціроўкі ў заданні і на іншых этапах урока простых задач на знаходжанне сумы, астачы, павелічэнне і памяншэнне ліку на некалькі адзінак у межах 10 (для больш падрыхтаваных — у межах 20 без пераходу праз дзесятак). Разметка па лінейцы (па ўзоры, памеры задаюцца ў сантыметрах).

## IV КЛАС

### Першае паўгоддзе

#### ВЫРОШЧВАННЕ ПАКАЁВЫХ РАСЛІН

**Практычныя работы.** Нарыхтоўка ў найбліжэйшым акружэнні зямлі, пяску на зіму для прыгатавання земляных сумесей.

**Пазнавальныя звесткі.** Знешнія прыметы дзярновай, ліставой, тарфяной зямлі, пяску. Агульнае ўяўленне пра разнастайнасць земляных сумесей.

#### РАБОТА З ГЛІНАЙ І ПЛАСТЫЛІНАМ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Лепка складаных па форме стылізаваных выяў жывёл і людзей з цэлага кавалка і іх састаў-

ленне з асобных частак, лепка камбінаваным спосабам. Лепка частак выявы, якія забяспечваюць апазнаванне чалавечага персанажа (лепка барады, шапкі, касічкі і г. д.). Нанясенне рысунка стэкай. Абазначэнне дробнымі ляпнымі дэталямі элементаў адзення.

**Пазнавальныя звесткі.** Уяўленне пра стылізаваную выяву, пра перадачу руху ў ляпной фігуры. Народная гліняная цацка.

**Вырабы.** Стылізаваныя аб'ёмныя выявы птушак (качка, гусь, лебедзь), звяроў (вавёрка, заяц, ліса), людзей (хлопчык, дзяўчынка, дзядуля), казачных персанажаў у статыцы і дынаміцы.

## РАБОТА З ПАПЕРАЙ І КАРДОНАМ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Перавод рысунка праз капіравальную паперу. Наклейванне дробных дэталей (элементаў мазаікі і г. д.). Выраб акантовачных палосак з абразаннем іх канцоў пад вуглом 45°. Наклейванне акантоўкі. Наразанне і наклейванне дробных дэталей з матэрыялаадходаў (фольгі або іншых). Прышыванне завязак на вырабы з паперы або кардону.

**Пазнавальныя звесткі.** Прызначэнне капіравальнай паперы, правілы капіравання рысунка. Мазаіка з паперы, яе віды (рванка, рэзанка, з выбітых на дзіркаколе кружочкаў), выкарыстанне мазаікі для ўпрыгожвання іншых вырабаў і ў якасці пано. Правілы наклейвання дробных дэталей і бяспечнага карыстання прадметамі з вострым канцом. Прызначэнне і правілы вырабу акантоўкі. Спалучэнне колеру фону, выявы і акантоўкі.

**Вырабы.** Закладкі і паштоўкі, упрыгожаныя простымі ўзорамі і прадметнымі мазаічнымі выявамі (элементамі мазаікі запаўняецца толькі контур выявы). Мазаічныя пано ў выглядзе простых контурных выяў (мяч, грыбок, груша і інш.) з акантоўкай з палосак паперы. Карнавальныя паўмаскі (акуляры) з тоўстай паперы або тонкага кардону.

## РАБОТА З ТЭКСТЫЛЬНЫМІ МАТЭРЫЯЛАМІ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Сшыванне дэталей вырабу косым абкідальным швом.

**Пазнавальныя звесткі.** Знешні выгляд і правілы выканання косага абкідальнага шва. Выкарыстанне косага абкідальнага шва для злучэння дэталей вырабу.

**Вырабы.** Закладка з цэлулоіду або фотаплёнкі з каляровым укладышам. Футляр для нажніц з кардону або цыраты (упрыгожваецца простай вышыўкай або аплікацыяй). Ігольніца (па самастойна зробленай выкрайцы).

### УМЕННІ

Арыенціроўка ў заданні па пытаннях настаўніка (пры стварэнні новых відаў вырабаў) і самастойна (пры стварэнні вырабаў, аналагічных тым, якія раней выконваліся). Папярэдняе планаванне ўсіх этапаў работы і справаздача аб яе выкананні з дапамогай пытанняў настаўніка аб асобных (больш складаных) этапах і самастойна з апорай на прадметную (графічную, інструкцыйную) карту. Выкарыстанне пры планаванні і ў працэсе работы кароткіх пісьмовых інструкцый (пісьмовага плана). Бягучы і выніковы канстатуючы самакантроль з выкарыстаннем вымярэнняў лінейкай. Дэталёвы аналіз свайго вырабу і вырабу таварыша, іх параўнанне з узорам з мінімальнай дапамогай настаўніка.

Рашэнне ў працэсе арыенціроўкі ў заданні і на іншых этапах урока простых задач на знаходжанне сумы, астачы, павелічэнне і памяншэнне ліку на некалькі адзінак у межах 20 без пераходу праз дзесятак (для больш падрыхтаваных — з пераходам).

## Другое паўгоддзе

### ВЫРОШЧВАННЕ ПАКАЁВЫХ РАСЛІН*
### (практычнае паўтарэнне)

**Практычныя работы.** Размнажэнне раслін, якія хутка ўкараняюцца, сцябловымі чаранкамі.

**Назіранні** за нарыхтоўкай чаранкоў настаўнікам, за развіццём чаранкоў.

**Пазнавальныя звесткі.** Тэрміны ўкаранення чаранкоў, асаблівасці іх догляду. Патрабаванні раслін да святла, вільгаці, цяпла і земляной сумесі.

---

* Калі ў III класе размнажэнне раслін сцябловымі чаранкамі замянялася іншымі відамі работ, то праводзяцца ўрокі вывучэння новага матэрыялу.

## РАБОТА З ПАПЕРАЙ І КАРДОНАМ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Рыцаванне кардону і тоўстай паперы. Падклейванне старонак, вокладак, карашкоў кніг і часопісаў.

**Пазнавальныя звесткі.** Прызначэнне рыцоўкі, правілы яе якаснага і бяспечнага выканання. Канструктыўныя часткі пераплётных кніг: пераплётная накрыўка (карашок старонкі), вокладка, папка, блок, сшыткі. Матэрыялы для пераплётных работ: каленкор, ледэрын, марля, тасьма.

**Практыкаванні** ў дробным рамонце кніг і часопісаў, іх абгортцы.

**Вырабы.** Мадэлі (стол, стул, крэсла) з паперы, кардону, каробачак. Каробкі з кардону, склееныя па стыках, і каробкі з клапанамі (бакі ўпрыгожваюцца малюнкамі або аплікацыяй).

## РАБОТА З ТЭКСТЫЛЬНЫМІ МАТЭРЫЯЛАМІ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Прышыванне гузікаў з чатырма дзірачкамі паралельнымі і перакрыжаванымі шыўкамі. Выцягванне нітак з тканіны пры афармленні сурвэткі, закладкі.

**Пазнавальныя звесткі.** Разнастайнасць (асартымент) тканін. Знешнія прыметы найбольш распаўсюджаных тканін. Спосабы прышывання гузікаў з чатырма дзірачкамі. Выкарыстанне абкідальнага шва для ўмацоўвання і ўпрыгожвання краю вырабу.

**Вырабы.** Закладкі і сурвэткі, аформленыя сфастрыгавальным і абкідальным швамі, а таксама выцягваннем нітак.

### УМЕННІ

Арыенціроўка ў заданні, папярэдняе планаванне работы, бягучы і выніковы самакантроль, справаздача аб этапах работы і тэхналогіі выканання асобных частак вырабу, аналіз якасці створаных вырабаў і іх параўнанне з узорам з мінімальнай дапамогай настаўніка і самастойна.

Самастойная арыенціроўка на плоскасці і ў трохвымернай прасторы. Выкарыстанне на розных этапах выканання задання вымярэнняў лінейкай і рашэння простых задач на знаходжанне сумы, астачы, павелічэнне і памяншэнне ліку на некалькі адзінак у межах 20, разметка па лінейцы з мінімальнай дапамогай настаўніка і самастойна.

## РАБОТЫ НА ВЫБАР НАСТАЎНІКА

## І клас

### ВЫРОШЧВАННЕ РАСЛІН НА ПРЫШКОЛЬНЫМ ВУЧЭБНА-ВОПЫТНЫМ УЧАСТКУ

**Асеннія практычныя работы.** Збор насення аднагадовых раслін, падрыхтоўка іх да захоўвання і закладка на захоўванне.

**Назіранні** за ўборкай ураджаю і асенняй апрацоўкай глебы.

**Пазнавальныя звесткі.** Расліны прышкольнага вучэбна-вопытнага ўчастка і іх плады. Патрабаванні санітарыі, гігіены і бяспекі працы на вучэбна-вопытным участку.

**Вясеннія практычныя работы.** Праполванне пустазелля.

**Пазнавальныя звесткі.** Значэнне праполвання пустазелля.

### РАБОТА З ДРАЎЛЯНЫМ КАНСТРУКТАРАМ

**Практычныя работы.** Канструяванне па ўзоры, канструяванне па рысунку з дэталей будаўнічага канструктара.

**Пазнавальныя звесткі.** Назвы дэталей будаўнічага канструктара.

### ДОГЛЯД СВОЙСКАЙ ЖЫВЁЛЫ

**Практычныя работы.** Кармленне акварыумных рыбак.

**Пазнавальныя звесткі.** Назвы і знешнія адметныя адзнакі некаторых акварыумных рыбак. Правілы кармлення акварыумных рыбак.

## ІІ клас

### ВЫРОШЧВАННЕ РАСЛІН НА ПРЫШКОЛЬНЫМ ВУЧЭБНА-ВОПЫТНЫМ УЧАСТКУ

**Асеннія практычныя работы.** Падрыхтоўка градак да апрацоўкі (праполванне пустазелля і рэшткаў раслін). Удзел ва ўнясенні перагною.

**Назіранні** за ўборкай ураджаю і асенняй апрацоўкай глебы.

**Пазнавальныя звесткі.** Значэнне выкананых работ.

**Вясеннія практычныя работы.** Праполванне пустазелля.

### АБ’ЁМНАЯ АПЛІКАЦЫЯ З ПАПЕРЫ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Згінанне і раскладванне паперы. Вырэзванне асобных дэталей аб’ёмнай аплікатыўнай выявы па

лініях разметкі. Склейванне дэталей аплікацыі, наклейванне элементаў аплікацыі або ўсёй аплікатыўнай выявы на фон.

**Пазнавальныя звесткі.** Прызначэнне пано. Спалучэнне колеру фону і колеру аплікатыўнай выявы. Спалучэнне аб'ёмнай аплікацыі з плоскаснай і малюнкам.

**Вырабы.** Пано з выявамі прадметаў, атрыманых шляхам вырэзвання, рознай складанасці згінання і складвання паперы (кветкі, фігуркі птушак, звяроў і інш.).

### СІМЕТРЫЧНАЕ ВЫРЭЗВАННЕ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Вырэзванне са складзенага ўдвая ліста тоўстай паперы выяў, якія маюць плаўны контур. Размалёўванне выяў, наклейванне і дарысоўка на іх асобных дэталей (афармленне ў выглядзе лічыльнага матэрыялу, паштовак).

**Пазнавальныя звесткі.** Паслядоўнасць вырабу сіметрычна выразаных выяў, асаблівасці і правілы размяшчэння шаблонаў, правілы вырэзвання.

**Вырабы.** Паштоўкі ў форме авала, сэрца. Сіметрычныя выявы прадметаў з адносна не складаным контурам (груша, яблык, грыб).

### РАБОТА З ПЛАСТМАСАВЫМ КАНСТРУКТАРАМ

**Практычныя работы.** Канструяванне па ўзоры, канструяванне па рысунку.

**Пазнавальныя звесткі.** Назвы дэталей, спосабы іх злучэння.

### ДОГЛЯД СВОЙСКАЙ ЖЫВЁЛЫ

**Практычныя работы.** Удзел у чыстцы клетак свойскіх птушак. Кармленне свойскіх птушак.

**Пазнавальныя звесткі.** Назвы і знешнія адметныя адзнакі свойскіх птушак, якіх трымаюць у клетцы. Віды кармоў і правілы кармлення. Патрабаванні санітарыі, гігіены і бяспекі выконваемых работ.

## III клас

### ВЫРОШЧВАННЕ РАСЛІН НА ПРЫШКОЛЬНЫМ ВУЧЭБНА-ВОПЫТНЫМ УЧАСТКУ

**Асеннія практычныя работы.** Збор насення аднагадовых кветкава-дэкаратыўных раслін, падрыхтоўка іх да захоўвання

і закладка на захоўванне. Падрыхтоўка вучэбна-вопытнага ўчастка да асенняй апрацоўкі глебы (уборка лісця, галінак, рэшткаў раслін).

**Пазнавальныя звесткі.** Прыметы выспявання, правілы збору, падрыхтоўкі да захоўвання і захоўвання насення. Значэнне асенніх работ на прышкольным вучэбна-вопытным участку.

**Вясеннія практычныя работы.** Сартаванне і адбор паўнацэннага насення фасолі, гароху, бобу, гарбузоў, кабачкоў, буракоў, аднагадовых кветкава-дэкаратыўных раслін. Рыхленне і разраўноўванне глебы граблямі пасля перакопвання (перакопванне выконваецца вучнямі старшых класаў). Правядзенне бараздаў рознымі спосабамі. Паштучная сяўба буйнога насення на зададзенай адлегласці з дапамогай меркі, сяўба зяленіўных культур, забараноўванне зямлёй або перагноем. Паліў пасеваў пасля забараноўвання і паліў усходаў. Рыхленне глебы. Праполванне. Збор зяленіўных культур.

**Практыкаванні** ў распазнаванні насення і ў распазнаванні ўсходаў культурных раслін і пустазелля.

**Пазнавальныя звесткі.** Знешні выгляд вывучаемых раслін і іх насення. Глыбіня бараздаў пры сяўбе насення розных культур. Бяспечнасць работы граблямі і іх захоўванне. Значэнне праполвання.

**Назіранні** за ўнясеннем удабрэнняў і падкормліваннем раслін.

## АБ'ЁМНАЯ АПЛІКАЦЫЯ З ПАПЕРЫ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Вырэзванне асобных дэталей аплікатыўнай выявы па лініях разметкі і «на вока». Наклейванне дэталей з фольгі, ваты і іншых матэрыялаў для ўпрыгожвання аплікацыі.

**Пазнавальныя звесткі.** Выкарыстанне аб'ёмнай аплікацыі для ўпрыгожвання паштовак і запрашальных білетаў.

**Вырабы.** Паштоўкі і запрашальныя білеты, упрыгожаныя ўклеенай у сярэдзіну або наклеенай звонку аб'ёмнай аплікацыяй.

## СІМЕТРЫЧНАЕ ВЫРЭЗВАННЕ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Вырэзванне са складзенага ўдвая ліста паперы па лініях ускладненай канфігурацыі (якія рэзка мяняюць напрамак). Наклейванне выявы спосабам «ад дошкі» і з нанясеннем на выяву клею пэндзлікам.

**Пазнавальныя звесткі.** Выкарыстанне сіметрычнага вырэзвання (выразанак) для ўпрыгожвання іншых вырабаў. Спосабы наклейвання выразанак.

**Вырабы.** Закладкі, упрыгожаныя выразанкамі ў выглядзе геаметрычнага або расліннага арнаменту (арнамент паслядоўна ўскладняецца).

### АПЛІКАЦЫЯ З РАЗНАСТАЙНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Нарыхтоўка апілак, драбленне яечнай шкарлупіны, сушка выкарыстаных молатай кавы і чайнай заваркі. Наклейванне сыпкіх матэрыялаў (нанясенне клею роўным слоем, насыпанне матэрыялу на клей, прыцісканне). Афарбоўванне вырабаў.

**Пазнавальныя звесткі.** Санітарна-гігіенічныя патрабаванні і правілы бяспечнай работы пры нарыхтоўцы і рабоце з сыпкімі матэрыяламі. Агульныя і адметныя адзнакі сыпкіх матэрыялаў. Матэрыялы для фону. Клеявыя саставы для аплікацыі з сыпкіх матэрыялаў (казеінавы клей, клей ПВА).

**Вырабы.** Пано «Грыбок» (шапачка з кавы, чайнай заваркі або манны, апілак, пафарбаваных потым у патрэбны колер; ножка з манны або апілак), «Медзведзяня» (апілкі, чайная заварка або іншыя матэрыялы), «Зайчык» (пафарбаваныя апілкі) і інш.

### РАБОТА З ПЛАСТМАСАВЫМ КАНСТРУКТАРАМ

**Практычныя работы.** Канструяванне па ўзоры, канструяванне па рысунку, канструяванне па задуме.

### ДОГЛЯД СВОЙСКАЙ ЖЫВЁЛЫ

**Практычныя работы.** Кармленне кошак і сабак (у выглядзе дамашняга задання).

**Пазнавальныя звесткі.** Правілы ўтрымання кошак і сабак у доме. Асаблівасці кармлення кошак і сабак. Патрабаванні санітарыі, гігіены і бяспекі выконваемых работ.

## IV клас

### ВЫРОШЧВАННЕ РАСЛІН НА ПРЫШКОЛЬНЫМ ВУЧЭБНА-ВОПЫТНЫМ УЧАСТКУ

**Асеннія практычныя работы.** Збор насення кветкава-дэкаратыўных раслін, падрыхтоўка іх да захоўвання і закладка на

захоўванне. Удзел ва ўборцы ўраджаю гародніны на прышкольным вучэбна-вопытным участку. Падрыхтоўка прышкольнага вучэбна-вопытнага ўчастка да асенняй апрацоўкі глебы. Перакопванне глебы.

**Пазнавальныя звесткі.** Харчовае значэнне гародніны. Правілы збору і захоўвання ўраджаю гародніны. Значэнне асенняга перакопвання глебы. Правілы бяспечнай работы з рыдлёўкай. Значэнне ўдабрэнняў.

**Назіранні** за ўнясеннем удабрэнняў.

**Вясеннія практычныя работы.** Сартаванне і адбор паўнацэннага насення. Перакопванне, рыхленне і разраўноўванне глебы. Разметка класнай дзялянкі. Сяўба буйнога і дробнага насення (культуры на выбар). Догляд пасеваў і ўсходаў (паліў, рыхленне глебы, праполванне). Збор зяленіўных культур.

**Практыкаванні** ў распазнаванні насення і ў распазнаванні ўсходаў культурных раслін і пустазелля.

**Пазнавальныя звесткі.** Знешні выгляд вывучаемых раслін і іх насення. Глыбіня барознаў пры сяўбе насення розных культур. Метр як адзінка вымярэння. Правілы разметкі ўчастка.

**Назіранні** за ўнясеннем удабрэнняў і падкормліваннем раслін.

## СІМЕТРЫЧНАЕ ВЫРЭЗВАННЕ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Вырэзванне з ліста, складзенага ў два, у чатыры разы, па знешнім і ўнутраным контуры.

**Пазнавальныя звесткі.** Сіметрычнае вырэзванне як від народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

**Вырабы.** Навагоднія ўзоры, пано (прадметныя выявы, простыя кампазіцыі з выяў некалькіх прадметаў).

## АПЛІКАЦЫЯ З РАЗНАСТАЙНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Расслаенне і наклейванне ваты. Наклейванне мазаічных элементаў з лускавінак шышак, кавалачкаў яечнай шкарлупіны.

**Пазнавальныя звесткі.** Уласцівасці выкарыстоўваемых у рабоце матэрыялаў. Асаблівасці тэхналогіі выканання аплікацыі з ваты (нанясенне рысунка на адным баку паперы, наклейванне ваты на другім баку, вырэзванне па контуры рысунка, наклейванне паперай на фон).

**Вырабы.** Пано «Снегавік», «Зайчык», «Мішка», «Лебедзь» — з ваты; «Сланяня» — з яечнай шкарлупіны; «Вожык» — з лус-

кавінак шышак у спалучэнні са звычайнай аплікацыяй, малюнкам. Пано ў выглядзе кампазіцый («Лебедзь на возеры» і інш.).

## РАБОТА З САЛОМКАЙ (АПЛІКАЦЫЯ)

**Аперацыі і прыёмы працы.** Рэзанне нажніцамі і наклейванне саломкі.

**Назіранні** за падрыхтоўкай саломкі да работы.

**Пазнавальныя звесткі.** Выкарыстанне аплікацыі з саломкі ў якасці пано і для ўпрыгожвання іншых вырабаў. Злакавыя расліны, сцёблы якіх выкарыстоўваюцца для аплікацыі. Паслядоўнасць падрыхтоўкі саломкі да работы. Правілы бяспекі пры апрацоўцы саломкі. Рацыянальныя спосабы выканання аплікацыі з саломкі з запоўненым контурам (выкананне рысунка на адным баку паперы, наклейванне саломкі на другім баку, вырэзванне выявы і наклейванне яе на фон).

**Вырабы.** Закладкі, каробачкі і іншыя вырабы, упрыгожаныя простымі ўзорамі з саломкі. Пано ў выглядзе прадметных аплікацый і кампазіцый.

## ВЫШЫВАННЕ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Выкананне швоў «строчка», сцяблістае, тамбурнае, пяцельнае.

**Пазнавальныя звесткі.** Сшывальныя швы і швы для ўпрыгожвання.

**Вырабы.** Закладкі і сурвэткі, іншыя простыя вырабы, упрыгожаныя вышыўкай.

## РАБОТА З ДРАЎНІНАЙ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Струганне драўніны нажом, зачыстка напільнікам і наждачнай паперай, злучэнне дэталей вырабу з драўніны цвікамі і шрубамі, падрыхтоўка гнязда для шрубы, даставанне цвіка і шрубы, афарбоўванне вырабаў з драўніны.

**Практыкаванні** ў завострыванні алоўкаў і калкоў нажом, зачыстцы вырабаў з драўніны (калкоў, падставак) напільнікам і наждачнай паперай.

**Пазнавальныя звесткі.** Выкарыстанне драўніны. Віды матэрыялаў з драўніны (дошкі, фанера). Ахова лясных багаццяў. Уласцівасці драўніны (рэжацца, стругаецца, утрымлівае цвікі і шрубы, афарбоўваецца). Інструменты для работы з драўнінай (нож,

напільнік, малаток, шыла, абцугі, адвёртка). Правілы бяспечнай работы з кожным інструментам. Арганізацыя рабочага месца і правілы бяспечнай работы на занятках з драўнінай. Агульныя звесткі аб прафесіях, па якіх праводзіцца навучанне ў школьнай сталярнай майстэрні.

**Вырабы.** Мадэлі мэблі і транспарту са злучэннем дэталей на цвіках і шрубах.

### РАБОТА З МЕТАЛАКАНСТРУКТАРАМ

**Аперацыі і прыёмы працы.** Злучэнне дэталей крапежнай парай (шрубка, гайка). Замацоўванне злучэнняў інструментамі. Разбіранне злучэнняў.

**Экскурсія** ў школьную слясарную майстэрню.

**Пазнавальныя звесткі.** Назвы і канструктыўныя асаблівасці дэталей набору металаканструктара. Інструменты набору металаканструктара. Арганізацыя рабочага месца і правілы бяспечнай работы на занятках з металаканструктарам. Агульныя звесткі аб прафесіі слесара-зборшчыка.

**Вырабы.** Мадэлі з трох (трохвугольнік), чатырох (квадрат, лесвіца, табурэт і г. д.) і больш злучэнняў.

### ДОГЛЯД СВОЙСКАЙ ЖЫВЁЛЫ

**Практычныя работы.** Кармленне курэй, качак, гусей, індычак.

**Пазнавальныя звесткі.** Назвы і знешнія адметныя адзнакі свойскіх птушак, асаблівасці іх кармлення. Патрабаванні санітарыі, гігіены і бяспекі выконваемых работ.

## БАЗАВЫ КАМПАНЕНТ

## V КЛАС

### РАБОТА З ПАПЕРАЙ І КАРДОНАМ

#### Аплікацыя

**Пазнавальныя звесткі.** Адзінкі вымярэння даўжыні (метр, сантыметр, міліметр). Прызначэнне і будова вымяральнай лінейкі і вугольніка. Асноўныя віды клею для работы з паперай і яго ўласцівасці. Пэндзлікі для клею. Разнастайнасць відаў папе-

ры і іх прымяненне. Паслядоўнасць разметкі прамавугольных дэталей з дапамогай лінейкі і вугольніка. Правілы нанясення клею пры наклейванні аплікатыўных дэталей.

**Практычныя работы.** Разметка дэталей па шаблонах. Разметка дэталей з дапамогай лінейкі і вугольніка. Вырэзванне дэталей нажніцамі па лініях разметкі. Папярэдняе размяшчэнне дэталей на месцы наклейвання. Наклейванне аплікатыўных дэталей.

**Вырабы.** Закладкі і паштоўкі, упрыгожаныя геаметрычным арнаментам.

### Аб'ёмныя вырабы з кардону

**Пазнавальныя звесткі.** Віды і ўласцівасці кардону. Паняцце разгорткі. Чарцёж, эскіз, тэхнічны рысунак. Умоўныя лініі і іх абазначэнне. Прызначэнне і будова фальцлінейкі. Правілы бяспечнай работы пры выкананні рыцоўкі.

**Практычныя работы.** Разметка загатоўкі (ліста кардону). Разметка аплікатыўных дэталей. Вырэзванне разгорткі. Рыцоўка разгорткі. Выкананне надрэзаў. Вырэзванне аплікатыўных дэталей. Адгінанне частак каробкі. Склейванне клапанаў. Наклейванне аплікатыўных дэталей.

**Вырабы.** Адкрытыя каробкі.

### Пакеты і канверты

**Пазнавальныя звесткі.** Разнастайнасць пакетаў і канвертаў і сітуацыі іх прымянення. Віды паперы для вырабу пакетаў і канвертаў. Паняцце фальцоўкі. Гладзілка і яе прызначэнне.

**Практычныя работы.** Выраб пакетаў і канвертаў розных канструкцый з гатовых і самастойна выкананых разгортак.

**Вырабы.** Пакеты і канверты розных канструкцый і памераў.

## РАБОТА З ТЭКСТЫЛЬНЫМІ МАТЭРЫЯЛАМІ

### Матэрыялазнаўства

**Пазнавальныя звесткі.** Віды тэкстыльных валокнаў. Кароткія звесткі пра выраб тканіны. Аснова і уток тканіны. Пруг тканіны. Левы і правы бок тканіны. Шырыня тканіны. Палатнянае перапляценне. Народнае ткацтва Беларусі.

**Лабараторна-практычныя работы:**

1. Вызначэнне левага і правага боку тканіны.
2. Выраб узораў палатнянага перапляцення.

### Шыццё па гатовым кроі

**Пазнавальныя звесткі.** Звесткі пра тканіну для рэкамендаваных вырабаў. Ніткі для шыцця і вышывання.

Арганізацыя рабочага месца і правілы бяспечнай работы пры шыцці і вышыванні.

Ручное сшывальнае шво, шво ўпадгінку з закрытым зрэзам, абкідальнае (пяцельнае) шво, іх прызначэнне і тэхналогіі выканання. Швы для ўпрыгожвання (сцяблініcтае, крыжападобнае), іх знешні выгляд і тэхналогія выканання.

**Практыкаванні** ў выкананні ручных швоў на ўзорах.

**Практычныя работы.** Шыццё вырабаў з прымяненнем сшывальнага шва, шва ўпадгінку з закрытым зрэзам, абкідальнага (пяцельнага) шва. Выкананне на вырабе швоў для ўпрыгожвання.

**Вырабы.** Падушачка для іголак, мяшэчак для захоўвання вырабаў.

### Стварэнне вырабаў па выкрайцы

**Пазнавальныя звесткі.** Чарцёж швейнага вырабу. Выкрайка. Інструменты і матэрыялы, неабходныя для выканання выкраек. Асноўныя і дапаможныя лініі чарцяжа выкрайкі. Абазначэнне памераў.

Звесткі пра тканіну для рэкамендаваных вырабаў. Швы для ўпрыгожвання (тамбурны), знешні выгляд і тэхналогія выканання.

Уключэнне і выключэнне электрапраса, правілы бяспечнай працы пры рабоце з электрапрасам.

**Практыкаванні** ў выкананні ручных швоў на ўзорах.

**Практычныя работы.** Выраб чарцяжоў квадратнай і прамавугольнай формы. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Раскрой тканіны па гатовай і самастойна зробленай выкрайцы. Раскрой вырабу па выцягнутых нітках. Выкананне на вырабе швоў для ўпрыгожвання. Выкананне махры. Прасаванне вырабу.

**Вырабы.** Сурвэтка, ручнік, закладка.

### Рамонт адзення

**Пазнавальныя звесткі.** Віды работ па рамонце адзення: прышыванне гузікаў, прышыванне вешалкі, рамонт па распоратым шве і разарваным месцы, накладанне латы, цыраванне.

Віды гузікаў і спосабы іх прышывання. Швы, якія прымяняюцца для прышывання вешалкі, рамонту па распоратым шве і разарваным месцы, накладання латы.

**Практычныя работы.** Падбор гузікаў і нітак, падрыхтоўка бялізны і адзення да рамонту. Прышыванне гузікаў. Падбор і прышыванне вешалкі. Рамонт па распоратым шве і разарваным месцы (складванне тканіны па распоратым шве і разарваным месцы; сшыванне шва ручным сшывальным швом; злучэнне краёў разрыву косым абкідальным швом; прасаванне).

### Машыназнаўства*

**Тэхнічныя звесткі.** Прызначэнне і марка нажной швейнай машыны. Прывадны, перадатачны і рабочы механізмы, іх узаемадзеянне.

Арганізацыя рабочага месца, рабочая поза і правілы бяспечнай працы пры рабоце на нажной швейнай машыне.

Паслядоўнасць падрыхтоўкі машыны да работы. Сшывальныя швы: у запрасоўку, у адпрасоўку. Шво ўпадгінку з закрытым зрэзам. Умовы выканання роўнай строчкі.

**Практыкаванні.** Знешні агляд машыны. Работа на халастым ходзе. Падрыхтоўка машыны да работы. Намотванне ніткі на шпульку, прыладжванне верхняй і ніжняй нітак. Строчка па прамых і закругленых лініях з ніткай па паперы і тканіне. Выкананне ўзораў сшывальнага шва і шва ўпадгінку з закрытым зрэзам.

### Шыццё на нажной швейнай машыне

**Пазнавальныя звесткі.** Звесткі пра тканіну для рэкамендаваных вырабаў. Канструкцыя выконваемых вырабаў.

**Практычныя работы.** Раскрой тканіны па гатовай выкрайцы. Шыццё вырабаў з прымяненнем сшывальнага шва і шва ўпадгінку з закрытым зрэзам. Прасаванне вырабаў.

**Вырабы.** Галаўная хустка. Павязка дзяжурнага.

## РАБОТА З МЯККІМ ДРОТАМ

**Тэхнічныя звесткі.** Правілы тэхнікі бяспекі і бяспечнай працы ў слясарнай майстэрні. Абсталяванне і арганізацыя рабочага месца слесара. Прызначэнне і будова слясарных ціскоў. Правілы работы са слясарнымі ціскамі.

---

* Вывучэнне тэм «Машыназнаўства» і «Шыццё на нажной швейнай машыне» рэкамендуецца для дзяўчынак, якія вучацца ў класах інтэграванага навучання.

Алюмініевы, медны і стальны дрот. Агульныя і адметныя адзнакі дроту з розных матэрыялаў. Прымяненне дроту ў паўсядзённым жыцці і ў народнай гаспадарцы. Інструменты і прылады для работы з дротам (лінейка металічная, пласкагубцы, вастрагубцы, круглагубцы, апраўка), іх прызначэнне, будова, правілы бяспечнага прымянення. Правілы захоўвання матэрыялаў і інструментаў.

Міліметр — асноўная мера даўжыні ў слясарнай справе.

**Практычныя работы.** Разметка загатовак з дроту. Адкусванне дроту кусачкамі. Выгінанне мяккага дроту рукамі. Навіванне спіралі на апраўкі. Выгінанне дроту пласкагубцамі. Выпростванне дроту. Злучэнне канцоў дроту скручваннем.

**Вырабы.** Геаметрычныя фігуры, ланцужок, контурныя выявы звяроў і птушак.

## РАБОТА З ДРАЎНІНАЙ

### Пілаванне ў стусле з абмежавальнікам

**Тэхнічныя звесткі.** Абсталяванне сталярнай майстэрні. Правілы тэхнікі бяспекі і бяспечнай працы ў сталярнай майстэрні. Прызначэнне і будова сталярнага варштата. Размяшчэнне на варштаце інструментаў і матэрыялаў. Захоўванне інструментаў і рабочага адзення.

Пароды драўніны і іх уласцівасці. Матэрыялы з драўніны.

Інструменты і прыстасаванні для пілавання ў стусле: стусла з абмежавальнікам, нажоўка, лінейка; іх прызначэнне і будова. Правілы бяспечнай работы пры пілаванні і шліфаванні.

**Практычныя работы.** Замацоўванне стусла ў клямары варштата. Пілаванне ў стусле з абмежавальнікам. Праверка прамалінейнасці адпілаванай дэталі. Зачыстка дэталей шліфавальнай шкуркай.

**Вырабы.** Лялечны будаўнічы матэрыял з гатовых брускоў.

### Выпілоўванне лобзікам

**Тэхнічныя звесткі.** Лобзік, яго прызначэнне і будова. Выпіловачны столік, яго прымацоўванне да варштата. Правілы бяспечнай работы з лобзікам.

Шыла, яго прызначэнне, будова, правілы бяспечнай работы. Спіральныя свердлы. Корба, яе прызначэнне і будова. Правілы бяспечнай работы пры свідраванні.

Капіравальная папера. Правілы пераводу рысунка праз капіравальную паперу.

Фанера для выпілоўвання.

**Практычныя работы.** Падбор фанеры. Зачыстка фанеры шліфавальнай шкуркай. Перавод рысунка праз капіравальную паперу, намётка прыпуску. Прасвідроўванне дзірак ва ўнутраных контурах. Выпілоўванне ўнутраных контураў. Выпілоўванне на вонкавых контурах. Аздабленне вырабу.

**Вырабы.** Літары для стэндаў, фігуркі звяроў і птушак.

### Выпальванне

**Тэхнічныя звесткі.** Будова і прымяненне прыбора для выпальвання. Правілы бяспечнай работы з электрычным прыборам для выпальвання. Правілы бяспечнай работы з лакам. Арганізацыя рабочага месца пры выпальванні.

**Практычныя работы.** Зачыстка асновы. Выбар і апрацоўка капіравальнай паперы (зняцце лішняй фарбы), перавод рысунка. Выпальванне. Размалёўванне. Пакрыванне лакам.

**Вырабы.** Літары для стэндаў, фігуркі звяроў і птушак.

## АПРАЦОЎКА ХАРЧОВЫХ ПРАДУКТАЎ*

### Гігіена харчавання

**Пазнавальныя звесткі.** Арганізацыя, парадак работы і правілы тэхнікі бяспекі ў кабінеце. Агульныя патрабаванні да якасці прадуктаў харчавання і іх захоўвання. Неабходнасць мыцця гародніны, садавіны, ягад перад ужываннем у ежу.

Кухня і яе абсталяванне. Агульныя звесткі пра гігіену памяшкання і абсталявання кухні. Спецадзенне. Правілы асабістай гігіены пры прыгатаванні ежы. Арганізацыя рабочага месца пры рабоце з харчовымі прадуктамі. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні і правілы бяспечнай працы ў працэсе прыгатавання ежы.

**Практычныя работы.** Мыццё садавіны, гародніны.

**Экскурсія** ў цэх школьнага харчаблока.

**Назіранні** за захоўваннем прадуктаў харчавання ў школьным харчаблоку.

---

* Змест навучання па дадзеным раздзеле ўдакладняецца з улікам падрыхтаванасці вучняў па сацыяльна-бытавой арыенціроўцы і прадмеце «Чалавек і свет».

### Прадукты харчавання

**Пазнавальныя звесткі.** Значэнне харчавання. Асноўныя прадукты харчавання. Рацыянальнае харчаванне — умова захавання здароўя. Агульныя правілы захоўвання прадуктаў харчавання.

Харчовая вартасць хлеба, беражлівыя адносіны да хлеба. Выкарыстанне хлебных адходаў. Бяспечнасць работы пры наразанні хлеба ўручную.

**Практычныя работы.** Прыгатаванне паніровачных сухароў з сушанага хлеба. Наразанне хлеба ўручную.

### Прыгатаванне гарачых напіткаў

**Пазнавальныя звесткі.** Гарачыя напіткі (чай, какава, кава), іх значэнне ў харчаванні чалавека і спосабы прыгатавання. Арганізацыя рабочага месца і правілы бяспечнай працы пры прыгатаванні гарачых напіткаў.

**Практычныя работы.** Заварванне чаю. Прыгатаванне какавы з какававага парашку. Размолванне кававых зярнят і прыгатаванне кавы. Мыццё чайнага посуду.

### Прыгатаванне бутэрбродаў

**Пазнавальныя звесткі.** Бутэрброды і іх віды. Тэхналогія прыгатавання і афармлення бутэрбродаў. Арганізацыя рабочага месца і правілы бяспечнай працы пры прыгатаванні бутэрбродаў.

**Практычныя работы.** Прыгатаванне адкрытых і закрытых, простых і камбінаваных бутэрбродаў. Мыццё посуду.

## РАБОТА Ў ГАЛІНЕ РАСЛІНАВОДСТВА І ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

### Агародніцтва

**Пазнавальныя звесткі.** Гародніна як прадукт харчавання. Тэрміны ўборкі гародніны, значэнне іх выканання. Інвентар для ўборкі гародніны, правілы бяспечнай работы з ім. Правілы ўборкі, сартавання і захоўвання гародніны.

Значэнне асенняй і вясенняй апрацоўкі глебы. Асаблівасці асенняй і вясенняй апрацоўкі глебы для вырошчвання агароднінных культур.

**Практычныя работы.** Уборка бульбы, буракоў, морквы і іншых агароднінных культур. Уборка пасляўборачных рэштак. Рыхленне глебы. Сяўба агароднінных культур.

### Жывёлагадоўля

**Пазнавальныя звесткі.** Сельскагаспадарчая жывёлагадоўля. Галіны жывёлагадоўлі. Прафесіі работнікаў жывёлагадоўлі.

Жывёлагадоўчыя памяшканні. Агульныя правілы догляду жывёлы. Інвентар для прыбірання жывёлагадоўчых памяшканняў, правілы іх прыбірання.

Асаблівасці кармлення жывёлы, якая ўтрымліваецца ў прышкольнай гаспадарцы. Патрабаванні санітарыі, гігіены і бяспечнай працы ў жывёлагадоўчых памяшканнях.

**Практычныя работы.** Удзел у кармленні свойскіх птушак (курэй, качак, гусей, індычак).

## ТЭХНІЧНАЯ ГРАФІКА

**Пазнавальныя звесткі.** Спосабы стварэння вобраза прадметаў: мастацкі малюнак і тэхнічны рысунак, фатаграфія, чарцёж; іх адрозненні.

Міліметр як асноўная адзінка вымярэння памеру на чарцяжах. Лініі чарцяжа.

**Практыкаванні** ў чытанні чарцяжоў плоскіх геаметрычных фігур, тэхнічных рысункаў разнастайных прадметаў.

### УМЕННІ

Арыенціроўка ў новых заданнях з дапамогай настаўніка, у заданнях, аналагічных тым, якія раней выконваліся, — самастойна або з нязначнай дапамогай. Выкарыстанне ў працэсе арыенціроўкі ў заданні знаёмых відаў тэхнічнай нагляднасці.

Планаванне работы ў групавой гутарцы. Выкарыстанне пры планаванні работы тэхналагічнай карты з дапамогай настаўніка і самастойна.

Самастойная арганізацыя рабочага месца.

Самастойнае выкананне знаёмых працоўных прыёмаў і тэхналагічных аперацый.

Бягучы і выніковы кантроль з дапамогай настаўніка і самастойна. Выкарыстанне пры кантролі памераў кантрольна-вымяральных інструментаў (лінейкі).

Славесная справаздача аб выкананай рабоце з дапамогай настаўніка і самастойна.

# ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Прадмет «Фізічная культура і здароўе» прызначаны ствараць умовы для нармальнага фізічнага развіцця, захавання і ўмацавання фізічнага і псіхічнага здароўя вучняў, выконваючы пры гэтым адукацыйную, аздараўленчую, карэкцыйную і выхаваўчую функцыі.

Аснову зместу прадмета складае фізічнае выхаванне — педагагічны працэс, накіраваны на фізічнае развіццё, навучанне ведам, рухальным уменням, навыкам, спосабам дзеяння, неабходным чалавеку для самавыхавання, аздараўлення, фізічнага, інтэлектуальнага і духоўнага самаўдасканальвання, фарміравання здаровага ладу жыцця.

*Спецыфіка фізічнага выхавання* дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю заключаецца ў тым, што задачы ўмацавання здароўя і загартоўвання арганізма, фізічнага развіцця, фарміравання ўменняў выконваць жыццёва важныя рухі, развіцця асноўных фізічных якасцей разглядаюцца ў адзінстве з карэкцыйнымі задачамі пераадолення ці аслаблення адхіленняў у фізічным развіцці і пазнавальнай дзейнасці вучняў.

*Адукацыйная накіраванасць* вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» аказвае фарміруючы ўплыў на светапогляд вучняў, інтэлектуальнае, псіхічнае, псіхафізічнае развіццё, маральна-валявыя і іншыя якасці асобы. Узмацненне адукацыйнай накіраванасці дасягаецца ў выніку вылучэння раздзелаў «Асновы ведаў», «Рухальныя ўменні і навыкі», «Развіццё фізічных якасцей».

Праграмны матэрыял насычаны рухавымі гульнямі, гульнёвымі практыкаваннямі, эстафетамі. Для развіцця фізічных якасцей ва ўсіх класах удзяляецца да 30 % вучэбнага часу на кожным уроку.

Выніковая адзнака за чвэрць і год выстаўляецца па дзесяцібальнай шкале (дадат. 1). Вучэбныя дасягненні ацэньваюцца

на падставе бягучых адзнак, якія адлюстроўваюць узровень ведаў, уменняў, навыкаў, адносін да заняткаў. Умовай атрымання станоўчай адзнакі за год па фізічнай падрыхтаванасці з'яўляецца ўдзел дзяцей у выкананні ўсіх вучэбных нарматываў.

У праграму ўключаны нарматывы ацэнкі ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці вучняў (дадат. 2, 3). Узровень фізічнай падрыхтаванасці не ўплывае на выніковую адзнаку за чвэрць і год. Вынікі тэстаў выкарыстоўваюцца выключна для матывацыі вучэбнай дзейнасці, індывідуалізацыі вучэбнага працэсу і для карэкцыі зместу фізічнага выхавання. Тэсціраванне праводзіцца 2 разы на год (у верасні і маі).

Якасць навучальна-выхаваўчага працэсу па прадмеце «Фізічная культура і здароўе» ў значнай меры залежыць ад правільнага планавання. Асноўнымі дакументамі планавання з'яўляюцца гадавы план-графік засваення праграмнага матэрыялу і дакументы паўрочнага планавання (паўрочныя планы-графікі па чвэрцях і планы-канспекты ўрокаў). У паўрочныя планы-графікі па чвэрцях уключаюцца ўсе веды, рухальныя ўменні і навыкі, выкладзеныя ў праграме. Пры планаванні паслядоўнасць засваення ведаў, уменняў і навыкаў, час, затрачаны на вывучэнне асобных рухальных дзеянняў, вызначае настаўнік фізічнай культуры і здароўя з улікам полу, рухальнай падрыхтаванасці, узроставага фактару, матэрыяльнай базы і іншых фактараў.

Урокі фізічнай культуры і здароўя маюць на ўвазе фарміраванне ў вучняў ведаў правілаў тэхнікі бяспекі пры карыстанні спартыўным інвентаром і абсталяваннем, захаванне санітарна-гігіенічных патрабаванняў у месцах заняткаў, стварэнне ўмоў для папярэджання траўматызму, наяўнасць спартыўнай формы і абутку.

Урокі праводзяцца з інтэрвалам у адзін дзень, пажадана пачынаць з другога ці трэцяга ўрока. Заняткі рэкамендуецца праводзіць па магчымасці на свежым паветры, што спрыяе загартоўванню арганізма, прафілактыцы захворванняў, павышае эфектыўнасць урока, дазваляе настаўніку выкарыстоўваць шырокі арсенал сродкаў і метадаў выхавання і развіцця вучняў. Зімой урокі на адкрытым паветры праводзяцца ў ціхае надвор'е ці пры слабым ветры пры тэмпературы не ніжэй як −10 °С.

На падставе даных аб стане здароўя і фізічнага развіцця вучняў размяркоўваюць для заняткаў фізічнай культурай у асноўную, падрыхтоўчую і спецыяльныя медыцынскія групы.

Вучні *асноўнай групы* дапускаюцца да заняткаў па праграме фізічнай культуры і здароўя, у спартыўных секцыях і да ўдзелу ў спартыўных спаборніцтвах.

Вучні *падрыхтоўчай групы* займаюцца на ўроках фізічнай культуры ў складзе класа пры ўмове больш строгага індывідуальнага падыходу. Для вучняў дадзенай групы рэкамендуецца праводзіць дадатковыя заняткі па агульнай фізічнай падрыхтоўцы 1 ці 2 разы на тыдзень па 45 (35) мінут у пазаўрочны час. Асноўны змест такіх заняткаў складаюць вучэбны матэрыял праграмы і спецыяльныя практыкаванні, распрацаваныя настаўнікам з улікам індывідуальных асаблівасцей кожнага вучня.

Для вучняў, у якіх ёсць значныя адхіленні ў стане здароўя пастаяннага ці часовага характару, якія патрабуюць абмежавання фізічных нагрузак, але дапускаюць вучэбныя заняткі па фізічнай культуры і здароўі, школы арганізуюць *спецыяльныя медыцынскія групы (СМГ)*. Заняткі ў гэтых групах павінны праводзіць настаўнікі, якія прайшлі спецыяльную падрыхтоўку.

Перавод з адной медыцынскай групы ў іншую ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзеючымі дакументамі. Вынікі работы па аздараўленні і фізічнай падрыхтоўцы вучняў штогод абмяркоўваюцца на педагагічным савеце школы.

Рэжым вучэбнага дня, насычаны ўсімі формамі фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў, з’яўляецца пэўным фактарам замацавання здароўя вучняў. У арганізацыі дадзеных мерапрыемстваў з вучнямі прымаюць удзел усе настаўнікі, выхавацелі і адміністрацыя школы.

Штодзённыя заняткі ранішняй гімнастыкай фарміруюць у вучняў звычку да сістэматычнага выканання фізічных практыкаванняў, садзейнічаюць павышэнню агульнай і разумовай працаздольнасці. У іх развіваюцца такія якасці, як арганізаванасць, дысцыплінаванасць, здольнасць да выканання калектыўных дзеянняў і да т. п. Комплексы практыкаванняў складае і ўзгадняе з урачом настаўнік фізкультуры.

Ранішняя гімнастыка праводзіцца на працягу 8—10 мінут. Комплекс складзены з 6—8 практыкаванняў. Рэкамендуецца ўключаць у комплексы практыкаванні для паставы, дыхання, карэкцыі тыповых недахопаў маторыкі, развіцця ўвагі і гнуткасці суставаў. Ранішнюю гімнастыку праводзіць выхавацель ці настаўнік фізкультуры ў прысутнасці выхавацеля.

Асаблівасці фізічнага і псіхічнага развіцця вучняў прадугледжваюць арганізацыю кароткачасовага адпачынку, які знімае

застойныя з'явы, выкліканыя знаходжаннем у адной позе. Перапынак у рабоце неабходны для органаў зроку, слыху, мышцаў тулава (асабліва спіны) і дробных мышцаў кісцей рук. Комплексы практыкаванняў падбіраюцца такім чынам, каб актыўна адпачывалі часткі цела і групы мышцаў, найбольш стомленыя ў працэсе работы ці ў выпадку знаходжання ў адной позе.

Фізічныя практыкаванні і гульні на дынамічных пераменах арганізуюцца настаўнікам фізічнай культуры пры дапамозе настаўнікаў-прадметнікаў. Праводзяцца на адкрытым паветры. Дынамічная перамена праводзіцца ў гульнёвай форме з улікам полу, узросту, а таксама зацікаўленасці дзяцей. У змест перамены ўваходзяць агульнаразвіццёвыя практыкаванні, рухавыя гульні, эстафеты, элементы спартыўных гульняў, скачкі са скакалкай, катанне на лыжах, санках, самакатах, самастойныя гульні дзяцей. Пажадана, каб гэта былі гульні і практыкаванні, якія вывучаліся на ўроках фізічнай культуры.

Штодзённыя фізкультурныя заняткі ў групах («Часы здароўя») праводзяцца выхавацелем або спецыялістам з адпаведнай адукацыяй. Змест заняткаў складаюць агульнаразвіццёвыя практыкаванні, практыкаванні па бегу і скачках, кіданні, катанні на лыжах і каньках, рухавыя гульні і конкурсы, гульнёвыя эстафеты і прагулкі, выкананне дамашніх заданняў, спартыўныя спаборніцтвы. Заняткі праводзяцца, як правіла, на адкрытым паветры. У малодшых класах 30—35 % часу адводзіцца свабодным гульням і забавам.

**Прыкладнае размеркаванне вучэбнага часу па раздзелах праграмнага матэрыялу**

| Раздзелы | Класы | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | I | II | III | IV | V |
| **Асновы ведаў** | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 |
| **Рухальныя ўменні і навыкі** | | | | | |
| Страявыя практыкаванні | 6 | 4 | 4 | 4 | 3 |
| Агульнаразвіццёвыя і карыгіруючыя практыкаванні | 16 | 12 | 12 | 12 | 12 |
| Хадзьба | 4 | 3 | 3 | 3 | 2 |
| Бег | 9 | 9 | 9 | 9 | 10 |

| Раздзелы | Класы | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | I | II | III | IV | V |
| Скачкі | 9 | 9 | 9 | 9 | 10 |
| Кіданні | 9 | 9 | 9 | 9 | 9 |
| Лажанне і перапаўзанне | 4 | 3 | 3 | 3 | 2 |
| Практыкаванні ў раўнавазе | 4 | 3 | 3 | 3 | 2 |
| Школа мяча | 9 | 9 | 9 | 9 | 10 |
| Перамяшчэнне на лыжах | 9 | 9 | 9 | 9 | 10 |
| **Развіццё фізічных якасцей** | 15 | 20 | 20 | 20 | 20 |
| Кантроль узроўню фізічнай падрыхтаванасці, тэсціраванне | 4 | 8 | 8 | 8 | 8 |
| **Усяго** | 102 | 102 | 102 | 102 | 102 |

З а ў в а г і: 1. У залежнасці ад умоў і аб'ектыўнай неабходнасці настаўнік можа змяніць аб'ём вучэбнага часу на розныя раздзелы праграмнага матэрыялу.

2. Веды фарміруюцца ў форме кароткіх размоў па ходзе фарміравання рухальных уменняў і навыкаў, развіцця фізічных якасцей.

3. Рухальныя ўменні і навыкі вывучаюцца і ўдасканальваюцца на кожным уроку, а таксама пры правядзенні рухавых гульняў і гульнёвых заданняў. Гульні настаўнік можа выкарыстоўваць выбарачна, у залежнасці ад умоў заняткаў і іншых фактараў. Можна дадаткова выкарыстоўваць фальклорныя гульні і забавы.

# П Р А Г Р А М Ы

## I КЛАС

### АСНОВЫ ВЕДАЎ

Правілы бяспечных паводзін у месцах заняткаў па прадмеце «Фізічная культура і здароўе» (на спартыўнай пляцоўцы, у спартыўнай зале, на лыжні, на вадаёмах). Правілы бяспечнага перамяшчэння па тратуарах і скрыжаваннях да месца заняткаў. Правілы бяспечных паводзін у дварах, на гульнёвых пляцоўках у пазаўрочны час. Значэнне заняткаў фізічнымі практыкаван-

нямі ў рэжыме дня для здароўя, добрага настрою, адпачынку. Гігіенічныя патрабаванні да адзення на ўроках фізічнай культуры і здароўя. Здаровы рэжым дня для вучняў I класа і правілы яго выканання.

## РУХАЛЬНЫЯ ЎМЕННІ І НАВЫКІ

**Страявыя практыкаванні:** асноўная стойка; пастраенне парамі, тройкамі, пастраенне ў шарэнгу па чарзе; пастраенне ў калону па адным і раўненне ў патыліцу; перастраенне з шарэнгі ў калону паваротам направа; пастраенне ў кола па загадзя ўстаноўленых арыенцірах; размыканне на шырыню паднятых у бакі рук улева ад накіроўваючага; павароты на месцы пераступаннем і скачком.

***Гульні на ўвагу і для падрыхтоўкі да строю:*** «Будзь напагатове», «Забаронены рух», «Рабі, як я», «Хуткае спыненне», «Ці ўсе на месцы», «Сачы за сігналам», «Па месцах», «Чыя каманда хутчэй пастроіцца па тройках».

З а ў в а г а. У пачатку вучэбнага года вучні выконваюць не каманды, а распараджэнні.

**Агульнаразвіццёвыя і карыгіруючыя практыкаванні:** асноўныя палажэнні рук, рухі рукамі (уперад, уверх, у бакі, на пояс, да плячэй, перад грудзьмі, за галаву, назад); асноўныя палажэнні кісцей рук (кісці ў кулаку, расслабленыя, апушчаныя, паднятыя, далонямі ўперад, назад, наверх); асноўныя рухі тулавам і нагамі (нахілы ў бакі, уперад, назад; махі нагамі ўперад, назад, у бакі); практыкаванні для фарміравання правільнай паставы і прафілактыкі плоскаступнёвасці (хадзьба на месцы, каля сценкі, з прадметам на галаве, седзячы на гімнастычнай лаўцы і падлозе); хадзьба па рэйцы шырынёй 5—7 см (якая ляжыць на падлозе) прыстаўнымі крокамі, абапіраючыся на яе ступнямі; комплексы практыкаванняў без прадметаў і з прадметамі (гімнастычнымі палкамі, флажкамі, малымі і вялікімі мячамі). Дыхальныя практыкаванні 1:2. Усе практыкаванні выконваюцца па прынцыпе «Рабі, як я».

***Гульні:*** «Вырасцем вялікія», «Паглядзі ў акенца», «Прыдумай сам», «Ванька-ўстанька», «Асілкі», «Спружынка», «Ваўчок», «Скакунок», «Хуткі цягнік».

**Хадзьба:** з захаваннем правільнай паставы; па разметках кароткімі і сярэднімі крокамі (на насках, на пятках, з падыман-

нем каленяў); па лініі; пераступаючы цераз невысокія перашкоды; з імітацыяй рухаў птушак і жывёл; у калоне па адным і ў парах, узяўшыся за рукі, за настаўнікам; з рознымі палажэннямі і рухамі рук (на пояс, за галаву, на галаву).

***Гульні:*** «Пераняcі на галаве», «Хто як ходзіць», «Стройныя бярозкі», «Хадзьба з воплескамі», «Хадзьба пад уласнае лічэнне».

**Бег:** у павольным тэмпе з захаваннем правільнай паставы за настаўнікам; у чаргаванні з хадзьбой; са змяненнем напрамку за настаўнікам; на хуткасць па «калідоры» шырынёй 40—50 см; на хуткасць (адлегласць да 20 м), парамі і тройкамі; чаўночны бег 4×5 м.

***Гульні:*** «Выклік звяроў», «Прынясі мяч», «Памяняй кубікі на мяч», «Пераноска прадметаў», «На новае месца», «Эстафета з вяртаннем на ранейшае месца».

**Скачкі:** на адной і дзвюх нагах (на месцы, з перамяшчэннем наперад, у бакі, вакол мяча, з паваротамі); саскокванне з вышыні 15—20 см з мяккім прызямленнем; з месца цераз адну і дзве гімнастычныя палкі; у даўжыню з месца (цераз невялікую перашкоду вышынёй 5—10 см у руханні па арыенцірах).

***Гульні:*** «Саскоч у ваду», «Ручаёк», «Вераб'і і кошкі», «Саскоч і павярніся», «З кола ў кола», «Конкурсы скакуноў».

**Кіданні:** гумовага мяча дзвюма рукамі з-за галавы; тэніснага мяча ў сценку правай і левай рукой; тэніснага мяча ў гарызантальную і вертыкальную цэлі з розных зыходных становішчаў (стоячы на адным калене, на каленях, седзячы); тэніснага мяча ў падлогу на вышыню падскоку і ў сценку на далёкасць адскоку.

***Гульні:*** «Хто самы меткі», «Конкурсы кідальнікаў», «Збі мяч», «Рухомая цэль».

**Лажанне і перапаўзанне:** лажанне па гімнастычнай сценцы; поўзанне па падлозе і гарызантальнай гімнастычнай лаўцы вольным спосабам; падцягванне лежачы на жываце па гарызантальнай лаўцы; перапаўзанне цераз маты.

***Гульні:*** «Пажарныя», «Перапаўзі, не страць», «Хто хутчэй да кубіка».

**Практыкаванні ў раўнавазе.** *Статычнае:* стойка на насках, на пятках з самкнутымі ступнямі (на падлозе, на гімнастычнай лаўцы, на бруску 5×5 см); стойка на адной назе, другая нага сагнутая (на падлозе, на гімнастычнай лаўцы); стойка на насках з расплюшчанымі і заплюшчанымі вачыма (рукі на поясе і ў бакі).

*Дынамічнае:* хадзьба па начэрчанай на падлозе лініі; хадзьба па гімнастычнай лаўцы; хадзьба на насках па дошчачках, якія ляжаць на падлозе; хадзьба з пераступаннем цераз невысокія перашкоды.

***Гульні:*** «Пераправа», «Канатаходцы», «Хто даўжэй не зваліцца», «Не заставайся на падлозе».

**Школа мяча:** падкідванне мяча ўверх двюма рукамі і адной рукой і лоўля яго; перакочванне мяча ў парах у зыходным становішчы «седзячы на падлозе»; перакідванне мяча ў парах цераз нацягнутую вяроўку на невялікай вышыні; падкідванне мяча двюма рукамі ўверх, даць мячу ўпасці і пасля адскоку ад падлогі злавіць яго; перадача мяча ў калоне злева і справа двюма рукамі.

***Гульні:*** «Мяч вядучаму», «Чыя пара большая», «Эстафеты з перадачай мяча ў шарэнзе, калоне», «Мяч над галавой».

**Перамяшчэнне на лыжах:** выкананне каманд: «На лыжы станавіся!», «Лыжы зняць!»; стойкі лыжніка (асноўная, высокая, нізкая); вяртанне ў зыходнае становішча пасля падзення; пярэдні ход; ступаючы крок без палак; перамяшчэнне на лыжах з даступнай для кожнага вучня хуткасцю.

***Гульні:*** «Шырэй крок», «Па месцах», «Хто хутчэй».

## РАЗВІЦЦЁ ФІЗІЧНЫХ ЯКАСЦЕЙ

У малодшых класах фізічныя якасці на ўроках фізічнай культуры і здароўя развіваюцца ў працэсе навучання рухавым уменням і навыкам, а таксама пры правядзенні рухавых гульняў, выкананні спаборніцкіх заданняў.

**Развіццё хуткасці рухаў:** перабежкі з месца на месца па сігнале; бег са зменай хуткасці і па сігнале; бег з высокім падыманнем бядра на месцы і ў руху; бег на месцы з пераходам на паскарэнне па сігнале на адрэзку да 10 м; падскокі ў хуткім тэмпе на адной і дзвюх нагах.

**Развіццё каардынацыйных здольнасцей, спрыту:** хадзьба і бег дробнымі крокамі па начэрчаных арыенцірах; скачкі ў даўжыню з месца ў абазначаныя арыенціры (у кола, у квадрат); спалучэнне рухаў рукамі, нагамі, тулавам з лічэннем; эстафеты з перадачай мячоў, кубікаў, мяшэчкаў з пяском.

**Развіццё сілы:** лажанне па нахіленай гімнастычнай лаўцы; падыманне тулава з зыходнага становішча «лежачы на спіне,

рукі складзены накрыж на грудзях»; віс на сагнутых руках; падцягванне ў вісе стоячы; прысяданні на дзвюх нагах.

**Развіццё агульнай вынослівасці:** хадзьба ў сярэднім і хуткім тэмпе (адлегласць да 300 м); перамяшчэнне на лыжах з даступнай для кожнага вучня хуткасцю (адлегласць да 500 м); бег у павольным тэмпе (адлегласць да 300 м) за настаўнікам.

**Рухавыя гульні** для развіцця фізічных якасцей (гл. папярэдні раздзел праграмы).

## II КЛАС

### АСНОВЫ ВЕДАЎ

Правілы бяспечных паводзін у месцах заняткаў па прадмеце «Фізічная культура і здароўе». Правілы бяспечных паводзін падчас гульняў на двары, на прыродзе, каля вадаёмаў. Правілы бяспечных і культурных паводзін вучняў падчас наведвання спаборніцтваў, масавых спартыўна-забаўляльных мерапрыемстваў. Паняцце «здаровы лад жыцця» і яго складнікі. Станоўчы ўплыў здаровага ладу жыцця на настрой, поспехі ў вучобе. Правілы дыхання пры выкананні розных агульнаразвіццёвых практыкаванняў. Звесткі пра рэжым дня і асабістую гігіену для вучняў II класа (ранішняя гімнастыка, фізкультхвілінкі на ўроках пісьма і чытання, гігіена цела і да т. п.).

### РУХАЛЬНЫЯ ЎМЕННІ І НАВЫКІ

**Страявыя практыкаванні:** асноўная стойка, выкананне каманд: «Станавіся!», «Раўняйся!», «Смірна!», «Вольна!», «На месцы шагам марш!», «Клас, стой!»; павароты на месцы пераступаннем і скачком, пастраенне ў калону па адным, у шарэнгу, кола; перастраенне з калоны па адным у калону па два (па тры) па загадзя пастаўленых накіроўваючых; перастраенне з шарэнгі ў кола, узяўшыся за рукі; размыканне на выцягнутыя рукі ад накіроўваючага (у шарэнзе, у калоне).

***Гульні:*** «Па месцах», «Хуткае спыненне», «Слухай сігнал», «Хутка ў кола», «Святлафор».

**Агульнаразвіццёвыя і карыгіруючыя практыкаванні:** практыкаванні для мышцаў шыі, рук, тулава, ног; для фарміравання правільнай паставы і прафілактыкі плоскаступнёвасці (у руках, каля сценкі, седзячы і лежачы на падлозе, на гімнастычнай лаўцы); выпады ўперад, у бакі, з адначасовым падыманнем рук

у бакі; вярчэнне рукамі ў асноўнай стойцы; нахілы ўперад у становішчы седзячы, стоячы ногі паасобку і ногі разам; комплексы практыкаванняў без прадметаў і з прадметамі (гімнастычнымі палкамі, флажкамі, малымі і вялікімі мячамі, скакалкамі), седзячы на гімнастычнай лаўцы. Дыхальныя практыкаванні 1:2.

***Гульні:*** «Прыдумай сам», «Забаронены рух», «Фігуры», «Клас, стой!», «Вырасцем вялікія», «Скакунок».

**Хадзьба:** з захаваннем правільнай паставы; з мячом, гімнастычнай палкай, са скакалкай з рознымі становішчамі і рухамі рук; сярэднім і шырокім крокам (па лініі, па разметках, пераступаючы цераз невысокія перашкоды); у калоне па адным з выкананнем рухаў рукамі (на пояс, у бакі, за галаву, на галаву); на насках, на пятках — пад уласнае лічэнне і лічэнне настаўніка.

***Гульні:*** «Па сцежцы», «Хто як ходзіць», «Хто цішэй пройдзе», «Карлікі і веліканы».

**Бег:** дробны і з высокім падыманнем бядра; з высокага старту; па «калідоры» шырынёй 30—40 см; па кольцах, па начэрчанай лініі; тэхніка бегу па прамой; бег на хуткасць (адлегласць да 30 м); чаўночны бег 4×9 м, бег у павольным тэмпе, які чаргуецца з хадзьбой (адлегласць да 500 м) (дз, х).

***Гульні:*** «Эстафета з вяртаннем на ранейшае месца», «Перанясі мяч», «Пасадка бульбы», «Выклік нумароў», «Па месцах».

**Скачкі:** на адной і дзвюх нагах (на месцы, з перамяшчэннем наперад, назад, управа, улева); у даўжыню з месца штуршком дзвюх ног (уверх на маты, па арыенцірах, цераз нацягнутую рызінку, у цэлым); з вышыні да 30 см (на гімнастычную мату); цераз скакалку ногі разам; мнагаскокі на далёкасць (3—5 скачкоў у кроку з прызямленнем на абедзве нагі); скачкі ў даўжыню з малога разбегу (5—6 крокаў) з пераадоленнем гарызантальнай перашкоды «сагнуўшы ногі» (2 рызінкі на адлегласці 20—50 см).

***Гульні:*** «Саскоч у ваду», «Конкурсы са скачкамі», «Ручаёк», «Сарві яблык», «Скокні, павярніся», «Верабейкі».

**Кіданні:** набіўнога мяча (0,3 кг) дзвюма рукамі з-за галавы са становішча седзячы, ногі паасобку; тэніснага мяча з месца, стоячы тварам у напрамку кідання (цераз шнур, нацягнуты на вышыні 2—3 м, у сценку на далёкасць адскоку); тэніснага мяча, стоячы бокам у напрамку кідання, спосабам «з-за спіны цераз плячо»); кіданне мяча (0,15 кг) на далёкасць з месца; тэніснага мяча ў вертыкальную і гарызантальную цэлі.

***Гульні:*** «Чый адскок далейшы», «Рухомая цэль», «Паспей злавіць», «Збі кеглі», «Хто самы меткі», «Хто далей».

**Лажанне і перапаўзанне:** лажанне па нахіленай гімнастычнай лаўцы ва ўпоры стоячы на каленях рознайменным і аднайменным спосабамі; падцягванне лежачы на жываце па нахіленай гімнастычнай лаўцы; перапаўзанне цераз горку мат, цераз гімнастычную лаўку; лажанне па гімнастычнай сценцы ў гарызантальным і вертыкальным напрамках.

***Гульні:*** «З прадметам пад дугой», «Перапаўзі, не страць», «Хто хутчэй да флажка», «Хто самы спрытны».

**Практыкаванні ў раўнавазе:** стойка на дзвюх нагах і адной назе з заплюшчанымі вачыма (на падлозе, на гімнастычнай лаўцы, на кубіку 15×15 см) з рознымі становішчамі рук; хадзьба па гімнастычнай лаўцы, высока падымаючы бядро, цераз невысокія перашкоды; хадзьба па рэйцы, якая ляжыць на падлозе, з рознымі становішчамі рук; хадзьба па арыенцірах, начэрчаных на гімнастычнай лаўцы.

***Гульні:*** «Не зваліся», «Пераправа», «Спрытны вадзіцель», «Канатаходцы».

**Школа мяча:** кіданні і лоўля баскетбольнага мяча (кінуць уверх і злавіць); перадача, кіданні і лоўля мяча (па коле, у шарэнзе, у калоне злева і справа, цераз галаву); перадача і лоўля мяча ў парах (любым спосабам); вядзенне баскетбольнага мяча на месцы адной і дзвюма рукамі.

***Гульні:*** «Разгрузка агародніны», «Перадаў — садзіся», «Мяч суседу», «Чыя пара большая», «Мяч збоку», «Хуткаснае вядзенне мяча».

**Перамяшчэнне на лыжах:** стойкі лыжніка (асноўная, высокая, нізкая); павароты пераступаннем вакол пятак лыжаў на месцы; слізготны крок без палак і з палкамі; пад'ёмы і спускі з невялікіх схілаў; перамяшчэнне на лыжах у даступным для кожнага вучня тэмпе (адлегласць 500 м).

***Гульні:*** «Хто хутчэй надзене лыжы», «Па месцах», «Лыжныя рэйкі», «Перамена месцаў», «Сінія, чырвоныя палачкі».

## РАЗВІЦЦЁ ФІЗІЧНЫХ ЯКАСЦЕЙ

**Развіццё хуткасці:** бег на месцы ва ўпоры; бег дробнымі крокамі з максімальнай частатой рухаў на адрэзку да 15 м; бег з розных зыходных становішчаў: седзячы, седзячы спінай да фінішу; бег са зменай напрамку па сігнале.

**Развіццё сілы рук, ног, тулава, статычнай вынослівасці:** згібанне і разгібанне рук ва ўпоры аб сценку стоячы; кіданні і лоўля набіўнога мяча (0,5 кг); падцягванне ў вісе стоячы і ў вісе лежачы; віс на сагнутых руках (х) і падыманне тулава са становішча лежачы на спіне (дз); прысяданні на дзвюх нагах; двухкратны скачок у даўжыню з месца; перамяшчэнне ў паўпрыседзе і прыседзе на адрэзку да 10 м; скачкі з нагі на нагу на адрэзку да 10 м.

**Развіццё агульнай вынослівасці:** хадзьба ў раўнамерным і пераменным тэмпе (адлегласць да 800 м); бег у чаргаванні з хадзьбой (адлегласць да 800 м); хадзьба на лыжах слізготным крокам (адлегласць да 800 м).

# III КЛАС

## АСНОВЫ ВЕДАЎ

Правілы бяспечных паводзін у месцах арганізаваных і самастойных заняткаў (на спартыўнай пляцоўцы, у спартыўнай зале, на прыродзе, каля вадаёмаў). Правілы бяспечных і культурных паводзін і пазбяганне няшчасных выпадкаў падчас наведвання масавых спартыўных і забаўляльных мерапрыемстваў. Абавязкі дзяжурнага на ўроках фізічнай культуры і здароўя. Правілы дыхання пры выкананні фізічных практыкаванняў, значэнне дыхання для здароўя. Правільная пастава, яе значэнне для здароўя і добрай вучобы. Станоўчы ўплыў здаровага ладу жыцця на настрой, вучобу. Здаровы рэжым для вучня III класа і правілы яго захавання. Значэнне ранішняй гімнастыкі на адкрытым паветры для здароўя школьніка. Патрабаванні да адзення на занятках па фізічнай культуры на адкрытым паветры ў розныя поры года.

## РУХАЛЬНЫЯ ЎМЕННІ І НАВЫКІ

**Страявыя практыкаванні:** пастраенні ў шарэнгу і раўненне па насках па камандзе настаўніка; выкананне каманд «Станавіся!», «Раўняйся!», «Смірна!», «Вольна!», «Направа!», «Налева!»; размыканне і змыканне прыстаўнымі крокамі ад сярэдзіны; перастраенне з калоны па адным у калону па два цераз сярэдзіну (узяўшыся за рукі); перамяшчэнне ў калоне па адным з выкананнем каманды «У абход шагам марш!».

***Гульні:*** «Хутка ў шарэнгу», «Слухай каманду», «Дакладны паварот».

**Агульнаразвіццёвыя і карыгіруючыя практыкаванні:** выпады ўперад, у бакі; прысяданні з адначасовым падыманнем рук у бакі, уверх, уперад; практыкаванні для фарміравання правільнай паставы і прафілактыкі плоскаступнёвасці ў асноўнай стойцы, ва ўпоры стоячы на карачках, седзячы і лежачы на падлозе, з легкім грузам на галаве; практыкаванні на гнуткасць каля гімнастычнай сценкі і каля апоры; комплексы практыкаванняў без прадметаў і з прадметамі (малымі і вялікімі мячамі, флажкамі, скакалкамі, гімнастычнымі палкамі, седзячы на гімнастычнай лаўцы). Дыхальныя практыкаванні 1:3.

***Гульні:*** «Забаронены рух», «Святлафор», «Перамена месцаў», «Ластаўка», «Карусель».

**Хадзьба:** з захаваннем правільнай паставы (з мячом, гімнастычнай палкай, са скакалкай, з абручом); на насках, на пятках з рознымі становішчамі і рухамі рук, з захаваннем паставы; у паўпрыседзе; на знешнім баку ступні; высока падымаючы бядро; прыстаўнымі крокамі на падлозе і па гімнастычнай лаўцы; з намаганнем на крок левай нагі; якая чаргуецца з бегам і скачкамі.

***Гульні:*** «Прынясі на галаве», «Хто як ходзіць», «Стоп», «Па сцежцы», «Цераз купіны і пянькі», «Следапыт», «Па чужым следзе».

**Бег:** дробны бег і бег з высокім падыманнем бядра; са змяненнем хуткасці; з высокага старту па «калідоры» шырынёй 20—25 см; па кольцах, па начэрчанай лініі; тэхніка бегу па прамой; бег на хуткасць (адлегласць да 30 м); чаўночны бег 4×9 м, бег з даступнай для кожнага вучня хуткасцю (адлегласць 500 м) (дз, х) без уліку часу.

***Гульні:*** «Прынясі флажок», «Перанясі мяч», «Два старты», «Эстафета з чаўночным бегам», «Выклік нумароў», «Спартсмены-коннікі».

**Скачкі:** на месцы на адной назе з паваротамі; у глыбіню з вышыні 30—40 см; цераз кароткую скакалку; у даўжыню з месца; з нагі на нагу (адлегласць да 10 м); у даўжыню з малога разбегу спосабам «сагнуўшы ногі» (схема скачка).

***Гульні:*** «Саскоч і павярніся», «Бег са скачкамі цераз перашкоды», «Нажная цэль», «Вуда скачковая», «Салкі» (са скачкамі на адной назе), «Сарві яблык».

**Кіданні:** набіўнога мяча (0,5 кг) дзвюма рукамі (з-за галавы і знізу ўперад-уверх); тэніснага мяча з месца цераз перашкоду

вышынёй 3—4 м; у сценку на далёкасць адскоку з адлегласці 3—5 м; тэніснага мяча (0,15 кг) з месца спосабам «з-за спіны цераз плячо»; на далёкасць.

***Гульні:*** «Чый адскок далейшы», «Роўна ў цэль», «Хто далей».

**Лажанне, перапаўзанне:** лажанне па нахіленай гімнастычнай лаўцы ва ўпоры прысеўшы, ва ўпоры стоячы на каленях; падцягванне лежачы на жываце па нахіленай гімнастычнай лаўцы; перапаўзанне цераз гімнастычную лаўку; лажанне па гімнастычнай лаўцы з пералажаннем на гімнастычную сценку і злажаннем па ёй.

***Гульні:*** «З мячом пад перашкодай», «Перапаўзі, не страць», «Хто хутчэй да мяча».

**Практыкаванні ў раўнавазе:** стойка на рэйцы гімнастычнай лаўкі на дзвюх нагах і адной назе; хадзьба па гімнастычнай лаўцы з падкідваннем і лоўляй мяча; павароты кругом пры хадзьбе на насках па гімнастычнай лаўцы; хадзьба па рэйцы гімнастычнай лаўкі.

***Гульні:*** «Разыдзіся, не зваліся», «Канатаходзец», «Пераправа».

**Школа мяча:** перадача і лоўля мяча дзвюма рукамі на ўзроўні грудзей (на месцы ў парах, каля сценкі, у шарэнгах); вядзенне мяча на месцы і пры перамяшчэнні па прамой; вядзенне мяча на месцы на хуткасць у абмежаванай зоне (кола дыяметрам 1,5 м).

***Гульні:*** «Дзесяць перадач», «Хуткаснае вядзенне мяча», «Мяч суседу», «Перадаў — садзіся», «Паляўнічыя і качкі», «Мяч вядучаму».

**Перамяшчэнне на лыжах:** слізготны крок без палак і з палкамі; павароты пераступаннем вакол пятак і наскоў лыжаў на месцы; пад'ёмы і спускі з невялікіх схілаў; перамяшчэнне на лыжах у павольным і сярэднім тэмпе на адлегласць 500 м (дз, х).

***Гульні:*** «Хутка ў строй», «Па месцах», «За мной», «Данясенне», «Перамена месцаў».

## РАЗВІЦЦЁ ФІЗІЧНЫХ ЯКАСЦЕЙ

**Развіццё хуткасці:** паўторны бег з высокага старту па камандзе (адлегласць да 30 м); бег дробнымі крокамі (адлегласць 30—40 м) з максімальнай частатой рухаў; бег з розных зыходных становішчаў у хуткім тэмпе на адрэзках 10—15 м; бег з гандыкапам на адрэзках 20 м; бег са зменай напрамку па сігнале.

**Развіццё сілы рук, ног, тулава:** падцягванне ў вісе на руках; згібанне і разгібанне рук ва ўпоры лежачы на гімнастычнай лаўцы; віс на сагнутых руках (х), падыманне тулава са становішча лежачы на спіне (дз); кіданні і лоўля набіўнога мяча (0,5 кг) у парах і тройках; падыманне сагнутых ног у вісе спінай да гімнастычнай сценкі; скачкі ў глыбіню з вышыні да 30 см; скачкі са скакалкай.

**Развіццё вынослівасці:** хадзьба ў пераменным тэмпе (адлегласць да 1000 м); бег у павольным раўнамерным тэмпе (да 3 мін); перамяшчэнне на лыжах у павольным раўнамерным тэмпе на адлегласць да 1000 м.

# IV КЛАС

## АСНОВЫ ВЕДАЎ

Правілы бяспечных паводзін у месцах арганізаваных і самастойных заняткаў (на спартыўнай пляцоўцы, у спартыўнай зале, на прыродзе, каля вадаёмаў). Правілы беражлівых адносін да інвентара і абсталявання падчас арганізаваных і самастойных заняткаў. Правілы культурных, бяспечных паводзін для пазбягання няшчасных выпадкаў падчас наведвання масавых спартыўных і забаўляльных мерапрыемстваў. Паказчыкі фізічнага развіцця. Гігіенічныя патрабаванні да цела і значэнне іх захавання падчас заняткаў фізічнымі практыкаваннямі для здароўя. Значэнне правільнай паставы і правілы яе кантролю падчас заняткаў фізічнымі практыкаваннямі.

## РУХАЛЬНЫЯ ЎМЕННІ І НАВЫКІ

**Страявыя практыкаванні:** пастраенне ў шарэнгу і калону па камандзе настаўніка; разлік па парадку, павароты на месцы, направа (налева) пад лічэнне, перастраенне з калоны па адным у калону па два паваротам налева; пачатак хадзьбы з левай нагі; выкананне каманд «На месцы шагам марш!», «Шагам марш!».

***Гульні:*** «Па месцах», «Дакладны паварот», «Слухай каманды», «Святлафор».

**Агульнаразвіццёвыя і карыгіруючыя практыкаванні:** спалучэнне выпадаў, нахілаў, прыседаў з рухамі рук без прадметаў і з прадметамі; на развіццё гнуткасці; дыхальныя; на паставу;

на месцы ва ўпоры без прадметаў і з прадметамі на галаве; у руханні; комплексы практыкаванняў з прадметамі (мячамі, скакалкамі, гімнастычнымі палкамі, абручамі) і без прадметаў.

***Гульні:*** «Палка пад нагамі», «Зблытай сігнал», «Што змянілася», «Па месцах», «Забаронены рух».

**Хадзьба:** са зменай даўжыні і частаты крокаў; прыстаўнымі і скрыжаванымі крокамі ўлева і ўправа; з перакрыжаваннем з пяткі на насок; з рознымі становішчамі і рухамі рук; з музычным суправаджэннем.

***Гульні:*** «Займі сваё месца», «Следапыт», «Па сцежцы», «Цераз купіны і пянькі».

**Бег:** з высокім падыманнем бядра; з захлёстам галёнкі; чаўночны бег 4×9 м, бег са старту з апорай на адну руку; на хуткасць (адлегласць да 30 м); з пераадольваннем перашкод вышынёй 20 см; бег з даступнай для кожнага вучня хуткасцю (адлегласць да 500 м).

***Гульні:*** «Змена месцаў», «Сустрэчная эстафета», «Бег з пераследаваннем», «Памяняй кубікі», «Два старты».

**Скачкі:** на дзвюх нагах па разметках; на адной назе па квадратах, са скакалкай (да 30 с); з нагі на нагу (адлегласць да 12 м); у даўжыню з месца цераз перашкоду; «у кроку» з 2—3 крокаў разбегу; у даўжыню з 5—7 крокаў разбегу спосабам «сагнуўшы ногі» (зона адштурхвання — 40 см).

***Гульні:*** «Салкі ў прыседзе», «Вуда скачковая», «Эстафета з бегам і скачкамі», «Скачок за скачком», «Чыя каманда скокне далей», «Ручаёк».

**Кіданні:** набіўнога мяча (0,5 кг) з-за галавы з месца і кроку; тэніснага мяча ў сценку на далёкасць адскоку; тэніснага мяча спосабам «з-за спіны цераз плячо» стоячы бокам у напрамку кідання; з кроку; на далёкасць; у гарызантальную і вертыкальную цэлі (1×1 м) з адлегласці 4—5 м.

***Гульні:*** «Цэлься без промаху», «Снайперы», «Чый адскок далейшы».

**Лажанне, перапаўзанне:** лажанне па гімнастычнай сценцы ў гарызантальным і вертыкальным напрамках аднайменным і змешаным спосабамі; на руках без дапамогі ног; перапаўзанне пераступаючы (цераз бервяно); перапаўзанне па-пластунску, на баку.

***Гульні:*** «Эстафеты з бегам і лажаннем», «Перапаўзі, не страць».

**Практыкаванні ў раўнавазе:** хадзьба па рэйцы гімнастычнай лаўкі (з даставаннем прадметаў з падлогі ў прыседзе і з нахілам; цераз набіўныя мячы; з паваротам кругом).

***Гульні:*** «Збяры ўсе прадметы», «Глядзі, не зваліся», «Эстафеты з элементамі раўнавагі».

**Школа мяча:** кіданне і лоўля мяча дзвюма рукамі на ўзроўні грудзей (на месцы ў парах, каля сценкі, у шарэнгах) з паступовым павелічэннем тэмпу выканання; вядзенне мяча на месцы і пры перамяшчэнні па прамой і са змяненнем напрамку; падача мяча адной рукой у гульні «Мяч над сеткай».

***Гульні:*** «Дваццаць перадач», «Хуткаснае вядзенне мяча», «Дзесяціметровы дрыблінг», «Гонка мячоў», «Хуткасная перадача мяча».

**Перамяшчэнне на лыжах:** слізготны крок без палак і з палкамі (палкі за спінай, трымаючы за сярэдзіну); спуск па пакатым схіле ў высокай і нізкай стойках; пад'ём «усходкамі» па пакатым схіле; перамяшчэнне на лыжах на адлегласць 500 м з даступнай для кожнага вучня хуткасцю.

***Гульні:*** «Хто першы», «Сустрэчная эстафета», «Змяні флажок», «Данясенне», «Хто далей», «Праз вароты».

## РАЗВІЦЦЁ ФІЗІЧНЫХ ЯКАСЦЕЙ

**Развіццё хуткасці:** бег з высокім падыманнем бядра ва ўпоры і на месцы; бег дробнымі крокамі з максімальнай частатой рухаў на адрэзках 10—15 м; бег з перасledаваннем на адрэзках 15—20 м; бег з розных зыходных становішчаў з максімальнай хуткасцю (адлегласць 10—15 м).

**Развіццё сілы рук, ног, тулава:** згібанне і разгібанне рук ва ўпоры лежачы на гімнастычнай лаўцы; віс на сагнутых руках (х); падыманне тулава са становішча лежачы на спіне (дз); падцягванне ў вісе (х); падыманне сагнутых ног у вісе; скачкі ў глыбіню з вышыні 40 см і з далейшым выскокваннем уверх; скачкі са скакалкай.

**Развіццё гнуткасці:** махі нагамі ва ўпоры ці з апорай (уперад, назад, у бакі), нахілы з розных зыходных становішчаў (стоячы, седзячы) з дапамогай настаўніка; падыманне тулава ў зыходным становішчы лежачы на жываце, рукі за галаву (ногі ўтрымлівае партнёр).

**Развіццё сілавой і хуткаснай вынослівасці:** паўторны бег 2—3×40—60 м у 3/4 сілы; пераменны бег 2—3×40—50 м праз 100 м хадзьбы; чаўночны бег 4×10—12 м; хадзьба ў сярэднім тэмпе (адлегласць да 800 м); бег у павольным раўнамерным тэмпе з даступнай індывідуальнай хуткасцю (да 3,5 мін); перамяшчэнне на лыжах на адлегласць да 1000—1200 м у павольным тэмпе.

# V КЛАС

## АСНОВЫ ВЕДАЎ

Правілы бяспечных паводзін на ўроках «Фізічнай культуры і здароўя». Рухальны рэжым школьніка (ранішняя гімнастыка, фізкультхвілінкі, рухавыя перапынкі, гадзіны і дні здароўя, спартыўныя спаборніцтвы, заняткі ў спартыўных секцыях). Правілы беражлівых адносін да інвентара і абсталявання. Пераахаладжэнне і яго папярэджванне на занятках і падчас самастойных прагулак зімой. Значэнне фізічных практыкаванняў для здароўя і разумовай працаздольнасці. Правілы выканання практыкаванняў комплексу ранішняй гімнастыкі. Правілы гульні «Мяч над сеткай». Правілы спаборніцтваў па кіданні мяча.

## РУХАЛЬНЫЯ ЎМЕННІ І НАВЫКІ

**Страявыя практыкаванні:** разлік на першы-другі-трэці; рапарт настаўніку; павароты направа, налева; паварот кругом (пераступаннем); перастраенне з адной шарэнгі ў дзве і наадварот (па раздзяленнях і ў цэлым; два павароты налева (направа) без зрокавага кантролю.

***Гульні:*** «Дакладны паварот», «Па месцах», «Алавянныя салдацікі», «Чыя шарэнга лепшая», «Хутка па месцах».

**Хадзьба:** з рознымі становішчамі і рухамі рук; са зменай даўжыні і частаты крокаў; з выпадамі; з перакочваннем з пяткі на насок і да т. п. *(на выбар настаўніка)*; са змяненнем напрамку па камандзе (правым плячом уперад, левым плячом уперад).

***Гульні:*** «Па сцежцы», «Стоп», «Захавай паставу», «Карлікі і веліканы».

**Агульнаразвіццёвыя і карыгіруючыя практыкаванні:** спалучэнне выпадаў, нахілаў, прыседаў з рухамі рук без прадметаў

і з прадметамі; комплексы практыкаванняў без прадметаў і з прадметамі (гімнастычнымі палкамі, абручамі, скакалкамі, на гімнастычнай лаўцы, каля гімнастычнай сценкі); практыкаванні ў парах на развіццё гнуткасці; дыхальныя; на паставу.

***Гульні:*** «Змена месцаў», «Абруч на сябе», «Палка пад нагамі», «Утрымай абруч», «Хто сядзе першы», «Прыдумай сам».

**Бег:** спецыяльныя бегавыя практыкаванні (бег з высокім падыманнем бядра; бег з захлёстам галёнкі); чаўночны бег 4×9 м; нізкі старт; бег на адлегласць 30 м; з пераадольваннем перашкод вышынёй 30—40 см; бег на адлегласць 500 м (дз, х) з даступнай для кожнага вучня хуткасцю.

***Гульні:*** «Эстафетны бег», «Выклік нумароў», «Спаборніцтвы з элементамі спрынтэрскага бегу», «Эстафета з абручамі», «Хто хутчэй», «Гонка калясніц», «Эстафета з трыма мячамі», «Эстафета са змяненнем напрамку», «Сустрэчная эстафета».

**Скачкі:** у даўжыню з разбегу (з месца штуршком адной нагі; з месца штуршком адной нагі «ў кроку»; з разбегу «ў кроку» цераз гарызантальныя і вертыкальныя (да 30 см) перашкоды; «у кроку» на ўзвышэнне, адштурхваючыся ад гімнастычнага мосціка; у цэлым спосабам «сагнуўшы ногі», на вынік (зона адштурхвання — да 40 см); у вышыню з разбегу спосабам «пераступанне» (цераз гумовы шнур, які ляжыць на падлозе, «на ўзлёт»; з бакавога разбегу з прызямленнем на штуршковую і махавую нагу цераз рызінку на вышыні да 30 см з 3—5 крокаў разбегу).

***Гульні:*** конкурс «Скачкі з месца цераз ручаёк», «Хто далей скокне», «Эстафета з бегам і скачкамі», «Маршавыя салкі са скачкамі», «Вуда», «Саскоч у ваду», «Сарві яблык», «Саскоч і павярніся», «Салкі ў прыседзе».

**Кіданні:** тэніснага мяча з месца, стоячы бокам у напрамку кідання; са скрыжаванага кроку; з двух крокаў разбегу ў сектар 40°; на вынік; спецыяльныя практыкаванні кідальніка (кіданне ў падлогу на вышыню падскоку; у сценку на далёкасць адскоку; набіўнога мяча (0,5 кг) з-за галавы наперад з месца і кроку).

***Гульні:*** «Чый адскок далейшы», «Метка ў цэль», «Снайперы», «Рухомая цэль», «Паляўнічыя і качкі», «Паспей злавіць», «Збі кеглі».

**Лажанне, перапаўзанне:** лажанне на руках па гарызантальнай і нахіленай лесвіцы, па канаце (шасце) адвольным спосабам (да 2,5 м); перапаўзанне з грузам на спіне; адпаўзанне ўбок.

***Гульні:*** «З мячом пад дугой», «Перапаўзі, не страць», «Міннае поле».

**Практыкаванні ў раўнавазе:** стойка на адной назе на набіўным мячы з расплюшчанымі і заплюшчанымі вачыма; перамяшчэнні правым (левым) бокам па вузкай рэйцы гімнастычнай лаўкі, скрыжаванымі крокамі па гімнастычнай лаўцы.

***Гульні:*** «Разыдзіся, не паваліся», «Скокні, павярніся».

**Школа мяча:** вядзенне мяча на месцы; пры перамяшчэнні крокам і бегам са змяненнем напрамку; вядзенне мяча на хуткасць па прамой і са змяненнем напрамку; перадача і лоўля мяча на хуткасць каля сценкі; верхняя перадача мяча каля сценкі; падача мяча адной рукой; кіданні мяча з двух крокаў у руху; розыгрыш мяча на тры пасы; вучэбная гульня «Мяч над сеткай».

***Гульні:*** «20 перадач», «Цэлявая перадача», «Хуткаснае вядзенне мяча», «Дрыблінг».

**Перамяшчэнне на лыжах:** папераменны двухкрокавы ход; тэхніка пад'ёмаў і спускаў: пад'ём наўскасяк «паўелачкай»; спуск у нізкай стойцы; праходжанне дыстанцыі 500 м з даступнай для кожнага вучня хуткасцю.

***Гульні:*** «Перамена месцаў», «Збяры флажкі», «Бобслей на раўніне», «Здолей устаяць», «Праз вароты», «Па месцах», «Маршавыя салкі».

## РАЗВІЦЦЁ ФІЗІЧНЫХ ЯКАСЦЕЙ

**Развіццё хуткасці рухаў, спрыту:** бег ва ўпоры з высокім падыманнем бядра; бег дробнымі крокамі з максімальнай частатой рухаў на адрэзках да 20 м; бег з гандыкапам на адрэзках 15—20 м; бег з розных зыходных становішчаў па сігнале на адрэзках 15—20 м; бег на хуткасць на адлегласць 30—40 м.

**Развіццё сілы:** скачкі са скакалкай на месцы і ў руху; скачкі з вышыні да 50 см з далейшым выскокваннем уверх; падцягванне ў вісе (х) і падыманне тулава са становішча лежачы на спіне, рукі скрыжаваныя на грудзях; падыманне прамых ног у вісе спінай да гімнастычнай сценкі; практыкаванні з набіўнымі мячамі (1 кг).

**Развіццё хуткаснай і агульнай вынослівасці:** паўторны бег 2—3×60—80 м у 3/4 сілы; пераменны бег 2—3×60—80 м праз 100 м павольнага бегу; бег у павольным тэмпе, які чаргуецца з

хадзьбой (да 4 мін); перамяшчэнне на лыжах з даступнай для кожнага вучня хуткасцю на адлегласць да 1500 м (за ўрок).

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВУЧНЯЎ, ЯКІЯ ЗАВЯРШАЮЦЬ НАВУЧАННЕ Ў V КЛАСЕ

Вучні у м е ю ц ь:

выконваць ранішнюю гімнастыку;

выконваць агульнаразвіваючыя практыкаванні;

выконваць асноўныя цыклічныя рухі (бег, перамяшчэнне на лыжах);

скакаць у даўжыню з разбегу (агульная схема скачка);

кідаць мяч з месца;

гуляць у рухавыя гульні і гульню «Мяч над сеткай».

З а ў в а г а. Вучні на працягу пяці гадоў навучання павінны паказаць станоўчую дынаміку ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці ў кожным тэсце. Іншыя патрабаванні ў пачатковай школе не прадугледжваюцца. Вынікі тэстаў выкарыстоўваюцца для матывацыі заняткаў фізічнай культурай як паказчык індывідуальнага развіцця школьнікаў і планавання індывідуальнай работы з імі.

## ПАЗАКЛАСНЫЯ ФОРМЫ ЗАНЯТКАЎ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРАЙ

**Спартыўныя гурткі** арганізуюцца, у першую чаргу, па відах спорту, якія складаюць аснову зместу вучэбнага працэсу па фізічным выхаванні, маюць глыбокія традыцыі ў школе. Вучэбна-трэніровачны працэс арганізуецца з улікам фізічнай падрыхтаванасці вучняў, іх узросту. Праграма складаецца кіраўніком гуртка.

**Групы агульнай фізічнай падрыхтоўкі з аздараўленчай накіраванасцю.** Арганізуюцца для асноўнай масы вучняў школы, жадаючых умацаваць сябе фізічна. Аснову зместу заняткаў у такіх групах могуць складаць практыкаванні з розных раздзелаў праграмы, якія мяняюцца ў залежнасці ад пораў года.

**Фізкультурна-масавыя спартыўныя мерапрыемствы.** «Дні (тыдні) здароўя». Арганізуюцца 1 раз на месяц. Мэта: прыцягнуць увагу ўсіх вучняў школы да штодзённых заняткаў фізічнымі практыкаваннямі, здаровага ладу жыцця. Праводзяцца

яны з выкарыстаннем натуральных аздараўленчых сродкаў: сонца і паветра. Усе вучні павінны мець дазвол урача.

Прыкладныя «Дні (тыдні) здароўя»: «Тыдзень АФП», «Тыдзень рухальнай актыўнасці», «Дзень асілка», «Тыдзень лыжнага спорту», «Дзень бегуна», «Дзень скакуна», «Дзень кідальніка» і да т. п.

Конкурсы: «Абсалютны чэмпіён малодшых класаў школы», «Лепшы клас». Конкурсы праводзяцца на працягу вучэбнага года з улікам проціпаказанняў для вучняў падрыхтоўчай групы.

*Дадатак 1*

**Інтэгральная шкала ацэнкі вучэбных дасягненняў вучняў дапаможнай школы**

| Балы | Паказчыкі |
|---|---|
| 1—2 | Распазнаванне асобных вывучаемых раздзелаў праграмы (бег, скачкі, кіданне, раўнавага і г. д.). Уменне выконваць агульнаразвіццёвыя практыкаванні, хадзьбу, бег і г. д., паўтараючы за настаўнікам. Наяўнасць істотных памылак і частковае іх устараненне з дапамогай настаўніка. |
| 3—5 | Узнаўленне нязначнай часткі праграмы (бег, скачкі, выкананне агульнаразвіццёвых практыкаванняў і г. д.) пасля тлумачэння і паказу настаўнікам. Наяўнасць асобных істотных памылак, іх устараненне з дапамогай настаўніка. |
| 6—8 | Усвядомленае выкананне рухальных уменняў і навыкаў значнай часткі праграмы. Узнаўленне значнай часткі матэрыялу (раздзелаў праграмы) пасля слоўнага тлумачэння і паказу ў знаёмай сітуацыі. |
| 9—10 | Усвядомленае выкананне рухальных уменняў і навыкаў і арыенціроўка ў розных умовах. Устараненне нязначных памылак па слоўнай інструкцыі настаўніка. Уменне правесці агульную і спецыяльную размінку самастойна і з класам. Веданне найпрасцейшых правілаў спаборніцтваў па вывучаемых відах спорту. |

*Дадатак 2*

## Нарматывы ацэнкі ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці

### *Хлопчыкі*

| Кантрольныя практыкаванні | Класы | Узроўні дасягненняў | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | высокі | | вышэйшы за сярэдні | | сярэдні | | ніжэйшы за сярэдні | | нізкі | |
| | | 10 | 9 | 8 | 7 | 6 | 5 | 4 | 3 | 2 | 1 |
| Бег 30 м з высокага старту (с) | II | 6,0 | 6,2 | 6,4 | 6,5 | 6,7 | 6,9 | 7,0 | 7,2 | 7,5 | 7,7 |
| | III | 5,7 | 5,9 | 6,1 | 6,2 | 6,3 | 6,5 | 6,7 | 6,9 | 7,2 | 7,4 |
| | IV | 5,5 | 5,7 | 5,9 | 6,0 | 6,1 | 6,2 | 6,3 | 6,5 | 6,8 | 7,0 |
| | V | 5,3 | 5,5, | 5,6 | 5,7 | 5,8 | 6,0 | 6,1 | 6,3 | 6,6 | 6,9 |
| Чаўночны бег 4×9 м (с) | II | 11,4 | 11,8 | 12,0 | 12,3 | 12,5 | 12,8 | 13,0 | 13,3 | 13,9 | 14,2 |
| | III | 11,0 | 11,4 | 11,6 | 11,8 | 12,0 | 12,2 | 12,4 | 12,7 | 13,1 | 13,3 |
| | IV | 10,6 | 10,9 | 11,1 | 11,3 | 11,5 | 11,7 | 11,9 | 12,1 | 12,6 | 13,0 |
| | V | 10,4 | 10,6 | 10,8 | 11,0 | 11,1 | 11,3 | 11,5 | 11,8 | 12,1 | 12,4 |
| Скачок у даўжыню з месца (см) | II | 142 | 136 | 130 | 127 | 122 | 120 | 115 | 110 | 104 | 100 |
| | III | 154 | 148 | 142 | 140 | 135 | 130 | 125 | 120 | 112 | 109 |
| | IV | 165 | 159 | 153 | 150 | 146 | 142 | 139 | 132 | 127 | 120 |
| | V | 175 | 170 | 165 | 161 | 157 | 153 | 150 | 144 | 136 | 132 |
| Нахіл уперад са становішча седзячы (см) | II | 10 | 7 | 5 | 4 | 2 | 1 | –1 | –3 | –6 | –8 |
| | III | 10 | 7 | 5 | 3 | 2 | 1 | 0 | –2 | –6 | –7 |
| | IV | 10 | 8 | 5 | 4 | 3 | 1 | 0 | –3 | –6 | –7 |
| | V | 9 | 7 | 5 | 4 | 3 | 1 | –1 | –3 | –6 | –7 |
| Віс на сагнутых руках (с) | II | 23 | 18 | 15 | 12 | 10 | 8 | 7 | 5 | 3 | 1 |
| | III | 24 | 22 | 18 | 15 | 13 | 11 | 9 | 7 | 5 | 2 |
| | IV | 37 | 30 | 24 | 20 | 17 | 14 | 12 | 9 | 6 | 3 |
| | V | 42 | 32 | 25 | 21 | 18 | 15 | 13 | 10 | 7 | 4 |
| Бег 500 м (мін, с) | II | 2,05 | 2,10 | 2,15 | 2,20 | 2,30 | 2,40 | 2,50 | 3,00 | 3,10 | 3,20 |
| | III | 2,00 | 2,05 | 2,10 | 2,15 | 2,25 | 2,35 | 2,45 | 2,55 | 3,05 | 3,15 |
| | IV | 1,55 | 2,00 | 2,05 | 2,10 | 2,20 | 2,30 | 2,40 | 2,50 | 3,00 | 3,10 |
| | V | 1,50 | 1,55 | 2,00 | 2,05 | 2,10 | 2,20 | 2,30 | 2,40 | 2,50 | 3,00 |
| Кіданне мяча вагой 0,15 кг (м) | II | 23 | 21 | 19 | 17 | 15 | 13 | 11 | 9 | 7 | 6 |
| | III | 26 | 24 | 22 | 20 | 18 | 16 | 14 | 12 | 10 | 8 |
| | IV | 29 | 27 | 25 | 23 | 21 | 19 | 17 | 15 | 12 | 9 |
| | V | 32 | 30 | 28 | 26 | 24 | 22 | 20 | 18 | 15 | 10 |

Дадатак 3

## Нарматывы ацэнкі ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці

### *Дзяўчынкі*

| Кантрольныя практыкаванні | Класы | Узроўні дасягненняў | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | высокі | | вышэйшы за сярэдні | | сярэдні | | ніжэйшы за сярэдні | | нізкі | |
| | | 10 | 9 | 8 | 7 | 6 | 5 | 4 | 3 | 2 | 1 |
| Бег 30 м з высокага старту (с) | II | 6,2 | 6,4 | 6,6 | 6,8 | 6,9 | 7,1 | 7,3 | 7,6 | 7,9 | 8,1 |
| | III | 6,0 | 6,1 | 6,3 | 6,4 | 6,6 | 6,7 | 6,9 | 7,1 | 7,4 | 7,6 |
| | IV | 5,7 | 5,9 | 6,1 | 6,2 | 6,3 | 6,5 | 6,6 | 6,9 | 7,2 | 7,4 |
| | V | 5,5 | 5,7 | 5,9 | 6,0. | 6,1 | 6,2 | 6,4 | 6,5 | 6,8 | 7,1 |
| Чаўночны бег 4×9 м (с) | II | 11,8 | 12,2 | 12,5 | 12,8 | 13,1 | 13,3 | 13,6 | 14,0 | 14,6 | 15,0 |
| | III | 11,4 | 11,8 | 12,0 | 12,2 | 12,4 | 12,6 | 12,9 | 13,1 | 13,6 | 13,9 |
| | IV | 11,1 | 11,4 | 11,6 | 11,9 | 12,0 | 12,2 | 12,4 | 12,7 | 13,2 | 13,5 |
| | V | 10,8 | 11,0 | 11,2 | 11,5 | 11,6 | 11,8 | 12,0 | 12,3 | 12,6 | 12,9 |
| Скачок у даўжыню з месца (см) | II | 130 | 125 | 120 | 117 | 114 | 110 | 105 | 100 | 95 | 90 |
| | III | 142 | 137 | 132 | 130 | 125 | 123 | 119 | 114 | 105 | 100 |
| | IV | 154 | 147 | 141 | 138 | 135 | 131 | 127 | 121 | 115 | 110 |
| | V | 163 | 155 | 150 | 148 | 143 | 140 | 136 | 131 | 125 | 120 |
| Нахіл уперад са становішча седзячы (см) | II | 11 | 8 | 7 | 5 | 4 | 3 | 1 | 0 | –3 | –4 |
| | III | 12 | 10 | 8 | 7 | 4 | 3 | 2 | 1 | –3 | –5 |
| | IV | 12 | 10 | 8 | 6 | 5 | 3 | 2 | 0 | –3 | –4 |
| | V | 12 | 10 | 7 | 5 | 4 | 3 | 1 | –1 | –4 | –5 |
| Падыманне тулава са становішча лежачы на спіне (кольк. за 30 с) | II | 22 | 20 | 18 | 17 | 16 | 15 | 14 | 13 | 11 | 9 |
| | III | 24 | 21 | 20 | 19 | 18 | 17 | 16 | 14 | 13 | 10 |
| | IV | 24 | 22 | 21 | 20 | 19 | 18 | 17 | 16 | 14 | 12 |
| | V | 25 | 23 | 22 | 20 | – | 19 | 18 | 17 | 15 | 10 |
| Бег 500 м (мін, с) | II | 2,15 | 2,20 | 2,25 | 2,30 | 2,35 | 2,45 | 2,55 | 3,05 | 3,15 | 3,25 |
| | III | 2,10 | 2,15 | 2,20 | 2,25 | 2,30 | 2,40 | 2,50 | 3,00 | 3,10 | 3,20 |
| | IV | 2,05 | 2,10 | 2,15 | 2,20 | 2,25 | 2,35 | 2,45 | 2,55 | 3,05 | 3,10 |
| | V | 1,55 | 2,00 | 2,05 | 2,10 | 2,15 | 2,25 | 2,35 | 2,45 | 2,55 | 3,05 |
| Кіданне мяча вагой 0,15 кг (м) | II | 14 | 13 | 12 | – | 11 | 10 | 8 | 7 | 6 | 5 |
| | III | 17 | 16 | 15 | 14 | 13 | 12 | 10 | 9 | 8 | 7 |
| | IV | 19 | 18 | 17 | 16 | 15 | 14 | 12 | 11 | 9 | 8 |
| | V | 22 | 21 | 20 | 19 | 16 | 15 | 13 | 12 | 10 | 9 |

# САЦЫЯЛЬНА-БЫТАВАЯ АРЫЕНЦІРОЎКА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Мэтай прадмета «Сацыяльна-бытавая арыенціроўка» (СБА) у I—V класах дапаможнай школы з'яўляецца фарміраванне ў вучняў практычных уменняў арыенціроўкі ў навакольным свеце (у побыце, ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі), авалоданне некаторымі спосабамі дзейнасці чалавека ў паўсядзённым жыцці, бытавымі працоўнымі працэсамі.

Гэта вызначае рашэнне наступных задач:

- фарміраванне ў вучняў бытавых працоўных уменняў (у сферы асабістай гігіены, арганізацыі харчавання, догляду жылля, адзення, абутку і іншых прадметаў ужытку);
- фарміраванне эканоміка-бытавых уменняў (беражлівыя адносіны да акаляючых прадметаў, свайго адзення, абутку, прадуктаў і прыгатаванай ежы, электрычнасці, вады і інш.);
- арыенціроўка вучняў у паслугах розных прадпрыемстваў і ўстаноў (гандлю, службы быту, сувязі, культуры, медыцынскай дапамогі), фарміраванне практычных уменняў карыстацца імі;
- фарміраванне ўменняў карыстацца паслугамі грамадскага транспарту;
- арыенціроўка вучняў у нормах культуры паводзін, узаемаадносін паміж рознымі людзьмі (знаёмымі і незнаёмымі, старэйшымі і малодшымі, аднагодкамі), фарміраванне ўменняў зносін;
- карэкцыя недахопаў развіцця пазнавальнай дзейнасці школьнікаў.

Гэтыя задачы ўказваюць на галоўныя напрамкі педагагічнай работы, на падставе якіх выдзелены восем асноўных раздзелаў:

1. Асабістая гігіена.
2. Харчаванне.
3. Адзенне.
4. Абутак.
5. Жыллё.
6. Пакаёвыя расліны.
7. Вуліца. Транспарт.
8. Прадпрыемствы, установы.

Дадзеныя раздзелы з'яўляюцца пастаяннымі на працягу ўсіх гадоў навучання дзяцей у малодшых класах. У праграме III—V класаў выдзелены таксама раздзел «Медыцынская дапамога».

Праграма пабудавана паводле канцэнтрычнага прынцыпу. Вывучэнне раздзелаў на працягу навучальнага года можа планавацца педагогам у іншай паслядоўнасці, чым прапанавана ў праграме.

У сувязі з рэзкай дыферэнцыяцыяй дзяцей паводле запасу практычных навыкаў і ўменняў змест навучання школьнікаў розных класаў адной паралелі можа быць розны. Таму *рэгламентацыя праграмнага зместу па класах з'яўляецца прыкладнай* і адпавядае, галоўным чынам, прынцыпу лагічнага размеркавання матэрыялу з улікам ступені ўзрастання яго складанасці. Педагогам варта, абапіраючыся на праграмны матэрыял усіх гадоў навучання ў межах кожнага раздзела і «Асноўныя патрабаванні да ўменняў вучняў, якія завяршаюць навучанне ў V класе», *вызначаць змест работы ў сваім класе на дыягнастычнай аснове* — з улікам рэальнага ўзроўню дасведчанасці і падрыхтаванасці вучняў.

Уменні, якія фарміруюцца ў дзяцей на спецыяльных уроках СБА, патрабуюць замацавання, удасканалення, рэгулярнага і сістэматычнага прымянення ў практычнай дзейнасці. Але шырокае кола жыццёва важных сацыяльна-бытавых уменняў, якія неабходна сфарміраваць у вучняў, і абмежаванне магчымасцей настаўніка фактарам часу (1—2 урокі на тыдзень) не дазваляюць ажыццявіць паўнацэннае замацаванне многіх уменняў. Таму паспяховасць педагагічнай работы па сацыяльна-бытавой арыенціроўцы вучняў залежыць ад *узаемадзеяння настаўніка і выхавальніка (а яшчэ лепш і бацькоў):* узгодненасці іх дзеянняў, інфармаванасці пра работу адзін аднаго і яе вынікі, скаардынаванасці планаў работы. У выніку такой інтэграцыі педагагічных намаганняў забяспечваецца цэласнасць і сістэмнасць працэсу сацыяльна-бытавой арыенціроўкі вучняў. Такім чынам, *дадзеная праграма адрасавана як настаўнікам СБА, так і выхавальнікам (бацькам).*

Эфектыўнасць педагагічнага працэсу залежыць і ад выкарыстоўваемых метадаў і прыёмаў навучання. Асноўнымі на ўроках па сацыяльна-бытавой арыенціроўцы ў малодшых класах з'яўляюцца: дэманстрацыя, назіранне, тлумачэнне, экскурсіі, практыкаванні, мадэліраванне рэальных сітуацый, дыдактычныя, рэжысёрскія і сюжэтна-ролевыя гульні, гульнёвыя сітуацыі, заданні-

спаборніцтвы, прыём параўнання і інш. Характэрнай асаблівасцю і асноўным недахопам дзейнасці вучняў дапаможнай школы з'яўляецца нізкі ўзровень самастойнасці дзяцей. Таму на ўроках СБА важна ствараць умовы для фарміравання не толькі рухальных, але і агульнапрацоўных (інтэлектуальных) уменняў: арыенціроўкі ў заданні, планавання ходу яго выканання і ажыццяўлення самакантролю. З гэтай мэтай разумна выкарыстоўваць тэхналагічныя карты выканання бытавых працоўных працэсаў. Галоўная ўмова эфектыўнасці выкарыстоўваемых метадаў і прыёмаў — улік пры іх адборы і прымяненні дыдактычных і карэкцыйных задач навучання, а таксама сацыяльна-бытавога вопыту дзяцей. Пералік асноўных метадаў і прыёмаў навучання ўключае ў сябе *метадычны кампанент праграмы*.

Спецыфікай дадзенага вучэбнага прадмета з'яўляецца неабходнасць забеспячэння шэрагу ўрокаў спецыяльнымі матэрыяламі і прыладамі працы: прадуктамі, посудам, сталовымі прыборамі, кухонным начыннем, тазікамі, мылам, лейкамі, шчоткамі, крэмам для абутку і інш. Правядзенне некаторых урокаў (мыццё адзення, умыванне і інш.) патрабуе спецыяльнага памяшкання. Таму мэтазгодна абсталяваць у школе асобнае памяшканне для вучняў малодшых класаў або забяспечыць ім доступ у кабінет СБА для старшакласнікаў. Кабінет павінен быць укамплектаваны ўсім неабходным (у адпаведнасці з праграмнымі патрабаваннямі). Толькі пры ўмове неабходнага матэрыяльнага забеспячэння ўрокаў па сацыяльна-бытавой арыенціроўцы магчымая рэалізацыя праграмы ў поўным аб'ёме.

Завяршае праграму *пералік асноўных патрабаванняў да ўменняў вучняў, якія завяршаюць навучанне ў V класе*. Аднак, у сувязі з магчымымі індывідуальнымі цяжкасцямі ў тых ці іншых вучняў, педагагічныя намаганні павінны быць накіраваны на дасягненне кожным школьнікам максімальна магчымага для яго ўзроўню развіцця ў сферы сацыяльна-бытавой арыенціроўкі.

На падставе педагагічнай дыягностыкі ў канцы навучання школьніка ў малодшых класах можа складацца яго *выпускны пашпарт*, які ўяўляе сабой апісанне ўзроўню сацыяльна-бытавой кампетэнтнасці вучня па вывучаных тэмах. Гэты пашпарт перадаецца настаўніку, які выкладае прадмет «Сацыяльна-бытавая арыенціроўка» ў сярэдніх і старшых класах, што ў пэўнай ступені будзе садзейнічаць забеспячэнню пераемнасці паміж навучаннем дзяцей у малодшых і наступных класах.

ПРАГРАМЫ

# І КЛАС

## 1. Асабістая гігіена

*Мыццё твару, вушэй, шыі, рук, ног.* Правілы, способы дзеянняў і іх паслядоўнасць. Карыстанне прадметамі асабістай гігіены (мыла, ручнік).

*Догляд зубоў.* Правілы, способы дзеянняў і іх паслядоўнасць пры выкананні чысткі зубоў. Прадметы гігіены (зубная шчотка, зубная паста, зубны парашок), карыстанне імі. Неабходнасць і перыядычнасць (два разы на дзень) чысткі зубоў. Паласканне поласці рота пасля кожнага ўжывання ежы.

*Расчэсванне валасоў.* Карыстанне расчоскай. Расчэсванне кароткіх валасоў. Расчэсванне валасоў перад люстэркам.

*Ранішні і вячэрні туалет.* Паслядоўнасць выканання ранішняга і вячэрняга туалету. Захоўванне прадметаў асабістай гігіены.

## 2. Харчаванне

*Прадукты харчавання: садавіна, агародніна, ягады.* Способы ўжывання (у сырым, вараным і інш. выглядзе). Кулінарныя стравы з садавіны, агародніны, ягад (суп, салат, кампот, сок і інш.), іх пазнаванне ў час ужывання ў сталовай. Распазнаванне свежых і сапсаваных прадуктаў (садавіны, агародніны, ягад). Мыццё садавіны, агародніны, ягад.

*Посуд і сталовыя прыборы.* Карыстанне посудам (талерка, кубак, шклянка) і сталовымі прыборамі (відэлец, сталовая і чайная лыжкі). Правілы ўжывання ежы (есці ціха, не спяшацца, добра пераўжоўваць ежу, дапамагаць хлебам пры набіранні ежы ў лыжку і інш.). Карыстанне сурвэткай.

*Культура паводзін за сталом.*

*Уборка стала пасля ежы.*

## 3. Адзенне

*Способы зашпільвання і расшпільвання адзення.* Віды засцежак для адзення: гузікі, кнопкі, аплікі, маланкі, ліпкія ленты «ліпучкі». Зашпільванне і расшпільванне адзення з рознымі засцежкамі.

*Складванне адзення.* Прыёмы складвання насовак, трусоў, маек. Складванне адзення ў стосік.

*Спосабы развешвання адзення:* на кручок, на адзежную вешалку.

*Размяшчэнне адзення* на стуле, на паліцы.

### 4. Абутак

*Абуванне.* Знаходжанне ў групе абутку аднолькавых па найменні пар. Састаўленне пар абутку. Правільнае абуванне, адрозніванне правага і левага чаравіка.

*Зашнуроўванне абутку.* Прыёмы выканання шнуроўкі. Завязванне вузельчыка і банціка.

*Прыбіранне пылу і гразі з абутку.* Скураны абутак. Прыбіранне пылу і гразі са скуранога абутку вільготнай анучкай, засохлай гразі — цвёрдай шчоткай.

*Сушка мокрага скуранога абутку.*

### 5. Жыллё

*Навядзенне парадку* (у партфелі, на рабочым месцы вучня ў класе, на паліцах з вучнёўскімі прыладамі, кнігамі, цацкамі, у прыложкавай тумбачцы і г. д.). Правілы і спосабы навядзення парадку (уборка лішніх прадметаў, рацыянальнае размяшчэнне неабходных прадметаў).

*Засціланне пасцелі.* Спосабы дзеянняў і іх паслядоўнасць.

*Прыбіранне пылу.* Прыбіранне пылу з цацак (з драўляных — вільготнай анучкай, з мяккіх — шчотачкай, з гумавых і пластмасавых — пры дапамозе вады).

### 6. Пакаёвыя расліны

*Паліў пакаёвых раслін.* Неабходны інвентар. Правілы паліву з лейкі. Патрабаванні да вады для паліву.

*Выдаленне сухіх лістоў.* Неабходны інвентар (нажніцы). Спосабы дзеянняў.

*Прыбіранне пылу з буйных тоўстых гладкіх лістоў.* Неабходны інвентар (вільготная анучка ці губка). Патрабаванні да вады (цёплая). Правілы і спосабы дзеянняў.

### 7. Вуліца. Транспарт

*Арыентаванне і паводзіны пешаходаў на вуліцы.* Правілы паводзін пешаходаў на вуліцы: правілы руху па тратуары (правабаковы рух; нельга штурхацца, перагароджваць увесь тратуар

і інш.); недапушчальнасць арганізацыі гульняў на праезнай частцы; пераход вуліцы па пешаходным пераходзе.

*Паводзіны пасажыраў у грамадскім транспарце.* Правілы пасадкі ў грамадскі транспарт і выхаду з яго. Правілы паводзін пасажыраў у грамадскім транспарце.

### 8. Прадпрыемствы, установы

*Арыентаванне ў магазіне.* Магазіны, іх прызначэнне. Экскурсія ў магазін.

*Паводзіны пакупнікоў у магазіне.* Правілы паводзін у магазіне. Дзеянні пакупніка: выбар тавару і яго аплата (мадэліраванне рэальных сітуацый). Маўленчы этыкет пакупніка.

## II КЛАС

### 1. Асабістая гігіена

*Расчэсванне валасоў.* Расчэсванне доўгіх валасоў. Завязванне банта.

*Догляд пазногцяў.* Чыстка пазногцяў. Карыстанне прыладамі для чысткі пазногцяў (шчотачкай, пілачкай).

### 2. Харчаванне

*Прадукты харчавання: малочныя, мучныя.* Спосабы спажывання (у сырым, смажаным і інш. выглядзе). Кулінарныя стравы з малочных прадуктаў (малочны суп, запяканка, сырнікі і інш.), з мукі (бліны і інш.), іх пазнаванне ў час ужывання ў сталовай.

*Рэжым харчавання* (неабходнасць ужывання ежы ў пэўны час). Суаднясенне часу сутак з часам ужывання ежы (снеданне, абед, полудзень, вячэра). Арыентаванне ў асноўных стравах снедання, абеду і вячэры.

*Прыёмы вымання прадуктаў з упакоўкі:* разгортванне ўпаковак (цукеркі, сырка, марожанага і інш.); раскрыццё ўпаковак шляхам разрывання іх па лініі склейвання (пакет сушак, пернікаў і інш.); развязванне поліэтыленавых пакетаў (з пячэннем, цукеркамі і інш.). Выкладванне мучных вырабаў, цукерак, фруктаў на блюда, сподак, талерку.

*Сервіроўка стала да снедання (вячэры).* Выбар неабходнага посуду і сталовых прыбораў, правілы і паслядоўнасць іх размяшчэння на стале.

*Культура паводзін за сталом:* як браць ежу з агульнага блюда (браць бліжэйшы кавалак, бутэрброд і г. д.); звяртацца да суседзяў за сталом з просьбай падаць блюда, калі яно стаіць далёка, і інш. Маўленчы этыкет за сталом.

### 3. Адзенне

*Выбар адзення* ў адпаведнасці з будучай дзейнасцю: школьнай, дамашняй, спартыўнай, святочнай (мадэліраванне рэальных сітуацый).

*Складванне адзення.* Прыёмы складвання кашулі.

*Развешванне штаноў, спадніц* на адзежныя вешалкі з кручкамі; на спецыяльныя вешалкі з заціскам.

*Размяшчэнне адзення ў шафе.* Спосабы размяшчэння адзення ў шафе. Правілы захоўвання адзення ў шафе.

*Чыстка адзення шчоткай.* Прадмет працы (мяккая шчотка). Правілы і спосабы дзеянняў. Змочванне шчоткі вадой у выпадку неабходнасці. Устанаўленне прадметаў адзення, якія патрабуюць чысткі.

*Дробны рамонт адзення.* Інструменты і прыстасаванні, неабходныя для рамонту адзення (іголкі, нажніцы, ніткі, шпількі, напарстак). Правілы карыстання імі. Арганізацыя рабочага месца. Падрыхтоўка іголкі і ніткі да работы (адмерванне ніткі патрэбнай даўжыні, адразанне ніткі ад шпулькі нажніцамі, уцягванне ніткі ў іголку, завязванне вузельчыка).

### 4. Абутак

*Мыццё гумавага абутку.* Гумавы абутак. Правілы і спосабы дзеянняў пры мыцці гумавага абутку. Выціранне вымытага абутку насуха.

*Сушка мокрага гумавага абутку.*

*Чыстка скуранога абутку губкай* са спецыяльным саставам.

### 5. Жыллё

*Прыбіранне пылу.* Выціранне пылу з прадметаў цвёрдай мэблі (з мэблі з непаліраванай паверхняй — вільготнай анучкай, з мэблі з паліраванай паверхняй — сухой анучкай), з падаконніка.

### 6. Пакаёвыя расліны

*Прыбіранне пылу з апушаных лістоў.* Неабходны інвентар (мяккі пэндзлік ці шчотачка). Правілы і спосабы дзеянняў.

*Выціранне вазонаў, мыццё паддонаў.*

### 7. Вуліца. Транспарт

*Арыентаванне і паводзіны пешаходаў на вуліцы.* Правілы пераходу вуліцы: арыентаванне на сігналы святлафора; рух па пешаходным пераходзе.

*Паводзіны пасажыраў у грамадскім транспарце.* Правілы паводзін пасажыраў у грамадскім транспарце. Маўленчы этыкет пасажыраў.

### 8. Прадпрыемствы, установы

*Арыентаванне ў магазіне.* Віды магазінаў (аддзелаў магазінаў): «Адзенне», «Абутак», «Цацкі», «Мэбля», «Садавіна, агародніна» і інш. Распазнаванне віду магазіна па вітрыне, умоўным абазначэнні-сімвале. Знаходжанне магазіна (аддзела), у якім можна набыць той ці іншы прадмет (у працэсе гульнёвых сітуацый).

*Паводзіны пакупнікоў у магазіне.* Дзеянні пакупніка ў магазіне (аддзеле) самаабслугоўвання: знаходжанне патрэбнага тавару і яго аплата ў касе (мадэліраванне рэальных сітуацый). Культура выбару тавару (захаванне парадку на паліцах, цэласнасці ўпаковак і інш.), паводзіны ў магазіне. Абавязковасць аплаты тавару.

## III КЛАС

### 1. Асабістая гігіена

*Расчэсванне валасоў.* Расчэсванне кароткіх і доўгіх валасоў. Выкарыстанне рызінак, заколак для валасоў.

*Догляд пазногцяў.* Падстрыганне пазногцяў на пальцах рук і ног.

*Уменне ажыццяўляць самакантроль свайго знешняга выгляду.* Ацэнка з дапамогай люстэрка свайго знешняга выгляду (чысціня скуры твару, валасоў, прычасанасць валасоў, ахайнасць адзення, абутку), уменне пры неабходнасці ўносіць змены.

### 2. Харчаванне

*Прадукты харчавання.* Паўтарэнне і пашырэнне ведаў пра вывучаныя раней групы прадуктаў (садавіна, агародніна, ягады, малочныя, мучныя прадукты). Арыентаванне ў назвах асноўных страў, якія штодзень ужываюцца дзецьмі на снеданне, абед,

полудзень, вячэру. Выбар прадуктаў, неабходных для прыгатавання простых страў (у працэсе дыдактычных гульняў).

Збожжавыя прадукты (крупы), спосабы іх ужывання. Кашы з розных круп (манная, рысавая, грэцкая, прасяная, аўсяная, ячная), іх пазнаванне і адрозніванне ў час ужывання ў сталовай.

Захоўванне прадуктаў харчавання (у хлебніцы, халадзільніку і інш.). Экскурсія на школьны харчаблок.

*Прыёмы вымання прадуктаў з упакоўкі:* адкрыванне бутэлек з накрыўкамі, якія закручваюцца (з напіткам, мінеральнай вадой і інш.); раскрыццё пакетаў з сокам, малаком і інш. Наліванне соку, напітку і інш. з бутэлек, пакетаў у кубкі, шклянкі.

*Прыгатаванне напіткаў.* Простыя спосабы прыгатавання розных напіткаў: размешванне растваральных парашкоў, варэння.

*Культура паводзін за сталом.* Маўленчы этыкет за сталом. Правілы ўжывання ежы.

*Мыццё посуду.* Патрабаванні да вады. Прадметы працы (анучка, губка і інш.). Арганізацыя рабочага месца. Правілы і спосабы дзеянняў. Сушка вымытага посуду (размяшчэнне ў сушылцы або выціранне ручніком).

## 3. Адзенне

*Складванне* розных прадметаў адзення. Прыёмы складвання маек, трусоў, кашуль, кофт і інш.

*Прышыванне гузікаў.* Разнастайнасць гузікаў: па колеры; па форме; па велічыні; па колькасці дзірачак. Падбор гузікаў і нітак па колеры да тканіны. Прышыванне гузікаў з дзвюма дзірачкамі з утварэннем «ножкі».

*Ручное мыццё адзення.* Абсталяванне рабочага месца. Прыгатаванне вады для мыцця. Выкарыстанне мыйных сродкаў (мыла, пральны парашок). Паслядоўнасць выканання працэсу мыцця: замочванне, намыльванне, адмыванне, паласканне, выкручванне. Сушка бялізны: выпростванне і ўстрэсванне вырабу, развешванне. Развешванне адзення на вяроўцы для прасушвання (з дапамогай прышчэпак і без іх).

Ручное мыццё дробных рэчаў: насовак, шкарпэтак.

## 4. Абутак

*Чыстка абутку.* Чыстка скуранога абутку крэмам. Неабходныя прадметы працы. Падбор колеру крэму ў адпаведнасці з колерам абутку. Паслядоўнасць дзеянняў пры чыстцы абутку

крэмам. Спосабы навядзення бляску на пачышчаным абутку (выкарыстанне аксаміткі або спецыяльнай губкі для абутку).

*Сушка мокрага абутку.* Спосабы сушкі мокрага абутку (гумавага, скуранога).

## 5. Жыллё

*Падмятанне падлогі.* Неабходны інвентар (венік або шчотка, шуфлік). Правілы і спосабы дзеянняў пры падмятанні падлогі венікам, шчоткай. Уборка смецця.

*Сухая ўборка памяшкання.* Правілы і паслядоўнасць правядзення сухой уборкі памяшкання (навядзенне парадку, падмятанне падлогі, прыбіранне пылу).

## 6. Пакаёвыя расліны

*Рыхленне глебы ў вазоне.* Прадмет працы (драўляны калочак). Правілы і спосабы дзеянняў пры рыхленні.

*Комплексны догляд пакаёвых раслін: выкарыстанне засвоеных працэсаў* (паліў, выдаленне сухіх лістоў, выціранне пылу з лістоў, рыхленне глебы, выціранне вазонаў, мыццё паддонаў).

## 7. Вуліца. Транспарт

*Арыентаванне і паводзіны пешаходаў на вуліцы.* Правілы пераходу вуліцы: арыентаванне на сігналы святлафора; рух па пешаходным пераходзе *(паўтарэнне)*. Правілы пераходу вуліц, дзе няма ні святлафора, ні пешаходнага пераходу.

*Паводзіны пасажыраў у грамадскім транспарце.* Месцы пасадкі ў грамадскі транспарт (прыпынкі). Правілы паводзін на прыпынках грамадскага транспарту, пасадкі ў грамадскі транспарт і выхаду з яго. Культура паводзін пасажыраў грамадскага транспарту.

## 8. Прадпрыемствы, установы

*Арыентаванне ў магазіне.* Разнастайнасць тавараў у адным магазіне, зручнасць універсальных магазінаў для пакупнікоў. Арыентаванне ў магазіне: знаходжанне патрэбных тавараў, размешчаных у розных аддзелах магазіна.

Працэс куплі ў магазіне праз прадаўца (мадэліраванне рэальных сітуацый). Зносіны з прадаўцом: зварот да прадаўца з пытаннямі пра наяўнасць і кошт тавару; з просьбай паказаць тавар (сшытак, майку і інш.) або адлічыць патрэбную колькасць

тавару (два сшыткі, тры булачкі і інш.). Маўленчы этыкет пакупніка. Правілы паводзін пакупніка (прытрымліванне чаргі і інш.).

*Паводзіны ў месцах адпачынку. Парк.* Спосабы адпачынку ў парку. Правілы паводзін у парку.

### 9. Медыцынская дапамога

*Аказанне першай медыцынскай дапамогі* (сабе ці таварышу): пры ўдары (накладванне халоднага кампрэса-прымочкі); пры насавым крывацёку (адкінуць галаву і налажыць на пераноссе халодны кампрэс).

## IV КЛАС

### 1. Асабістая гігіена

*Ацэнка свайго знешняга выгляду.* Уменне ацэньваць свой знешні выгляд (чысціня скуры твару, рук, валасоў, стан пазногцяў, прычасанасць валасоў, ахайнасць адзення, абутку), уменне пры неабходнасці ўносіць змены. Правілы і спосабы агульнага догляду цела.

*Догляд валасоў.* Заплятанне касічкі.

### 2. Харчаванне

*Прадукты харчавання.* Паўтарэнне і пашырэнне ведаў пра вывучаныя ў папярэдніх класах групы прадуктаў (садавіна, агародніна, ягады, малочныя, мучныя прадукты, крупы), спосабы іх ужывання ў ежу. Правілы і прыёмы захоўвання прадуктаў і прыгатавання страў.

Мясныя і рыбныя прадукты, спосабы іх ужывання ў ежу. Правілы, спосабы і месцы захоўвання мясных і рыбных прадуктаў. Спосабы выбару дабраякасных прадуктаў.

Арыентаванне ў назвах і складзе асноўных страў, якія штодзень ужываюцца дзецьмі на снеданне, абед, полудзень, вячэру. Выбар прадуктаў, неабходных для прыгатавання простых страў (у працэсе дыдактычных гульняў).

*Посуд і сталовыя прыборы.* Карыстанне сталовымі прыборамі: відэльцам і нажом.

Чайны, кававы посуд. Сервіроўка стала да чаю (кавы): выбар неабходнага посуду і прыбораў, іх размяшчэнне на стале.

*Мыццё посуду* (чайнага, кававага) з выкарыстаннем мыйных сродкаў для выдалення плям, налёту ад чаю, кавы і г. д.

*Прыгатаванне напіткаў.* Простыя спосабы прыгатавання напіткаў: прыгатаванне кавы, какавы, напітку з растваральных парашкоў; прыгатаванне чаю з выкарыстаннем заваркі ў пакецiках. Дабаўленне цукру, малака, вяршкоў у розныя напіткі.

*Прыгатаванне бутэрбродаў.* Прыгатаванне бутэрбродаў з гатовых кампанентаў (нарэзаных педагогам кавалачкаў хлеба, каўбасы, агурка і г. д.). Вызначэнне, з якіх прадуктаў складаецца бутэрброд. Намазванне кавалачка хлеба маслам. Размяшчэнне на кавалачку хлеба з маслам гатовых кампанентаў бутэрброда (каўбасы, сыру, агурка і інш.). Састаўленне розных па знешнім выглядзе бутэрбродаў з аднолькавых кампанентаў. Упрыгожванне бутэрбродаў. Размяшчэнне бутэрбродаў на блюдзе, талерцы.

*Культура паводзін за сталом* (як частаваць і дзякаваць суседзям па стале і інш.). Маўленчы этыкет за сталом. Правілы ўжывання ежы.

### 3. Адзенне

*Спосабы захоўвання адзення.* Складванне, развешванне. Размяшчэнне складзенага адзення ў чамадан, сумку, пакет.

*Ручное мыццё адзення.* Адбор адзення, якое патрабуе мыцця. Правілы захоўвання бруднага адзення да мыцця (асобна ад чыстага; у сухім выглядзе; белая бялізна асобна ад каляровай і інш.). Сартаванне адзення па колеры (белая і каляровая бялізна). Мыццё дробных прадметаў адзення. Спосабы сушкі адзення (развешванне на вяроўцы, размяшчэнне ў сушылцы).

*Прасаванне адзення.* Падрыхтоўка рабочага месца для прасавання. Правілы тэхнікі бяспекі падчас працы з прасам. Паслядоўнасць дзеянняў пры прасаванні. Прасаванне дробных баваўняных рэчаў: насовак, хусцінак і інш.

*Прышыванне гузікаў.* Прышыванне гузіка з чатырма дзірачкамі.

*Уцягванне рызінкі ў пояс прадметаў адзення* (трусоў, калготак, рэйтузаў і г. д.). Замацоўванне канцоў уцягнутай рызінкі сшываннем.

### 4. Абутак

*Чыстка абутку.* Чыстка тэкстыльнага абутку цвёрдай чыстай шчоткай.

Адрозненне абутку па матэрыяле (скураны, гумавы, тэкстыльны). Спосабы чысткі абутку з розных матэрыялаў: мыццё гумавага абутку; выціранне скуранога абутку вільготнай ануч-

кай, чыстка шчоткай з крэмам, губкай са спецыяльным саставам; чыстка тэкстыльнага абутку цвёрдай чыстай шчоткай (практычнае паўтарэнне).

*Сушка мокрага абутку.* Спосабы сушкі мокрага абутку з розных матэрыялаў (гумавага, скуранога, тэкстыльнага).

### 5. Жыллё

*Спосабы асвятлення памяшкання.* Асветленасць памяшкання (сонцам, з дапамогай асвятляльных прыбораў). Беражлівыя адносіны да расходавання электраэнергіі. Выключэнне і ўключэнне асвятляльных прыбораў. Карыстанне настольнай лямпай.

*Спосабы сухой уборкі памяшканняў:* навядзенне парадку, падмятанне падлогі, прыбіранне пылу з прадметаў мэблі.

*Утульнасць у доме.* Уменне ўпрыгожыць памяшканне (выкарыстанне пакаёвых раслін; букетаў з кветак, засушанага лісця, сухіх і зялёных галінак; прыгожых вырабаў, сурвэтак, малюнкаў і г. д.).

### 6. Пакаёвыя расліны

*Прыбіранне пылу з дробных гладкіх лістоў.* Неабходны інвентар (пульверызатар або змочаная вадой шчотачка). Правілы і спосабы выканання работы.

*Мыццё пакаёвых раслін.* Неабходны інвентар (тазік, цырата, вялікая лейка з сітцам). Абсталяванне рабочага месца. Правілы і паслядоўнасць выканання работы.

### 7. Вуліца. Транспарт

*Арыентаванне і паводзіны пешаходаў на вуліцы.* Загарадная дарога, асаблівасці яе будовы (праезная частка і абочына). Правілы руху пешаходаў па загараднай дарозе.

*Паводзіны пасажыраў у грамадскім транспарце.* Неабходнасць платы за праезд у грамадскім транспарце (куплянне праязных білетаў, талонаў). Арыентаванне ў праязных білетах, талонах (поўныя і льготныя). Месцы набыцця праязных дакументаў: кіёск, магазін, каса, у вадзіцеля, у кандуктара. Набыццё талона. Правілы карыстання праязнымі дакументамі: кампасціраванне; прад'яўленне кантралёру, вадзіцелю; захоўванне да канца паездкі. Культура паводзін і маўленчы этыкет пасажыраў (пры купляннi талонаў; пры перадачы талона на кампосцер і інш.).

### 8. Прадпрыемствы, установы

*Арыентаванне ў магазіне.* Невялікія *гандлёвыя пункты:* латкі, кіёскі. Асартымент іх тавараў (садавіна, агародніна, булачкі, кнігі, ручкі, сшыткі і інш.). Куплянне дробнага штучнага тавару пад наглядам педагога.

*Арыентаванне ў месцах культуры і адпачынку.* Экскурсія ў школьную бібліятэку. Правілы паводзін чытачоў у *бібліятэцы.* Запіс у бібліятэку. Зносіны чытачоў з бібліятэкарам. Правілы карыстання кнігамі.

Элементы кнігі: вокладка, старонкі, змест. Арыентаванне ў кнізе: знаходжанне яе назвы, аўтара; знаходжанне ў змесце неабходнага тэксту.

Экскурсія ў *кінатэатр.* Неабходнасць набыцця білетаў. Куплянне білетаў, захаванне пры гэтым правілаў маўленчага этыкету. Правілы паводзін гледачоў.

### 9. Медыцынская дапамога

*Аказанне першай медыцынскай дапамогі* (сабе ці таварышу): пры неглыбокіх парэзах, драпінах, ранках (змазванне дэзінфектарам — ёдам, зялёнкай, адэкалонам).

Дамашняя аптэчка: яе напаўненне, арыентаванне ў аптэчцы (знаходжанне бінту, ваты, ёду і інш.).

## V КЛАС

### 1. Асабістая гігіена

*Выкарыстанне касметычных сродкаў для догляду цела.* Касметычныя сродкі для догляду цела (крэм, гігіенічная памада), іх прызначэнне. Выкарыстанне крэму для догляду скуры рук. Выкарыстанне гігіенічнай памады. Прымяненне дзіцячага крэму для догляду скуры твару (сітуацыі, у якіх неабходна карыстацца крэмам; прыёмы нанясення крэму на скуру).

### 2. Харчаванне

*Прадукты харчавання.* Арыентаванне ў прадуктах вывучаных раней груп (садавіна, агародніна, ягады, малочныя, мучныя, мясныя, рыбныя прадукты, крупы): іх назвы, спосабы ўжывання ў ежу, спосабы, правілы і месцы захоўвання. Распаз-

наванне прыгодных для выкарыстання і сапсаваных прадуктаў харчавання.

Пашырэнне ведаў пра разнастайнасць прадуктаў, пра групы прадуктаў: кандытарскія вырабы, ласункі. Правілы і спосабы ўжывання ў ежу.

Меню. Арыентаванне ў назвах і складзе асноўных страў, якія штодзень ужываюцца дзецьмі на снеданне, абед, полудзень, вячэру. Адбор прадуктаў да пэўнага меню (у працэсе дыдактычных гульняў).

*Прыгатаванне чаю.* Інгрэдыенты, неабходныя для прыгатавання чаю: чайная заварка, кветкі або лісты некаторых раслін (ліпы, рамонкаў, суніц, малін і інш.); кіпень; цукар. Заварванне чаю. Захаванне правіл тэхнікі бяспекі пры абыходжанні з кіпенем. Уплыў чаю на арганізм чалавека. Значэнне правільнага прыгатавання чаю для захавання яго ўласцівасцей. Вызначэнне па надпісах на ўпакоўках чаю віду чайнай заваркі (рассыпная ці ў пакецiках).

*Прыгатаванне бутэрбродаў.* Вызначэнне, з якіх прадуктаў складаюцца дэманструемыя бутэрброды. Адбор прадуктаў для прыгатавання бутэрбродаў.

Апрацоўка прадуктаў для прыгатавання бутэрбродаў: зняцце скуркі з каўбасы, сыру, з адварной і сырой агароднiны), разразанне, наразанне, расціранне відэльцам. Намазванне хлеба маслам, мяккім сырам, прыгатаванай бутэрброднай пастай і да т. п. Размяшчэнне на кавалачку хлеба з маслам кампанентаў бутэрброда. Упрыгожванне бутэрбродаў рознымі спосабамі (галінкамі зяленіва, рубленым зяленівам, кропелькамі маянэзу, кетчупу і інш.). Спосабы размяшчэння бутэрбродаў на блюдах рознай формы.

*Стравы хуткага прыгатавання.* Прыгатаванне страў (каша, суп) шляхам заварвання кіпенем сухога змесціва і размешвання атрыманай сумесі. Захаванне тэхнікі бяспекі пры абыходжанні з кіпенем.

*Сервіроўка стала да абеду.* Выбар неабходнага посуду і сталовых прыбораў, правілы і паслядоўнасць іх размяшчэння на стале. Культура паводзін і маўленчы этыкет за сталом. Правілы ўжывання ежы.

### 3. Адзенне

*Захоўванне адзення.* Спосабы размяшчэння адзення ў шафе. Неабходнасць праветрывання і прасушвання шафы і адзення

(некалькі разоў на год). Спосабы размяшчэння адзення для праветрывання, прасушвання (на вяроўцы, на вешалцы і інш.).

*Ручное мыццё адзення.* Падрыхтоўка адзення да мыцця: адбор адзення, якое патрабуе мыцця; сартаванне адзення па колеры (белая і каляровая бялізна), па ступені забруджвання; ачыстка кішэняў ад смецця і пабочных прадметаў. Ручное мыццё кашулі, блузкі. Спосабы развешвання кашулі, блузкі для прасушвання (на вяроўцы, на вешалцы).

*Прасаванне адзення.* Прасаванне адзення простага крою з баваўнянай тканіны.

*Прышыванне гузікаў.* Прышыванне гузіка з «вушкам».

*Прышыванне вешалак.* Прышыванне вешалак з гатовага матэрыялу (тасьмы, шнурка і інш.) да адзення.

*Зашыванне расцягнутых петляў для гузікаў.* Уменне ажыццяўляць кантроль велічыні пятлі з дапамогай гузіка.

*Зашыванне адзення па распоратых швах.* Выкананне шва «строчка». Зашыванне адзення па распоратых швах швом «строчка».

### 4. Абутак

*Падрыхтоўка сезоннага абутку да захоўвання.* Умовы захоўвання сезоннага абутку: чысціня, сухасць абутку; захаванне формы абутку. Месцы захоўвання абутку. Падрыхтоўка да захоўвання сезоннага абутку з розных матэрыялаў: сушка, чыстка. Спосабы захавання формы абутку. Спосабы размяшчэння абутку для захоўвання (заварочванне ў паперу; укладванне ў кардонную каробку).

### 5. Жыллё

*Чыстка дываноў, дывановых дарожак, пакрыццяў механічнай шчоткай.* Механічная шчотка, яе будова. Правілы чысткі дываноў і дывановых пакрыццяў механічнай шчоткай.

*Вытрасанне невялікіх палавікоў.*

*Падмятанне лесвіцы, ганка.*

### 6. Пакаёвыя расліны

*Размнажэнне пакаёвых раслін.* Размнажэнне пакаёвых раслін разеткамі-«дзеткамі» (хларафітум, каменяломнік і інш.). Знаходжанне «дзетак» на раслінах, аддзяленне іх ад мацярынскай расліны. Пасадка маладой расліны ў падрыхтаваны педагогам вазон.

Размнажэнне пакаёвых раслін сцябловымі чаранкамі (традэсканцыя, фуксія, бальзамін і інш.). Назіранне за падрыхтоўкай чаранкоў педагогам. Пасадка чаранкоў у падрыхтаваныя педагогам вазоны.

Догляд маладых раслін (апрыскванне з пульверызатара, паліў). Назіранне змен, якія адбываюцца ў працэсе росту раслін.

### 7. Вуліца. Транспарт

*Арыентаванне і паводзіны пешаходаў на вуліцы.* Пашырэнне ведаў пра вуліцы: наяўнасць у вуліц назваў, у дамоў — нумароў; размяшчэнне на адным баку вуліцы будынкаў з цотнымі нумарамі, на другім — з няцотнымі. Арыентаванне на вуліцы. Формулы маўленчага этыкету пры звароце да прахожых з мэтай знайсці пэўную вуліцу ці дом. Назвы найбліжэйшых вуліц і вуліц, якія найбольш часта наведваюцца.

Паводзіны ў сітуацыі «Калі ты заблудзіў...».

*Паводзіны пасажыраў у грамадскім транспарце.* Наяўнасць маршруту ў грамадскага транспарту. Выбар патрэбнага аўтобуса (тралейбуса і інш.): арыентаванне па маршрутнай таблічцы і нумары аўтобуса (тралейбуса і інш.).

Прыпынкі грамадскага транспарту: кожны мае сваю назву, умоўныя абазначэнні відаў транспартных сродкаў, якія на ім спыняюцца, нумары аўтобусаў (тралейбусаў, трамваяў). Арыентаванне на прыпынках грамадскага транспарту.

Выкарыстанне формул маўленчага этыкету пры неабходнасці даведацца пра маршрут руху транспартнага сродку, пра назву прыпынку і да т. п. Культура паводзін пасажыраў.

### 8. Прадпрыемствы, установы

*Арыентаванне ў грамадска-бытавых установах.*

Распазнаванне *магазіна* па яго вітрыне, умоўным сімвалічным абазначэнні, шыльдзе. Абсталяванне і інвентар магазіна: прылавак, паліца, вітрына, каса, вагі, кошыкі для пакупак. Месцы і спосабы размяшчэння тавараў у магазіне.

Арыентаванне ў прадуктовых магазінах, іх аддзелах. Куплянне дробнага штучнага тавару (хлеба, булачак, ёгурту, марожанага, соку і г. д.) пад наглядам педагога. Упакоўванне купленых прадуктаў (неабходнасць змяшчэння некаторых прадуктаў

у поліэтыленавыя пакеты або заварочвання іх у паперу). Рацыянальнае размяшчэнне пакупак у сумцы.

Распазнаванне *пошты* па ўмоўным сімвалічным абазначэнні, шыльдзе. Памяшканне пошты, яго абсталяванне і прызначэнне прадметаў абсталявання. Віды паштовай карэспандэнцыі (лісты, паштоўкі, тэлеграмы). Разнастайнасць паштовак. Выбар і куплянне паштовак да пэўнага свята.

*Карыстанне тэлефонам.* Тэлефон, яго прызначэнне. Часткі тэлефона (трубка, дыск з лічбамі або кнопі, рычаг). Карыстанне тэлефонам. Адрозненне гудкоў «занята» і «свабодна» ў трубцы тэлефона. Нумары тэлефонаў. Нумары экстранага вызаву (01, 02, 03). Вядзенне гутаркі па тэлефоне (выклік урача да хворага, пажарнай машыны; віншаванне са святам, днём нараджэння; перадача звестак і інш.).

Распазнаванне *цырульні* па ўмоўным сімвалічным абазначэнні, шыльдзе. Правілы паводзін наведвальнікаў (мадэліраванне рэальных сітуацый).

### 9. Медыцынская дапамога

*Аказанне першай медыцынскай дапамогі* (сабе ці таварышу): пры ўкусе пчалы (чыстымі рукамі дастаць джала, змачыць месца ўкусу нашатырным спіртам, налажыць халодны кампрэс-прымочку). Арыентаванне ў дамашняй аптэчцы.

*Арыентаванне ў медыцынскіх установах: бальніцы, аптэцы, службе «хуткай дапамогі».* Уменне расказваць урачу пра сваё адчуванне (мадэліраванне рэальных сітуацый).

Агульнаазнаямляльная экскурсія ў *аптэку*. Асаблівасці тавараў: лекавыя сродкі (таблеткі, парашкі, настойкі, кроплі, мазі, лекавыя травы, вітаміны і інш.), перавязачныя матэрыялы (бінт, вата, пластыр і інш.), медыцынскія прылады (піпетка, градуснік, пузыр для лёду і інш.).

## МЕТАДЫЧНЫ КАМПАНЕНТ

**Дэманстрацыя** педагогам кожнага дзеяння працоўнага працэсу (з тлумачэннем).

**Экскурсіі, назіранні.**

**Практыкаванні:**

- паказ педагогам прадметаў, якія ён называе;
- называнне прадметаў пры іх прад'яўленні;
- трэніровачныя практыкаванні па засваенні асобных працоўных дзеянняў, рухальных прыёмаў;
- практыкаванні ў планаванні будучай дзейнасці, складанні справаздачы аб выкананай рабоце;
- размяшчэнне элементаў тэхналагічнага плана выканання пэўнага бытавога працоўнага працэсу ў правільнай паслядоўнасці;
- практыкаванні, накіраваныя на выпрацоўку ўменняў карыстацца паслугамі магазіна, пошты, бібліятэкі, транспарту, тэлефона і інш.;
- практыкаванні ў выкарыстанні формул маўленчага этыкету;
- выпраўленне памылак у запісах правіл, звестак і іншыя практыкаванні.

**Дыдактычныя гульні:**

- «Паглядзі і запомні»;
- «Што знікла?»;
- «Што змянілася?»;
- «Чацвёрты лішні»;
- «Навядзі парадак»;
- «Знайдзі памылку»;
- «Не памыліся!»;
- «Знайдзі такі самы прадмет» і інш.

**Сюжэтна-ролевыя гульні, мадэліраванне рэальных сітуацый** (могуць арганізоўвацца па кожнай тэме праграмы).

**Вучэбныя заданні:**

- «Пакажы, як ты ўмееш ... »;
- «Раскажы (пакажы, навучы) бацькам, выхавальнікам, чаму ты навучыўся»;
- «Дапамажы Каці (...) скласці ... »;
- «Навучы Кацю (...), як трэба ... » і інш.

**Гульнёвыя сітуацыі,** якія патрабуюць тлумачэння, паказу, дапамогі персанажам, якія не ведаюць (не ўмеюць), або выпраўлення іх памылак.

**Праблемныя сітуацыі,** якія патрабуюць прымянення ведаў і ўменняў у змененых умовах (ствараюцца ў працэсе сюжэтна-ролевых гульняў, мадэліравання рэальных сітуацый і г. д.).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВУЧНЯЎ, ЯКІЯ ЗАВЯРШАЮЦЬ НАВУЧАННЕ Ў V КЛАСЕ

Вучні ў м е ю ц ь:
выконваць ранішні і вячэрні туалет;
чысціць і падстрыгаць пазногці на пальцах рук і ног;
прычэсваць валасы;
мыць садавіну, агародніну, ягады;
называць стравы штодзённага рацыёну;
гатаваць простыя стравы (бутэрброды), заварваць чай;
сервіраваць стол да снедання (вячэры), абеду;
карыстацца сталовымі прыборамі (сталовай і чайнай лыжкамі, відэльцам і нажом);
прыбіраць стол пасля ўжывання ежы;
мыць посуд;
зашпільваць і расшпільваць адзенне з рознымі засцежкамі;
складваць і развешваць адзенне;
размяшчаць адзенне ў шафе;
чысціць адзенне шчоткай;
мыць дробныя прадметы адзення;
прасаваць адзенне простага крою;
прышываць гузікі (з дзвюма, чатырма дзірачкамі, з «вушкам»);
прышываць вешалкі да адзення;
уцягваць рызінку ў пояс прадметаў адзення;
зашываць адзенне па распоратых швах;
зашнуроўваць і завязваць абутак са шнуркамі;
мыць гумавы абутак;
чысціць скураны абутак крэмам;
чысціць тэкстыльны абутак шчоткай;
сушыць мокры абутак;
заўважаць у памяшканні непарадак (дзе чыста, а дзе брудна);
наводзіць парадак у памяшканні;
засцілаць ложак;
прыбіраць пыл з мэблі, падаконнікаў, цацак;
падмятаць падлогу;
чысціць механічнай шчоткай дываны і дывановыя дарожкі;
паліваць пакаёвыя расліны;
выдаляць сухія лісты;
прыбіраць пыл з лістоў пакаёвых раслін;
рыхліць глебу ў вазоне;

выціраць вазоны і мыць паддоны;

пераходзіць вуліцу, якая рэгулюецца святлафорам, і вуліцу, якая не рэгулюецца святлафорам;

арыентавацца на прыпынках грамадскага транспарту: называць прыпынак, від транспартнага сродку, які спыняецца на дадзеным прыпынку, і яго нумар;

купляць праязныя талоны;

кампасціраваць талоны;

прад'яўляць талоны, білеты кантралёру, вадзіцелю;

захоўваць правілы паводзін пасажыраў у грамадскім транспарце, карыстацца формуламі маўленчага этыкету;

вызначаць, у якім магазіне можна набыць названы ў заданні тавар;

пазнаваць магазін па яго вітрыне і ўмоўным знаку-сімвале;

купляць дробныя прадметы;

карыстацца тэлефонам.

## ЗМЕСТ


Беларуская мова. I—V класы ............................ 3

Русский язык. V клас ....................................... 32

Матэматыка. I—V класы .................................. 38

Чалавек і свет. I—V класы ............................... 70

Працоўнае навучанне. I—V класы ..................... 102

Фізічная культура і здароўе. I—V класы ........... 139

Сацыяльна-бытавая арыенціроўка. I—V класы .... 163

Вучэбнае выданне

**ПРАГРАМЫ**
**дапаможнай школы**
**з беларускай мовай навучання**

**І аддзяленне**

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**
**РУССКИЙ ЯЗЫК**
**МАТЭМАТЫКА**
**ЧАЛАВЕК І СВЕТ**
**ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ**
**ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ**
**САЦЫЯЛЬНА-БЫТАВАЯ АРЫЕНЦІРОЎКА**

**І–V класы**

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактары *Л. В. Дземід, А. М. Краўчанка*
Мастацкі рэдактар *І. А. Усенка*
Камп'ютэрная вёрстка *А. М. Кісялёва*
Карэктары *Т. Ф. Шайко, Ю. А. Якаўчэнка*

---

Падпісана ў друк 10.01.2007. Фармат 60×84/16. Папера газетная.
Гарнітура Школьная. Друк афсетны. Ум.-друк. арк. 10,69.
Ул.-выд. арк. 9,92. Тыраж 1160 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. ЛВ № 02330/0133300
ад 30.04.2004. 220004, Мінск, Караля, 16.

Надрукавана ў друкарні РУП «Прамдрук». ЛП № 02330/0148775
ад 30.04.2004. 220049, Мінск, Чарняхоўскага, 3.

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ПРАГРАМЫ

## ДАПАМОЖНАЙ ШКОЛЫ З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

I АДДЗЯЛЕННЕ

---

- **БЕЛАРУСКАЯ МОВА**
- **РУССКИЙ ЯЗЫК**
- **МАТЭМАТЫКА**
- **ЧАЛАВЕК І СВЕТ**
- **ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ**
- **ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ**
- **САЦЫЯЛЬНА-БЫТАВАЯ АРЫЕНЦІРОЎКА**

**I–V класы**

2007